# Беларуская літаратура 10



# Беларуская літаратура

Вучэбны дапаможнік для **10** класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання
(з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню)

Пад рэдакцыяй
А. П. Бязлепкінай-Чарнякевіч, І. Д. Воюш

*Дапушчана
Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Нацыянальны інстытут адукацыі
2020

Правообладатель Национальный институт образования

УДК 821.161.3.09(075.3=161.3=161.1)
ББК 83.3(4Беи)я721
Б43

А ў т а р ы:

**А. П. Бязлепкіна-Чарнякевіч** («Беларуская літаратура 1920—1930-х гадоў», «Максім Гарэцкі», «Уладзімір Дубоўка»), **А. А. Акушэвіч** («Беларуская літаратура пачатку XX стагоддзя», «Цётка», «Ядвігін Ш.», «Якуб Колас»), **І. Д. Воюш** («Уводзіны», «Змітрок Бядуля», «Кандрат Крапіва», «Міхась Зарэцкі»), **В. І. Еўмянькоў** («Развіццё новай беларускай літаратуры XIX стагоддзя»), **Н. В. Заяц** («Беларуская літаратура пасляваенных дзесяцігоддзяў (1945—1965)», «Пімен Панчанка»), **В. І. Караткевіч** («Янка Купала», «Максім Багдановіч», «Алесь Гарун»), **Н. В. Кузьміч** («Даўняя літаратура (XI—XVIII стагоддзі)»), **А. У. Скакоўская** («Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945)», «Героіка-патрыятычны пафас ваеннай лірыкі», «Іван Мележ»), **І. Ч. Часнок** («Кузьма Чорны»)

Р э ц э н з е н т ы:

вучоны савет дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (кандыдат філалагічных навук, дацэнт, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела тэорыі і гісторыі літаратуры *С. У. Калядка*); намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце, настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 1 імя Ф. Скарыны г. Мінска» *Н. У. Целяпун*; прафесар кафедры гісторыі беларускай літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар *Л. Д. Сінькова*; настаўнік беларускай мовы і літаратуры кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» дзяржаўнай установы адукацыі «Маларыцкая раённая гімназія» *М. І. Навумчык*

На вокладцы рэпрадукцыя карціны Л. М. Гоманава «Дарога».

**Умоўныя абазначэнні:**

— біяграфічны факт пра пісьменніка;

— успомніце раней вывучаны матэрыял;

— дадатковая інфармацыя;

— абмяркоўваем разам;

— пытанні і заданні даследчага, творчага характару;

— дадатковы матэрыял, размешчаны на электронным адукацыйным рэсурсе «Беларуская літаратура. 10 клас» (нацыянальны адукацыйны партал: http://e-vedy.adu.by). Для работы з рэсурсам трэба зарэгістравацца;

— спасылкі на заданні (QR-коды) для праверкі ведаў пры дапамозе смартфона або планшэта;

— матэрыял электроннага дадатку, які вывучаецца на павышаным узроўні

**ISBN 978-985-594-737-1**

© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2020

Правообладатель Национальный институт образования

# *Ад аўтараў*

Дарагія дзесяцікласнікі! У гэтым годзе ваша падарожжа па неабсяжнай і шматколернай краіне літаратуры працягваецца.

Вы пазнаёміліся ўжо са многімі выдатнымі творамі прыгожага пісьменства Беларусі, сталі дасведчанымі і кампетэнтнымі чытачамі: вывучылі асноўныя этапы развіцця літаратуры, даведаліся пра яе функцыі, роды і жанры, мастацкія тропы, навучыліся аналізаваць тэксты і многае іншае.

Цяпер свет літаратурнай творчасці раскрыецца перад вамі на больш высокім узроўні, паўстане перад вашымі вачамі як цэласная сістэма са сваімі заканамернасцямі. Набытыя веды і ўменні дапамогуць вам асвоіць новыя тэарэтычныя паняцці, узняцца яшчэ на адну прыступку ў асэнсаванні гісторыі літаратуры, навучыцца асновам літаратурна-крытычнай дзейнасці.

Важным кампанентам вывучэння літаратуры стане разважанне над знакавымі тэкстамі для беларускай паэзіі, прозы, драматургіі. Гэта не толькі развівае інтэлект і забяспечвае асобасны рост, але і дае пэўны эмацыянальны вопыт, разуменне каштоўнасці, важнасці жыцця асобнага чалавека і ўсяго народа. У X класе вы пазнаёміцеся з творамі сур’ёзнай, дарослай літаратуры, што прымушаюць задумацца над філасофскімі пытаннямі сэнсу жыцця, маральнага выбару, прызначэння прыгожага, разумення патрыятызму, выяўлення гуманізму.

Вучэбны дапаможнік быў створаны, каб суправаджаць вас у пазнанні новага, натхняць на адкрыцці, даваць нагоду задумацца над сэнсам мастацкай творчасці. Для гэтага арганізавана рубрыка «Уклад у літаратуру», дзе акрэслены здабыткі, якімі кожны майстар слова папоўніў скарбонку мастацкіх каштоўнасцей беларускай літаратуры. У рубрыцы «Літаратурныя сувязі» паказаны тэматычныя, жанравыя ўзаемадачыненні паміж мастацкімі творамі ў літаратурным працэсе, творчая пераемнасць розных пакаленняў пісьменнікаў.



Правообладатель Национальный институт образования

Асноўны тэкст вучэбнага дапаможніка будзе прызначаны для вывучэння, а паняцці на плашках з тэрмінамі пад рубрыкай «Тэорыя літаратуры» — для запамінання. Некаторыя тэарэтычныя моманты коратка растлумачаны побач з асноўным матэрыялам або ў зносках. У канцы дапаможніка змешчаны невялікі Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў, у які ўключаны ўсе паняцці, што сустракаюцца на старонках кнігі.

З мэтай развіцця і ўдасканалення вашых уменняў па аналізе тэкстаў розных жанраў у вучэбным дапаможніку пададзены алгарытмы аналізу паэтычнага, празаічнага, драматычнага твораў і прыведзены адпаведныя прыклады.

Для тых, каго цікавіць літаратура, паралельна з асноўным тэкстам пад рубрыкай «Навукоўцы гавораць» размешчаны вытрымкі з даследаванняў, навуковыя гіпотэзы і ідэі, пад рубрыкай «З успамінаў» — дзённікавыя, мастацкія, дакументальныя запісы.

Літаратуразнаўства, з аднаго боку, — свабодны творчы працэс спасціжэння і спараджэння ідэй, з другога — вельмі дакладная і строгая навука. Гэта кніга заклікана дапамагчы вам знайсці баланс паміж натхненнем і логікай і з карысцю для душы і розуму прайсці цікавымі, інтрыгуючымі, а часам і цярністымі шляхамі беларускай літаратуры.

Аўтары жадаюць вам плённай і захапляльнай вандроўкі ў свет прыгожага!

Правообладатель Национальный институт образования



# Уводзіны

**1.** Узгадайце, калі пачалося развіццё мастацкага слова на тэрыторыі Беларусі. **2.** Якія літаратурныя творы вам найбольш спадабаліся? Чым яны вылучаюцца (сюжэт, персанажы, майстэрства аўтара або інш.)?

**Літаратура — спецыфічная форма пазнання жыцця народа, выяўлення мастацкага спосабу мыслення.** Мастацкая літаратура — гэта цэласная сістэма з унутранымі сувязямі, заканамернасцямі развіцця, складанымі ўзаемадзеяннямі паміж тэкстам і чытачом, на якія ўплываюць грамадскія абставіны.

Этапы развіцця літаратуры, тэарэтычныя аспекты яе функцыянавання, літаратурную крытыку, ролю слоўнага мастацтва ў нашым жыцці даследуе **літаратуразнаўства**. Гэтай навуцы ўжо больш за 200 гадоў.

Вучоныя называюць **літаратурай** сукупнасць пісьмовых і друкаваных твораў прыгожага пісьменства ў іх узаемадзеянні.

Слова «літаратура» паходзіць ад лацінскага *litteratura*, што значыць ‘напісанае’, і таму творы вуснай народнай творчасці да літаратуры не адносяць.

У фальклорных творах, як правіла, няма канкрэтнага аўтара, яны бытуюць у вуснай форме. Літаратурныя творы функцыянуюць у запісаным (надрукаваным) выглядзе, і ў іх ёсць аўтар.

**Мастацкай літаратурай** называюць від мастацтва, у якім сродкам адлюстравання свету выступае слова (як у мастацтве фатаграфіі — святло, колер і перспектыва, у музыцы — гук, яго вышыня, працягласць, тэмбр).

Літаратуру можна з поўным правам назваць спосабам пазнання свету. Спачатку пісьменнік асэнсоўвае законы жыцця, пільна назіраючы за ім, а затым перадае сваё бачанне чытачам, якія праз мастацкі



Правообладатель Национальный институт образования

твор спазнаюць навакольнае асяроддзе. Паступова творы літаратуры фарміруюць светапогляд чытача. Напрыклад, асоба, знаёмая з творамі Максіма Гарэцкага, разумее трагізм становішча чалавека на вайне, апынаецца разам з героямі ў складаных жыццёвых сітуацыях.

Духоўныя каштоўнасці сцвярджаюцца, захоўваюцца і перадаюцца наступным пакаленням праз закладзеныя ў творах маральныя прынцыпы, праз жыццёвыя ўрокі, якія дае літаратура, праз выхаванне маладых чытачоў на літаратурнай класіцы. Дзякуючы гэтаму больш за сто гадоў беларуская літаратура аб’ядноўвае грамадства.

Даследаванне літаратуры ідзе ў трох напрамках, паводле якіх выдзяляюць тры **галіны літаратуразнаўства**: гісторыю літаратуры, тэорыю літаратуры і літаратурную крытыку.




! Дэталёва аналізаваць развіццё прыгожага пісьменства літаратуразнаўству дапамагае *тэксталогія* — спецыяльная дысцыпліна, якая вывучае і ўзнаўляе гісторыю і лёс твораў, іх варыянты, аўтарскія рэдакцыі з мэтай далейшага даследавання, інтэрпрэтацыі, апублікавання.

**I. *Гісторыя літаратуры*.** Даследуе заканамернасці ўзнікнення і развіцця пэўных літаратурных з’яў і фактаў, устанаўлівае значэнне творчасці пісьменнікаў і асобных твораў у нацыянальным, рэгіянальным і сусветным літаратурным працэсе (гл. раздзел «Тэорыя літаратуры. Літаратурны працэс»), жыцці грамадства.

У гісторыі беларускай літаратуры вучоныя вылучаюць некалькі этапаў. Новы этап можа пачацца па розных прычынах: у сувязі з культурнымі падзеямі, развіццём іншых відаў мастацтва, наватарскімі пошукамі асобных аўтараў, са зменамі гістарычных абставін, палітычнага ладу. Сістэмнае апісанне этапаў развіцця літаратуры называецца *перыядызацыяй*.

У X класе вы паслядоўна пазнаёміцеся з некаторымі **этапамі развіцця беларускай літаратуры:**

1. **Даўняя літаратура (XI—XVIII стагоддзі).** Зразумела, падчас такога працяглага перыяду літаратура змянялася, была неаднароднай.


Правообладатель Национальный институт образования

Літаратура *Сярэдневякоўя* (XI—XV стагоддзі), час пасля прыняцця хрысціянства, — гэта перыяд твораў царкоўна-рэлігійнай тэматыкі, дзейнасці беларускіх падзвіжнікаў Кірыла Тураўскага, Ефрасінні Полацкай, стварэння цэнтраў пісьменства, летапісання, распаўсюджвання рукапісных дакументаў і кніг.

У тэкстах часоў Вялікага Княства Літоўскага, у склад якога ўваходзіла тэрыторыя Беларусі, назіралася ўнікальная сітуацыя з наяўнасцю трох моў: дзвюх кніжных — інтэрнацыянальных (царкоўнаславянскай і лацінскай) і адной вуснай — старабеларускай. У XV стагоддзі, калі з'явіліся пераклады пісьмовых тэкстаў на нацыянальныя мовы, пазіцыя старабеларускай мовы ўмацавалася.

У XVI стагоддзі пачалася эпоха *Адраджэння* (або, па назве з лацінскай мовы, *Рэнесансу*), падчас якой еўрапейскія культуры звярнуліся да ідэалаў і каштоўнасцей антычнасці. Стварэнне статутаў Вялікага Княства Літоўскага, асветніцкая і літаратурная дзейнасць на старабеларускай мове Францыска Скарыны, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, лацінамоўная творчасць Міколы Гусоўскага, з'яўленне друку, напісанне твораў пра беларусаў на лацінскай і польскай мовах — вось няпоўны пералік таго, чым узбагаціла гэта эпоха літаратуру. Да гэтага ж часу адносяць і з'яўленне кітабаў — беларускамоўных тэкстаў, напісаных арабскімі літарамі.

У літаратуры XVII—XVIII стагоддзяў выдзяляюць эпохі барока і Асветніцтва. Падчас *барока* (XVI—XVIII стагоддзі) расквітнела паэзія (Сімяон Полацкі), з'явілася так званая школьная драма — камедыі, а з імі інтэрмедыі, а таксама творы палітычнай сатыры.

Творы мастацкай літаратуры на беларускіх землях, якія ўваходзілі ў склад Рэчы Паспалітай, пісаліся ў асноўным на польскай мове. Кніжная старабеларуская сыходзіла ў нябыт. Для стварэння мастацкіх тэкстаў усё часцей выкарыстоўвалася беларуская гутарковая мова. Праўда, аўтары заставаліся невядомымі, выдаваць кнігі на ёй было немагчыма — і творы распаўсюджваліся праз завучванне на памяць. З'яўляліся тэксты на лацінскай мове. Выхадцы з Беларусі, якія працавалі на ніве рускай культуры, пісалі па-руску (напрыклад, Сімяон Полацкі).

Літаратура эпохі *Асветніцтва* (другая палова XVIII — пачатак XIX стагоддзя) — гэта перыяд культу інтэлекту, рацыянальнага



Правообладатель Национальный институт образования

погляду на свет, распаўсюджвання свецкай друкаванай кнігі. У мастацтве другой паловы XVIII стагоддзя пераважаў такі мастацкі напрамак, як *класіцызм*.

2. **Развіццё новай беларускай літаратуры (XIX стагоддзе).** Беларуская літаратура названа новай таму, што ў ёй пасля доўгага перапынку на аснове гутарковых пластоў беларускай мовы аднавілася прыгожае пісьменства. Пэўны час для літаратуры было ўласціва шматмоўе.

Менавіта тады на літаратурнай ніве працавалі Ян Баршчэўскі, Ян Чачот, Уладзіслаў Сыракомля, Кастусь Каліноўскі, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Францішак Багушэвіч, Янка Лучына, Адам Гурыновіч і інш. Некаторыя пісьменнікі надавалі вялікае значэнне пачуццям чалавека, што выявілася ў літаратуры *сентыменталізму*; развіваўся *рамантызм*; зарадзіўся наіўны, а затым і класічны *рэалізм*, які стане адным з вядучых літаратурных напрамкаў на працягу XX і пачатку XXI стагоддзяў.

> ! Амаль да сярэдзіны XIX стагоддзя ў літаратурным асяроддзі Паўночна-Заходняга краю Расійскай імперыі панавалі традыцыі Рэчы Паспалітай з адпаведным дамінаваннем польскай мовы. Пасля паўстання 1830—1831 гадоў было ўведзена абавязковае вывучэнне рускай мовы — і паступова пісьменнікі з беларускіх тэрыторый пачалі ёй карыстацца. Статус беларускай мовы ў XIX стагоддзі моцна змяніўся: яна прайшла шлях ад вуснай гаворкі, увасобленай у ананімных тэкстах, да выкарыстання ў друкаваных аўтарскіх і перакладных творах.

3. **Беларуская літаратура першай паловы XX стагоддзя.** Адносна невялікі па працягласці перыяд першай паловы XX стагоддзя быў вельмі насычаны з пункту гледжання змен у сацыяльна-палітычных абставінах і ў слоўным мастацтве.

*У пачатку XX стагоддзя* фарміраваліся класічныя асновы беларускай літаратуры. Гэтаму спрыялі аўтары і стваральнікі першых беларускамоўных газет «Наша доля» і «Наша ніва», таму азначаны перыяд называюць нашаніўскім. У гэтых выданнях пачыналі творчы шлях пісьменнікі, якія заклалі падмурак беларускай літаратуры, — Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Максім Гарэцкі. Услед за паэзіяй сталі развівацца празаічныя жанры, літаратурная крытыка. Да рамантычных і рэалістычных далучыліся творы беларускага *мадэрнізму*.

Утварэнне БССР, палітыка беларусізацыі абумовілі наступны этап *літаратурна-грамадскага руху 1920—1930-х гадоў* — перыяд



Правообладатель Национальный институт образования

літаратурных спрэчак, творчых пошукаў і смелых эксперыментаў, дзейнасці літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», затым — арганізацыі БелАПП (Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў), што завяршыўся ўтварэннем Саюза пісьменнікаў БССР; гады самастойнага развіцця заходнебеларускай літаратуры. Гэта час фарміравання *сацыялістычнага рэалізму*, прыходу ў літаратуру Кузьмы Чорнага, Міхася Зарэцкага, Кандрата Крапівы, Андрэя Мрыя, перыяд ідэалагізацыі літаратуры, падпарадкавання яе палітычным установкам.

> ! Мастацкія тэксты першай трэці XX стагоддзя пераважна былі напісаны на беларускай мове як мове тытульнай нацыі. Таксама пісьменнікі Беларусі ў той час карысталіся рускай мовай, ідыш і польскай. Выбар мовы твора быў часцей за ўсё абумоўлены адукацыяй, паходжаннем аўтара і той аўдыторыяй, да якой ён хацеў звярнуцца.

Літаратура перыяду *Вялікай Айчыннай вайны* развівалася ва ўмовах змагання беларускага народа з захопнікамі. Яна прадстаўлена сатырычнай публіцыстыкай («Раздавім фашысцкую га́дзіну», «Партызанская дубінка»), нататкамі, кароткім апавяданнем і, несумненна, яркай паэзіяй, што выявілася ў вершах, баладах, ліра-эпічных паэмах. Аўтары ў імкненні ўзняць дух байцоў і жыхароў акупаваных тэрыторый плённа выкарыстоўвалі фальклорныя вобразы народных заступнікаў, барацьбітоў за волю.

Тэмы стваральнай працы, аднаўлення разбуранай краіны, перамогі над фашызмам сталі вызначальнымі для літаратуры *першых пасляваенных дзесяцігоддзяў:* 1945—1955 і 1955—1965 гадоў. Пазней ідэйна-тэматычныя абсягі літаратуры, натуральна, пашырыліся, а многія падзеі былі пераасэнсаваны. У пасляваенную паэзію прыйшлі такія майстры, як Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч, у драматургію — Андрэй Макаёнак. У гэты час літаратура ўзбагацілася аповесцямі, раманамі, эпапеямі мэтраў беларускай прозы Міхася Лынькова, Васіля Быкава, Івана Мележа, Уладзіміра Караткевіча, Івана Шамякіна.

**II.** ***Тэорыя літаратуры як навука.*** Дазваляе разабрацца ў літаратурных напрамках і плынях, складаных шляхах развіцця нацыянальнага прыгожага пісьменства, літаратурных родах і жанрах, вершаваных памерах, мастацкіх сродках, якія ствараюць індывідуальны стыль пісьменніка, а таксама ў іншых аспектах літаратурнай



Правообладатель Национальный институт образования

творчасці. Гэта дае магчымасць і чытачам, і навукоўцам правільна зразумець і вытлумачыць мастацкія вартасці тэкстаў, іх сэнс, ролю ў літаратурным працэсе. Напрыклад, тэарэтыкі прапануюць аднастайна прымяняць паняцце лірызму як «элемента эмацыянальнасці, паэтычнай усхваляванасці ў творах мастацтва», каб пазбегнуць двухсэнсоўнасці, розных трактовак.

**III.** ***Літаратурная крытыка.*** Заклікана ацаніць мастацкія тэксты. Часцей за ўсё гэта новыя творы, але бывае, што яны ўпершыню друкуюцца праз шмат гадоў пасля напісання, — і крытыка пачынае займацца імі пасля публікацыі. Задача літаратурных крытыкаў — аб’ектыўна, з навуковага пункту гледжання ацаніць поспехі, наватарства, знаходкі аўтара, параўнаць твор з іншымі падобнымі, паставіць яго ў кантэкст беларускай, а магчыма, еўрапейскай і сусветнай літаратуры, асэнсаваць яго значэнне для культуры і грамадства. Вядома, калі аўтарскаму тэксту не хапае пэўных істотных якасцей, літаратуразнаўцы могуць указаць на недахопы.

Адным словам, нацыянальныя літаратуры, як кавалачкі мазаікі, ствараюць карціну сусветнага мастацтва. Яны могуць быць больш яркія і ўплывовыя або зусім невялікія, але без аднаго фрагмента выява будзе няпоўная. Беларуская літаратура прыўнесла ў гэта вялікае мастацкае палатно свой унікальны нацыянальны свет, які рухаецца вакол земляробчага календара, знаходкі народнай мудрасці, вобразы загадкавага князя-ваўкалака, мужнага гусляра, селяніна-гаспадара і гараджаніна ў першым пакаленні, інтэлігента і інтэлектуала, вобразы беларускай прыроды і многае іншае, што можна пазнаць, калі прачытаць творы беларускіх пісьменнікаў.

1. З апорай на матэрыял раздзела самастойна дайце азначэнне паняццям «літаратура», «мастацкая літаратура». Параўнайце ваша азначэнне з трыма іншымі, прапанаванымі ў вучэбных дапаможніках, слоўніках або энцыклапедыях. Разгледжаныя вамі азначэнні супярэчаць адно аднаму або ўзаемадапаўняюцца?
2. Назавіце асноўныя галіны літаратуразнаўства. Якія ў іх задачы?



3. На якіх мовах ствараліся тэксты беларускай літаратуры на працягу яе развіцця? На якой падставе іншамоўныя творы далучаюць да беларускай літаратуры — паводле зместу, месца напісання, паказаных падзей беларускай гісторыі, наяўнасці персанажаў-беларусаў або інш.?



Правообладатель Национальный институт образования

## Літаратурны напрамак

Паводле перыядызацыі можна заўважыць, што з развіццём літаратуры напрамкі і плыні змяняліся, часам існавалі паралельна, часам аднаўляліся ў новым выглядзе.

***Літаратурны напрамак*** — творчае адзінства груп літаратараў пэўнага гістарычнага перыяду, блізкіх па светапоглядзе і мастацкай манеры.

Прадстаўнікі пэўнага літаратурнага напрамку распрацоўваюць агульныя матывы і тэматыку, карыстаюцца падобнымі выяўленчымі сродкамі. Часта ўтвараюць літаратурную суполку і выдаюць часопіс або альманах.

Літаратурныя напрамкі вырастаюць на глебе творчых метадаў, мастацкіх стыляў. У літаратуры агульнапрызнанымі сталі напрамкі і стылі рэнесансу, барока, класіцызму, сентыменталізму, рамантызму, рэалізму, мадэрнізму, постмадэрнізму.

**Рэнесанс.** Эстэтыка Рэнесансу стала адказам культуры на схаластыку і дагматызм Сярэдневякоўя, што выявілася ў з'яўленні пратэстантызму. Гэты этап таксама называюць Адраджэннем, што азначае абнаўленне, зварот пісьменнікаў, мысліцеляў, мастакоў да антычнай культуры і перайманне яе ўзнёслых ідэалаў.

Рэнесансны стыль мае на ўвазе погляд на антычнасць вачыма людзей з Сярэдневякоўя — прадстаўнікоў розных сацыяльных слаёў, перш за ўсё гараджан, якія вывучалі філасофію, а таксама паэтаў, мастакоў. Аб'ектам пазнання для іх у мастацтве і навуках стаў чалавек. Адсюль і назва гэтых дзеячаў — гуманісты.

***Схаластыка*** — сярэдневяковая філасофія, у якой дзеля тэарэтычнага абгрунтавання рэлігійных дагматаў выкарыстоўваюцца фармальныя, абстрактныя лагічныя аргументы.

У еўрапейскіх літаратурах запатрабаваным эпічным жанрам Рэнесансу была навела, у лірыцы найбольш ярка праявіўся санет, набыла папулярнасць драматургія. У літаратуры Вялікага Княства Літоўскага развіваліся жанры сілабічнай паэзіі (у ліку іншых — эпічная паэма), рэлігійна-філасофскай публіцыстыкі, летапіснай,



Правообладатель Национальный институт образования

мемуарнай літаратуры, дзелавога пісьменства, што адлюстравалася ў творчасці Францыска Скарыны, Міколы Гусоўскага.

**Барока.** Сутнасныя асновы барока выявіліся падчас грамадскіх, рэлігійных, навуковых узрушэнняў (напрыклад, рэфармацыйны рух, вучэнне Мікалая Каперніка). Падчас эпохі барока часткова разбуралася антычнае ўяўленне пра свет як разумнае і ўсталяванае адзінства, змяніўся рэнесансны падыход да асобы як каштоўнасці. Рэлігійна-схаластычны светапогляд Сярэдневякоўя не аднавіўся ў поўнай меры. Гэта «раздарожжа» на шляху развіцця літаратуры ўвасобілася ў эстэтыцы барока. Па-першае, чалавек у творах гэтага перыяду знаходзіцца ў нявызначанай пазіцыі — ён «і ўсё, і ніхто», таму яго перапаўняюць кантрасныя эмоцыі, перажыванні. Па-другое, свет паўстае перад ім драматычным, часта небяспечным, поўным таямнічых знакаў, супярэчлівым. Гэты свет можа спалучаць рысы рэальнасці і ілюзіі, прыгожага і агіднага, пачуццёвага і рацыянальнага.

Такі шырокі дыяпазон сэнсаў перадаецца ў творах барока незвычайнымі разгорнутымі метафарамі, іншасказаннямі, сімваламі. Жанры барока абнаўляюцца, узбагачаюцца за кошт набыткаў іншых родаў і відаў культуры.

> **!** Выдзяляюць «высокае» (арыстакратычнае, элітарнае) і «нізкае» (дэмакратычнае, масавае) барока. «Высокае» адрозніваецца цягай да рэдкага, выбітнага, экзатычнага, а «нізкае» — да штодзённага, грубаватага, камічна-парадыйнага. Часам у беларускай літаратуры выдзяляюць яшчэ «сярэдняе» барока — творы, якія прызначаліся для гараджан і збяднелых шляхціцаў.

Прадстаўніком «высокага» барока, напрыклад, быў Сімяон Полацкі, «нізкага» — аўтары інтэрмедый, батлейкавых спектакляў, палітычнай сатыры.

**Класіцызм.** Класіцысцкія творы мастацтва сталі вынікам звароту грамадства да класічных узораў антычнасці з іх упарадкаванасцю, значнасцю, дакладнасцю, строгім падзелам на прыгожае і агіднае, трагічнае і камічнае, высокае і нізкае.

Літаратурныя тэксты класіцызму маюць пэўныя асаблівасці: 1) інтэлектуальнае асэнсаванне жыццёвых з’яў; 2) імкненне да абсалютнага ідэалу; 3) перамога грамадзянскага абавязку над пачуццёвымі памкненнямі героя. Таму і персанажы класіцысцкай літаратуры манументальныя, значныя (падзвіжнікі, цары, палкаводцы). А жанры дакладна размежаваны на высокія (ода, трагедыя і інш.) і нізкія (байка, камедыя і інш.).



Правообладатель Национальный институт образования

! Трагедыя класіцызму была падпарадкавана пэўнаму рэгламенту: 1) адзінства месца дзеяння на працягу ўсіх пяці актаў; 2) адзінства самога дзеяння, дзе сюжэт павінен быў паказвацца цалкам — ад завязкі да развязкі; 3) адзінства часу, калі ўсе падзеі змяшчаліся прыкладна ў тры гадзіны.

Беларуская літаратура адгукнулася на класіцызм апасродкавана — праз парадыйна-сатырычныя творы Вікенція Равінскага «Энеіда навыварат» і Канстанціна Вераніцына «Тарас на Парнасе», дзе «высокае» (багі і героі) «пераапранута» ў «нізкае» (простых сялян). І таму пазнаць рысы класіцызму ў іх даволі складана.

**Сентыменталізм.** Сентыменталісты бачылі галоўную мэту ў пазнанні ўнутранага свету чалавека, яго сяброўскіх або інтымных пачуццяў, якія часта выяўляліся на фоне прыроды. Сацыяльны статус героя не меў вырашальнага значэння: персанажамі сентыменталісцкіх твораў маглі стаць і збяднелы шляхціц, і сялянка — іх памкненні і перажыванні сцвярджаліся як вартыя і самакаштоўныя. Сюжэт мог быць аддалены ад грамадска-палітычных падзей, замкнуты ў міжасабовых стасунках. Такія сюжэты ўвасабляліся ў жанрах ідыліі, пасталі, сентыментальнай аповесці, перапіскі. Сентыменталізм паўплываў на вершы Яна Чачота, творчасць Яна Баршчэўскага, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

Сентыменталізм яшчэ называюць перадрамантызмам, бо ён папярэднічаў гэтаму напрамку.

**Рамантызм.** Прадстаўнікі рамантызму адмаўлялі строгія правілы класіцысцкіх твораў, бачылі навакольнае як адлюстраванне двух супрацьлеглых светаў — дасканалага ідэальнага і недасканалага рэальнага. Яны імкнуліся выявіць незалежнага героя, што безнадзейна змагаецца з рэчаіснасцю, грамадствам, якое яго не разумее. Гэты ідэаліст, адзінокі летуценнік, змагар называецца ў літаратуразнаўстве рамантычным героем. Вялікую долю ўвагі рамантыкі надавалі індывідуальнаму характару асобнага персанажа і народнаму характару. Цікавасць да нацыянальнай самабытнасці прывяла да распаўсюджвання твораў гістарычнай тэматыкі. Папулярнымі жанрамі рамантызму былі балада, паэма, элегія, раман, рамантычная казка.

! У сусветнай літаратуры факт з’яўлення рамантычных твораў — гэта сведчанне нацыянальнага і культурнага самасцвярджэння этнасу. У беларускай літаратуры гэты факт засведчыла перш за ўсё паэзія Янкі Купалы.



Правообладатель Национальный институт образования

У другой палове XIX стагоддзя з рамантычнай мастацкай сістэмай перасякаліся два новыя напрамкі — неарамантызм і сімвалізм. У беларускай літаратуры даволі ярка праявіўся **неарамантызм**.

У пачатку XX стагоддзя прынцыпы рамантызму відазмяніліся пад уплывам сучаснасці: новыя рамантыкі (неарамантыкі) верылі ў моцную, яркую асобу, сцвярджалі адзінства ідэальнага і рэальнага, мары і явы.

Неарамантыкаў не задавальняў працэс дэгераізацыі літаратуры, заняпаду эпічных сюжэтаў — і яны імкнуліся абудзіць у чытачоў прагу подзвігу, імкненне да прыгод. Свет неарамантычнай літаратуры поўны загадак, нечаканасцей і небяспекі, але ў ім дзейнічаюць людзі, якія самі выбіраюць свой шлях, стараюцца не здрадзіць сабе, захаваць самапавагу. І таму іх жыццё аказваецца поўным, яскравым і прыцягальным.

Беларуская літаратура гэтага часу ўзбагацілася такімі творамі, як, напрыклад, зборнік Янкі Купалы «Спадчына», паэма «Курган», а таксама паэзіяй Цёткі, Максіма Багдановіча, прозай Міхася Зарэцкага (апавяданне «Дзіўная»). У другой палове XX стагоддзя традыцыі рамантычнага адлюстравання рэчаіснасці працягнуў Уладзімір Караткевіч (аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха»).

**Рэалізм.** Галоўная рыса рэалізму — гэта адлюстраванне праўды жыцця сродкамі тыпізацыі.

Для твораў гэтага метаду характэрна наступнае: 1) героі — звычайныя людзі ў звычайных абставінах; 2) характары персанажаў псіхалагічна цэласныя, пры гэтым складаныя, супярэчлівыя; 3) грамадскае жыццё абумоўлівае працэсы фарміравання духоўнага свету героя; 4) дакладная адпаведнасць рэчаіснасці ў творы становіцца мерай яго мастацкасці. Сярод жанраў, прыдатных для рэалістычнага ўзнаўлення рэчаіснасці, тэарэтыкі літаратуры найчасцей называюць апавяданне, аповесць, раман.

Рысы раэлістычнага светабачання ў беларускай літаратуры можна заўважыць ужо ў творчасці аўтараў XIX стагоддзя. Пры гэтым класічны рэалістычны эпас сусветнага значэння ў беларускай літаратуры прадстаўлены творчасцю Якуба Коласа (паэмы, апавяданні, аповесці («У палескай глушы»)) і Максіма Гарэцкага (апавяданні («Літоўскі хутарок»), аповесці, раманы) ужо ў XX стагоддзі.

У літаратурах народаў Савецкага Саюза выпрацаваўся напрамак **сацыялістычнага рэалізму**, творы якога павінны былі ўзнаўляць рэчаіснасць стваральнага будаўніцтва новай краіны. Галоўным героем



Правообладатель Национальный институт образования

становіцца персанаж з выключнымі маральнымі якасцямі (звычайна чалавек працы), які змагаецца з праявамі старога ладу і перамагае. Мэта твораў сацыялістычнага рэалізму — сцвярджэнне ідэалаў сацыялістычнага грамадства ў даступнай для простага чалавека форме.

Ідэалагічныя абмежаванні не перашкодзілі таленавітым беларускім пісьменнікам выявіць сябе ў гэтым напрамку. Пра тое сведчаць рэалістычная проза Васіля Быкава («Незагойная рана», «Жураўліны крык»), Івана Мележа («Палеская хроніка»), вострасюжэтныя аповесці пра сучаснікаў Івана Шамякіна («Непаўторная вясна»), камедыяграфія Кандрата Крапівы («Хто смяецца апошнім»), Андрэя Макаёнка («Выбачайце, калі ласка!»), драматычныя творы Аляксея Дударава («Вечар») і інш.

***Камедыяграфія*** — сукупнасць камедый пэўнага аўтара, перыяду, літаратуры, эпохі.

**Мадэрнізм.** Мадэрнісцкае светаадчуванне звязана з крызісам традыцыйных каштоўнасцей у культуры, упадніцтвам. У літаратуры гэты погляд выявіўся ў мадэрнізме (сімвалізм, імпрэсіянізм, неарамантызм) і авангардызме (экспрэсіянізм, футурызм, імажынізм).

Творчыя пошукі аўтараў, якія імкнуліся пераадолець традыцыйны погляд на літаратуру, адысці ад канонаў, адмовіцца ад стандартызацыі і тыповасці, прывялі да з'яўлення абсалютна новых твораў: а) нязвыклага зместу (ірацыянальнага, пачуццёва-інтуітыўнага, фантастычнага); б) з нязвыклым героем (не падобным да іншых, абстрактным, індывідуалізаваным); в) нязвыклай формы (каліграмы, творы без знакаў прыпынку, вершы-«лесвічкі», паўтор аднаго і таго ж слова або сугучча).

***Каліграма*** — верш, радкі якога ўтвараюць сабой малюнак.

Найчасцей мадэрністы выступаюць у лірычных вершаваных жанрах, але часам у літаратуры мадэрнізму можна сустрэць празаічныя і сінтэтычныя творы, індывідуальна-аўтарскія жанравыя формы.

Паводле меркавання літаратуразнаўца Вячаслава Рагойшы, да ўласна беларускіх літаратурных напрамкаў XX стагоддзя можна аднесці маладнякізм і ўзвышэнства (ад назваў літаратурных аб'яднанняў 1920-х гадоў «Маладняк» і «Узвышша»).

**Постмадэрнізм.** У беларускай літаратуры постмадэрнізм з'явіўся не пасля мадэрнізму, як у многіх іншых, а пасля сацыялістычнага рэалізму. Такія перадумовы прывялі да наслаення ў літаратурных творах некалькіх напрамкаў: постмадэрнізм суседнічаў з рэалізмам і нават авангардызмам.



Правообладатель Национальный институт образования

У сучаснай літаратуры некаторыя асаблівасці постмадэрнізму можна акрэсліць так: 1) адсутнасць адзіных эстэтычных крытэрыяў, адмаўленне аўтарытэтаў, адпаведнасць прынцыпу «кожнаму твору — свае правілы»; 2) парадаксальнасць і крайнасці ў выяўленні ідэі твора, сціранне любых меж; 3) успрыманне свету як адчужанага, пазбаўленага сэнсу і ўпарадкаванасці; 4) двухсэнсоўнасць інтэрпрэтацыі, шматслойнасць мастацкіх тэкстаў; 5) псеўдадакументалізм, «гульня ў рэальнасць»; 6) цікавасць да таемнага, схаванага, эзатэрычнага; 7) знарочыста хаатычная, мазаічная кампазіцыя і прыхільнасць да мантажу, калажу, розных відаў пераасэнсавання і цытавання; 8) вольнае і часам іранічнае стаўленне да класікі, парадзіраванне; 9) цьмянасць аўтарскага «я», імкненне аўтара адсутнічаць у творы або схавацца пад маскай.

Працэс з'яўлення ў літаратуры новых мастацкіх напрамкаў і метадаў няспынны. Аднак у сучаснай беларускай літаратуры не ўсе яны аднолькава замацаваліся або атрымалі развіццё. Адны зніклі, іншыя відазмяніліся праз грамадскія і культурныя падзеі, займелі новае напаўненне, гучанне.

1. Якія мастацкія напрамкі прадстаўлены ў беларускім прыгожым пісьменстве? Параўнайце з вядомымі вам напрамкамі рускай літаратуры.
2. Абапіраючыся на матэрыял вывучаных раздзелаў, запоўніце табліцу.

| Назва мастацкага напрамку | Жанры твораў, уласцівыя напрамку | Асаблівасці твораў адпаведнага напрамку |
|---|---|---|
| | | |

Правообладатель Национальный институт образования



# Даўняя літаратура (XI—XVIII стагоддзі)

## ЛІТАРАТУРА ЭПОХІ СЯРЭДНЕВЯКОЎЯ (XI—XV стагоддзі)

**1.** З якімі творамі беларускай літаратуры Сярэдневякоўя вы ўжо знаёмыя?
**2.** Ці заўсёды ў тэкстах XI—XV стагоддзяў пазначалася імя аўтара? Чаму?
**3.** Якія асобы станавіліся галоўнымі героямі твораў у Сярэдневякоўі?

Сёння цалкам аднавіць літаратурны працэс XI—XV стагоддзяў амаль немагчыма. Многія помнікі пісьменства страчаны ў выніку шматлікіх войнаў, пажараў, прыродных катаклізмаў або проста псавання матэрыялу, на якім яны былі напісаны. Пры гэтым па тых нешматлікіх тэкстах, што захаваліся да нашых дзён, можна меркаваць, як развівалася літаратура тысячу гадоў таму назад.

Нашы продкі пачалі карыстацца пісьменнасцю не пазней за X стагоддзе. Кірылічную пісьменнасць на стараславянскай мове заснавалі асветнікі IX стагоддзя Кірыл і Мяфодзій, якія паходзілі, найбольш верагодна, з Македоніі. На гэтай мове былі створаны першыя вядомыя помнікі літаратуры нашага краю. У рэлігійных творах таго часу ўжывалася царкоўнаславянская мова, а ў творах свецкага характару траплялiся элементы гутарковай.

Родныя браты Мяфодзій і Кірыл былі сынамі грэчаскага ваяводы. Старэйшым з сямі братоў быў Мяфодзій, а Канстанцін (у манастве Кірыл) — самым малодшым. Ён вучыўся разам з будучым канстанцінопальскім імператарам Міхаілам у лепшых настаўнікаў і стаў адным з самых адукаваных людзей сваёй эпохі: ведаў асновы ўсіх тагачасных навук і некалькі моў. Сучаснікі дзівіліся з мудрасці маладога чалавека, у яго нават была мянушка Філосаф.



Правообладатель Национальный институт образования



Літара В. Буквіца з Аршанскага Евангелля (канец XII — пачатак XIII стагоддзя)

Практыка набажэнства патрабавала адпаведных кніг, а таксама людзей, здольных чытаць і весці па іх службу. Кнігі пісаліся буйным разборлівым почыркам на пергаменце — асаблівым чынам выдубленай цялячай, авечай або валовай скуры, упрыгожваліся каляровымі мініяцюрамі, залатымі і сярэбранымі апрaвамі з каштоўнымі камянямі.

Пры буйных храмах і ў манастырах былі заснаваны **скрыпторыі** (ад лац. *scriptum* — 'пісанне, тэкст') — майстэрні па перапісванні кніг. Вакол іх, верагодна, гуртавалася асноўная частка адукаваных людзей, праз чые рукі праходзілі псалтыры, евангеллі, трэбнікі, ізборнікі і інш. Самыя даўнія евангеллі Беларусі, створаныя ў скрыпторыях, датуюцца XI стагоддзем (Полацкае) і канцом XII — пачаткам XIII стагоддзя (Аршанскае).

! Слова «псалтыр» паходзіць ад назвы струннага шчыпковага музычнага інструмента, пад які выконваліся духоўныя песні, гімны. Пазней назва перайшла на кнігі, у якіх яны змяшчаліся. Богаслужэбныя тэксты ўваходзілі ў трэбнікі. Ізборнікі — рукапісныя зборы ўрыўкаў з розных кніг і перакладаў.

Для Сярэдневякоўя характэрна своеасаблівае ўяўленне пра аўтарства і аўтарскае права. Аўтарства вядомых багасловаў беражліва ахоўвалася: іх творы старанна капіравалі, цытавалі, перакладалі. Пры гэтым большасць тэкстаў менш вядомых аўтараў была ананімная, і перапісчык мог дадаць уласны ўрывак альбо скараціць частку. У выніку аб'ём, а часта і змест аднайменных тэкстаў значна адрозніваліся.

! Тэксты перапісваліся марудна — па 1,5—2 старонкі ў дзень, таму рукапісныя кнігі распаўсюджваліся вельмі павольна.

Большасць твораў Ранняга сярэдневякоўя мела царкоўна-рэлігійны характар. Найбольш вядомыя з **жыцій** на нашых землях — ***«Жыціе Ефрасінні Полацкай»*** (канец XII — пачатак XIII стагоддзя), прысвечанае Прадславе (у манастве Ефрасінні), унучцы полацкага князя



Правообладатель Национальный институт образования




Выявы князя Рагвалода, князёўны Рагнеды на паштовых марках Рэспублікі Беларусь

Усяслава Чарадзея. У творы паслядоўна расказваецца пра жыццёвы шлях і духоўныя подзвігі асветніцы.

Паступова адбывалася зараджэнне **летапіснага жанру**. У ім спалучаліся якасці дзелавога дакумента і літаратурнага твора, а таксама суседнічалі рэгістрацыя канкрэтных фактаў і іх эмацыянальна-вобразнае апісанне. Летапісы былі пераважна састаўныя і ўяўлялі сабой сукупнасць гістарычных запісаў, зробленых у храналагічнай паслядоўнасці ў розны час рознымі аўтарамі і змешчаных пад адной вокладкай. У дакуменце часта адсутнічалі звесткі пра асобу аўтара, бо летапісцы былі выразнікамі ідэй свайго сацыяльнага асяроддзя, інтарэсаў горада, дзяржавы, а часам і таго княжацкага двара, пры якім яны працавалі. Галоўныя героі такіх тэкстаў, як правіла, князі, што ўзначальвалі абарону зямель ад нападаў звонку або вадзілі дружыны супраць непакорлівых суседзяў («Аповесць мінулых гадоў», «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх»).

Са старонак летапісаў паўстаюць яркія постаці, якія пакінулі значны след у гісторыі. Ключавыя персанажы тэкстаў гэтага часу — Рагвалод, Усяслаў Чарадзей, Міндоўг, Ягайла, Вітаўт. З'яўляліся ў пагадовых запісах і звесткі пра жанчын: князёўну Рагнеду, асветніцу Ефрасінню Полацкую, жонку князя Вітаўта Ганну.

**Кірыл Тураўскі** (каля 1110 — пасля 1182) — беларускі Залатавуст. Так яго назваў аўтар пахвалы, напісанай у гонар асветніка.



*М. Інькоў.* Помнік Кірылу Тураўскаму ў Тураве

Адзінае летапіснае ўпамінанне свяціцеля Кірыла, епіскапа Тураўскага, датуецца 1169 годам.



Правообладатель Национальный институт образования

Дакладных звестак пра жыццё і дзейнасць Кірыла Тураўскага захавалася мала. Да нас дайшло кароткае жыціе асветніка канца XII стагоддзя, якое ўключае пахвалу Кірылу. З жыція вядома, што ён быў сынам заможных бацькоў і вылучаўся адукаванасцю (у тыя часы ў Тураве класічную грэчаскую адукацыю, якую меў асветнік, можна было атрымаць толькі пры княжацкім двары).

> «Блажэнны Кірыл нарадзіўся і ўзгадаваўся ў... горадзе Тураве. Быў ён сынам багатых бацькоў, але не любіў багацця і марнай славы гэтага свету, а любіў больш за ўсё вучэнне боскіх кніг», — запісаў невядомы аўтар у кароткім жыціі тураўскага епіскапа.

Сёння складана вызначыць дакладныя даты, звязаныя з жыццём святіцеля, бо няма звестак ні пра колькасць пражытых ім гадоў, ні пра час смерці. Не занатавана нават імя, дадзенае Кірылу пры хрышчэнні. Вядома толькі пра яго дзесяцігадовае самотніцтва ў стаўпевежы — таму асветніка яшчэ называюць стоўпнікам. Адмежаваны ад свету і зямных турбот, малады манах Кірыл займаўся вывучэннем, тлумачэннем і каментаваннем Свяшчэннага Пісання. Падчас стоўпніцтва да Кірыла прыйшла шырокая літаратурная вядомасць. Яго творамі захапляліся, чыталі, перапісвалі іх і нават вучылі на памяць. Пасля самотніцтва ён як надзвычай аўтарытэтны багаслоў быў запрошаны на пасаду тураўскага епіскапа.

**Словы. Казанні. Павучанні.** Пасля Кірыла Тураўскага захавалася вялікая, нават унікальная для аўтара XII стагоддзя пісьмовая спадчына, да якой даследчыкі адносяць каля 70 твораў (словы, прыпавесці, малітвы, каноны). Такая колькасць захаваных тэкстаў сведчыць пра надзвычайную папулярнасць асветніка. У спадчыне Кірыла Тураўскага даследчыкі размяжоўваюць помнікі, што дакладна належаць асветніку, і тыя, прыналежнасць якіх пяру красамоўцы толькі верагодная.

> ***Канон*** — узор, стандарт, твор мастацтва, які лічыцца афіцыйным, прызнаным.

Найбольш вядомая і даследаваная частка мастацкай спадчыны — творы ўрачыстага красамоўства (іх яшчэ называюць аратарскай прозай), да якіх адносяць восем слоў, каля трыццаці казанняў і яшчэ каля дзясятка тэкстаў. Словы рыхтаваліся для прамаўлення пастырам пасля набажэнства або падчас рэлігійных свят. Яны часта мелі павучальны змест, таму іх яшчэ называюць павучаннямі. Тэматыка такіх твораў нярэдка пазначалася аўтарам у загалоўку: «Слова пра



Правообладатель Национальный институт образования

кніжнае шанаванне і пра навучанне», «Слова аб тым, каб не забывалі настаўнікаў сваіх», «Слова пра чалавека і пра нябесныя сілы».

У кожным творы Кірыл Тураўскі выяўляў сімвалічны сэнс свята або падзеі, тлумачыў змест свяшчэнных тэкстаў, але рабіў гэта арыгінальна. Напрыклад, змест «Слова ў першую нядзелю пасля Пасхі» біблейскі, але пісьменнік увёў у яго ўласныя аўтарскія аналогіі: абуджэнне прыроды вясной параўнаў з аднаўленнем чалавека праз веру, працу пчол — з працай чалавека па самаўдасканаленні.

**Уклад у развіццё літаратуры**

1. Кірыл Тураўскі перанёс на нацыянальную літаратурна-культурную глебу хрысціянскую тэматыку, акрэсленую ў біблейскіх тэкстах і творах айцоў царквы.

2. Асветнік адным з першых у беларускай філасофскай традыцыі сфармуляваў значнасць кніжных ведаў, гуманітарнай навукі і пазнання.

Асветнік прапаноўваў прынцыпы ўладкавання справядлівага грамадства і мадэль паводзін чалавека, заснаваную на штодзённай духоўнай працы, здзяйсненні добрых спраў. У такіх тэкстах агульначалавечае дамінавала над канфесійным, нябеснае было знітавана з зямным — патрэбамі і жаданнямі, перажываннямі і страхамі, сумненнямі чалавека.

Амаль у кожным творы аўтар гаварыў пра ўзорныя паводзіны, крытыкаваў заганы. Напрыклад, у «Слове пра чалавека і пра нябесныя сілы» асветнік разважаў пра місію чалавека і бачыў яе ў нястомнай духоўнай працы, здзяйсненні вартых павагі ўчынкаў. «Слова аб прамудрасці» накіравана на маральнае выхаванне асобы: тут пералічваецца больш за тры дзясяткі ўчынкаў, якіх чалавеку належыць пазбягаць (паклёп, абраза, асуджэнне, сваркі, бойкі, злыя намеры, кража, чарадзейства і інш.). А ў «Слове аб тым, каб не забывалі настаўнікаў сваіх» асветнік звяртаў увагу на выключную ролю людзей, якія дапамагаюць іншым стаць лепшымі, і падкрэсліваў, што ўдзячныя вучні трымаюць імёны настаўнікаў у сэрцы, душы і розуме.

**Майстэрства слова.** Кірыл Тураўскі — сапраўдны майстар аратарскай прозы. Сэнсавая глыбіня яго твораў забяспечвалася багаццем вобразна-выяўленчых сродкаў, насычанасцю сімволікі. Гэтым ён працягваў традыцыі філосафаў, айцоў царквы, што таксама імкнуліся да эстэтычнай выразнасці, і разам з тым праяўляў уласны літаратурны



Правообладатель Национальный институт образования

талент. Ёмістыя вобразы ён знаходзіў не толькі ў хроніках і гістарычных дакументах, але і ў навакольным свеце (сонца, месяц, вецер, рэкі, дрэвы, кветкі).

Творы Кірыла Тураўскага вылучаліся паэтычнасцю, унутранай гармоніяй і ледзьве не вершаванай рытмікай. Так, «Слова на Вялікдзень» — яркі прыклад вытанчанага стылю, якому ўласціва лексічная разнастайнасць, багатая вобразнасць, эмацыянальнасць і іншасказальнасць. Пісьменнік плённа выкарыстоўваў анафарычныя паўторы, параўнанні, рытарычныя фігуры. Але тое, што спачатку трактавалася даследчыкамі як аўтарская мастацкая аздоба тэксту, часцей за ўсё аказвалася традыцыйнай для таго часу фігурай маўлення, параўнаннем або метафарай. Справа ў тым, што ў даўняй літаратуры лепшым лічыўся тэкст, дзе было прыведзена больш цытат з кананічных твораў, аўтарытэтных багаслоўскіх прац, а не ўвасоблены арыгінальны аўтарскі погляд. Кірыла Тураўскі і сам не раз сціпла ўказваў, што ён не пісьменнік, а толькі праваднік хрысціянскай ісціны.

! Існуе версія, што Кірыл Тураўскі мог быць аўтарам вядомага помніка ўсходнеславянскага гераічнага эпасу «Слова пра паход Ігараў».

Талент Кірыла Тураўскага выявіўся ва ўменні адначасова вобразна і лагічна, у адпаведнасці з ідэяй, асэнсаваць і скласці ў адзін тэкст ужо вядомыя цытаты, афарызмы, запазычанні, знайсці найлепшыя слоўныя ілюстрацыі да тэзісаў выступлення. Гэта ўнутраная знітаванасць усіх элементаў твора, празрыстасць галоўнай думкі, багатыя веды аўтара рабілі яго казанні, словы, павучанні, малітвы эстэтычна завершанымі, унікальнымі паводле сілы ўздзеяння на чытача (слухача).

! У Сярэдневякоўі выступленне павінна было выклікаць у слухачоў захапленне гармоніяй боскага свету, а не асобай аўтара або яго талентам.

Творы Кірыла Тураўскага перажылі яго на стагоддзі і сёння дзівяць яснасцю думкі, прадуманасцю вобразаў і глыбокім сэнсам.

! **Літаратурныя сувязі.** Творы старабеларускай літаратуры служаць крыніцай тэм, сюжэтаў, вобразаў для пісьменнікаў, мастакоў, музыкантаў. У сваёй творчасці да іх звярталіся Максім Багдановіч, Уладзімір Караткевіч, Леанід Дайнека, Кастусь Тарасаў, Уладзімір Бутрамееў, Людміла Рублеўская і іншыя беларускія аўтары.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Растлумачце паняцце «кірылічная пісьменнасць». Што вам вядома пра яе заснавальнікаў?
2. Чаму літаратура Сярэдневякоўя мела рэлігійны характар? Як гэта звязана з распаўсюджваннем хрысціянства?
3. Дзе і якім чынам адбывалася тыражаванне тэкстаў тагачаснай кніжнасці?
4. Чым выклікана ўзнікненне такога жанру, як летапіс?
5. Уявіце, што вядомы інтэрнэт-рэсурс збірае меркаванні грамадства па наступным дыскусійным пытанні: «Які чалавек мог стаць героем твора ў старажытнасці?», і напішыце твіт-адказ на прапанаванае пытанне.
6. Што сёння вядома пра Кірыла Тураўскага? Чаму пра яго захавалася няшмат звестак?
7. Чаму да імя асветніка дадавалася Тураўскі? Імёны якіх іншых дзеячаў Сярэдневякоўя мелі тапанімічную частку? Чаму іх нельга лічыць прозвішчамі?
8. Творы якіх жанраў са спадчыны Кірыла Тураўскага дайшлі да нашых дзён? У чым заключаецца асветніцкая функцыя кожнага з іх?
9. Што агульнага можна заўважыць у жыцці і творчасці Ефрасінні Полацкай і Кірыла Тураўскага?
10. Якія думкі Кірыла Тураўскага можна назваць сучаснымі? Аргументуйце адказ.
11. Складзіце сінквейн[1] на тэму «Кірыл Тураўскі».

| Структура | Прыклад | Уласны сінквейн |
|---|---|---|
| тэма<br>2 прыметнікі<br>3 дзеясловы<br>4 словы (фраза, сказ)<br>1 назоўнік | **Паэзія Куляшова**<br>Праўдзівая, моцная.<br>Цэліць, пранізвае, абнаўляе.<br>Расчытвае душу цэлага пакалення.<br>Рэалізм | **Кірыл Тураўскі** |

12. Паспрабуйце сябе ў якасці аратара. Па ўзоры твора Кірыла Тураўскага стварыце слова з нагоды свята (значнай падзеі, добрай адзнакі) або пахвалу свайму сябру (бацькам).
13. Адшукайце ў інтэрнэце або бібліятэцы творы, галоўнымі героямі якіх з'яўляюцца гістарычныя дзеячы Сярэдневякоўя. Чаму іх вобразы актыўна ўводзілі ў свае тэксты беларускія пісьменнікі?

---

[1] *Сінкве́йн* — японская пяцірадковая вершаваная форма, якая ў нерыфмаваным выглядзе стала выкарыстоўвацца для навучання творчаму мысленню.



Правообладатель Национальный институт образования

## Жанры літаратуры Сярэдневякоўя

Звычайна ў літаратуры Сярэдневякоўя вылучаюць два перыяды: літаратура *Ранняга* сярэдневякоўя і літаратура *Позняга* сярэдневякоўя.

Кніжнасць Ранняга сярэдневякоўя знаходзілася пад моцным уплывам рэлігіі. Царкоўна-рэлігійная літаратура выпрацавала свае жанры. Асноўнымі сярод іх былі жыціі і хаджэнні.

***Жыціе*** — жанр сярэдневяковай літаратуры, у якім распавядаецца пра ўзорнае жыццё людзей, кананізаваных царквой.

Гэты жанр быў даволі папулярны ва ўсходніх славян. Напрыклад, на кіеўскіх землях быў створаны вядомы помнік жыційнай літаратуры «Жыціе Феадосія Пячэрскага».

Сярод твораў старабеларускай кніжнасці трэба назваць «Жыціе Ефрасінні Полацкай», «Жыціе прападобнага Аўрамія Смаленскага». Жыційную літаратуру яшчэ называюць **агіяграфічнай** (ад грэч. *hagios* — ‘святы’ і *grapho* — ‘пішу’, што даслоўна можна перакласці як ‘пісанне жыцця святых’).

З пашырэннем хрысціянства сталі распаўсюджвацца запісы відавочцаў пра вандроўкі ў Святую Зямлю — пра далёкі шлях, наведванне святынь, норавы іншых народаў, экзатычную прыроду Блізкага Усходу. Гэтыя аповеды атрымалі назву «хаджэнні».

***Хаджэнні*** — апісанні падарожжаў да святых мясцін, на Блізкі Усход.

Як жыціі складаюць агіяграфічную літаратуру, так хаджэнні складаюць **паломніцкую**. Паломнікамі называлі людзей, якія ажыццявілі паход у Канстанцінопаль (Царград) альбо Іерусалім. Звычайна адтуль у якасці сувеніра яны неслі пальмавае лісце. Так утварылася слова «паломнік».

Адно з першых вядомых — «Хаджэнне ігумена Даніїла», створанае ў XII стагоддзі. Многія наступныя тэксты нарадзіліся пад яго ўплывам, у тым ліку «Хаджэнне Ігнація Смаляніна», напісанае ў канцы XIV — пачатку XV стагоддзя на старабеларускай мове.



Правообладатель Национальный институт образования

У літаратуры Позняга сярэдневякоўя развіваўся летапісны жанр. Найбольшую вядомасць атрымалі «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх», «Беларуска-літоўскі летапіс (1446)».

***Летапіс*** — гісторыка-літаратурны твор з апісаннем падзей па гадах.

Гэта запісы пра важныя палітычныя, грамадскія і іншыя падзеі. Па відавых прыметах летапісы блізкія да заходнееўрапейскіх хронік. Яны могуць уключаць устаўкі — сведчанні ўдзельнікаў апісаных падзей, звесткі пра незвычайныя прыродныя з'явы, часткі кніг і ранейшых рукапісаў, паданняў і інш. У летапісны звод маглі трапляць запісы, запазычаныя з больш ранніх летапісаў і хронік. Летапіс — адзін з самых значных жанраў усходнеславянскай літаратуры.

Летапісы, побач з такімі жанрамі сярэдневяковай кніжнасці, як хаджэнні і жыціі, спрыялі выпрацоўцы эпічных жанраў.

Значнае месца ў творчасці сярэдневяковых дзеячаў займалі пропаведзі.

***Пропаведзь*** — жанр аратарскай прозы, які мае рэлігійна-дыдактычны (павучальны) характар і прызначаны для прамаўлення падчас набажэнства.

Першапачаткова пропаведзі ўзніклі ў культуры Еўропы і Азіі ў IX—V стагоддзях да нашай эры. Пазней жанр распаўсюдзіўся ў славянскіх літаратурах. Майстрам пропаведзі ў даўняй беларускай кніжнасці быў Кірыл Тураўскі.

У станаўленні жанру пропаведзі значную ролю адыграла **патрыстыка** — сукупнасць сачыненняў айцоў царквы, грэка-рымскіх філасафаў-багасловаў II—VIII стагоддзяў.

***Слова*** — жанр красамоўства ў даўняй літаратуры, твор павучальнага зместу.

У жанры слова напісаны многія выдатныя творы аратарскай прозы — напрыклад, «Слова аб законе і благадаці» мітрапаліта Іларыёна, словы Кірыла Тураўскага. Словы дыдактычнага, выхаваўчага характару яшчэ называюць **павучаннямі**.



Правообладатель Национальный институт образования

Пропаведзі і словы сталі асновай зараджэння мастацка-публіцыстычных жанраў.

1. Назавіце найбольш распаўсюджаныя жанры літаратуры Сярэдневякоўя. Дайце ім кароткую характарыстыку, прывядзіце прыклады.
2. Ці можна сцвярджаць, што жыціе — гэта біяграфія, а летапіс — гістарычны раман? Чаму?
3. Якія з жанраў даўняй літаратуры падобны да сучасных трэвэл-блогаў? Аргументуйце адказ.

## ЛІТАРАТУРА ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ (XVI стагоддзе)

**1.** Што вы ведаеце пра эпоху Адраджэння? **2.** Успомніце прадстаўнікоў гэтай эпохі ў беларускай культуры. **3.** Узгадайце з урокаў гісторыі, што такое Рэфармацыя.

Для культуры Сярэдневякоўя доўгі час быў характэрны тэацэнтрызм — такі погляд на свет, паводле якога Бог прызнаваўся яго цэнтрам. Пазней адбыўся адыход ад строгага дагматызму, уласцівага сярэдневяковаму светапогляду, пачалося адраджэнне ідэалаў антычнасці, вяртанне і актуалізацыя яе здабыткаў у галіне філасофіі, літаратуры, выяўленчага мастацтва і інш. Гэта эпоха атрымала назву Адраджэння, або Рэнесансу. Чалавек з яго здольнасцямі і талентамі стаў разглядацца як увасабленне боскай задумы, закладзенай у акце стварэння свету. Прызнанне каштоўнасці чалавечай асобы і яе права самастойна вырашаць уласны лёс паклала аснову новага светапогляду, які быў названы гуманізмам.

Культуры Адраджэння ўласцівы: а) сувязь з ідэаламі антычнасці; б) гуманістычны характар — зварот да чалавека, яго перажыванняў, унутранага свету; в) разбурэнне догмаў, важнасць свабоды асобы, яе права на радасці жыцця; г) сцвярджэнне значнасці навукі, асветы; д) развіццё мастацтваў, зварот да адоранасці, таленту майстра; ж) з’яўленне літаратур на нацыянальных мовах пасля панавання царкоўнаславянскай і лацінскай.

Літаратура, выяўленчае мастацтва, музыка, архітэктура дасягнулі неверагоднага росквіту. Мастацтва пачало «служыць» не толькі Богу,



Правообладатель Национальный институт образования

але і чалавеку: яму знайшлося месца як у храмах і манастырах, так і ў штодзённым жыцці людзей.

Прыгожае пісьменства на нацыянальных мовах стала перадумовай росквіту большасці еўрапейскіх літаратур.

**Пашырэнне гуманістычнага светаўспрымання і светаадчування.** Гуманістычны светапогляд паступова пракладаў сабе дарогу. Гуманісты прапагандавалі свабоду розуму, выступалі супраць неабмежаванага панавання царкоўных догмаў, прапаноўвалі смелыя ідэі і ажыццяўлялі свае задумы. Менавіта на эпоху Адраджэння прыпадае дзейнасць Мікалая Каперніка, Галілея Галілея, Джардана Бруна, філасофскія погляды і навуковыя адкрыцці якіх апярэджвалі свой час і станавіліся штуршком для развіцця еўрапейскай навуковай думкі.

Гуманісты-мастакі здолелі аб’яднаць хрысціянскую і антычную эстэтыку. Рэнесанс быў не проста вяртаннем да пластычна-скульптурнага ідэалу антычнасці, а яго пераўтварэннем, напоўненым хрысціянскай духоўнасцю. Бог сімвалічна называўся нябесным мастаком, аўтарам дасканалага твора — чалавека. Мерай каштоўнага і прыгожага ў зямным мастацтве стаў лічыцца чалавек, а талент творцы, умельца-рамесніка пачаў прызнавацца і высока цаніцца.

**Эпоха Адраджэння ў Беларусі.** Эпоха Адраджэння — гэта перыяд росквіту Вялікага Княства Літоўскага, удасканалення заканадаўства і справаводства, развіцця старабеларускай мовы, узнікнення кнігадрукавання, станаўлення свецкіх відаў мастацтва. Нездарма XVI стагоддзе называюць залатым векам у культурнай гісторыі даўняй Беларусі. У беларускай літаратуры гэтага часу таксама выявіліся тэндэнцыі еўрапейскага Адраджэння.

Пра зараджэнне духу свабоды на нашых землях сведчыць дадзенае гарадам магдэбургскае права (права на самакіраванне), распрацоўка Статута Вялікага Княства Літоўскага. Жыхары краіны маглі выязджаць на вучобу ў заходнееўрапейскія ўніверсітэты, гандляры з мясцовымі таварамі бывалі ў розных краінах свету. Высокага ўзроўню дасягнулі рамёствы (у XVI стагоддзі налічвалася каля 50 спецыяльнасцей). Рамеснікі будавалі і ўпрыгожвалі замкі, цэрквы, касцёлы. Як і ў Заходняй Еўропе, у Беларусі панавала гатычнае дойлідства (яркімі ўзорамі беларускай готыкі з’яўляюцца Барысаглебская царква ў Навагрудку, храмы ў Смаргоні, Асташыне, Койданаве). Склалася мясцовая школа жывапісу, узнік жанр параднага



Правообладатель Национальный институт образования

партрэта. Беларускае мастацтва гэтага часу прадстаўлена таксама ўзорамі драўлянай скульптуры, керамікі, іканапісу, а творы «Брэсцкага канцыянала», «Нясвіжскага песенніка» сведчаць пра высокі ўзровень музычнай культуры нашых продкаў. Пад апекай магнатаў у шматлікіх друкарнях выдаваліся кнігі, прычым не толькі рэлігійнага, але і свецкага зместу, у тым ліку і мастацкія тэксты.

Творцаў таго часу можна назваць універсаламі: яны мелі энцыклапедычныя веды, дасягнулі поспеху ў розных галінах навукі і мастацтва, валодалі некалькімі мовамі, падарожнічалі. Вялікія мысліцелі-гуманісты Адраджэння Францыск Скарына, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, паэт Мікола Гусоўскі заклалі падмурак нашай нацыянальнай свядомасці, узбагацілі філасофію разважаннямі на тэалагічныя і гуманістычныя тэмы (суадносіны боскага і чалавечага, свабоды і несвабоды, узаемадачыненняў уладара і народа), паставілі культуру тагачасных беларускіх зямель у шэраг самых развітых сярод суседзяў.

На фарміраванне беларускай літаратуры Адраджэння ўплывала некалькі акалічнасцей:

1. У Беларусі Адраджэнне пачалося крыху пазней за Заходнюю Еўропу і прыпала на XVI стагоддзе.

2. Геаграфічнае становішча спрыяла таму, што ў культуры і, адпаведна, у літаратуры спалучаліся ўсходняя (візантыйская) і заходняя (рымска-каталіцкая) традыцыі.

3. У Вялікім Княстве Літоўскім рэфармацыйны рух як сацыяльная і рэлігійная з’ява быў цесна звязаны з Рэнесансам. Вядомымі дзеячамі гэтага напрамку былі кнігавыдаўцы, асветнікі, публіцысты Сымон Будны і Васіль Цяпінскі.

4. Ідэі гуманізму вывелі на першы план *аўтарскі пачатак* у творы — тэксты перасталі бытаваць ананімна. Зварот да асобы чалавека паспрыяў таксама звароту да яго нацыянальнай ідэнтычнасці, таму побач з царкоўнаславянскай і лацінскай (Мікола Гусоўскі) аўтары ўсё часцей карысталіся мовай свайго народа (Францыск Скарына), што спрыяла развіццю і самой мовы, і прыгожага пісьменства.

5. Асаблівасцю тагачаснай літаратуры стала зліццё даўніх мясцовых традыцый красамоўства і новых адраджэнскіх мастацкіх прынцыпаў. У нашай, як і ў іншых еўрапейскіх літаратурах, узнікла *лірыка* (яе пачынальнікам стаў Францыск Скарына). Плённае развіццё атрымаў жанр *эпічнай паэмы* («Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага).



Правообладатель Национальный институт образования

Вынікам рэнесанснага светабачання і рэфармацыйнага руху стала распаўсюджванне свецкай і царкоўна-рэлігійнай *публіцыстыкі* (прадмовы Францыска Скарыны, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага да рэлігійных кніг). У гэты перыяд адбывалася *белетрызацыя* твораў — гэта значыць, у гістарычны матэрыял або дзелавыя дакументы ўключаліся фрагменты мастацкага апавядання, элементы займальнасці (напрыклад, лісты аршанскага старасты Філона Кміты-Чарнабыльскага). Пазней узніклі іншыя жанры, што мелі характарыстыкі мастацкай літаратуры, — дзённікі (дыярыушы) і ўспаміны (мемуары).

> ***Белетрыстыка*** — мастацкая проза; непаэтычныя творы вытанчанай славеснасці (раманы, аповесці, нарысы і інш.).

Важныя змены адбываліся ў гэты перыяд і ў летапісанні. Першы летапісны звод — «Беларуска-літоўскі летапіс (1446)» — перапісваўся і чытаўся ў гэты час. А ў першай палове XVI стагоддзя з'явіўся другі беларуска-літоўскі летапісны звод — «Хроніка Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага», які стаў крыніцай «Хронікі Быхаўца» — важнай з'явы ў развіцці беларускай гістарычнай белетрыстыкі даўняй пары.



*У. Басалыга.* Мікола Гусоўскі. Фрагмент літаграфіі (1980)

Самы яркі твор адраджэнскай лацінамоўнай паэзіі ў гісторыі беларускай літаратуры — гэта паэма ***«Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага***. Аўтар меркаваў апісаць паляванне на волата пушчы, а стварыў сапраўдны гімн сваёй Радзіме — Вялікаму Княству Літоўскаму.

У тэксце выразна гучаць патрыятычныя матывы, паўстае прырода беларускага краю, апяваюцца ідэалы справядлівасці, раскрываюцца ўяўленні пра ідэальнага кіраўніка дзяржавы (вобраз Вітаўта). У «Песні пра зубра» згадваюцца вобразы антычнай міфалогіі, ярка адлюстроўваецца аўтарскае «я», што ўласціва літаратуры Адраджэння.

У XVI стагоддзі пачаў разгортвацца рэфармацыйны рух. Адпаведна, пачалася міжканфесійная палеміка — пратэстанцкія, праваслаўныя і каталіцкія багасловы вусна і пісьмова выказваліся супраць дактрын апанентаў, вялі перапіску, спрэчкі, дыспуты, распаўсюджвалі тэзісы і водпаведзі на іх. Гэты працэс спрыяў нараджэнню самабытных



Правообладатель Национальный институт образования

і яркіх тэкстаў, а значыць, развіццю літаратуры. Выдатным майстрам палемічнай[1] публіцыстыкі быў Сымон Будны.

Пры напісанні твораў мастацкай літаратуры перавага аддавалася лацінскай — мове міжнацыянальных зносін у тагачаснай Еўропе, а таксама польскай, але з'яўляліся і выдатныя творы, напісаныя на старабеларускай.



Мікалай Радзівіл Чорны. Работа невядомага мастака (1825)

У сярэдзіне XVI стагоддзя канцлер літоўскі **Мікалай Радзівіл Чорны** заснаваў берасцейскі кальвінскі збор — першую пратэстанцкую царкву на тэрыторыі княства — і друкарню пры ёй. На кароткі час Бярэсце (сёння Брэст) ператварылася ў адзін з інтэлектуальных цэнтраў Еўропы, куды з'язджаліся вядомыя вучоныя, пісьменнікі, музыканты, а таксама — у буйны выдавецкі цэнтр, прадукцыя якога прызначалася не толькі мясцовым чытачам. Там убачыла свет першая на тэрыторыі Беларусі пратэстанцкая Біблія.

Распаўсюджванне кнігадрукавання паскарала культурна-гістарычныя працэсы. Несумненныя заслугі ў наладжванні выдавецкай справы належалі ўсходнеславянскаму першадрукару Францыску Скарыну, а таксама яго паслядоўнікам — Сымону Будному і Васілю Цяпінскаму.

1. Якія рысы ўласцівы культуры Адраджэння? Каштоўнасці якога часу ўзнаўляліся ў літаратуры гэтай эпохі?
2. Як развівалася культура нашай краіны ў гэты час?
3. Прадоўжыце выраз «Гуманізм у перыяд Рэнесансу — гэта...».
4. Якія агульныя рысы можна вылучыць у літаратурных творах эпохі Адраджэння?



5. Пералічыце жанры, характэрныя для літаратуры Рэнесансу. Параўнайце з сучаснымі жанрамі літаратуры. Якія з іх мадэрнізаваліся?
6. У кантэксце эпохі Адраджэння гавораць пра «ўніверсалізм» творцаў. Паглядзіце дакументальны фільм з гістарычнага праекта Albaruthenia

[1] *Палемíчны* (ад слова «палеміка», што значыць 'бітва', 'вайна') — непрымірымы, той, што тычыцца спрэчак.



Правообладатель Национальный институт образования

«Код Скарыны» (2010, рэжысёр Пётр Цвыд, тэлеканал «Лад») і прывядзіце прыклады падобнага ўніверсалізму.

**7.** Якая знакамітая асоба беларускага Адраджэння (акрамя Францыска Скарыны), на ваш погляд, заслугоўвае найбольшай увагі? Складзіце сінквейн, прысвечаны гэтай асобе. Абмяняйцеся сінквейнамі з сябрамі, не паказваючы адно аднаму загаловак. Здагадайцеся, якіх дзеячаў яны выбралі.

# Францыск Скарына

## (каля 1490 — каля 1551)

**1.** Што вы ведаеце пра жыццё і творчасць Францыска Скарыны? **2.** Якія ідэі прасочваюцца ў знакамітым урыўку з прадмовы беларускага першадрукара да кнігі «Юдзіф» («Понеже от прирожения...»)?

Францыск Скарына з Полацка, чалавек незвычайнай вучонасці, па загадзе караля Жыгімонта І стаў недатыкальнай асобай — вызваляўся з-пад юрысдыкцыі гарадскіх і земскіх судоў, браўся пад каралеўскую ахову і апеку (паводле ўказаў Жыгімонта І ад 21 і 25 лістапада 1532 года).

Рознабаковая дзейнасць пачынальніка беларускага Адраджэння Францыска Скарыны адкрыла новую эпоху ў гісторыі беларускай культуры, шмат у чым вызначыла яе нацыянальную спецыфіку і напрамкі будучага развіцця.

Жыццяпіс Скарыны падобны да пункцірнай лініі: пачатак яго губляецца ў канцы XV, а завяршэнне — у сярэдзіне XVI стагоддзя. Пра некаторыя падзеі з жыцця гэтага выбітнага чалавека можна толькі меркаваць, бо дакладных дат і фактаў, звязаных з яго асобай, не вельмі шмат.



Францыск Скарына. Гравюра з пражскага выдання Бібліі (1517—1519)

**Пераклад і выданне кніг Бібліі.** Як вядома, на працягу трох гадоў у пражскай друкарні выйшлі 23 ілюстраваныя кнігі першай беларускай Бібліі пад агульнай назвай



Правообладатель Национальный институт образования



Наборны шрыфт. Каса малых літар. Музей Плантэна — Марэтуса, Бельгія

«Бивлия руска, выложена доктором Франциском Скориною из славнаго града Полоцька, Богу ко чти и людем посполитым к доброму научению» (1517—1519).

На дзіва, Скарыну ўдалося ажыццявіць гэты перадавы праект. За кароткі тэрмін былі падрыхтаваны да выдання даволі складаныя тэксты, выканана афармленне (створаны гравюры-ілюстрацыі, застаўкі, буквіцы, каляровыя элементы) — і ўсё гэта было выдадзена вялікім тыражом на вельмі высокім тэхнічным і мастацкім узроўні.

! Набор тэксту ажыццяўляўся ўручную наборнымі літарамі ў люстраным парадку, каб пасля можна было прачытаць адбітак.

Францыск Скарына выдаў каля дваццаці пяці тысяч экзэмпляраў кніг. Уручную такую колькасць старонак перапісвала б тысяча людзей на працягу пяці гадоў.

Каля 1520 года асветнік вярнуўся на Радзіму, а ў 1522 годзе ў віленскай друкарні ўбачыла свет яго «Малая падарожная кніжка». Таксама ў Вільні ў 1525 годзе з'явілася яго апошняе вядомае на сёння выданне «Апостал». Дарэчы, менавіта з «Апостала» ў 1564 годзе пачалі ў Маскве рускае кнігадрукаванне Іван Фёдараў і наш зямляк Пётр з Мсціслаўля (Мсціславец).

**Уклад у развіццё культуры**

1. Францыск Скарына першы ў гісторыі ўсходнеславянскай культуры выдаў пераклад Бібліі.

2. Скарына суправаджаў біблейскія тэксты прадмовамі і пасляслоўямі ўласнага аўтарства (50 прадмоў і 62 пасляслоўі), у якіх адлюстраваліся яго філасофскія, прававыя, педагагічныя і літаратурна-эстэтычныя погляды. Беларускі першадрукар увёў у кнігі адметныя элементы: анатацыі, каментарыі, глосы[1].

[1] *Гло́сы* — іншамоўныя або малазразумелыя словы з тлумачэннямі або каментарыямі; змяшчаліся на палях кнігі.



Правообладатель Национальный институт образования

3. У творах Францыска Скарыны сфармулявана новая рэнесансная мараль: Радзіме можна служыць не толькі праз вайсковыя подзвігі, але і праз навуку і культуру. У якасці самых значных каштоўнасцей ён разглядаў асобу чалавека і яго жыццё, самаўдасканаленне і навуку.

4. Першадрукар стаў адным з пачынальнікаў беларускага вершаскладання.

**Прадмовы Францыска Скарыны.** Назвы прадмоў адлюстроўваюць асаблівасці іх зместу, структуры і стылістыкі. Прадмовы мелі значны аб'ём, складаліся з некалькіх частак, утрымлівалі падрабязныя апісанні, гістарычныя, тэалагічныя, юрыдычныя каментарыі. Сказанні, як правіла, змяшчалі кароткія анатацыі да кніг з лаканічнымі тлумачэннямі інфармацыйнага характару. Можна меркаваць, што прадмовы Скарына пісаў для менш распаўсюджаных тэкстаў Старога Запавету, а сказанні — да добра вядомых кніг Новага Запавету. У прадмовах аўтар вёў з чытачом гаворку пра духоўныя каштоўнасці, любоў да Радзімы, сэнс жыцця. Пасляслоўі прадстаўлены сціслымі звесткамі пра выдаўца, перакладчыка, рэдактара, месца выхаду кнігі і кароткімі малітвамі, адсылкамі і каментарыямі да асноўнага тэксту.

**Прадмова да ўсёй Біблii** раскрывае сутнасць асветніцкай місіі Скарыны. Першадрукар разглядаў Кнігу Кніг не проста як невычэрпную крыніцу ведаў, мудрасці і вынік шматвяковага духоўнага вопыту чалавецтва, але і прапаноўваў выкарыстоўваць яе ў якасці падручніка па сямі вольных навуках — граматыцы, логіцы, рыторыцы, музыцы, арыфметыцы, геаметрыі, астраноміі.



Першая старонка прадмовы да ўсёй Біблii (да 1520-га)

Вобразна, рытмічна напісана **прадмова да кнігі «Псалтыр»**. Менавіта такой мовы патрабаваў змест выдання, бо гэта пераклады псалмоў (песень). «...Псалмы — гэта скарб, безліч каштоўных камянёў! Яны розную немач духоўную і цялесную выганяюць! Душу і розум прасвятляюць! Гнеў і лютасць уціхамірваюць! Мір і пакой чыняць! Смутак і скруху адганяюць! Пачуцці ў малітвах даюць!



Правообладатель Национальный институт образования

Людзей зычлівымі робяць!» Асветнік бачыў у «Псалтыры» лекі для цела і акрасу для душы, лічыў, што ў гэтай кнізе кожны чалавек знойдзе штосьці важнае для сябе. Карысць «усялякага слова» першадрукар знаходзіў у тым, што яно робіць чалавека лепшым: «вучыць, выкрывае, выпраўляе і карае».

Звяртаючыся да «люду паспалітага» ў прадмовах і пасляслоўях, Францыск Скарына заклаў у беларускай літаратуры асновы навукова-асветніцкай, маральна-дыдактычнай, філасофскай публіцыстыкі. Публіцыстычныя творы друкара яшчэ мелі стылявыя адзнакі сярэдневяковай літаратуры (наяўнасць філасофскіх, тэалагічных, навукова-аналітычных пластоў, элементаў вершаванай мовы), але багаслоўскія элементы ўжо спалучаліся ў іх з выяўленнем патрыятычных, выхаваўчых, прававых і асветніцкіх ідэй. Важнае месца ў скарынаўскай публіцыстыцы займала сцвярджэнне духоўнай каштоўнасці роднай мовы.

З публіцыстычных твораў упершыню ва ўсходнеславянскім свеце пачалося ўсведамленне культурнага перавароту, які прынесла кнігадрукаванне, спасціжэнне агульначалавечай каштоўнасці лепшых здабыткаў нацыянальнай літаратурнай думкі і значэння роднай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры.

**Вершатворчасць.** Першае вершаванае чатырохрадкоўе Францыска Скарыны «Богу в Троици единому...» было змешчана ў кнізе «Іоў» у 1517 годзе, і гэты факт стаў сведчаннем узнікнення беларускай паэзіі.

Богу в Троици единому ко чти и ко славе,
Матери Его Пречистой Марии к похвале.
Всем небесным силам и святым Его к веселию,
Людем посполитым к доброму научению.

Твор уяўляе сабой так званыя **вíршы** — своеасаблівы від верша, у радках якога чаргуецца колькасць складоў (15—14, 15—14), а паўза падзяляе радок на дзве часткі. Пры гэтым рэгулярнае чаргаванне націскных і ненацiскных складоў у віршах не мае прынцыповага значэння.



(15 складоў)
(14 складоў)
(15 складоў)
(14 складоў)



Правообладатель Национальный институт образования

Падобная сістэма вершаскладання называецца сілабічнай, або складовай (ад слова «сілаба» — ‘склад’). У сілабічным вершаскладанні неабавязковая наяўнасць звыклай для нас рыфмы — для яго характэрна праца менавіта з колькасцю складоў і паўзамі. Звернем увагу на падабенства (паралелізм) выкарыстаных у творы сінтаксічных канструкцый: Богу — ко чти и ко славе, Матери Его — к похвале, небесным силам — к веселию, людем — к научению. Такі прыём дазволіў асветніку структурна арганізаваць тэкст, падтрымаць яго рытмічнае гучанне.

Унікальным для беларускай літаратуры творам стала пяцірадкоўе Францыска Скарыны, напісанае паводле дзесяці запаведзяў Майсея (з прадмовы да кнігі «Исходъ»). Калі запісаць запаведзі парамі — так, як у скарынаўскім арыгінале, атрымаецца вельмі гарманічная будова. Колькасць складоў размяркуецца наступным чынам: 20—16—16—16—20.

**Рысы рэнесанснага гуманізму ў творчасці Францыска Скарыны.** Для Францыска Скарыны аснова маралі — гуманістычны закон «натуральнага» права: «Паводзь сябе з іншымі, як хацеў бы, каб ставіліся да цябе». Скарына выступаў за грамадства, дзе працаваў бы такі закон. Яго ідэалам маралі і права адпавядае згода, заснаваная на добрай волі (гармонія ўзаемаадносін паміж людзьмі, народамі і дзяржавамі). Крыніцай маралі і права з’яўляецца сумленне — усведамленне чалавекам сваёй недасканаласці, свайго адрыву ад сусветнай гармоніі. Неабходнасць жа існавання дзяржавы і права, якія павінны забяспечваць раўнацэннасць кожнага чалавека незалежна ад статусу, выклікана недасканаласцю грамадства, адыходам людзей ад маральнасці.

У рэнесансным духу таксама гучаў тэзіс Скарыны аб прызначэнні таленту. Кожны павінен развіваць свой талент і выкарыстоўваць яго для павелічэння агульнага дабрабыту: «Як вядома, усе людзі на свеце скіроўваюць свой розум і сэрца на пэўныя рэчы. Адны — на царствы і панаванне. Другія — на багацці і скарбы... Іншыя — на дзяцей, на сяброўства, на службу...»

Яшчэ адна рыса адраджэнскай эстэтыкі — асэнсаванне прыналежнасці да свайго народа. У прадмовах і пасляслоўях аўтар не толькі падкрэсліваў месца свайго нараджэння, а ўказваў роднай «рускую» (тагачасную старабеларускую) мову: «...Я, Францішак, Скарынін сын



Правообладатель Национальный институт образования

з Полацка, у лекарскіх навуках доктар, загадаў “Псалтыр” ціснуці рускімі словамі славянскае мовы».

> **!** У пасляслоўях Францыск Скарына праслаўляў Радзіму: там каля 50 разоў згадваецца «места Полацкае» ў спалучэнні з эпітэтам «слаўнае».

Францыск Скарына бачыў у «чалавеку паспалітым» самадастатковую асобу, у якой павінна было скласціся ўласнае меркаванне аб прачытаным. З гэтай прычыны друкару было важна растлумачыць цьмяныя месцы, значэнне асобных выразаў і слоў, што прывяло яго да ідэі стварэння глосаў. Глосы ствараліся на старабеларускай мове, зразумелай сучаснікам. Той самай мэце — тлумачэння і арыентавання ў тэксце — служылі і скарынаўскія анатацыі. Сёння гэтыя пазнакі даюць вучоным-лінгвістам уяўленне пра жывую мову нашых продкаў.

Творчасць беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара, пісьменніка, філосафа, асветніка, перакладчыка — гэта пачатак эпохі беларускага Адраджэння, пазначанага дэмакратызацыяй культуры, развіццём свецкай літаратуры, выяўленчага мастацтва, школьнай адукацыі, шырокім выхадам на творчыя ўзаемасувязі айчыннай культуры з культурамі іншых заходнееўрапейскіх, у тым ліку славянскіх, народаў. Яго патрыятычныя звароты да суайчыннікаў з заклікам шчырай любові да роднай краіны, мовы набылі значэнне сакральнага сімвала для дзеячаў нацыянальнага адраджэння на ўсіх этапах яго развіцця. Нездарма з 1979 года малая планета № 3283 у Галоўным поясе астэроідаў Сонечнай сістэмы носіць назву «Скарына».

> **!** **Літаратурныя сувязі**. Беларускаму асветніку прысвячалі творы Максім Багдановіч і Змітрок Бядуля, Уладзімір Караткевіч і Максім Танк. П’есы пра яго напісалі Міхайла Грамыка, Алесь Петрашкевіч; драматычныя паэмы — Мікола Арочка і Міхась Клімковіч; раманы і аповесці — Мікалай Садковіч сумесна з Яўгенам Львовым, Сымон Хурсік. Цікавую спробу пераказаць асобныя яго прадмовы свабодным вершам зрабіў Алесь Разанаў.
>
> На сучасную беларускую мову пераклады прадмовы да кнігі «Юдзіф» зроблены Алесем Разанавым, Іванам Саверчанкам, Сяргеем Панізнікам.

1. Майстрам якіх жанраў быў Францыск Скарына?
2. Якую ролю адыгрывалі прадмовы і пасляслоўі першадрукара да кніг Бібліі?



Правообладатель Национальный институт образования

3. Якія рэнесансныя погляды Францыска Скарыны актуальныя для сучаснай моладзі, а якія не?
4. Падрыхтуйце ў групах калектыўны праект «Вобраз Францыска Скарыны ў літаратуры, скульптуры, выяўленчым мастацтве, кіно» (на выбар). Чаму, на вашу думку, скульптары і мастакі паказваюць асветніка менавіта такім?
5. Складзіце кластар на тэму «Францыск Скарына» па прапанаваным узоры.

*Кластар* — графічнае адлюстраванне сувязей паміж ключавым словам і звязанымі з ім паняццямі; часцей у форме блокаў і стрэлак.




6. Пазнаёмцеся з дадатковай інфармацыяй пра асобу Францыска Скарыны ў інтэрнэце. Падрыхтуйце для дзевяцікласнікаў квест па біяграфіі і творчасці асветніка.

**Развіццё беларускага кнігадрукавання.** Кнігадрукаванне на нацыянальнай мове пашырылася дзякуючы намаганням не толькі Францыска Скарыны, але і прадаўжальнікаў яго справы Сымона Буднага і Васіля Цяпінскага.

Яркі беларускі дзеяч Рэфармацыі **Сымон Будны** (каля 1530—1593) — бліскучы пісьменнік, таленавіты філолаг, вядомы філосаф і багаслоў. У юнацтве авалодаў некалькімі мовамі (царкоўнаславянскай, беларускай, польскай, грэчаскай, лацінскай, старажытнаяўрэйскай). Свой талент і схільнасць да навук прысвяціў спасціжэнню глыбінь тэалогіі, чым набыў агульнаеўрапейскую вядомасць.




Выява Сымона Буднага на карыкатуры (XVI стагоддзе)

Сымон Будны таксама знакаміты як крытык і перакладчык. На старонках яго твораў разглядаліся працы папярэднікаў і сучаснікаў. Аўтар палымяна спрачаўся, пераконваў, абвяргаў. Нярэдка звяртаўся да гістарычных паралеляў, суправаджаў свае паведамленні каментарыямі, выкарыстоўваў прымаўкі і афарызмы.

На пачатку лета 1562 года ў Нясвіжскай пратэстанцкай друкарні, якая належала пану Мацвею Кавячынскаму, пры падтрымцы Мікалая Радзівіла Чорнага з'явілася першая на тэрыторыі Беларусі кніга



Правообладатель Национальный институт образования

*Катэхізіс* — форма падачы матэрыялу ў пытаннях і адказах.

«Катэхізіс, або Навука старадаўняя хрысціянская ад Святога Пісьма, для простых людзей мовы беларускай у пытаннях і адказах сабраная». «Катэхізіс» адрасаваны «простым людем» і дзецям «языка рускoго» — гэта адначасова дагматычна-багаслоўская праца, чытанка і падручнік. Кніга была з густам аздоблена, мела салідны аб'ём — больш за 500 старонак. Парадак раздзелаў кнігі знешне паўтараў вядомы «Вялікі Катэхізіс» 1529 года Марціна Лютэра.

Праз тры месяцы выйшаў новы твор на старабеларускай мове «Апраўданне грэшнага чалавека перад Богам», але, на жаль, не захавалася ніводнага яго экзэмпляра.

! Кнігі Сымона Буднага, выдадзеныя ў Нясвіжы і Лоску («Катэхізіс», Нясвіж, 1562; «Аб дзвюх прыродах Хрыста», Лоск, 1574), былі папулярныя ў краінах Заходняй Еўропы.



Тытульны ліст «Катэхізіса» Сымона Буднага (1562)

Найбольш поўна Сымон Будны выявіўся як пісьменнік-публіцыст. Творчасць яго мела выразную гуманістычную і сацыяльную скіраванасць, а галоўнае месца адводзілася этычнай праблематыцы, сістэме каштоўнасцей і духоўных арыенціраў.

У ***прадмове да «Катэхізіса»***, звяртаючыся да князёў Радзівілаў, аўтар выступаў за выхаванне любові да мовы свайго народа, ужыванне яе ў набажэнствах, выказваў ідэю павагі да іншых моў і яднання са славянскімі народамі. Сымон Будны заклікаў вялікіх князёў акружаць сябе мудрымі і адукаванымі людзьмі, якія могуць даваць разумныя парады, аказваць дапамогу ў крытычныя для дзяржавы моманты. Важную ролю ў грамадстве асветнік адводзіў настаўнікам і пастырам, трапна параўноўваючы іх з «соллю зямлі»: як соль захоўвае тое, што ёю пасолена, каб не сапсавалася, так і настаўнік навучаннем захоўвае людзей ад духоўнай гнілі. «Катэхізіс» Сымона Буднага шырока абмяркоўваўся як мясцовымі прадстаўнікамі рэфармацыйнага руху, так і заходнееўрапейскімі філосафамі і багасловамі.



Правообладатель Национальный институт образования

**Васіль Цяпінскі (Амельяновіч)** (каля 1540 — каля 1604) — выдатны філолаг і таленавіты перакладчык родам з Полаччыны. Васіль Амельяновіч атрымаў прозвішча Цяпінскі па назве родавага маёнтка Цяпіна каля Лепеля (цяпер Віцебская вобласць). Па сваіх поглядах Цяпінскі быў блізкі да Сымона Буднага, які стаў для яго і настаўнікам, і сябрам. Меў землі ў некалькіх паветах. Служыў малодшым афіцэрам коннай роты. Верагодна, Васіль Цяпінскі прадаў частку маёмасці, каб арганізаваць друкарню. Па веравызнанні ён быў пратэстантам.



Васіль Цяпінскі. Работа невядомага аўтара

З творчай спадчыны пісьменніка захаваліся рукапісная прадмова да Евангелля, адна старонка «Катэхізіса, або Сумы навукі для дзяцей у Ісусе Хрысце», а таксама няпоўны пераклад Новага Запавета.

Васіль Цяпінскі — прадаўжальнік традыцый Скарыны. Каля 1570 года ён набыў друкарню. Абапіраючыся на стараславянскія пераклады Бібліі Кірыла і Мяфодзія, пераклаў на беларускую мову Евангелле і выдаў са сваёй рукапіснай прадмовай і кароткімі каментарыямі. У кнігу ўвайшлі часткі Новага Запавета на старабеларускай і царкоўнаславянскай мовах. Новым для таго часу было размяшчэнне побач царкоўнаславянскага тэксту і старабеларускага перакладу, што спрыяла больш дакладнаму разуменню сэнсу. Як і Францыск Скарына, Васіль Цяпінскі змяшчаў на палях Евангелля глосы.



Фрагмент першай старонкі Евангелля з друкарні Васіля Цяпінскага (каля 1570-га)



Правообладатель Национальный институт образования

Сваю місію як перакладчыка і кнігавыдаўца Васіль Цяпінскі выклаў у ***прадмове да Евангелля***. Яе пісьменнік бачыў у служэнні ісціне і свайму народу, які ён называе «высакародным, слаўным, дасціпным, сумленным».

У прадмове да Евангелля асноўную ўвагу Васіль Цяпінскі звяртаў на асветніцка-адукацыйныя і культурна-выхаваўчыя пытанні. У час разгортвання паланізацыі непакоіўся пра ўмацаванне пазіцый беларускай мовы — заявіў пра неабходнасць развіцця пісьменства, літаратуры і навукі на роднай мове. Патрыятызм і годнае выкананне грамадзянскага абавязку пісьменнік лічыў фундаментам дзяржаўнасці і захавання традыцый. Друкар выказваў занепакоенасць станам школьнай адукацыі, даказваў, што яе развіццё і асвета моладзі выратуюць народ і дзяржаву, дапамогуць пераадолець грамадскі крызіс. Напрыклад, вось як эмацыянальна аўтар звяртаўся да «шляхетных паноў»: «...у звычайным клопаце аб недастатковасці навукі братам вашым (будзьце) прыкладам міласэрным... каб гэтаму вашаму народу, невуцтвам сапсаванаму і засмучанаму, дапамагчы... каб ні хабарам, ні подкупам дзеля займання пасад... а слову Божаму самі вучыліся і іншых (навучалі)».

Прадмова да Евангелля — адзіная крыніца звестак пра погляды Васіля Цяпінскага.

Васіль Цяпінскі заклікаў магнатаў быць патрыётамі сваёй Айчыны: мець рашучасць і смеласць, «калі яна загіне, згінуць з ёю», але знайсці сілы і жаданне разам з ёю паўстаць.

1. Чым вядомы Сымон Будны?
2. Чаму Васіля Цяпінскага называюць прадаўжальнікам справы Францыска Скарыны?
3. Якія праблемы, актуальныя для сённяшняга грамадства, закраналі ў публіцыстычных тэкстах Сымон Будны і Васіль Цяпінскі?
4. Параўнайце афармленне старонак скарынаўскай Бібліі і «Катэхізіса» Сымона Буднага (факсімільнае выданне або электронную копію). У чым іх падабенства?
5. Адшукайце паштоўкі, выявы скульптур, партрэты Сымона Буднага ў інтэрнэт-прасторы. Які агульны элемент, прадмет сустракаецца на выявах? Чаму?



Правообладатель Национальный институт образования

## Жанры літаратуры Адраджэння

Эпоха Адраджэння, або Рэнесансу (XVI стагоддзе), — перыяд у гісторыі культуры Еўропы паміж Сярэдневякоўем і Новым часам. На тэрыторыі сучаснай Беларусі падчас Адраджэння дзейнічала цэлая плеяда асветнікаў-гуманістаў: Францыск Скарына, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі. У прадмовах і пасляслоўях яны не толькі тлумачылі змест надрукаваных кніг, выказвалі свае эстэтычныя, маральныя, філасофскія погляды, але і заклікалі сучаснікаў далучацца да навукі, ствараць дзяржаву на прынцыпах справядлівасці і ўзаемапавагі, шанаваць сваю мову. Гэты элемент закліку, ацэнкі сучаснасці, уздзеяння на чытача зрабіў літаратурныя тэксты Адраджэння публіцыстычнымі, гэта значыць звернутымі да шырокай грамадскасці, дзеля абмеркавання актуальных палітычных, эканамічных, літаратурных, філасофскіх і іншых праблем, іх ацэнкі з мэтай змянення сітуацыі.

***Прадмова*** — уступнае слова да кнігі, у якім выдавец, рэдактар або аўтар паведамляе чытачу звесткі, неабходныя для лепшага разумення прапанаванага тэксту.

У прадмове могуць быць апісаны мэты выдання, структура кнігі, растлумачана задума, значнасць, як, напрыклад, у прадмовах Васіля Цяпінскага да Евангелля, Сымона Буднага да «Катэхізіса».

***Пасляслоўе*** — змешчаны пасля твора дадатак, прысвечаны ўдакладненню, абмеркаванню, каментаванню асноўнага тэксту, які ўжо вядомы чытачу.

У пасляслоўі можа змяшчацца інфармацыя пра выданне ад складальніка або рэдактара, як гэта было зроблена ў пасляслоўях Францыска Скарыны да кніг Бібліі.

Супрацьстаянне пратэстанцкіх і традыцыйных плыняў у тагачаснай царкве вяло да ўзнікнення **палемічнай публіцыстыкі** — адкрытых спрэчак, публічнай перапісцы паміж прадстаўнікамі розных канфесій і грамадскіх структур у выглядзе лістоў, пасланняў, водпаведзяў, памфлетаў, чалабітных, скаргаў (су́плік). Гэтым творам уласцівы



Правообладатель Национальный институт образования

непрымірымасць аўтарскай пазіцыі, адстойванне пастулатаў сваёй веры, багатая аргументацыя, а таксама іронія, сарказм у адносінах да апанентаў.

1. Чаму многія творы эпохі Адраджэння мелі публіцыстычны характар?
2. Якія магчымасці даваў у той час творцам жанр прадмовы? Чым прадмовы адрозніваліся ад пасляслоўяў?
3. Які рэлігійна-грамадскі рух паспрыяў узнікненню палемічнай публіцыстыкі? Назавіце яе вызначальныя прыметы.
4. Як выглядала б прадмова да гэтага вучэбнага дапаможніка, калі яе напісаў бы Васіль Цяпінскі або Сымон Будны? Аргументуйце адказ.

## ЛІТАРАТУРА ЭПОХІ БАРОКА (XVII—XVIII стагоддзі)

**1.** Якія гістарычныя падзеі адбываліся на тэрыторыі нашай краіны ў XVII—XVIII стагоддзях? Пры адказе выкарыстайце звесткі з урокаў гісторыі Беларусі. **2.** Што вы ведаеце пра стыль барока ў беларускай культуры?

У XVII—XVIII стагоддзях беларуская літаратура развівалася ў рэчышчы якасна іншым у параўнанні з папярэдняй эпохай. У адрозненне ад культуры Адраджэння, якая арыентавалася на антычную гармонію і меру, мастацтва новага перыяду было скіравана на вытанчанасць, дасціпнасць, арыгінальнасць. Гэты новы напрамак пранік ва ўсе віды мастацтва і атрымаў назву **барока** — ад італьянскага слова «барока», што ў перакладзе азначае ‘незвычайны’, ‘дзіўны’.

У беларускім барока спалучыліся заходнееўрапейскія, візантыйскія і мясцовыя традыцыі. Найярчэй барока праявілася ў архітэктуры: былі пабудаваны храмы, магнацкія рэзідэнцыі, частка з якіх захавалася да нашых дзён (напрыклад, касцёл езуітаў у Нясвіжы (цяпер касцёл Божага Цела), кляштар дамініканцаў у Стоўбцах (цяпер касцёл Св. Казіміра), Фарны касцёл у Лідзе, Спаская царква ў Магілёве). Паралельна ішла эвалюцыя паркавага мастацтва. У жывапісе расквітнеў жанр параднага партрэта. З’явіліся барочныя пастаноўкі ў тэатры Францішкі Уршулі Радзівіл — першай на тэрыторыі Беларусі жанчыны-драматурга, «нясвіжскай Мельпамены». Ствараліся музычныя кампазіцыі ў новых жанрах: канцоны, сюіты («Полацкі сшытак»), выкарыстоўваліся новыя інструменты. Узбагацілася барочнымі тра-



Правообладатель Национальный институт образования

дыцыямі кніжная графіка, прыкладам чаго могуць стаць магілёўскія старадрукі.

**Барока ў беларускай літаратуры.** З умацаваннем каталіцызму амаль спынілася рэлігійная палеміка, якая была ўласціва Адраджэнню. На змену міжканфесійнай перапісцы і водпаведзям прыйшлі свецкія сатырычныя творы-пародыі на жанры афіцыйнай літаратуры — сеймавыя прамовы, дзелавыя пасланні.

Парадыйна-сатырычная проза — праяўленне свядомай мастацкай творчасці з ярка выяўленымі рысамі барочнага стылю (гратэскнасць, шматзначнасць). Найбольш выразнымі прыкладамі **палітычнай сатыры** можна лічыць ананімныя «Прамову Мялешкі» і «Ліст да Абуховіча».

Творцы эпохі барока карысталіся стараславянскай, польскай і лацінскай мовамі, прычым пераважала польская (нават мясцовае летапісанне ажыццяўлялася па-польску, напрыклад хронікі Магілёва і Віцебска). Таму вельмі важным крокам у развіцці беларускай літаратуры стала **вершатворчасць на беларускай мове**.

Паколькі хутка развівалася тэатральнае мастацтва, вылучыўся прыдворны тэатр, а пры дварах арыстакратыі нават былі створаны аркестры, то заканамерна, што адбывалася развіццё і **драматургіі**. У духоўных навучальных установах — калегіях — з'явіўся так званы школьны тэатр, які даў пачатак станаўленню **школьнай драмы**.

**Палітычная сатыра. «Прамова Мялешкі»** — сатырычная пародыя на афіцыйны жанр сеймавай прамовы, які выкарыстоўваўся на пасяджэннях урада Рэчы Паспалітай. Невядомы аўтар для праўдападабенства сітуацыі выкарыстаў імя гістарычнай асобы — Івана Мялешкі — мазырскага падкаморыя[1] і кашталяна[2] смаленскага, але зрабіў гэта, хутчэй за ўсё, пасля яго смерці (1622). Разам з тым магчыма, што гэта рэальная прамова самога Мялешкі на сейме 1589 года, толькі літаратурна апрацаваная.

Аўтар супаставіў час кіравання Жыгімонта I з праўленнем Жыгімонта III (Сігізмунда III Вазы) і паказаў, што за колішнім каралём было намнога лепш, як за сённяшнім: «Адзін толькі Жыгімонт Першы — салодкая памяць яго! <...> І значна лепей пры ім нашым жылося, хоць і не хадзілі ў дарагіх світах». Вялікае Княства Літоўскае ў часы Жыгімонта Старога было самастойнай дзяржавай: менавіта

[1] *Падкаморый* — супрацоўнік судовых органаў, якія займаюцца зямельнымі пытаннямі.

[2] *Кашталян* — адміністратар замка і прылеглых тэрыторый.



Правообладатель Национальный институт образования

тады ўбачылі свет кнігі Францыска Скарыны, паэма «Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага, быў прыняты першы Статут Вялікага Княства Літоўскага. Зусім іншая справа — гады праўлення Жыгімонта III, у прысутнасці якога нібыта і была сказана прамова: «...што старыя нашы князі сабралі — тое ўсё немцам раздалі нашыя гаспадары!»

У тэксце актыўна выкарыстоўваецца жывая гутарковая мова, можна сустрэць прыказкі, прымаўкі. Сам Мялешка паказаны іранічна — як чалавек старамодны, які трымаецца за ўсё старасвецкае. Вось як ён, напрыклад, ставіцца да навамодных рэчаў: «І тое на свеце дуроцце — гадзіннікі! <...> Добры наш гадзіннік — певень, бо няхібна апоўначы кукарэкае». Такая наіўнасць прамоўцы ў адлюстраванні і характарыстыцы звычаяў сучаснага яму шляхецкага асяроддзя пададзена невыпадкова: праз гэта крытыкавалася распаўсюджванне чужароднай культуры, падкрэслівалася перавага айчыннага перад іншаземным. «Прамова Мялешкі» хоць і прасякнута гумарам, але надзвычай патрыятычная паводле ідэі.



*В. Варэца, Л. Варэца.*
Сімяон Полацкі (1995)

**Вершатворчасць на беларускай мове.** Выдатным прадстаўніком літаратуры барока з'яўляецца **Сімяон Полацкі** (Самуіл Пятроўскі-Сітняновіч) (1629—1680) — пісьменнік, асветнік, філосаф, педагог.

Паходзіў ён з заможнай полацкай сям'і. Вучыўся спачатку ў Кіева-Магілянскай калегіі — адной з лепшых навучальных устаноў таго часу, а пасля — у Віленскай акадэміі. У 1656 годзе пастрыгся ў манахі. А праз восем гадоў прыняў запрашэнне рускага цара Аляксея Міхайлавіча і пераехаў у Маскву.

Сімяон Полацкі арганізаваў у Маскве лацінскую школу для служачых Прыказа тайных спраў. А ў 1667 годзе яго афіцыйна прызначылі выхавальнікам і настаўнікам царскіх дзяцей — царэвічаў Аляксея, Фёдара і царэўны Соф'і. Наглядаў беларускі асветнік і за навучаннем будучага цара Пятра I, для якога выдаў у 1679 годзе «Букварь языка славенска, сиречь начало учения детям, хотящим учиться чтению и писанию».

Творчая спадчына Сімяона Полацкага шматгранная. Ён пісаў сатыру, драматычныя і багаслоўскія творы, вершы, павучанні, словы.



Правообладатель Национальный институт образования

Сімяон Полацкі імкнуўся да ўдасканалення літаратурнага майстэрства, займаўся паэтычнымі эксперыментамі. Яшчэ ў кіеўскі і віленскі перыяды ён напісаў кнігу «Розныя вершы» на польскай і лацінскай мовах. Творы зборніка вызначаліся дыдактызмам і маралізатарствам, як, напрыклад, верш «Папярэджвай на пачатку», дзе паэт-настаўнік дасціпна і даходліва тлумачыў, чаму варта пазбягаць ліхіх думак:



*А. Апсіт.* Сімяон Полацкі чытае вершы дзецям (1900-я)

Дубчык маладзенькі як хочаш скіруеш —
Дрэва ж старое ўжо не напрастуеш.
Рэчку з вытоку ўтаймаваці можна,
А разальецца — грэбля не паможа.
Полымя ў іскры тушаць: разгарыцца —
Можа так стацца — вады не збаіцца.
<...>
Гэтак і думак брыдкіх не трымайся —
Выкінь без жалю, з імі развітайся.

Барочная эстэтыка з яе ўскладненасцю формы і пышнай дэкаратыўнасцю найбольш яскрава выявілася ў графічных, або фігурных, вершах Сімяона Полацкага — каліграмах. У яго набытку ёсць фігурныя вершы ў выглядзе крыжа, сэрца, васьміканцовай зоркі, серпанцінавай стужкі, геаметрычных фігур. Паэт таксама захапляўся стварэннем неалагізмаў, слоўнай гульнёй — прыёмам, што быў закліканы забаўляць чытачоў, якія стаміліся ад навучання. Дзякуючы звароту да рэбуснай паэтыкі пісьменнік раскрыў не толькі талент вершатворцы-эксперыментатара, але і здольнасці педагога-наватара.



Каліграма Сімяона Полацкага (1660-я)

Асветнік актыўна займаўся і перакладчыцкай працай: ён ажыццявіў адзін з першых усходнеславянскіх паэтычных перакладаў Песняў цара Давіда і выдаў іх асобнай кнігай «Псалтыр рыфматворная».

Прапаведніцкае майстэрства Сімяона Полацкага раскрылася ў зборніках пропаведзяў «Абед духоўны» і «Вячэра духоўная», кожны з якіх налічвае больш за 1500 старонак.



Правообладатель Национальный институт образования

Таксама вядомы яго паэтычныя зборнікі «Вертаград[1] шматкветны», дзе ў вершаванай форме пададзены звесткі з гісторыі, геаграфіі, антычнай міфалогіі, тэалогіі, і «Рыфмалагіён», куды ўвайшлі творы патрыятычнага зместу. Вядомы і драматычныя творы пісьменніка.

Часам асветнік запазычваў вобразы, сюжэты, матывы з антычнай літаратуры, інтэрпрэтаваў іх. У нейкай ступені ён спрыяў распаўсюджванню жанру байкі, бо пісаў і гумарыстычныя творы. Сваёй дзейнасцю Сімяон Полацкі сцвярджаў у свядомасці сучаснікаў уяўленне пра асаблівую каштоўнасць пісьменніцкай працы.

**Станаўленне беларускага тэатра.** З XIII стагоддзя народных «іграцоў», «плясуноў», «гудцоў» усё часцей пачынаюць называць скамарохамі. Часта слова «скамарох» сустракалася ў дзелавых дакументах XVI—XVII стагоддзяў. Гэтыя запісы змяшчалі інфармацыю пра матэрыяльны стан (скамарохі былі абавязаны плаціць падаткі), характар жыцця (аседлыя або вандроўныя), асаблівасці дзейнасці (музыкі, штукары, жанглёры або важатыя вучоных мядзведзяў), але не давалі звестак пра слоўнае мастацтва артыстаў. Толькі ў XIX стагоддзі, калі сама традыцыя скамароства пачала знікаць, былі апісаны гульні, якія ў аснове мелі скамарохаў пачатак («Жаніцьба Цярэшкі», «Каза», «Юр'еўскі абрад пастухоў»).

Беларуская драматургія ўзнікла ва ўзаемадзеянні кніжнай і фальклорнай традыцый. У 1569 годзе ў сувязі з распаўсюджваннем пратэстантызму на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага пачалася дзейнасць ордэна езуітаў. Адным з яе аспектаў было адкрыццё агульнадаступных школ і калегій. Курс адукацыі ў школах прадугледжваў практычнае засваенне рыторыкі. Дзеля фарміравання навыкаў дэкламацыі і духоўнага выхавання пры школах ствараліся тэатры, дзе вучні пад кіраўніцтвам ментараў[2] ладзілі пастаноўкі. Школьны тэатр быў не забавай, а адной з вучэбных дысцыплін.

Прадстаўленні ладзіліся па пэўнай схеме, мелі абавязковыя кампаненты: прысвячэнне, пралог, тры (радзей пяць) акты, эпілог і оду.

> ***Пралог*** — уступ у мастацкім творы, які знаёміць чытача (гледача) з падзеямі, што папярэднічалі асноўнаму дзеянню.

Але тэатральныя гледачы, відаць, з самага пачатку сутыкнуліся з шэрагам псіхалагічных цяжкасцей, бо аб'ёмны лацінамоўны тэкст слухаць было даволі складана.

---

[1] *Вертагра́д* — сад; абгароджаныя пасадкі.

[2] *Ме́нтар* — дарадчык, кансультант, часта — настаўнік.



Правообладатель Национальный институт образования

А купцы, шляхта, мясцовыя жыхары часам увогуле прымалі сцэны са спектакля за рэальнасць.

Быў выпадак, калі падчас спектакля адзін шляхціц пачаў прапаноўваць грошы герою, які па сцэнарыі не мог сплаціць пазыку. Калі шляхціцу растлумачылі, што дзеянне адбываецца не ў сапраўднасці, ён усё роўна аддаў акцёру грошы.

Каб падрыхтаваць гледачоў да дзеяння, у п'есу ўводзіліся разгорнутыя антыпралогі і пралогі. У перапынках паміж дзеямі маглі разыгрывацца невялікія гумарыстычныя або сатырычныя сцэнкі. Паступова ўстаўныя часткі пачалі пашырацца, у іх з'явіліся новыя героі — так нарадзіліся **інтэрмедыі**.

***Інтэрмедыя*** — невялікая камічная сцэнка бытавога або сацыяльнага зместу, што разыгрываецца паміж актамі асноўнай п'есы. Частка *інтэр-* азначае 'паміж'.

У інтэрмедый былі і іншыя задачы: утрымаць гледача ва ўмоўнай атмасферы тэатральнай гульні, падмацаваць ілюзію сапраўднасці дзеянняў на сцэне, даць адпачыць ад манатоннай лацінскай мовы і складанага сюжэта. Інтэрмедыі, як правіла, ствараліся не настаўнікамі, а вучнямі старэйшых курсаў. Часта студэнты ўносілі ў сцэнкі элементы народнай гаворкі, уводзілі сучасных персанажаў-суайчыннікаў («Селянін і студэнт», «Селянін і вучань-уцякач», «Літарат, селянін і Самахвальскі», «Чорт Асмалейка», «Селянін у касцёле»).

Паступова са сцэн езуіцкіх і каталіцкіх тэатраў пачала знікаць беларуская і польская інтэрмедыя. Але на яе аснове зараджалася камедыя, якая выконвалася не ў прамежках паміж дзеямі драмы, а асобна, часам нават на наступны дзень.

Адметным выступаў галоўны герой у інтэрмедыях, якія ставіліся на праваслаўнай і ўніяцкай школьнай сцэне. Селянін паказваўся стваральнікам зямных даброт, роўным са шляхтай, выклікаў у гледачоў сімпатыю.

У часы барока папулярным стаў **лялечны тэатр (батлейка)**. Можна толькі меркаваць, якім было батлейкавае прадстаўленне ў XVII і XVIII стагоддзях, бо запісы батлейкавых тэкстаў сталі рабіцца пазней.



Батлейка з традыцыйнымі персанажамі



Правообладатель Национальный институт образования



*М. Блішч.* Беларускі тэатр «Батлейка» (1959)

Узнікненне батлейкі звязана са святкаваннем Нараджэння Хрыстова і Хрышчэння, калі вандроўныя манахі, вучні семінарый ладзілі ў вёсках і мястэчках тэатралізаваныя прадстаўленні. У XVIII стагоддзі выканаўцамі батлейкі сталі сяляне і рамеснікі. Спектаклі ладзіліся ў драўлянай аднапавярховай або двухпавярховай скрыні (батлейцы) са статычнымі або рухомымі лялькамі. Іх дзеянні суправаджаліся вершаванымі дыялогамі, песнямі. Першапачаткова батлейкавы тэатр меў выключна рэлігійны характар. У яго прадстаўленнях, прымеркаваных да калядных свят, паказваліся біблейскія сцэны. Асноўная частка, якая была запазычана ў заходнееўрапейскага тэатра, раскрывала евангельскі сюжэт пра нараджэнне Хрыста, забойства немаўлят царом Ірадам і ўцёкі Святога сямейства ў Егіпет.

З прыходам у батлейку свецкіх лялькаводаў рэпертуар дэмакратызаваўся — і рэлігійным па змесце застаўся толькі пралог. Услед за ім звычайна ішла драма «Цар Ірад», у якой ужо выразна прасочваліся народна-фальклорныя элементы, а сюжэт настолькі наблізіўся да рэальнасці, што дадаліся новыя персанажы — жаўнеры, цівуны, жандары, Смерць, якая шукае Ірада. Паступова Ірад ператварыўся ў пана, а станоўчыя персанажы — у сялян і рамеснікаў. Такім чынам народ увасобіў свае спадзяванні на справядлівасць і помсту. У драме сцвярджалася думка аб роўнасці людзей, іх праве на абарону свайго жыцця і годнасці.

1. Чым адметнае беларускае барока?
2. Ці можна «Прамову Мялешкі» назваць узорам барочнай публіцыстыкі? Чаму?
3. Часам Сімяона Полацкага вобразна называюць першым беларускім авангардыстам. Наколькі, на ваш погляд, гэта адпавядае сапраўднасці?
4. Запішыце верш любімага паэта ў выглядзе фігуры. Пракаментуйце, чаму вы выбралі адпаведную фігуру.
5. Звярніце ўвагу на кампазіцыю, дэталі, лініі, тэхніку малюнка Аляксандра Апсіта «Сімяон Полацкі чытае вершы дзецям». Складзіце паводле



Правообладатель Национальный институт образования

яго невялікі сюжэтны аповед, выкарыстоўваючы вывучаны матэрыял (факты, даты, дзейнасць, назвы твораў).

6. Знайдзіце ў «Вікіпедыі» артыкул «Жаніцьба Цярэшкі». Якія элементы сярэдневяковай тэатралізаванай пастаноўкі ўтрымлівае гульня?
7. Прывядзіце прыклады персанажаў і сюжэтаў, характэрных для інтэрмедый. Прыдумайце ў групах сучасны сюжэт (напрыклад, «Вучань у сталовай», «Завуч і дзесяцікласнік») і арганізуйце невялікае батлейкавае прадстаўленне для аднакласнікаў.
8. Перадайце словамі настрой палатна мастака Міхаіла Блішча.

## ЛІТАРАТУРА АСВЕТНІЦТВА (другая палова XVIII — пачатак XIX стагоддзя)

Канец XVIII стагоддзя ўвайшоў у гісторыю як эпоха Асветніцтва, калі ў гісторыі еўрапейскай культуры адмаўлялася перавага рэлігійнага светаразумення і прызнаваўся зварот да розуму як да адзінага крытэрыю спасціжэння прыроды, чалавека і грамадства. Папулярызаваліся веды, якія павінны былі стаць даступнымі ўсім, а не толькі прывілеяваным сацыяльным слаям. У аснове навуковай, філасофскай і грамадскай думкі ляжалі рацыяналізм і вальнадумства. Асветнікі імкнуліся вырашыць праблему чалавека і яго прыроды, абапіраючыся на тэорыю натуральнага права.

> ***Сентыменталізм*** — літаратурны напрамак, у якім пачуццё прызнаецца сутнасцю чалавечай прыроды. Адным з пачынальнікаў сентыменталізму ў сусветнай літаратуры лічыцца француз Жан-Жак Русо.

Асноўнымі літаратурнымі напрамкамі эпохі Асветніцтва сталі класіцызм і сентыменталізм. Класіцысты ў мастацкіх творах звярталіся найперш да розуму, сентыменталісты — да сэрца, пачуццяў. Перад літаратурай ставілася задача актыўна ўмешвацца ў жыццё, фарміраваць з чалавека грамадзяніна і патрыёта, вучыць і выхоўваць яго.

Беларускамоўныя тэксты былі распаўсюджаны менш, чым у часы барока, некаторыя бытавалі ў рукапісным выглядзе. Зрэдку творы на беларускай мове, напрыклад лірычныя песні, траплялі ў друкаваныя зборнікі. Часта яны былі ананімныя. Пры гэтым рысы Асветніцтва ў Беларусі выразна праявіліся ў шматмоўнай літаратуры. Асноўнай літаратурнай мовай была польская (Юльян Нямцэвіч, Адам Нарушэвіч, Францішак Карпінскі, Францішак Князьнін, Францішак Багамолец), напрыканцы XVIII стагоддзя распаўсюдзілася яшчэ



Правообладатель Национальный институт образования

руская (Іван Сакольскі, Гаўрыла Дабрынін). Сустракаліся тэксты на лацінскай, французскай і нямецкай мовах, бо творы на гэтых мовах на той час былі папулярныя ў Еўропе.

**Паэзія.** Класіцысцкія каноны прадугледжвалі для «высокіх» жанраў адпаведныя мовы — лацінскую, польскую, а для «нізкіх» — парадыйных, бурлескных — мову «людзей простых».

***Бурлеск*** (ад слова «бурлеска» — ‘жартоўны’) — разнавіднасць паэзіі класіцызму, калі «высокія» рэчы апяваюцца «нізкім» стылем і наадварот.

Беларуская паэзія Асветніцтва прадстаўлена калядкамі, велікоднымі песнямі. Напрыклад, у калядцы «Того дня вельмі слаўного», запісанай у глыбоцкай школе, камічны эфект выклікае спалучэнне «высокага» малітоўнага складу («Того дня вельмі слаўного, алі, алілуя, // Народівся нам Спасіцель») і «нізкага», прыземленага зместу («А ты, Івашку, бігай по кашку, // Шчобы децінка не сголодняла»).

У парадыйна-сатырычным вершы «Уваскрэсенне Хрыстова» выразна праявілася асветніцкае вальнадумства. Аўтар вельмі свабодна абышоўся з тэкстам: біблейскія персанажы надзелены чалавечымі слабасцямі, паводзяць сябе як звычайныя местачкоўцы: асілак Самсон «быў лас на сон», Ілля «ехаў на канях — гром пушчаў такі, аж страх», а «святы Яфет нёс і шаблю, і мушкет». Гэтыя традыцыі пазней выявяцца ў паэмах «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе».

**Драматургія.** У эпоху Асветніцтва тэатру адводзілася роля выхавальніка грамадства, таму так пашырылася гэта мастацтва. Побач са школьным і народным у Беларусі з’явіліся прыдворныя і прафесійныя тэатры. У рэпертуары прыезджых прафесійных труп пераважалі заходнееўрапейскія, часцей польскія, п’есы, а артысты прыдворных тэатраў увасаблялі творчасць мясцовых аўтараў. Напрыклад, былі пастаўлены камедыі Францішкі Уршулі Радзівіл у Нясвіжы, оперы і балеты ў «сядзібе музаў» Міхала Казіміра Агінскага ў Слоніме. Функцыянаваў «плывучы тэатр» на баржах на канале Агінскага — частка сцэны затаплялася вадой з канала,



Сцэна з музычнага спектакля «Камедыя» (рэж. В. Чыгілейчык). Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр



Правообладатель Национальный институт образования

і па ёй маглі плыць лодкі. У эпоху Асветніцтва рабіліся спробы ўвесці ў пастаноўкі беларускую мову.

Пышныя відовішчы па-ранейшаму наладжваліся на сцэнах езуіцкіх калегій. З уніяцкіх тэатраў найбольшай вядомасцю карыстаўся базыльянскі тэатр у Жыровічах. На праваслаўнай школьнай сцэне былі пастаўлены інтэрмедыі «Селянін у касцёле» і «Селянін на споведзі», героі якіх паводзілі сябе даволі свавольна.

Развіццё школьнай драматургіі знайшло лагічнае завяршэнне ў пастаноўках Забельскай дамініканскай калегіі (Полаччына). Найбольш значны твор забельскага рэпертуару — «Камедыя» Каятана Марашэўскага (1787). П'еса напісана паводле законаў класіцызму — захоўваецца адзінства месца, часу і дзеяння, а ў развагах персанажаў дамінуе рацыянальны погляд на свет.

Два вядучыя героі «Камедыі» з трох (селянін Дзёмка і карчмар) гавораць па-беларуску. Селянін не задаволены сваім лёсам: «Мала што кроўю не пацею, аж пакуль не пакуль кавалак хлебаараблю». Вінаваты ў тым, згодна з Дзёмкавым меркаваннем, пан, які не лічыць сялян за людзей, а яшчэ карчмар-арандатар, які ашуквае і спойвае іх, але галоўная бяда — грэх Адама. Дзёмка пайшоў у заклад з Чортам, што не паўторыць граху Адама — не спакусіцца. Паводле дамовы ён не павінен вымавіць ні слова на працягу гадзіны і тады атрымае грошы. «Хоць бы сабе і на галаве хадзілі б, то я ані паўслоўца не скажу. <...> Але ж калі дацярплю — сто рублей маіх будзець!» — разважае ён. Вядома, Чорт ашукаў небараку.

Твор поўны народнага гумару, напісаны зразумелай жывой гаворкай. Ён і сёння ставіцца ў тэатры: спектакль паводле «Камедыі» Каятана Марашэўскага ідзе на сцэне Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра.

1. Чаму беларускую літаратуру другой паловы XVIII — пачатку XIX стагоддзя называюць эпохай рукапісаў?
2. Растлумачце моўныя асаблівасці бурлескнай паэзіі.
3. Перакажыце гісторыю, паказаную ў «Камедыі» Каятана Марашэўскага, ад імя аднаго з герояў (на выбар). Сачыце, каб ваша мова была набліжана да мовы гэтага персанажа.
4. Арганізуйце дыскусію, каму магла належаць ідэя стварэння інтэрмедый у школьных прадстаўленнях — настаўнікам або вучням.
5. Разгледзьце фотаздымак сцэны са спектакля «Камедыя» (рэжысёр Валерыя Чыгілейчык). Па якіх прыметах вы пазналі персанажаў? Дзе і калі адбываецца дзеянне?



Правообладатель Национальный институт образования

## Пытанні і заданні для паўтарэння і падагульнення

1. Якія тэмы найбольш цікавілі аўтараў перыяду Сярэдневякоўя?
2. Чаму Кірыла Тураўскага называюць «тураўскім Залатавустам»?
3. Назавіце асаблівасці літаратурнай эпохі Адраджэння ў Беларусі.
4. Паглядзіце гісторыка-біяграфічны фільм «Я, Францыск Скарына» (1969, рэжысёр Барыс Сцяпанаў, «Беларусьфільм»). Напішыце рэцэнзію на гэты твор, у якой адкажыце на пытанні: 1) Што, чаму і навошта рэцэнзуецца? 2) Чым вам запомнілася ігра акцёраў? 3) Як можна ацаніць твор і чаму? 4) Якія недахопы заўважаюцца? 5) Да якіх высноў вы прыйшлі?
5. У чым заключаўся перадавы падыход Францыска Скарыны да кнігадруку, літаратуры?
6. З улікам вопыту пісьменнікаў Адраджэння напішыце прадмову (або пасляслоўе) да вашай любімай кнігі на беларускай мове. Чым яна адрозніваецца ад аналагічных твораў мінулага?
7. Ці падобныя, на вашу думку, архітэктура і літаратура барока?
8. Праслухайце музычныя кампазіцыі з «Полацкага сшытка» для блокфлейты. Для якіх літаратурных твораў эпохі барока будзе прыдатны такі музычны фон (батлейка, школьная драма, інтэрмедыя, п’еса прыдворнага тэатра, палітычная сатыра, барочная паэзія)? Растлумачце свой выбар.
9. Параўнайце мову паэтычных твораў Францыска Скарыны і Сімяона Полацкага. Якія тэксты вам больш зразумелыя? Як вы думаеце чаму?
10. Арганізуйце дыскусію «Ці можна сцвярджаць, што сучасныя гумарыстычныя шоу працягваюць традыцыі даўніх інтэрмедый і камедый?».
11. Параўнайце школьны тэатр і батлейку паводле наступных крытэрыяў: аўтары, удзельнікі, мова, змест пастановак, героі спектакляў.
12. Зрабіце 6-8 картак з цытатамі вывучаных твораў. Назву твора і аўтара напішыце на адваротным баку. Прапануйце сябрам адгадаць тэкст, з якога вамі ўзята цытата, і яго аўтара.
13. Складзіце табліцу (да 10 радкоў, па стагоддзях) найбольш значных, на вашу думку, падзей у гісторыі літаратуры XI—XVIII стагоддзяў.

| Стагоддзе | Падзея | Значэнне для гісторыі літаратуры |
|---|---|---|
| | | |



Правообладатель Национальный институт образования



# Развіццё новай беларускай літаратуры XIX стагоддзя

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XIX СТАГОДДЗЯ

? **1.** Якія падзеі на тэрыторыі Беларусі канца XVIII стагоддзя адбіліся на літаратурным жыцці краіны? **2.** Каго з беларускіх дзеячаў культуры XIX стагоддзя вы можаце назваць?

У гісторыі беларускай літаратуры XIX стагоддзя новы перыяд развіцця пачынаецца з 1795 года, з апошняга падзелу Рэчы Паспалітай, калі гэта магутная краіна знікла з карты Еўропы.

З сярэдзіны XVIII стагоддзя і да пачатку 1820-х гадоў у Еўропе панавала ідэалогія Асветніцтва. На тэрыторыі Беларусі ў XVIII стагоддзі буйнымі цэнтрамі культуры і літаратуры былі каралеўскі двор Станіслава Аўгуста Панятоўскага і маёнтак Пулавы Адама Казіміра Чартарыйскага. У літаратуры «станіслаўаўскага перыяду» (да пачатку XIX стагоддзя) пераважаў *класіцызм*, які найбольш поўна праявіўся ў творчасці Адама Нарушэвіча, у пачатку XIX стагоддзя — у творчасці Юльяна Нямцэвіча. Для беларускага класіцызму характэрна наследаванне ўзораў французскай літаратуры, вера ў ідэальнае мінулае, у магчымасць існавання добрага манарха, дыдактызм, які праявіўся ў імкненні выправіць норавы грамадства, і інш.

У 1810-я гады культурны і адукацыйны цэнтр тагачаснай Беларусі — гэта Віленскі ўніверсітэт, дзе панаваў дух Асветніцтва. Ва ўніверсітэце ўтварылася асаблівае інтэлектуальнае асяроддзе. Выкладчыкі і студэнты прымалі ўдзел у выданні газет і часопісаў. З 1816 да 1822 года ва ўстанове самаарганізоўваліся нелегальныя студэнцкія таварыствы шубраўцаў, філаматаў, філарэтаў і прамяністых. Бунтоўны дэмакратычны дух універсітэта спрыяў развіццю *рамантызму*



Правообладатель Национальный институт образования

(самы яркі прадстаўнік — Адам Міцкевіч), які стаў галоўным мастацкім метадам у літаратуры 1830-х — пачатку 1860-х гадоў і вызначыўся беларускім зместам.

**Дзейнасць студэнцкіх таварystваў.** **Шубраўцы** (з пол. — ‘гарэза’, ‘свавольнік’, ‘штукар’) — напаўлегальнае навуковае таварыства, адным з заснавальнікаў якога быў загадчык бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта Казімір Кантрым. Таварыства дзейнічала ў 1816—1822 гадах, выдавала газету «Вулічныя навіны» (Wiadomości Brukowe), сярод яе рубрык — «Бесклапотна-філасофскія падарожжы» і «Вулічныя навіны з таго свету». Мэтай дзейнасці шубраўцаў было абвешчана выкрыццё грамадскіх заган, паляпшэнне маралі, распаўсюджванне асветы. Праўда, сродкі яе дасягнення былі спрэчныя: літаратурнае свавольства, выкарыстанне любой нагоды дзеля прыцягнення ўвагі да той або іншай праблемы. Вядомыя ўдзельнікі таварыства — Тамаш Зан, Ігнат Ходзька, Антон Гарэцкі.

**Філаматы** (з грэч. — ‘аматары ведаў’) — віленскае тайнае навукова-асветніцкае таварыства. Першае пасяджэнне адбылося ў 1817 годзе, а праіснавала таварыства да 1823 года. Заснавальнікамі і ўдзельнікамі сталі сакратар суполкі Тамаш Зан, яе прэзідэнт Юзаф Яжоўскі, а таксама Адам Міцкевіч і Ян Чачот. Мэты таварыства былі блізкія шубраўцам: папулярызацыя навукі сярод моладзі, паляпшэнне звычаяў, выхаванне патрыятычных пачуццяў на падставе славянскай культуры (праз вывучэнне беларускага фальклору, міфалогіі, гісторыі). Мовай штодзённых зносін студэнтаў была польская, а мовай тайнага таварыства — беларуская.


Філаматы і філарэты: Тамаш Зан, Ігнат Дамейка, Адам Міцкевіч, Антон Эдвард Адынец, Ян Чачот

Гісторыя аб’яднання скончылася трагічна: у жніўні 1824 года некаторых удзельнікаў асудзілі да турэмнага зняволення, а іншых — да высылкі.

У 1820 годзе арганізавалася падобнае па духу да філаматаў таварыства **філарэтаў** — прыхільнікаў маральнай чысціні. Да яго літаратурнага аддзялення — Блакітнага саюза пад кіраўніцтвам Яна Чачота — прымкнуў паэт, сябар Адама Міцкевіча, Эдвард Адынец.



Правообладатель Национальный институт образования

**Прамяністыя.** У тым самым годзе на чале з Тамашом Занам утварыўся Саюз прамяністых, у які ўвайшлі каля 130 чалавек. Прамяністыя выпрацавалі «15 правілаў для моладзі», зацверджаных рэктарам універсітэта Сымонам Малеўскім. Удзельнікі суполкі планавалі не толькі пашыраць асвету, адукацыю, але і прыцягваць настаўнікаў, таленавітых маладых людзей да Саюза прамяністых.

**Выдатныя прадстаўнікі** гэтага перыяду — філаматы Адам Міцкевіч, творчасць якога вывучалася ў IX класе, а таксама Тамаш Зан і Ігнат Дамейка.

**Тамаш Зан** (1796—1855) — беларуска-польскі паэт, фальклярыст. Паводле паходжання — радавіты беларускі шляхціц з Мясаты, што на Маладзечаншчыне. Вучыўся ў Мінскай гімназіі, а затым — на фізіка-матэматычным факультэце Віленскага ўніверсітэта. Паводле ўспамінаў сучаснікаў, юнак быў душой студэнцкай кампаніі. Як ужо было згадана, Тамаш Зан заснаваў таварыства філаматаў і Саюз прамяністых. Па справе філаматаў ён як кіраўнік суполкі, узяўшы на сябе віну Адама Міцкевіча, Яна Чачота, Ігната Дамейкі і іншых, быў накіраваны ў высылку ў Арэнбург, дзе заняўся геалогіяй і нават заснаваў Арэнбургскі музей мінералогіі.

У 1837 годзе Тамаш Зан вярнуўся да звычайнага жыцця: спачатку ў Пецярбургу (пісаў кнігу пра адкрытыя ім на Урале радовішчы золата, нафты, меднай руды), праз чатыры гады ў Вільні, дзе быў прыняты як нацыянальны герой. У 50-гадовым узросце ўзяў шлюб з аматаркай рамантычнай паэзіі Брыгідай Свентажэцкай і жыў у маёнтку Кахачын на Аршаншчыне.

Менавіта Тамаш Зан першым сярод філаматаў-літаратараў звярнуўся да новага напрамку — рамантызму, а таксама адным з першых пачаў складаць творы на аснове беларускага фальклору і міфалогіі. У паэзіі вядомы як аўтар паэм «Табакерка» і «Твардоўскі», балад «Свіцязь-возера» і «Цыганка».

**Ігнат Дамейка** (1802—1889). Славуты геолаг з Навагрудчыны, складальнік карт Рэчы Паспалітай, ён, як і Тамаш Зан, вучыўся на фізіка-матэматычным факультэце Віленскага ўніверсітэта. Чатырнаццацігадовы юнак быў адным з самых маладых студэнтаў. Гэты філамат стаў сусветна вядомым у літаратуры праз паэму Адама Міцкевіча «Дзяды» (там ён выступае пад сваёй студэнцкай мянушкай Жэгота). У выніку рэпрэсій супраць таварыства апынуўся пад наглядам паліцыі і жыў як селянін у в. Жыбуртоўшчына (Дзятлаўшчына). Удзельнічаў у паўстанні 1830—1831 гадоў, пасля паражэння якога эміграваў у



Правообладатель Национальный институт образования

Францыю, вучыўся ў Сарбоне. З цягам часу пераехаў у Чылі, дзе адкрыў новы мінерал, займаўся навуковай і выкладчыцкай дзейнасцю, узначальваў універсітэт у Сант'яга. Разнастайная навуковая, культурная, асветніцкая дзейнасць Дона Ігнацыя ўшанавана ў Чылі, Польшчы, Літве і, вядома, у Беларусі.

**Мова твораў XIX стагоддзя.** Польская мова — асноўная літаратурная мова на тэрыторыі Беларусі ў першай палове XIX стагоддзя. Яна перайначвала развіццё нацыянальнай літаратуры і культуры. Пры гэтым польскамоўная творчасць многіх пісьменнікаў-беларусаў засноўвалася на падзеях і фактах з беларускай гісторыі, на беларускай міфалогіі і фальклоры.

На дзвюх мовах — польскай і беларускай — пісалі Ян Чачот, Уладзіслаў Сыракомля, Вінцэсь Каратынскі. У сярэдзіне XIX стагоддзя ў літаратурным працэсе з'явіліся аўтары, у творчасці якіх беларуская мова пераважала (Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Францішак Багушэвіч).

! Не ўсе беларускамоўныя творы таго часу дайшлі да нашых дзён, бо найлепш захоўваліся менавіта надрукаваныя тэксты. Уладзіслаў Сыракомля і яго сакратар Вінцэсь Каратынскі планавалі выпусціць уласныя творы на беларускай мове, але з прычыны канфлікту з выдаўцом Адамам Кіркорам кніга не выйшла — і творы згубіліся.

Надзеі шляхты на аднаўленне Рэчы Паспалітай прывялі да зацікаўленасці гісторыяй краіны (Ян Чачот «Спевы пра даўніх ліцвінаў», Адам Міцкевіч «Пан Тадэвуш», Юльян Нямцэвіч «Гістарычныя песні») і цікавасці да фальклору. Але калі ў палякаў фальклор быў польскі, то ў філаматаў — беларускі. Так паступова родная мова стала вяртацца ў літаратурны працэс. Аднак «аматары ведаў» выразна ўсведамлялі сваё нацыянальнае адрозненне ад палякаў, і гэты факт можна лічыць першым крокам да беларускага нацыянальнага адраджэння.

***Гутарка*** — вершаваны маналог або дыялог, у якім у форме няспешнай гаворкі раскрываюцца вострыя сацыяльна-палітычныя (зямля, воля, адмена прыгоннага права) і маральныя (праўда і крыўда, п'янства) праблемы. Напрыклад, ананімныя «Гутарка Кузьмы з Апанасам», «Гутарка пана з хлопам».

**Асаблівасці беларускамоўнай літаратуры.** У беларускамоўнай літаратуры XIX стагоддзя прысутнічалі наступныя тэндэнцыі: паэзія і драматургія колькасна пераважалі над прозай, дамінавалі ананімныя творы. Распрацоўваліся новыя жан-



Правообладатель Национальный институт образования

ры травесційнай («Энеіда навыварат» Вікенція Равінскага) і парадыйнай («Тарас на Парнасе», як мяркуе большасць даследчыкаў, Канстанціна Вераніцына) літаратуры. Шырока распаўсюджваліся паэмы, гутаркі, быліцы («Купала», «Халімон на каранацыі» Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча).

***Быліца*** — разнавіднасць вершаванага апавядання, у аснову якога пакладзены аповед пра цікавы жыццёвы выпадак.

**Бурлескна-травесційныя творы ў паэзіі XIX стагоддзя.** Паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе» — яркія прыклады бурлескна-травесційных твораў.

***«Энеіда навыварат»*** — парадыйна-сатырычная паэма, напісаная не пазней за пачатак 1830-х гадоў. Найбольш верагодны аўтар — ураджэнец Смаленшчыны Вікенцій Равінскі. Сюжэт твора заснаваны на змесце паэмы «Энеіда» рымскага паэта Вергілія Марона. Вергілій расказаў гісторыю пра героя Траянскай вайны Энея, які пасля захопу грэкамі Троі, зведаўшы шматлікія прыгоды, патрапіў у Італію, дзе нібыта заснаваў магутную дзяржаву. Да нашых дзён дайшоў толькі ўрывак «Энеіды навыварат» (палова першай песні), які вызначаецца грубаватым народным гумарам, іроніяй, багатай фразеалогіяй, гратэскным паказам персанажаў і, галоўнае, травесці — «пераапрананнем» так званых «высокіх» антычных вобразаў багоў і герояў у «нізкія» — хабарнікаў, зладзеяў, какетак, выпівох, лайдакоў, якіх тагачасны чытач мог убачыць у беларускіх сёлах і мястэчках. Траянцы ж, наадварот, паказаны аўтарам хоць і ў сатырычным ключы, але з сімпатыяй.

У сюжэце паэмы пераплецены рэаліі і персанажы антычнай і сучаснай аўтару гісторыі. Вельмі сакавітая мова твора. Напрыклад, вось якімі словамі гаворыць багіня Юнона:

«Ці ведаеш маё ты гора?
Эней з траянцамі плыве:
Спіхні яго ты, сват, у мора, —
Няхай, паганец, воду п’е!»

***«Тарас на Парнасе»*** — гумарыстычна-сатырычная паэма, створаная ў сярэдзіне XIX стагоддзя. Твор спалучае ў сабе два планы — рэальна-побытавы і ўмоўна-фантастычны. У цэнтры сюжэта знаходзіцца паляўнічы Тарас, які накіраваўся аднойчы ў




Вокладка выдання паэм «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе» (1945)



Правообладатель Национальный институт образования

пушчу, але дзіўным чынам патрапіў на Парнас — гару багоў і паэтаў. Вось як расказвае пра гэта галоўны герой:

Ляцеў, ляцеў — як разануўся, —
Аж стала зелена ўваччу!
Ляцеў ці доўга я, ці мала,
Таго ніяк не ўцямлю,
Але ўжо ладно рассвітала,
Як я зваліўся на зямлю.

Як і ў «Энеідзе навыварат», персанажы антычнай міфалогіі падаюцца Канстанцінам Вераніцыным у гумарыстычным, набліжаным да сялянскага светабачання выглядзе. Таксама ў паэме сустракаюцца рэальныя імёны пісьменнікаў, паказваюцца праблемы XIX стагоддзя, што робіць твор актуальным для сучаснікаў паэта.

Вялікі ўплыў на літаратуру Беларусі другой паловы XIX стагоддзя аказала паўстанне 1863—1864 гадоў. Сярод яго правадыроў быў Кастусь Каліноўскі. Менавіта ён адным з першых зразумеў карысць роднага слова як самага кароткага шляху да душы селяніна. Каб абудзіць нацыянальную самасвядомасць беларусаў, Каліноўскі выдаваў газету «Мужыцкая праўда». Гэта палымяная публіцыстыка, дзе ўпершыню з «мужыком» вялася размова як з роўным, вольным чалавекам: «Дзецюкі! <...> Пыталі і пытаюць усе, што чуваці па свеце, хто нам, бедным мужыкам, дасць вольнасць. Но, праўду сказаўшы, мала хто хочэ сказаці так, як сумленне кажа — па справядлівасці. Мы мужыкі, браты вашыя, мы вам будзем гаварыць цэлую праўду, толька слухайце нас!» Асуджаны на смерць, паўстанец напісаў вядомыя «Лісты з-пад шыбеніцы» — своеасаблівы запавет беларускаму народу.

Паўстанне ўскалыхнула адраджэнскі нацыянальны рух. Нягледзячы на рэпрэсіі пасля яго і фактычны тэрор царскіх улад у адносінах да «нядобранадзейных» грамадзян, літаратура працягвала развівацца. У яе прыйшлі польскія пісьменнікі, якія пісалі пра беларусаў, Юзаф Крашэўскі — аўтар больш за сотню раманаў, Эліза Ажэшка — двойчы намінантка на Нобелеўскую прэмію, а таксама выдатны беларускі паэт Янка Лучына («Паляўнічыя акварэлькі з Палесся»), які пісаў на трох мовах.

Што аб'ядноўвала гэтых пісьменнікаў? Пазітывізм як ідэалогія малых спраў, няўхільнай эвалюцыі і развіцця. Рэвалюцыя не ўдаецца — значыць, патрэбна эвалюцыя, маленькія крокі наперад, добрыя, няхай і нябачныя справы. Пазітывізм выявіўся ў рэалізме, але своеасаблівым — пазітывісцкім. Побач з ім існаваў і крытычны рэалізм, прадстаўлены творчасцю Францішка Багушэвіча.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Чаму ў першай палове XIX стагоддзя пісьменнікі і паэты Беларусі пісалі пераважна на польскай мове?
2. Як паўплывала на беларускую літаратуру дзейнасць філаматаў і філарэтаў?
3. Назавіце асноўныя асаблівасці новай беларускай літаратуры.
4. Што аб’ядноўвае паэмы «Тарас на Парнасе» і «Энеіда навыварат»?
5. Якія рэаліі ў паэме «Энеіда навыварат» адносяцца да старажытнарымскіх, а якія — да беларускіх?
6. Імёны якіх асоб расійскай культуры сустракаюцца ў паэме «Тарас на Парнасе»? Дзеля чаго яны ўведзены ў твор?
7. Чаму, на вашу думку, многія тагачасныя беларускія творы бытавалі як ананімныя?
8. Падрыхтуйце анатаваны спіс анлайн-публікацый пра знакавага беларускага пісьменніка XIX стагоддзя (на выбар) па наступным плане: прозвішча, імя; гады жыцця; асноўныя творы; 3-5 галоўных публікацый; кароткая анатацыя да іх; спасылкі. Абмяркуйце з сябрамі.

## РАМАНТЫЗМ У ЕЎРАПЕЙСКІМ І БЕЛАРУСКІМ МАСТАЦТВЕ СЛОВА КАНЦА XVIII — ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТАГОДДЗЯ

**1.** Якога чалавека называюць рамантыкам? Каго лічаць рамантыкамі літаратуразнаўцы? **2.** Успомніце беларускіх пісьменнікаў, якія працавалі ў рэчышчы рамантызму.

Рамантызм як літаратурны напрамак сцвердзіў свае пазіцыі ў краінах Заходняй Еўропы ў канцы XVIII стагоддзя. Прычыны яго ўзнікнення трэба шукаць у наступствах Французскай рэвалюцыі, якая здзяйснялася ў перыяд Асветніцтва дзеля ўсеагульнага дабра, братэрства і міру, але прынесла шматлікія страты і разбурэнні. Расчараванне ў выніках рэвалюцыі адначасова было і расчараваннем у магчымасцях чалавечага розуму зрабіць свет лепшым. Ідэалогіі Асветніцтва, якая засноўвалася на рацыяналізме, быў супрацьпастаўлены ірацыяналізм рамантызму.

Даволі хутка рамантызм узялі на ўзбраенне філосафы, дзеячы мастацтва, паэты і пісьменнікі. Гэты новы мастацкі метад прынёс у літаратуру прынцып індывідуальнасці, самабытнасці творчасці, катэгарычнае непрыняцце будзённасці жыцця, культ пачуццяў, захапленне гісторыяй і фальклорам. Нарэшце, у рамантызме выявіўся



Правообладатель Национальный институт образования

своеасаблівы тып героя-бунтара, які выразна праявіўся ў творчасці Джорджа Байрана, Аляксандра Пушкіна, Адама Міцкевіча, крыху пазней — Тараса Шаўчэнкі, Янкі Купалы, Майроніса і інш.

На тэрыторыі тагачаснай Беларусі новы літаратурны напрамак з'явіўся ў 1820-я гады і праіснаваў прыблізна да 1860-х гадоў. Аднак перш чым Адам Міцкевіч абвясціў маніфест рамантызму ў першым паэтычным зборніку («Паэзія», 1822), існаваў перыяд так званага **перадрамантызму**, адной з самых яркіх ідэйна-мастацкіх з'яў якога быў **сентыменталізм.**

На тэрыторыі цяперашняй Беларусі сентыменталізм узнік у 1760-я гады ў асяроддзі польскамоўных паэтаў. Пачынальнікам гэтага напрамку быў Францішак Карпінскі — надворны паэт князя Чартарыйскага, «паэт сэрца», як яго называлі, аўтар твораў у жанры сялянкі, дыдактычнай п'есы («Чынш»). Да пачынальнікаў сентыменталізму трэба аднесці і Францішка Князьніна, аўтара лібрэта да оперы Міхала Казіміра Агінскага «Цыганы».

***Сялянка*** — даўні паэтычны жанр, у якім апяваюцца праца і побыт вяскоўца, каханне на ўлонні прыроды, вяртанне ў залаты век беззаганнага існавання.

Аўтар, творчасць якога лічыцца пераходнай ад класіцызму да рамантызму, — Юльян Нямцэвіч. Мастацкі метад пісьменніка не абмежаваны строгай нарматыўнасцю, не скаваны абстрактнасцю тыпізацыі. У ім праявіліся канкрэтна-гістарычныя прыметы часу, а створаныя пісьменнікам вобразы мелі глыбока індывідуальныя рысы. Чужы пісьменніку і «мёртвы рацыяналізм», жаданне «выкрасаць прыгажосць з матэматычных формул». Юльян Нямцэвіч — перадрамантык, а яго мастацкі стыль нагадвае паэзію Яна Чачота.

Развіццё **класічнага рамантызму** ў літаратуры Беларусі звязана з творчасцю славутага паэта з Наваградка **Адама Міцкевіча** (1798—1855). Яго першая кніга «Паэзія» нарадзілася пад уплывам нямецкіх рамантыкаў Шлегеля, Шылера, Наваліса, Гётэ. Іх уплыў выявіўся ў творчым выкарыстанні фальклорных сюжэтаў, міфалагічных вобразаў. Істотна тое, што Адам Міцкевіч звяртаўся менавіта да беларускага фальклору. Паэт узяў беларускія легенды за сюжэтную аснову сваіх балад «Свіцязь», «Свіцязянка», «Рыбка», «Курганок Марылі», выкарыстаў сюжэт прымхі ў баладзе «Люблю я».

***Прымхі*** — ірацыянальныя кампаненты грамадскай і індывідуальнай свядомасці, якія датычаць незвычайнага, цудадзейнага і страшнага.



Правообладатель Национальный институт образования

Беларуская песенная паэтыка заўважаецца ў баладах «Дудар», «Курганок Марылі». Шырока выкарыстоўваў Адам Міцкевіч казачных персанажаў: прывідаў («Рамантычнасць», «Люблю я»), русалак («Свіцязянка», «Рыбка»), чараўніка-чарнакніжніка («Тукай», «Пані Твардоўская»), злую бабу («Лілеі», «Пані Твардоўская»).

Звяртаўся паэт і да беларускай дэманалогіі — народных уяўленняў пра дэманаў, нячысцікаў, духаў і людзей, якія валодаюць звышнатуральнымі здольнасцямі. У яго тэкстах можна знайсці вобразы чорта як прайдзісвета, немчыка («Пані Твардоўская»), пякельнай здані («Люблю я», «Лілеі»).




Тытульны ліст зборніка Адама Міцкевіча «Паэзія» (1822)

Сапраўднай скарбонкай беларускіх фальклорных вобразаў стала паэма «Дзяды», змест якой засноўваецца на беларускіх абрадах памінання продкаў. У паэме навідавоку вобраз рамантычнага героя Густава — індывідуаліста, бунтара, які выступае супраць несправядлівасці на зямлі і на небе.

Філаматы лічылі, што ў іх аўтарскіх творах павінен дакладна захоўвацца сюжэт народных легенд і паданняў, але Адам Міцкевіч быў перакананы, што аўтар мае права гэты сюжэт творча пераасэнсоўваць у адпаведнасці з мастацкай задумай.

Этапным творам 1820-х гадоў і гімнам цэламу пакаленню раўеснікаў Адама Міцкевіча стала «Ода да маладосці». У ёй аўтар супрацьпаставіў рацыяналізму асветнікаў запал і энтузіязм юнацтва. Матыў супрацьпастаўлення маладосці і сталасці выяўляецца і ў «Песні філарэтаў». Сапраўдным маніфестам рамантызму стала балада «Рамантычнасць», у якой Адам Міцкевіч прапаноўваў спасцігаць «жывую праўду прыроды», дзеля чаго неабходна «мець сэрца і глядзець у сэрца» — кахаць і верыць.

Яшчэ адзін рамантычны герой паўстаў у паэме Адама Міцкевіча «Конрад Валенрод», надрукаванай у 1828 годзе. Фабула звязана з гістарычнымі падзеямі канца XIV стагоддзя: працягвалася вайна Вялікага Княства Літоўскага і Тэўтонскага ордэна, у адным з набегаў крыжакі ўзялі ў палон Альфа, сына літоўскага князя. З часам Альф



Правообладатель Национальный институт образования



*У. Маяраноўскі.* Конрад Валенрод (1844)

прыняў імя Конрад, стаў магістрам ордэна, адпомсціў «ненавісным крыжакам» і разбурыў ордэн знутры. Конрад — «і ліс, і леў», і здраднік, і змагар. У вайне за Айчыну, як пераканаы Адам Міцкевіч, усе сродкі добрыя. Намерам Конрада-Альфа спрыяе язычніцкі жрэц Гальбан. Магістр ордэна жывіцца таксама і каханнем да дачкі Кейстута Альдоны, прамовы якой («Песня Віліі», «Песня з вежы») — самыя яркія старонкі паэмы.

Для рамантызму характэрна засяроджанасць аўтара на фальклоры і міфалогіі, імкненне адлюстраваць рэчаіснасць праз створаны фантастычны свет казак і легенд. Рамантызм праяўляўся ў творчасці Уладзіслава Сыракомлі, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, з'яўляўся своеасаблівай візітоўкай Яна Баршчэўскага. У зборніку апавяданняў «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» Ян Баршчэўскі, абапіраючыся на архаічную беларускую культуру, пры дапамозе алегорый і метафар расказваў пра нацыянальнае і палітычнае жыццё свайго краю, падказваў спосабы адрознення дабра ад зла. Пісьменнік не проста збіраў фальклор, але і ствараў яго, прыдумваў міфы, якія ўважлівы чытач мусіў расшыфроўваць.



1. Чаму мастакі слова ў канцы XVIII стагоддзя расчараваліся ў магчымасцях чалавечага розуму?
2. Назавіце гістарычныя падзеі на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, якія паспрыялі ўзнікненню рамантызму.
3. Як паўплываў на развіццё рамантызму сентыменталізм?
4. Чаму Адама Міцкевіча лічаць пачынальнікам рамантызму ў Беларусі?
5. Які беларускі абрад даў назву вядомай паэме Адама Міцкевіча? Што вам вядома пра гэты абрад?



6. Знайдзіце ў раздзеле імёны пісьменнікаў, якія сустрэліся вам упершыню. Падбярыце цікавыя факты з іх біяграфіі або творчасці, карыстаючыся інтэрнэт-рэсурсамі. Растлумачце, якія крыніцы літаратуразнаўчай інфармацыі вы лічыце надзейнымі і чаму.
7. Уважліва разледзьце карціну Уладзіслава Маяраноўскага і знайдзіце на ёй дэталі, якія падкрэсліваюць рамантычны змест паэмы Адама Міцкевіча «Конрад Валенрод».



Правообладатель Национальный институт образования

# Ян Чачот

(1796—1847)

**1.** Што вы ведаеце пра магнацкія роды Радзівілаў і Тызенгаўзаў? **2.** Якімі мовамі карысталіся на тэрыторыі Беларусі ў першай палове XIX стагоддзя?



Калі Адам Міцкевіч пачаў пісаць вершы, яго рэдактарам і своеасаблівым літаратурным агентам быў Ян Чачот. «Адам, польскай мовы ты зусім не ведаеш, — казаў яму сябар. — Таму не крыўдуй, буду выпраўляць усе твае памылкі!»



Ян Чачот нарадзіўся 7 ліпеня[1] 1796 года ў вёсцы Малюшычы цяперашняга Карэліцкага раёна. Бацькі яго паходзілі са збяднелай, але старадаўняй шляхты.

Маленства будучага паэта праходзіла паблізу Баранавіч, у маёнтку Рэпіхава, што належаў графу Тызенгаўзу. Ян бавіў час з сялянскімі дзецьмі. Зрэшты, нічым ад іх не адрозніваўся, таму беларускую культуру і мову ўспрымаў як родную.

У 1809 годзе бацькі аддалі яго ў навагрудскую школу, дзе ў якасці настаўнікаў служылі манахі дамініканскага ордэна. Там Ян пасябраваў з Адамам Міцкевічам, і гэта сяброўства абодва пранеслі праз усё жыццё. Навучанне было класічным: мовы, матэматыка, гісторыя, літаратура, права. Адам і Ян мелі здольнасці да вучобы, і іх імёны заўсёды былі сярод выдатнікаў.

Самай улюбёнай іх справай было наведванне беларускіх свят. У літаральным сэнсе яны не абміналі ніводных Каляд, любілі Купалле і адзначалі Дзяды. Беларуская культура стала светапоглядным падмуркам для творчасці абодвух паэтаў, яна доўгія гады натхняла іх на служэнне навуцы і літаратуры.

Далей было навучанне ў Віленскім універсітэце. Ян Чачот паступіў туды ў 1816 годзе на аддзяленне маральных і палітычных навук. Напэўна, ён зрабіў бы выдатную кар'еру навукоўца, калі б не складаны фінансавы стан бацькоў.

[1] Тут і далей даты нараджэння ўказаны па новым стылі.



Правообладатель Национальный институт образования

! Ян Чачот быў закаханы ў дачку рэктара Віленскага ўніверсітэта Зосю Малеўскую, але гэта было неўзаемнае каханне. І паколькі ён больш нікога не пакахаў і ніколі не ажаніўся, то яна адзіная стала прататыпам для вобраза недасяжнай каханай, што часта сустракаўся ў яго творчасці.

Ян вымушаны быў пакінуць вучобу і пачаць самастойна зарабляць на жыццё. Ён уладкаваўся ў канцылярыю, якая займалася ўпарадкаваннем архіва князёў Радзівілаў. Праца была складаная, але цікавая. Паэт трымаў у руках і чытаў дакументы, кнігі, якім было па трыста і болей гадоў, гісторыя краіны была ў яго на далоні.

У 1818 годзе Ян Чачот уступіў у таварыства філаматаў. Яго ўлюбёная тэма — Статут Вялікага Княства Літоўскага, які ён цудоўна ведаў. Праз два гады Ян Чачот узначаліў літаратурны аддзел таварыства філарэтаў. Ён быў прызнаны адным з найлепшых паэтаў краю, а яго вершы, пакладзеныя на музыку, сучаснікі спявалі падчас свят.

Трэба адзначыць, што Ян Чачот быў знаёмы з усімі тагачаснымі літаратарамі, якія гуртаваліся вакол Віленскага ўніверсітэта. Але найбольш блізкія адносіны ў яго па-ранейшаму былі з Адамам Міцкевічам. Сяброўства ў таварыстве філаматаў было надзвычайнай каштоўнасцю і адной з важных тэм для абмеркавання. У літаратуры таго часу быў нават модны сюжэт пра любоўны трохвугольнік, у якім сяброўства аказвалася даражэйшым за каханне.

! **З успамінаў.** «З дзяцінства Чачот быў паэтам, як і Адам (Міцкевіч. — *Аўт.*), і хоць яны былі нібы звязаныя адной душой, значна адрозніваліся знешнасцю, характарам, як гэта кажуць, тэмпераментам. Адам заўсёды вызначаўся кемлівасцю і незразумелым дарам прыцягнення да сябе не толькі равеснікаў... Чачот адзіны, можа, каму дазволена было бурчаць на Адама, дакараць яго і рабіць яму заўвагі. Нават у знешнасці яго заўважаўся дзіўна лагодны, рахманы характар. Нізкі, круглатвары, як паблажлівы да ўсіх, так патрабавальны да сябе і Адама, ён быў сапраўдным увасабленнем чуласці і любові да бліжняга» *(Ігнат Дамейка)*.

Але лёс склаўся так, што шляхі сяброў разышліся. У 1823 годзе Яна Чачота арыштавалі па справе філаматаў і разам з паплечнікамі выслалі ў Арэнбург. У 1826—1830 гадах ён жыў пад паліцэйскім наглядам ва Уфе. Седзячы ў «бернардынскіх мурах» вязніцы, ён разам з іншым сваім сябрам Тамашом Занам узяў усю віну на сябе.



Правообладатель Национальный институт образования

Гэтым ён выратаваў і Міцкевіча, і многіх іншых удзельнікаў таварыства, якія атрымалі меншае пакаранне (пад суд пайшло 108 чалавек, зняволена — 85). Далей яго чакалі турма, катарга, выгнанне. Ян Чачот мужна і самаахвярна пераадолеў усе выпрабаванні і нейкім цудам вярнуўся на Радзіму, працаваў у Лепелі канцылярыстам у інжынерным упраўленні Бярэзінскага канала. Тут ён стаў збіраць беларускі фальклор. З 1837 года ў Вільні асобнымі выпускамі выйшла шэсць фальклорных зборнікаў Яна Чачота пад агульнай назвай «Сялянскія песні з-над Нёмана і Дзвіны».




Шлюз Бярэзінскага канала ў Лепелі. Фотаздымак XIX стагоддзя

У зборніках аўтар — збіральнік твораў вуснай народнай творчасці — адзначыў дасканаласць народнай паэзіі, прааналізаваў граматычныя асаблівасці беларускай мовы і даказаў спецыфічнасць яе сістэмы, каб потым Яўхім Карскі напісаў, што «ўся сукупнасць характэрных для яе рыс не паўтараецца ні ў адной са славянскіх моў». Чачот апублікаваў не толькі польскія і ўкраінскія, але і беларускія валачобныя, юр’еўскія, вясновыя, купальскія, калядныя, жніўныя, дажынкавыя, вясельныя, хрэсьбінныя, пазаабрадавыя, дзіцячыя песні. Праца Яна Чачота не страціла каштоўнасці для навукі і зараз.

Падарванае здароўе не дазволіла паэту развіць паэтычны талент. Нейкі час ён працаваў у Шчорсаўскай бібліятэцы, адной з найбольш багатых у Беларусі. У 1847 годзе творца паехаў на лячэнне ў Друскенікі (цяпер Друскенінкай, Літва), але там яго здароўе пагоршылася — і Ян Чачот памёр. Апошні спачын пісьменнік знайшоў на могілках вёскі Ротніца (Літва). Ян Чачот — знакавая асоба для гісторыі трох народаў — Беларусі, Польшчы і Літвы.




Вокладка зборніка Яна Чачота «Сялянскія песні...» (1837)



Правообладатель Национальный институт образования

**Уклад у развіццё літаратуры**

1. У пачатку XIX стагоддзя тэксты на жывой беларускай гаворцы былі ананімныя. Ян Чачот — адзін з першых аўтараў беларускамоўных тэкстаў, каго мы ведаем па імені[1].

2. Ян Чачот сваімі творамі («Калдычэўскі шчупак», «Падземны звон на горцы ў Пазяневічах») прадвызначыў з'яўленне жанру гутаркі (гавэнды), які стаў вельмі папулярным у літаратуры XIX стагоддзя.

3. Ян Чачот можа лічыцца адным з першых тэарэтыкаў беларускай лінгвістыкі (прадмовы да «Сялянскіх песень...», 1846). На падставе сваіх назіранняў за з'явамі беларускай мовы ён даў тэарэтычныя парады наступным пакаленням паэтаў наконт сілаба-танічнай сістэмы вершаскладання[2], якая сапраўды аказалася найбольш прыдатнай для паэзіі.

4. Ян Чачот сабраў, апрацаваў і выдаў шэсць зборнікаў пад агульнай назвай «Сялянскія песні...». Сваю місію ён бачыў у тым, каб абудзіць у адукаванай публікі цікавасць да духоўнага жыцця сялян, сцвердзіць эстэтычную каштоўнасць народнай песні і культуры.

1. Прасачыце па карце Расійскай імперыі жыццёвы шлях Яна Чачота.
2. Якім чынам Ян Чачот паўплываў на Адама Міцкевіча?
3. У чым заслуга паэта перад беларускай літаратурай?
4. Разгледзьце на фотаздымку канструкцыю шлюза Бярэзінскага канала. Знайдзіце звесткі пра тое, якія справаводчыя навыкі дазволілі Яну Чачоту працаваць канцылярыстам, разумець складаную дакументацыю і дзе ён іх набыў.

## Паэтычная творчасць Яна Чачота

Кожны радок верша Яна Чачота **«Покуль сонца ўзыдзе...»** прасякнуты болем за беларускі народ, які мусіў цярпець жорсткі прыгон. Лірычны герой верша звяртаецца да ўяўнага пана з просьбай: «Пан, ты наш пане! // Будзь жа нам ласкавы, // Не дай аканома, // Што адсцёбаць жвавы». Бадай што за кожным словам гэтага верша

---

[1] Самым першым з такіх аўтараў быў, верагодна, Ян Баршчэўскі. Даследчык Рамуальд Падбярэскі адзначаў, што пісьменнік у маладыя гады пісаў па-беларуску (напрыклад, верш «Рабункі мужыкоў», 1812).

[2] Сам Чачот у беларускамоўных творах мала карыстаўся сілаба-тонікай, бо на яго ўплывалі фальклорныя тэксты.



Правообладатель Национальный институт образования

стаяць факты сацыяльнай няроўнасці, ганебнага, рабскага становішча сялян. Праўда, побач з гэтым відавочным сацыяльным злом у вершы даволі моцна гучыць і матыў веры ў добрага пана, які мусіць прыцягнуць да адказнасці злога падпанка або аканома-ліхадзея. Ян Чачот нават папярэджваў пана:

Хто мужыкоў глуміць,
Надвае варожыць:
Грош пану ў кішэню,
А два сабе ўложыць.

Ян Чачот, нягледзячы на ўсведамленне сацыяльнага зла, усё ж верыў у тое, што паны добрыя, аканомы, наадварот, дрэнныя. Гэта вера ў тое, што арыстакратыя не можа катаваць уласны народ, нарадзілася менавіта ў эпоху Асветніцтва, прыхільнікам якога большую частку жыцця і быў паэт.

> ! Ян Чачот стала ўжываў беларускую мову ў побыце, а таксама ў навуцы і літаратурнай дзейнасці. І гэта было ўнікальным, бо беларуская мова лічылася «мужыцкай», а паўсюль панавалі польская і руская.

Верш **«Да мілых мужычкоў»** хаця і мае востры сацыяльны характар, пачынаецца ўсё ж з красамоўнага і надзвычай характэрнага для Чачота выказвання: «Ды і я ж між вамі ўзрос // Пры бацьку і маці». Паэт у чарговы раз прызнаў роднаснасць з беларускімі сялянамі, нацыянальную ідэнтычнасць, што дало яму права наракаць на заганныя паводзіны, заклікаць сялян да цвярозага жыцця: «Доля, шчасце зачне жыць, // Дзе цвяроза хата». Гутарка тут пра п'янства, якое стала не самым лепшым адказам на сацыяльны і нацыянальны ўціск. Ян Чачот разумеў прычыны гэтай бяды, аднак не апраўдваў тых, хто пакінуў памяць і сумленне ў карчме.

Як вядома, у XIX стагоддзе наша краіна ўвайшла без уласнай дзяржаўнасці. Шляхта і магнаты па гістарычных прычынах былі апалячаныя. Стаўленне да беларускіх сялян («хлопаў») было не самае добрае. Ян Чачот у такой сітуацыі казаў ад імя «мужыкоў» («Покуль сонца ўзыдзе…»), пра іх праблемы («Да мілых мужычкоў»), на іх мове («На прыезд Адама Міцкевіча»).

Верш **«На прыезд Адама Міцкевіча»** мае цікавую гісторыю. Ён быў напісаны адразу пасля атрымання Янам Чачотам ліста ад сябра. Адам Міцкевіч пісаў: «…твае песні, я бачу ў іх агромністы і хуткі



Правообладатель Национальный институт образования

прагрэс з часу твайго ўступлення на пісьменніцкую дарогу. Лёгкасць, ды прытым агонь... пераўзышлі нават тыя надзеі, якія я ўскладаў на цябе».

Апроч шчырай павагі і сяброўскай прыязнасці Яна Чачота да Міцкевіча, у вершы надзвычай моцна «заўважаецца паэтыка беларускіх народных песень, даволі скупых на вобразна-выяўленчыя сродкі, але змястоўных сваёй адметнай дакладнасцю і насычаных памяншальна-ласкальнымі словамі» *(Уладзімір Мархель)*:

Адчыняйце ж варотца!
Да ўжо ж на двары Адам.
Да прымайце ж малотца,
Да кажы ж, ці здароў сам?..

**Літаратурныя сувязі.** Менавіта Ян Чачот зацікавіў Адама Міцкевіча беларускім фальклорам і міфалогіяй, прыхінуў аднаго з геніяў еўрапейскага рамантызму да айчыннай гісторыі і культуры. Адам Міцкевіч, без перабольшання, абавязаны Чачоту сваёй фантастычнай папулярнасцю.

1. Якія грамадскія заганы крытыкаваў Ян Чачот у сваёй творчасці?
2. Намалюйце словамі карціну «Беларусы і Беларусь у вершах Яна Чачота».
3. Прааналізуйце адзін з беларускамоўных вершаў паэта паводле алгарытму аналізу паэтычнага твора, прапанаванага на старонках 133—134.
4. Якія асаблівасці беларускай мовы XIX стагоддзя ў параўнанні з сучаснымі нормамі вы заўважылі ў вершах Яна Чачота?
5. Як ставіліся да сяброўства і кахання Адам Міцкевіч і Ян Чачот? Абгрунтуйце адказ.

## *Тэорыя літаратуры*

### Рамантызм як літаратурны напрамак

Вырашальнай перадумовай развіцця рамантызму сталі падзеі Французскай рэвалюцыі. З’яўленне рамантызму звязана з антыасветніцкім рухам, прычыны якога ляжаць у расчараванні ў сацыяльным, прамысловым, палітычным і навуковым прагрэсе.

Мысліцелі эпохі Асветніцтва ўяўлялі новае грамадства як самае «натуральнае» і «разумнае». Лепшыя розумы Еўропы абгрунтоўвалі і прадказвалі з’яўленне грамадства будучыні, але рэчаіснасць аказалася



Правообладатель Национальный институт образования

непадуладнай «розуму», будучыня — непрадказальнай, ірацыянальнай, а дзяржава стала пагражаць прыродзе чалавека і яго свабодзе.

***Рамантызм*** (ад фр. *romantisme* — ‘рамантызм’) — мастацкі напрамак, які сфарміраваўся на мяжы XVIII—XIX стагоддзяў у краінах Заходняй Еўропы. Цэнтр мастацкай сістэмы рамантызму — асоба, галоўны канфлікт — паміж асобай і грамадствам.

Асноўнай ідэяй рамантызму было прызнанне каштоўнасці духоўна-творчага жыцця кожнага чалавека і яго права на незалежнасць і свабоду. Вельмі часта ў творах эпохі рамантызму дзейнічалі героі, якія валодалі моцным, бунтарскім норавам, сюжэты былі напружаныя і дынамічныя. Адным з сусветна вядомых рамантыкаў-пачынальнікаў лічыцца англічанін Джордж Байран.

***Рамантычны герой*** — вядучы мастацкі вобраз літаратуры рамантызму; выключная асоба ў выключных абставінах, герой, якога не разумее грамадства і які супрацьстаіць недасканаламу свету, пераўтвараючы рэчаіснасць паводле сваіх ідэалаў.

Уздым пачуццяў, выкліканы звышасабовым ідэалам, барацьбой героя з неспрыяльнымі абставінамі і складаным светам, спарадзіў **рамантычны пафас**.

У літаратуры Беларусі XIX стагоддзя рамантызм праявіўся ў творчасці Адама Міцкевіча, Яна Баршчэўскага, Уладзіслава Сыракомлі, якія папярэднічалі прыходу Янкі Купалы — аднаго з самых вялікіх рамантыкаў і неарамантыкаў славянскага свету. Аказаў уплыў рамантызм і на беларускае мастацтва — творы Валенція Ваньковіча, Вікенція Дмахоўскага, некаторыя працы Яна Дамеля, Артура Бартэльса і многіх іншых мастакоў XIX стагоддзя.

У музычным мастацтве рамантыкам лічаць кампазітара Станіслава Манюшку, які звяртаўся ў творчасці да тэкстаў Яна Чачота, Уладзіміра Сыракомлі, Яна Карловіча — знаўцаў і папулярызатараў беларускага фальклору. Кампазітара прываблівалі песенная аснова іх вершаў, народнасць і лаканічная прастата тэкстаў.

1. Складзіце кластар па тэме «Рамантызм у беларускім мастацтве слова канца XVIII — першай паловы XIX стагоддзя».



Правообладатель Национальный институт образования

2. Дайце ўласнае азначэнне паняццю «рамантычны герой», абагульніўшы матэрыял раздзелаў «Тэорыя літаратуры. Літаратурныя напрамкі» і «Тэорыя літаратуры. Рамантызм як літаратурны напрамак».
3. Стварыце свайго рамантычнага героя, апішыце яго знешнасць, характар, узрост, дайце яму імя. Падумайце, персанажам якога твора (ужо напісанага або не) ён мог бы стаць. Якія ў гэтага твора могуць быць сюжэт, назва?

# *Францішак Багушэвіч*

(1840—1900)

1. У якім беларускамоўным драматычным творы XIX стагоддзя гумарыстычна адлюстравана жыццё дробнай беларускай шляхты? Якім паказана гэта жыццё? 2. Францішак Багушэвіч заклікаў: «...не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі». Патлумачце сэнс гэтай цытаты. Ці страціла яна актуальнасць у XXI стагоддзі?

Падчас паўстання 1863—1864 гадоў былы настаўнік Доцішскай школы Францішак Багушэвіч ваяваў у атрадзе Людвіка Нарбута. У сутычцы з рускай арміяй ён быў паранены. Ад смерці пісьменніка выратавалі сяляне. Праз колькі гадоў юрыст Багушэвіч стане «сялянскім адвакатам» і будзе бясплатна абараняць правы простых людзей у судзе.



Францішак Багушэвіч нарадзіўся 21 сакавіка 1840 года ў фальварку Свіраны каля Вільні. Сям'я паходзіла са старадаўняй збяднелай шляхты.

Бацька паэта Казімір Багушэвіч мусіў даказваць сваё шляхецтва ў геральдычнай камісіі расійскага Сената. Неўзабаве пасля нараджэння Францішка Багушэвічы пераехалі ў спадчынны маёнтак Кушляны, што ў Ашмянскім павеце. Там прайшло дзяцінства хлопчыка. Пачатковую адукацыю ён атрымаў, хутчэй за ўсё, дома, а працягнуў вучобу ў Віленскай гімназіі. У навучальнай установе Багу-



Правообладатель Национальный институт образования

шэвіч надзвычай зацікавіўся гісторыяй і нават прыняў удзел у збіранні экспанатаў для Віленскага музея старажытнасцей.

Ёсць вялікая верагоднасць таго, што ў Вільні Францішак пазнаёміўся з вядомым польска-беларускім паэтам Уладзіславам Сыракомлем. Ва ўсякім разе Францішак быў запрошаны на адкрыццё музея, дзе прысутнічала ледзь не ўся інтэлектуальная эліта: Адам Кіркор, Яўстах Тышкевіч, Вінцэсь Каратынскі, Ігнат Ходзька. Словам, паэт трапіў у кола патрыятычна настроеных, надзвычай адукаваных і прагрэсіўных людзей, якія, безумоўна, паўплывалі на яго сталенне. Атмасфера ў гэтым асяроддзі нагадвала тую, што некалі была сярод філаматаў і філарэтаў, і зусім невыпадкова, што менавіта філаматы (Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Тамаш Зан) сталі для Багушэвіча своеасаблівым маральным і жыццёвым арыенцірам.

У 1861 годзе Францішак Багушэвіч завяршыў навучанне ў гімназіі. Яго прозвішча згадвалася ў ліку лепшых выпускнікоў. Наперадзе — бліскучыя перспектывы. Паэт паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта, аднак вучыцца там яму не давялося. Пачаліся студэнцкія хваляванні супраць новых правілаў, якія абмяжоўвалі правы студэнтаў. У лістападзе Францішак Багушэвіч прасіў рэктара аб звальненні «з прычыны цяжкай хваробы». Тым часам студэнцкі пратэст стаў такім сур’ёзным, што хутка прашэнне аб звальненні падаў сам рэктар, а напрыканцы снежня ўніверсітэт наогул быў часова закрыты ўладамі.

Таленавіты юнак вярнуўся на Радзіму, дзе вучыў беларускіх дзетак у прыватнай школе на Лідчыне. Беларусь (як і іншыя землі былой Рэчы Паспалітай) знаходзілася ў перадрэвалюцыйным стане, людзі марылі аб свабодзе. У 1863 годзе выбухнула паўстанне, і Францішак Багушэвіч прыняў у ім удзел. Змагаўся ў Аўгустоўскіх лясах, дзе быў паранены. Нейкім цудам яму ўдалося пазбегнуць трагічнага лёсу кіраўнікоў паўстання. Багушэвіч быў вымушаны скрывацца, з’ехаць з Беларусі на тэрыторыю Украіны, хоць у тагачасных умовах гэта было перамяшчэнне ў межах адной дзяржавы — Расійскай імперыі.

У 1865 годзе ён паступіў у Нежынскі юрыдычны ліцэй, навучанне ў якім завяршыў толькі ў 1868 годзе. Гэта быў надзвычай складаны перыяд жыцця паэта: яму даводзілася літаральна змагацца за жыццё, хапацца за любую магчымасць зарабіць на кавалак хлеба. Атрымаўшы атэстат, Багушэвіч спачатку пераехаў у Чарнігаў, потым — у Кралявецкі павет, потым зноў у Чарнігаў. Працаваў судовым следчым.



Правообладатель Национальный институт образования

У 1871 годзе яго перавялі ў Валагодскую губерню. Для такіх частых пераездаў, зразумела, была свая прычына — былы паўстанец скрываўся, не мог рабіць кар'еру, бо гэта прыцягнула б да яго залішнюю ўвагу. Толькі ў 1883 годзе, праз 20 гадоў пасля паўстання, пасля каранацыі Аляксандра III была аб'яўлена амністыя. Тады сотні «ўдзельнікаў польскага мяцяжу» пачалі вяртацца на Бацькаўшчыну. У 1884 годзе Францішак Багушэвіч прыехаў у Вільню, прывёз небагаты набытак, а таксама жонку Габрыэлю, якая нарадзіла яму дачку Канстанцыю і сына Тамаша.

На Радзіме Багушэвіч зарабляў на жыццё адвакацкай дзейнасцю, пры гэтым набыў рэпутацыю абаронцы мужыкоў. З бедных людзей Багушэвіч грошы не браў, чым ускладняў і без таго няпростае матэрыяльнае становішча ўласнай сям'і.




Тытульны ліст зборніка Мацея Бурачка «Дудка беларуская» (1914)

Першыя вядомыя паэтычныя спробы Францішка Багушэвіча датуюцца 1880 годам, хаця не выключана і тое, што да мастацкага слова паэт звяртаўся значна раней, яшчэ падчас свайго навучання ў Нежынскім ліцэі.

Першыя творы Францішка Багушэвіча польскамоўныя, але пісьменніца Эліза Ажэшка пераканала сябра, што вершы па-беларуску ў яго атрымліваюцца лепш.

У 1891 годзе ў Кракаве першы зборнік паэта «Дудка беларуская» выйшаў неверагодным па тым часе тыражом у 3000 экземпляраў і актывізаваў кнігавыданне: пасля яго пачалі штогод выходзіць кнігі па-беларуску, аўтарскія або перакладныя. Беларуская мова ў ім перадавалася не кірылічным, а лацінскім шрыфтам — беларускай лацінкай. Зборнік складаўся з 16 вершаў і паэмы «Кепска будзе!». Самыя вядомыя публіцыстычныя вершы гэтай кнігі — «Мая дудка», «Бог не роўна дзеле», «Праўда».

> **!** У 1907 годзе, праз сем гадоў пасля смерці Францішка Багушэвіча, кніга «Дудка беларуская» была перавыдадзена суполкай «Загляне сонца і ў наша аконца» ў дарагім (50 капеек) і танным (25 капеек) афармленні. Потым кніга вытрымала яшчэ пяць перавыданняў і была адной з самых шматтыражных на мяжы стагоддзяў.



Правообладатель Национальный институт образования

Францішак Багушэвіч узяў сабе псеўданім — Мацей Бурачок. Такое імя спатрэбілася, каб чытач хутчэй даверыўся аўтару, які нібыта быў такім самым селянінам, а не збяднелым шляхціцам татарскага паходжання, кім па крыві насамрэч быў Францішак Багушэвіч.

**Навукоўцы гавораць.** Паводле Ігара Запрудскага, псеўданімы Мацей і Сымон былі абраныя Францішкам Багушэвічам невыпадкова: Мацей выступае як «той, хто гаворыць», а Сымон (у перакладзе са старажытнаяўрэйскай мовы) — як «той, хто чуе». Так, у другім зборніку «Смык беларускі» паэт зрабіў адсылку да першай кнігі: быццам бы Сымон Рэўка з-пад Барысава, прачытаўшы «Дудку беларускую» Мацея Бурачка, пачуў беларускае слова і таксама стаў пісаць.

Другі прыжыццёвы зборнік «Смык беларускі» Францішак Багушэвіч выдаў, хутчэй за ўсё, у Познані ў 1894 годзе. Як і першая кніга, ён быў надрукаваны лацінкай, хоць пазней перавыдаваўся і кірыліцай. Падобна да таго, што, ужываючы некалькі псеўданімаў, Францішак Багушэвіч імітаваў наяўнасць актыўнага літаратурнага жыцця, прысутнасць на беларускім паэтычным Парнасе адразу некалькіх аўтараў. «Смык ёсць, а хтосьці скрыпку, можа, даробе, а там была “Дудка” — вот і мы зробім музыку». Гэта спатрэбілася, каб давесці чытачу, што беларусы нарэшце абудзіліся, што ўсё часцей з іх шэрагаў выходзяць паэты, а значыць, ёсць надзея на нацыянальнае і сацыяльнае адраджэнне.



Тытульны ліст зборніка Францішка Багушэвіча «Смык беларускі» (1920)

Змест зборніка «Смык беларускі» вельмі блізкі паводле сацыяльнай скіраванасці і вобразнага напаўнення да кнігі «Дудка беларуская». У яго ўвайшлі творы розных жанраў: вершы, песні, калыханка, балада, байка.

У 1896 годзе Францішак Багушэвіч нечакана атрымаў спадчыну і адбудаваў сядзібу ў Кушлянах. Паэт падаў у адстаўку і вырашыў прысвяціць астатак жыцця творчасці. У красавіку 1900 года пад страхой бацькоўскага дома Францішак Багушэвіч памёр, аднак пакінуў пра сябе самую светлую памяць, застаўся ў гісторыі Беларусі як адзін з пачынальнікаў новай нацыянальнай літаратуры.



Правообладатель Национальный институт образования

**Уклад у развіццё літаратуры**

1. Францішак Багушэвіч даў беларускай літаратуры ўзор аўтарскай сялянскай паэзіі. Нават псеўданімы падбіраў адпаведныя: Мацей Бурачок, Сымон Рэўка з-пад Барысава. Да яго беларускамоўныя творы былі альбо ананімныя, альбо напісаныя шляхціцамі пра мужыкоў. Шляхціц жа Багушэвіч для актывізацыі літаратурнага працэсу пісаў ад імя селяніна.

2. Багушэвіч быў аўтарам першай цалкам беларускамоўнай кнігі паэзіі, стварыў першыя беларускія апавяданні «Тралялёначка», «Дзядзіна», «Палясоўшчык». З 1891 года, калі была выдадзена яго першая кніга, пачалі штогод выходзіць кнігі па-беларуску, аўтарскія альбо перакладныя.

3. Паэт сваёй творчасцю ініцыяваў узнікненне крытычнага рэалізму ў беларускай літаратуры.

4. У прадмове да «Дудкі беларускай» Багушэвіч падняў статус беларускай мовы ад гаворкі да еўрапейскай мовы, абапіраючыся на звесткі па дэмаграфіі, гісторыі і геаграфіі Беларусі, якія таксама сталі адкрыццём для яго чытачоў.

5. Францішак Багушэвіч вызначыў развіццё беларускай літаратуры на некалькі дзесяцігоддзяў наперад: надзвычайная папулярнасць яго вершаў пра сялян і сялянскае жыццё паказала паэтам наступных пакаленняў запатрабаванасць і важнасць гэтай тэмы.

1. Чаму, на вашу думку, Францішак Багушэвіч пачаў пісаць на беларускай мове?
2. З якой мэтай паэт выкарыстоўваў розныя псеўданімы?
3. У чым заключаецца ўклад пісьменніка ў гісторыю беларускай літаратуры?

## Паэма «Кепска будзе!»

Адным з найбольш яркіх, самабытных твораў Францішка Багушэвіча з'яўляецца паэма **«Кепска будзе!»**. У цэнтры ўвагі паэтадэмакрата — лёс беларускага хлопца, у якім, без перабольшання, увасоблены лёс беларускага народа. З самага маленства герою паэмы спадарожнічаюць гора і няўдачы. Нарадзіўся ён у сакавіку, калі ў сялянскай хаце не было чаго есці, а ўжо каб справіць хрэсьбіны, пра тое не даводзілася нават марыць. Замест таго каб везці немаўля ў касцёл, спрытная кума хрысціць яго вадою з Бярэзіны і сама выдумляе імя — Аліндарка.



Правообладатель Национальный институт образования

— Вот і хрэст увесь тут, — кажа, —
І ксёндз хрысце гэтаксама,
Толькі яшчэ чымсь памажа,
А хлопцу ўсё роўна — яма!

Не быў шчаслівым і далейшы лёс Аліндаркі — спачатку памірае маці, потым гіне бацька. Хлопец застаецца сіратой, жыве нейкі час у цёткі, пакуль не трапляе да добрага чалавека — айчыма, які прымае небараку як роднага сына. Жыццё беларускіх сялян паказвалася Францішкам Багушэвічам надзвычай рэалістычна. Паэт не хаваў сацыяльнай няроўнасці, бездапаможнасці мужыка перад чыноўніцтвам. Беларус нібыта нараджаўся пад злой зоркай, усё жыццё імкнуўся пазбавіцца ад галечы, але вынікам гэтых намаганняў нязменна станавіліся крыж і магіла. Праўда, свет сялянства не аднастайны. Былі сярод вяскоўцаў і п'яніцы, і прайдзісветы, але былі і сумленныя людзі. Гэта яшчэ раз сведчыць, што паэт імкнуўся крытычна глядзець на суайчыннікаў, не прыхарошваў, не ідэалізаваў беларускія рэаліі.

У літаратуры Беларусі пазнейшага перыяду (Янка Купала, Якуб Колас, Максім Гарэцкі і інш.), у дарэвалюцыйных творах 1910-х гадоў, звычайна прысутнічаў востры сацыяльны канфлікт паміж панам і мужыком. Пры гэтым пан разглядаўся як асноўная крыніца зла. У мастацкім свеце паэмы «Кепска будзе!» такога звыклага для нас супрацьстаяння няма. Вобраз злога пана замяняе чыноўнік. Францішак Багушэвіч паказвае чыноўніка як бяздушны інструмент беспрычыннага гвалту царскага самаўладдства. Матыў неабароненасці чалавека перад сістэмай паўстае надзвычай яскрава ў сцэне, дзе Аліндарка спрабаваў заступіцца за сябе і айчыма перад асэсарам.

Дваццацігадовы Аліндарка — сумленны, працавіты, старанны, свабодалюбівы юнак. Ён трапіў у турму. Тое, як успрымае Аліндарка астрог і яго насельнікаў, вельмі падобна да адпаведных момантаў з часткі III паэмы Адама Міцкевіча «Дзяды»: спрытныя, падобныя да чарцей, юрысты, людзі-здані, якія вартуюць «злачынцаў», і людзі-здані, якія знаходзяцца пад вартай. Турма для Аліндаркі — гэта своеасаблівы чысцец (згадаем верш паэта «Быў у чысцы!»), адкуль яго мусіць вызваліць айчым. У фінале герой атрымлівае надзею на шчаслівую будучыню, калі даведваецца сваё сапраўднае імя. На думку даследчыкаў літаратуры, лёс Аліндаркі сімвалізуе лёс Беларусі. Францішак Багушэвіч спадзяваўся, што родная старонка набудзе лепшую долю.


Правообладатель Национальный институт образования

Вобразу айчыма трэба надаць асаблівую ўвагу. Ён, звычайны селянін, у паэме з'яўляецца носьбітам якасцей праведніка, бо здолеў захаваць веру ў справядлівасць, у тое, што «праўда выйдзе, як з магілы!». Намаганнямі айчыма галоўны герой вяртаецца на Радзіму. Здаецца, зло пераможана, праўда ўзяла верх. Аднак вяртанне ў родную вёску не азначала для Аліндаркі сацыяльнага і нацыянальнага разнявалення. Вяртанне — толькі невялікі адпачынак перад новымі выпрабаваннямі. І разам з тым змест паэмы не пакідае ўражання бесперспектыўнасці, беспрасветнасці. Аліндарка і айчым у паэме Багушэвіча — «людзі Божыя», што значыць, маюць трывалую веру ў дабро. Менавіта вера дапамагае ім захоўваць чалавечнасць у сапраўды нечалавечых умовах.

**Літаратурныя сувязі.** Кнігі Францішка Багушэвіча «Дудка беларуская» і «Смык беларускі» ідэйна паўплывалі на «Прамову» (1893) Каруся Каганца[1] і кампазіцыйна — на кнігі «Скрыпка беларуская» (1906) Цёткі, «Жалейка» (1908) Янкі Купалы, «Песні-жальбы» (1910) Якуба Коласа, «Чыжык беларускі» (1912) Гальяша Леўчыка.

1. Вызначце ідэю паэмы Францішка Багушэвіча «Кепска будзе!». Як яна звязана з загалоўкам?
2. Якія элементы сюжэта ёсць у паэме? Коратка перакажыце сюжэт у стылі сучаснага рэпартажу з месца падзей.
3. Дайце характарыстыку мастацкага вобраза — персанажа Аліндаркі паводле прыкладнага плана разгорнутага адказу.
4. Якія нацыянальныя і агульначалавечыя каштоўнасці ўвасоблены ў вобразе айчыма? Якую ролю ён адыграў у лёсе Аліндаркі?
5. Назавіце сродкі мастацкай выразнасці, выкарыстаныя Францішкам Багушэвічам у паэме «Кепска будзе!». Як паэма звязана з фальклорам? Прывядзіце прыклады з тэксту.
6. Існуе думка, што ў паэме «Кепска будзе!» Францішак Багушэвіч паказаў жыццястойкасць беларускага народа. Паразважайце ў мікрагрупах, ці можна пагадзіцца з такім меркаваннем.
7. Уявіце, што паэму «Кепска будзе!» апублікуюць на інтэрнэт-партале для вучняў. Падбярыце да твора адпаведны візуальны, тэкставы і аўдыяматэрыял. Растлумачце, як вы ажыццяўлялі выбар.

Апавяданне «Траляля-начка»

Янка Лучына

[1] Карусь Каганец (Казімір Кастравіцкі) быў стрыечным дзядзькам французскага пісьменніка, паэта і крытыка Гіёма Апалінэра (Вільгельма Альберта Уладзіміра Аляксандра Апалінары Вонж-Кастравіцкага).



Правообладатель Национальный институт образования

## Рэалізм як літаратурны напрамак

***Рэалізм*** (ад лац. *reālis* — ‘сапраўдны’) — літаратурны метад і напрамак, які з’явіўся пасля рамантызму і заключаўся ў праўдзівым адлюстраванні рэчаіснасці; у адрозненне ад рамантызму, скіраванага на выключнае, у рэалізме важна тыповае.

Пачынаючы з 1830-х гадоў развіваўся ў Францыі, пазней — і ў іншых краінах Заходняй Еўропы, Расійскай імперыі. У адрозненне ад рамантызму рэалізм акцэнтуе ўвагу на праблеме ўзаемадзеяння чалавека і навакolля, засяроджваецца на тым, як сацыяльна-гістарычныя абставіны ўплываюць на фарміраванне духоўнага свету (характару) асобы. Замест інтуітыўна-пачуццёвага метаду пазнання свету на першае месца ў літаратуры выходзіць аналітычны пачатак, а тыпізацыя рэчаіснасці сцвярджаецца як універсальны спосаб мастацкага абагульнення.

Адным са знакамітых сусветных рэалістаў-пачынальнікаў лічыцца француз Анарэ дэ Бальзак. У літаратуры Беларусі XIX стагоддзя рэалізм выявіўся перш за ўсё ў ананімных вершаваных гутарках «Вось які цяпер люд стаў», «Гутарка Данілы са Сцяпанам» і інш.

Надзвычай моцна рэалістычны погляд на жыццё адлюстраваны ў публіцыстыцы перыяду паўстання 1863—1864 гадоў. У тэкстах газеты «Мужыцкая праўда» праўдзіва паказана сітуацыя сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, пад якім знаходзіліся беларусы. У цэнтры ўвагі былі такія надзённыя праблемы, як рэкрутчва, палітыка русіфікацыі, адсутнасць беларускай асветы.

Рэалістычна адлюстраваў жыццё беларусаў і аўтар польскамоўнай паэмы «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся» Янка Лучына (Іван Неслухоўскі, 1851—1897). Герой паэмы — стары ляснік Грышка, носьбіт традыцыйных каштоўнасцей беларускага сялянства. Ён працавіты, настойлівы, памяркоўны і сумленны, з яго вобразам Лучына звязваў вобраз Радзімы. Сацыяльная прыгнечанасць селяніна выказвалася праз вострае перажыванне за родную старану. Паэт адкрываў чытачу беларускі народ не ў ідэалістычным святле, што было характэрна для паэтаў перыяду рамантызму, а ў святле праўды, не забываючыся на ўсе жыццёвыя супярэчнасці і канфлікты.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Чым рэалізм як мастацкі напрамак адрозніваецца ад рамантызму?
2. Як рэалізм праявіўся ў паэзіі XIX стагоддзя?
3. Якія праявы рэалізму вы можаце назваць у паэме Францішка Багушэвіча «Кепска будзе!»?

## Пытанні і заданні для паўтарэння і падагульнення

1. У якіх сацыяльна-палітычных і эканамічных умовах развівалася беларуская культура ў XIX стагоддзі?
2. Раскажыце пра ўплыў рамантызму на беларускую літаратуру XIX стагоддзя.
3. Якія парадыйна-сатырычныя творы з'явіліся два стагоддзі таму назад? Чым яны адметныя?
4. Дзякуючы якім дасягненням філаматы і філарэты ўвайшлі ў гісторыю Беларусі?
5. Хто з дзеячаў XIX стагоддзя атрымліваў вышэйшую адукацыю на фізіка-матэматычным факультэце? Ці меў гэты факт уплыў на іх далейшы лёс?
6. Назавіце беларускія ананімныя творы XIX стагоддзя. На якія змены ў грамадскай свядомасці ўказвае іх існаванне?
7. Ян Чачот збіраў і апрацоўваў фальклорныя матэрыялы. Паспрабуйце гэтаксама літаратурна апрацаваць легенду або паданне пра вашу малую радзіму.
8. Як распаўсюджванне перыядычных выданняў у другой палове XIX стагоддзя адбілася на развіцці беларускай літаратуры?
9. Дакажыце, што паэма «Кепска будзе!» з'яўляецца прыкладам рэалізму ў літаратуры.
10. Чаму Аліндарку нельга назваць рамантычным героем?
11. Складзіце хранограф самых яркіх, на вашу думку, падзей у беларускай літаратуры XIX стагоддзя.

| Якая падзея адбылася? | Калі? | Чаму? | Альтэрнатыўная версія гісторыі літаратуры |
|---|---|---|---|
| | | | |

12. Карыстаючыся схемай, падрыхтуйце разгорнутае паведамленне пра асаблівасці новай беларускай літаратуры.
13. Разгледзьце стужку часу (XI—XIX стагоддзі) на форзацы. Якімі персаналіямі вы яе дапоўнілі б? Чаму?

Тарас Шаўчэнка



Правообладатель Национальный институт образования



# Шляхі развіцця беларускай літаратуры першай паловы XX стагоддзя

## БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

**1.** Узгадайце найбольш значныя гістарычныя падзеі пачатку XX стагоддзя ў Беларусі і свеце. **2.** Якія беларускія пісьменнікі працавалі ў гэты час? Якія іх творы вы чыталі?

Беларуская літаратура пачатку XX стагоддзя развівалася на фоне рэвалюцыйных падзей 1905—1907 і 1917 гадоў, Першай сусветнай (1914—1918) і польска-савецкай (1919—1921) войнаў, якія непасрэдна закранулі беларускія землі. У гэты час адбывалася фарміраванне класічных асноў беларускай літаратуры XX—XXI стагоддзяў. Творчы шлях пачыналі прызнаныя майстры слова — Максім Багдановіч, Алесь Гарун, Максім Гарэцкі, Якуб Колас, Янка Купала, Вацлаў Ластоўскі, Цётка, Ядвігін Ш. і інш.

Аўтары, з аднаго боку, адчувалі непарыўную сувязь з беларускімі творцамі XIX стагоддзя. У прадмове да свайго зборніка «Скрыпка беларуская» Цётка (пад псеўданімам Гаўрыла з Полацка) пісала: «Прачытаўшы тую “Дудку”, я сказаў: “Дзякуй табе, Мацей Бурачок! Чэсць і слава тваему слову! А ты, “Дудка”, грай і мне голас дай!”» З другога боку, на літаратараў уплывалі руская і польская літаратуры, а таксама ўвесь еўрапейскі літаратурны працэс. Услед за папярэднікамі пісьменнікі працягвалі традыцыі рэалізму і рамантызму, разам з тым звярталіся і да ідэй мадэрнізму.

Вялікае значэнне для беларускай літаратуры мела арганізацыя беларускамоўнага перыядычнага друку, у якім вылучалася газета «Наша ніва». Развівалася таксама выдавецкая дзейнасць (суполка «Загляне сонца і ў наша аконца» (Пецярбург), «Беларускае выдавецкае



Правообладатель Национальный институт образования

таварыства» (Вільня), выдавецтва Антона Грыневіча (Пецярбург), «Наша хата» (Вільня), «Мінчук» (Мінск) і інш.). З’явіліся і выданні, прызначаныя непасрэдна для дзяцей («Першае чытанне для дзетак беларусаў» Цёткі, «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Якуба Коласа і інш.).

**Значэнне перыядычных выданняў пачатку XX стагоддзя для развіцця літаратуры.** Першая легальная газета на беларускай мове **«Наша доля»** пачала выходзіць з верасня 1906 года ў Вільні. Прызначалася для сельскага і гарадскога люду. Мела рэвалюцыйна-дэмакратычны напрамак. Выпуск нумароў суправаджаўся судовымі канфліктамі і забаронамі. Усяго чытачам прадставілі 6 нумароў (усе — за 1906 год). У студзені 1907 года работа выдання была спынена.

**«Наша ніва»** выдавалася з лістапада 1906 года да жніўня 1915 года ў Вільні. Газета выконвала асветніцкія мэты, знаёміла з падзеямі тагачаснага жыцця і гісторыяй Беларусі, спрыяла нацыянальна-культурнаму адраджэнню, друкавала шматлікія творы беларускіх аўтараў. Перыядычнае выданне стала цэнтрам літаратурнага жыцця, згуртавала вакол сябе творчыя сілы, адкрыла шлях у літаратуру Янку Купалу, Якубу Коласу, Максіму Багдановічу, Максіму Гарэцкаму і інш. Літаратараў, якія супрацоўнічалі з газетай «Наша ніва», часта называюць нашаніўцамі, а адпаведны перыяд існавання літаратуры — нашаніўскім.

Таксама ў пачатку XX стагоддзя выходзілі часопісы «Саха», «Лучынка», альманах «Маладая Беларусь», газеты «Беларус», «Гоман» і інш.

**Паэзія.** У паэтычнай творчасці аўтары звычайна адштурхоўваліся ад набыткаў фальклору, абапіраліся на традыцыйныя прынцыпы і прыёмы вершаскладання. Паэты падымалі пытанні абуджэння нацыянальнай свядомасці, адраджэння культуры, цяжкай долі селяніна і інш. У творах нярэдка прасочвалася пэўная публіцыстычнасць, прысутнічалі заклікі да змагання за будучыню. У паэзіі ярка праявілі сябе Максім Багдановіч, Янка Купала, Якуб Колас, Канстанцыя Буйло, Цётка, Алесь Гарун і інш.

Асаблівае месца ў літаратурным працэсе пачатку XX стагоддзя займаюць творы Янкі Купалы і Якуба Коласа. У іх ёсць і гераічны аповед пра лёс беларусаў, і энцыклапедыя народнага жыцця, і пошук беларусамі страчанай Бацькаўшчыны, і трагічны разлад паміж народам і яго элітай, і асэнсаванне нацыянальнага мастацтва. За некалькі гадоў яны стварылі той народны эпас, які ў іншых народаў пісаўся стагоддзямі, і сталі класікамі беларускай літаратуры.



Правообладатель Национальный институт образования

Беларускія аўтары пачатку XX стагоддзя актыўна карысталіся псеўданімамі. У аднаго пісьменніка іх колькасць магла налічваць дзясяткі (напрыклад, у Якуба Коласа). Многія псеўданімы былі падкрэслена народнымі: Алаіза Пашкевіч — Цётка, Людвіка Сівіцкая — Зоська Верас. Жанчыны часам хаваліся пад мужчынскімі псеўданімамі: Канстанцыя Буйло — Эдвард Буйло (падпісвалася імем брата), Алаіза Пашкевіч — Мацей Крапіўка, Банадысь Асака, Гаўрыла з Полацка і інш.

**Проза.** Празаікі пачатку XX стагоддзя працавалі, як правіла, у малых жанрах. Сваімі тэкстамі творцы пашыралі палітру беларускага апавядання, казкі, навелы (Ядвігін Ш., Якуб Колас, Змітрок Бядуля, Цішка Гартны і інш.). Пісьменнікі сярод іншага ўздымалі праблемы нацыянальна-культурнага адраджэння, Першай сусветнай вайны, жыцця вёскі (Максім Гарэцкі, Вацлаў Ластоўскі і інш.).

Паступова пашырылася колькасць жанравых форм беларускага апавядання: з'явіліся сацыяльна-бытавыя, гумарыстычныя і псіхалагічныя навелы, навелы-прытчы, алегорыі, імпрэсіі, абразкі.

**Драматургія.** Адбывалася станаўленне беларускага прафесійнага тэатра, якое звычайна звязваецца з імёнамі Францішка Аляхновіча, Ігната Буйніцкага і Уладзіслава Галубка. У 1917 годзе арганізацыйна афармілася Першае беларускае таварыства драмы і камедыі. Драматургічныя творы пісалі Францішак Аляхновіч («На Антокалі»), Уладзіслаў Галубок («Пісаравы імяніны»), Максім Гарэцкі («Антон»), Карусь Каганец («Модны шляхцюк»), Янка Купала («Паўлінка», «Раскіданае гняздо») і інш.



Тэатральная трупа Ігната Буйніцкага пасля выступлення (1912)

**Крытыка.** Набірала сілу і літаратурная крытыка, чаму садзейнічала з'яўленне легальных перыядычных выданняў на беларускай мове. Публікаваліся рэцэнзіі, агляды, палемічныя артыкулы і інш. У крытыцы праявілі сябе Максім Багдановіч, Максім Гарэцкі, Антон Луцкевіч, Вацлаў Ластоўскі, Сяргей Палуян.

У гэты час даволі імкліва пачала ўзбагачацца скарбонка беларускамоўных тэкстаў. Пісьменнікі адлюстроўвалі ў сваёй творчасці



Правообладатель Национальный институт образования

нацыянальнае і агульначалавечае, гістарычнае і пазачасавае, звярталіся да розных жанраў і стыляў, увасаблялі вобразы і матывы роднай зямлі, шляху, адраджэння, самаахвярнасці і г. д.

1. Што паўплывала на развіццё беларускай літаратуры ў пачатку XX стагоддзя?
2. Якую ролю ў развіцці тагачаснай беларускай літаратуры адыграў перыядычны друк?
3. Хто са славутых беларускіх аўтараў пачаў творчы шлях у нашаніўскі перыяд?
4. Акрэсліце тэндэнцыі ў развіцці паэзіі, прозы і драматургіі пачатку XX стагоддзя.
5. Назавіце вядучыя тэмы ў паэзіі Якуба Коласа і Янкі Купалы пачатку XX стагоддзя. Якія з іх застаюцца актуальнымі ў наш час?
6. Чаму для беларускай прозы вывучанага перыяду характэрны ў асноўным малыя жанры? Як іх развіццё ўплывае на ўзнікненне буйных форм (аповесці, рамана)?
7. Чаму ў пачатку мінулага стагоддзя пісьменнікі часта карысталіся псеўданімамі?
8. Разгледзьце фотаздымак беларускай тэатральнай трупы, зроблены ў 1912 годзе. Карыстаючыся даведачнымі крыніцамі, устанавіце, ці можна назваць яго «Пасля выступлення Першага беларускага таварыства драмы і камедыі».
9. У пачатку XX стагоддзя беларуская літаратура развівалася паскорана, засвойваючы за лічаныя гады тое, на што ў іншых былі дзесяцігоддзі. Чаму, на вашу думку, наша літаратура развівалася паскорана ў параўнанні з іншымі? Якія падзеі запавольвалі яе станаўленне ў XIX стагоддзі?
10. Пазнаёмцеся са свежым нумарам сучаснага беларускага перыядычнага выдання, прысвечанага мастацкай літаратуры (ЛіМ, «Маладосць», «Полымя»). Зрабіце яго вусны агляд. Параўнайце тэматыку разгледжанага вамі нумара з тэматыкай газеты «Наша ніва» ў 1906—1915 гадах.
11. Абапіраючыся на набытыя веды, стварыце самастойны электронны макет першай паласы газеты, прысвечанай літаратуры пачатку XX стагоддзя. Прадумайце, якімі будуць назва і дэвіз выдання, хто стане яго мэтавай аўдыторыяй, якія знакавыя творы і крытычныя артыкулы варта размясціць, якія выявы лепш выкарыстаць. У асобную калонку прапануйце літаратурную творчасць сваіх аднакласнікаў.



Правообладатель Национальный институт образования

## Літаратурны працэс

***Літаратурны працэс*** — гістарычнае развіццё літаратуры, якое абумоўлена масавым узаемадзеяннем і ўзаемаўплывам асоб, твораў, крытыкі, грамадска-палітычных абставін, літаратурнага канона і эстэтычных ідэалаў часу.

У працэсе фарміравання і развіцця літаратуры вылучаюцца найбольш выдатныя пісьменнікі, а іх творы з цягам часу становяцца нацыянальнай класікай.

**Навукоўцы гавораць.** «Для літаратурнага працэсу важная ідэйна-мастацкая пераемнасць. Беларуская літаратура развіваецца перарывіста. У выніку моўныя, геаграфічныя, дзяржаўныя, палітычныя, канфесійныя перамены ўскладняюць пераемнасць — і гэта на некалькі дзесяцігоддзяў або нават назаўжды змяняе натуральны ход літаратурнага працэсу.

На беларускі літаратурны працэс паўплывалі, напрыклад, наступныя падзеі: высылка філаматаў за межы тэрыторыі Беларусі; рэакцыя пасля паўстання 1863—1864 гадоў; праслед рэвалюцыйна настроеных пісьменнікаў пачатку XX стагоддзя; гібель літаратараў падчас Першай сусветнай вайны; рэпрэсіі 1930-х гадоў; Другая сусветная вайна і г. д.» *(Аксана Бязлепкіна)*.

У пачатку XX стагоддзя ў беларускай літаратуры пісьменнікі працавалі найперш у рэчышчы рэалізму і мадэрнізму. Рэалізм, напрыклад, праявіўся ў творчасці Якуба Коласа і Максіма Гарэцкага. Пры гэтым на тагачасных творцаў працягваў аказваць уплыў і рамантызм, прыметы якога ў пачатку XX стагоддзя заўважаюцца, напрыклад, у Янкі Купалы і Максіма Багдановіча. Таксама навукоўцы аперыруюць паняццем «неарамантызм», якое можна разумець і як працяг рамантызму, і як напрамак мадэрнізму.

**Мадэрнізм** — агульная назва многіх літаратурных плыняў, якія вызначаліся засяроджанасцю на ўнутраным свеце чалавека, адасобленасцю ад сацыяльна-гістарычных пераўтварэнняў, элітарнасцю, незвычайнасцю мастацкай формы.

Найбольш актуальнымі для беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя былі такія яго напрамкі, як імпрэсіянізм, сімвалізм і неарамантызм (гл. табліцу «Літаратурны працэс»).



Правообладатель Национальный институт образования

*Імпрэсіянізм* — літаратурная плынь, у якой дамінуюць суб'ектыўныя ўражанні аўтара і якая вызначаецца фрагментарнасцю і расплывістасцю адлюстравання, увагай да дэталей, адценняў. Адным з заснавальнікаў з'яўляецца французскі паэт Поль Верлен.

*Сімвалізм* — літаратурная плынь, якая вызначаецца зваротам да філасофскіх таямніц, выкарыстаннем сімволікі, недасказанасці, намёкаў, загадкавых вобразаў. Сімвал — гэта знак, што злучае рэальны свет з ірэальным. Адзін з творцаў узорнага сімвалізму — Аляксандр Блок.

*Неарамантызм* — «новы рамантызм», эстэтычная плынь, што ўзнікла ў Еўропе на мяжы XIX і XX стагоддзяў, развівала эстэтыку рамантызму. У неарамантычных творах апяваліся амбівалентныя героі, якіх разрываюць гарачыя пачуцці; у творах не было адназначнай перамогі дабра над злом.

Паралельна развіваўся **авангардызм**. Пад гэтай назвай звычайна аб'ядноўваюць наватарскія стылі і плыні мяжы XIX—XX стагоддзяў, якія адмаўлялі традыцыйныя падыходы ў мастацтве. Авангардных плыняў у сусветнай культуры шмат, але для беларускай літаратуры актуальныя найперш экспрэсіянізм, імажынізм і футурызм.

*Экспрэсіянізм* — адна з плыняў авангардызму, якая вызначаецца трагічным светапоглядам, напружанасцю пачуццяў, шматзначнасцю матываў, сімвалаў і перавагай плана выражэння ўнутранага зместу над планам знешняга адлюстравання. Узнік як рэакцыя на імпрэсіянізм. Адзін са стваральнікаў экспрэсіянізму — аўстрыец Франц Кафка.

*Імажынізм* — паэтычная школа, для якой маляванне словам, чыстая вобразнасць значаць больш за тэматыку твораў, дзе аўтары пазбягаюць неабавязковых слоў, цэняць нечаканыя і запамінальныя слоўныя малюнкі. Яскравым імажыністам у сваёй ранняй творчасці быў рускі паэт Сяргей Ясенін.

*Футурызм* — мастацкі рух 1920-х гадоў, які сцвярджаў мастацтва будучыні праз адмаўленне традыцыйнай культуры. У творах апяваліся гарадская эстэтыка і індустрыялізацыя. Славуты футурыст — рускі паэт Уладзімір Маякоўскі.

1. Растлумачце, што такое літаратурны працэс. Якое значэнне для яго мае бесперапыннасць?
2. Якія літаратурныя напрамкі ўласцівы прозе і паэзіі пачатку XX стагоддзя?



Правообладатель Национальный институт образования

**3.** Разгледзьце табліцу «Літаратурны працэс». Знайдзіце ў мастацкіх прыкладах праяўленне асаблівасцей адпаведных напрамкаў (плыняў, школ і г. д.).

**4.** Адшукайце ў інтэрнэце карціны сімвалістаў і імпрэсіяністаў. Падбярыце словы, якімі вы маглі б іх апісаць, і складзіце адпаведны невялікі слоўнік эмоцый.

*Табліца*

**Літаратурны працэс**

| Паняцце | Аўтары | Прыклады |
|---|---|---|
| Сентымен-<br>талізм | Вінцэнт Дунін-<br>Марцінкевіч | Як сягоння, здаецца, бачу век праснёны,<br>Калі з мілым Каролем у гэты лес зялёны<br>Мы хадзілі спакойна пад апекай Бога.<br>Нашы сэрцы дзіцячы не зналі трывогаў.<br>*Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. «Ідылія»* |
| Рамантызм | Янка Купала<br><br>Цётка<br><br>Уладзімір<br>Жылка | Скурганіў бы душу чырванцом тваім я;<br>Гуслям, княжа, не пішуць законаў:<br>Небу справу здае сэрца, думка мая,<br>Сонцу, зорам, арлам толькі роўна.<br>Бачыш, княжа, загоны, лясы, сенажаць, —<br>Ім пакорны я толькі з гуслямі,<br>Сілен, княжа, караць, галаву сілен зняць, —<br>Не скуеш толькі дум ланцугамі.<br>*Янка Купала. «Курган»* |
| Рэалізм | Якуб Колас | І тут у першы раз Міхала<br>Вось гэта думка напаткала:<br>Купіць зямлю, прыдбаць свой кут,<br>Каб з панскіх выпутацца пут,<br>І там зажыць сабе нанова:<br>Свая зямля — вось што аснова!<br>*Якуб Колас. «Новая зямля»* |
| Імпрэсія-<br>нізм | Максім<br>Багдановіч<br><br>Змітрок<br>Бядуля<br><br>Ядвігін Ш. | Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог,<br>Улажылі спаць мяне вы на зямлі.<br>Не курыцца светлы пыл усцяж дарог,<br>Ў небе месяца праглянуў бледны рог,<br>Ў небе ціха зоркі расцвілі.<br>*Максім Багдановіч.*<br>*«Цёплы вечар, ціхі вецер...»* |



Правообладатель Национальный институт образования

| Паняцце | Аўтары | Прыклады |
| --- | --- | --- |
| Сімвалізм | Янка Купала<br><br>Максім Гарэцкі<br><br>Уладзімір Жылка | На крыжавых пуцінах з ёй сустрэўся —<br>Куды ісці, не ведала яна,<br>І я не ведаў — ў полі я ці ў лесе,<br>І мне ляжала сцежка не адна.<br>Як путнікі, заблуканыя ўночы,<br>Стаялі мы пад труднай ношкай дум;<br>Адно другому пазіралі ў вочы<br>І слухам клікалі найменшы шум.<br>*Янка Купала. «Яна і я»* |
| Неараман-тызм | Янка Купала<br><br>Вацлаў Ластоўскі | Так страшны той разбойнік згінуў,<br>Што ўмеў любіць і забіваць;<br>На грэх пусціўся праз дзяўчыну<br>І мусіў праз яе сканаць.<br>*Янка Купала. «Магіла льва»* |
| Экспрэсія-нізм | Максім Гарэцкі<br><br>Вацлаў Ластоўскі | Ніхто не ведаў, што гора ў мяне. Ніхто не ведаў, што цяжка мне. З кім мне было гора падзяліць? З кім мне было цяжкасць аблягчыць? Вакол людзі сцюдзёныя, чужыя... Што ім да мяне... Горка мне было, што песень хаўтурных не пачую, што гутарак спачувальных не будзе...<br>*Максім Гарэцкі. «Скарбы жыцця»* |
| Імажынізм | Язэп Пушча<br><br>Уладзімір Дубоўка | Пальцы жоўтых кляновых лістоў<br>мкнуцца восень схапіць за шыю.<br>Не парушаць яе хараство,<br>не парушаць лісты залатыя.<br>*Уладзімір Дубоўка. «Пальцы жоўтых кляновых лістоў»* |
| Футурызм | Паўлюк Шукайла<br><br>Уладзімір Дубоўка | Перагрупоўка настрояў,<br>стыляў:<br>самалёты...<br>лапці...<br>галіфэ...<br>Новае ўсё шырыцца няспынна,<br>ля касцёла ж —<br>фэст...<br>*Уладзімір Дубоўка. «Кругі»* |



Правообладатель Национальный институт образования

# Цётка

(1876—1916)

**1.** Успомніце, што такое публіцыстыка. **2.** З якім творам Цёткі вы пазнаёміліся ў папярэдніх класах? Пералічыце праблемы, паднятыя ў гэтым творы.

Цётка вучылася на Вышэйшых курсах Пятра Лесгафта — і стала добрай медсястрой і масажысткай. Масажам у ліку іншага яна зарабляла на заняткі па акцёрскім майстэрстве. Як актрыса Цётка нават выступала ў тэатры Ігната Буйніцкага.



Цётка (Алаіза Пашкевіч) нарадзілася 15 ліпеня 1876 года ў фальварку Пешчын (цяпер Шчучынскі раён) у шматдзетнай шляхецкай сям'і.

Пэўны час дзяўчынка выхоўвалася ў бабулі ў фальварку Тарэсін, жыла ў маёнтку Стары Двор. У дзяцінстве будучая пісьменніца пазнаёмілася з народнай творчасцю, навучылася чытаць і пісаць па-польску, займалася з хатнімі настаўнікамі, праяўляла цікавасць і здольнасці да навукі. У 1894 годзе Алаіза Пашкевіч паступіла адразу ў чацвёрты клас прыватнай жаночай гімназіі Веры Прозаравай у Вільні. У 1902 годзе Цётка атрымала пасведчанне на званне хатняй настаўніцы. Аднак вучобе ўжо тады перашкаджала хвароба — сухоты, якія нагадвалі пра сябе ўсё жыццё.

**З успамінаў.** «Алёйза Пашкевічанка, вучаніца тады ўжо 7 кляса, абамлела ў часе лекцыі, і школьная лекарка прызнала, што гэта ад недаядання яна гэтак аслабела. <…> Наогул гэты выпадак узварушыў не толькі нас, вучаніц, але і наша начальства. Наша Вера Міхайлаўна мела добрае сэрца і на радзе бацькоў парупілася, каб Алёйзе Пашкевічанцы прызналі стыпендыю, бо яна была вельмі старанная і добра вучылася (плата за навуку была вельмі высокая: 100 рублёў на год, якраз удвая, як у казённай гімназіі — 50 рублёў)» *(Юліяна Вітан-Дубейкаўская).*



Правообладатель Национальный институт образования

Вялікую ўвагу пісьменніца надавала самаўдасканаленню. Яна вучылася на Вышэйшых курсах П. Лесгафта ў Пецярбургу, якія не завяршыла. Наведвала заняткі ў Ягелонскім (Кракаў) і Львоўскім універсітэтах, збірала матэрыялы для даследавання беларускай батлейкі.



Вокладка часопіса «Лучынка» (1914)

Пісьменніца ўдзельнічала ў гуртку студэнтаў «Круг беларускай народнай прасветы» (Пецярбург), была сябрам партыі «Беларуская рэвалюцыйная грамада», прымала ўдзел у жаночым з'ездзе ў Маскве (1905) як дэлегат ад беларускіх жанчын. Алаіза Пашкевіч мела дачыненне да выдання газет «Наша доля» і «Наша ніва», фактычна была рэдактарам часопіса для моладзі «Лучынка».

Творчасць Цёткі прадстаўлена паэзіяй, прозай і публіцыстыкай. Асобныя вершы паэтэсы былі змешчаны ў нелегальных выданнях «Калядная пісанка на 1904 год» (1903) і «Вялікодная пісанка» (1904). У 1906 годзе ўбачылі свет паэтычныя зборнікі «Скрыпка беларуская» і «Хрэст на свабоду». Апошні яскрава адлюстроўвае тагачасныя рэвалюцыйныя настроі. Вершы «Мора», «Хрэст на свабоду», «Пад штандарам» і апавяданне «Прысяга над крывавымі разорамі» выдаваліся асобна — як праклamацыі[1].

! На словы верша Цёткі «Лета» са зборніка «Скрыпка беларуская» напісана вядомая лірычная песня «Кася» (кампазітар Ігар Лучанок).

Частку жыцця Цётка правяла ў эміграцкіх вандроўках, якія былі выкліканы яе грамадска-палітычнай дзейнасцю. Падарожжы натхнілі пісьменніцу на напісанне падарожных нататак «Успаміны з паездкі ў Фінляндыю», «З дарогі».

! **З успамінаў.** «Як усе натуры, каторыя працуюць парывамі — выбухова, Цётка пачынала пісаць многа, але даводзіла да канца толькі нязначную частку распачатых прац», — узгадваў арганізатар першых беларускіх газет, беларускі дзеяч Антон Луцкевіч.

---

[1] *Праклама́цыя* — агітацыйны лісток палітычнага зместу; пераважна так называюцца лістоўкі дарэвалюцыйнага часу.



Правообладатель Национальный институт образования

Апавяданні Цёткі даволі разнастайныя па настроі: ад апавядання-закліку «Прысяга над крывавымі разорамі» да поўных пранікнёнага лірызму і філасафічнасці твораў «Асеннія лісты», «Зялёнка», «Міхаська». Вобразы яе празаічных тэкстаў не толькі абагульненыя — рэвалюцыйна настроеная грамада, але і індывідуалізаваныя — двое старых, што ў задуменнасці сузіраюць наваколле і асэнсоўваюць хуткаплыннасць жыцця; маладая курсістка, якая жыве надзённымі справамі; хлопчык, які сэрцам адгукаецца на чужы боль, нават калі гэта боль падбітай птушкі.




Вокладка «Першага чытання...» Цёткі (1906)

У вядомых публіцыстычных выступленнях Цёткі — «Шануйце роднае слова!», «Да вясковай моладзі беларускай», «Як нам вучыцца» — уздымаюцца актуальныя для яе сучаснікаў пытанні.

Заўважнай з'явай стала выданне кнігі ў дзвюх частках «Першае чытанне для дзетак беларусаў», у якім Цётка змясціла невялікія тэксты для дзіцячага чытання на беларускай мове. Гэта былі аўтарскія вершы, апавяданні, прыпеўкі, загадкі, казкі, прыказкі.

У 1911 годзе Алаіза Пашкевіч выйшла замуж за інжынера, дзеяча літоўскага сацыял-дэмакратычнага руху Сцяпана (Сцяпонаса) Кайрыса. Пасля змены прозвішча яна змагла вярнуцца ў Беларусь.

У 1915 годзе Цётка працавала ў Беларускім таварыстве дапамогі пацярпелым ад вайны, займалася арганізацыяй беларускіх школ і настаўніцкіх курсаў у Вільні, дапамагала ствараць дзіцячыя прытулкі, даглядала хворых як сястра міласэрнасці.

! **З успамінаў.** «Аб Цётцы ў Вільні памяталі і часта гаварылі, яе імя стала яшчэ больш папулярным, яе гарачыя вершы пераходзілі з вуснаў у вусны. <...> Элаіза Ажэшка, даведаўшыся, што я звязана з беларускім рухам, вельмі цёпла гаварыла аб Цётцы і аб Янку Купале» *(Уладзіслава Луцэвіч. «Успаміны пра Цётку»)*.

У 1916 годзе Алаіза Пашкевіч прыехала на пахаванне бацькі і засталася на некаторы час ратаваць сваіх блізкіх і землякоў ад тыфу. Дапамагаючы іншым, пісьменніца сама заразілася гэтай хваробай і пайшла з жыцця ў Старым Двары, на радзіме.



Правообладатель Национальный институт образования

**Уклад у развіццё літаратуры**

1. Цётка — адна з самых вядомых беларускіх паэтак[1] мяжы XIX—XX стагоддзяў. Яна падтрымала сфармуляваную Францішкам Багушэвічам канцэпцыю нацыянальнага адраджэння (у Яна Чачота або Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча не было такіх актыўных паслядоўнікаў), пашырыла яго эстэтыку і разам з іншымі аўтарамі-сучаснікамі змагалася за беларускую дзяржаўную ідэю.

2. У беларускай літаратуры XX стагоддзя Цётка — адна з пачынальніц жанру дарожнага эсэ (падарожныя нататкі). Ва «Успамінах з паездкі ў Фінляндыю» пісьменніца ўзняла актуальную тэму — Беларусь у свеце і свет для Беларусі.

3. Цётка прынесла ў беларускую паэзію моцную стыхію лірызму, пачуццёвасці, якая абапіралася на вобразы і мастацкія прыёмы фальклору.

4. Героі і гераіні Цёткі траплялі ў сітуацыі на мяжы жыцця і смерці і ў такіх абставінах асэнсоўвалі сваё жыццё (апавяданне «Зялёнка»). Праз некалькі дзесяцігоддзяў творы такога тыпу будуць называць экзістэнцыяльнымі.

5. Цётка стварыла ўзоры сацыяльна-бытавога, алегарычнага, псіхалагічнага і сатырычнага апавяданняў, выкарыстоўвала пры гэтым прыёмы сінтэтычнага пісьма: рэальны сюжэт часта меў сімваліка-алегарычны план, містычныя перажыванні ўплята179 ў рэалістычныя падзеі.

6. Цётка была аўтарам першых беларускіх чытанак, закладвала асновы методыкі выкладання, падрыхтаваўшы «Першае чытанне для дзетак беларусаў». У 1906 годзе выйшаў «Беларускі лемантар, або Першая навука чытання», дзе Цётка, магчыма, была адным з аўтараў.

7. Цётка ўдзельнічала ў стварэнні непадцэнзурнага, а потым і легальнага беларускага перыядычнага друку.

1. Параўнайце звесткі пра Цётку з дакументальнага фільма «Алаіза Пашкевіч (Цётка): урокі жыцця першай беларускай настаўніцы» (2019, рэжысёр Алена Лявай, тэлеканал «Беларусь-3») і з іншых відэа, якія зможаце знайсці. Якую інфармацыю вы лічыце больш верагоднай, праверанай? Якой асобай вам уяўляецца дзяячка беларускага адраджэння?
2. У чым заключаецца ўклад Цёткі ў гісторыю беларускай літаратуры?
3. Разгледзьце вокладку «Першага чытання для дзетак беларусаў». Якую інфармацыю можна з яе атрымаць?

---

[1] Імёны жанчын-пісьменніц паступова вяртаюцца ў літаратуру. У XIX стагоддзі пісалі Марыя Косіч (1850—1911) і Зоф'я Манькоўская (1847—1911), знойдзены рукапіс таямнічай Адэлі з Устроні.



Правообладатель Национальный институт образования

## Патрыятычная лірыка Цёткі

У вершах паэткі прасочваюцца рысы вуснай народнай творчасці (танічнае вершаскладанне, фальклорныя вобразы і эпітэты, параўнанні, звароткі), звязаныя з песеннай традыцыяй, у творах прысутнічаюць рамантычна-сімвалічныя вобразы, засяроджваецца ўвага на мастацкіх дэталях. Паэтычны стыль Цёткі вылучаецца адмысловай («няроўнай») рытмікай і інтанацыйнай выразнасцю (прынцып інтанацыйнага падкрэслівання), выкарыстаннем гукапісу і тропаў, адметным паэтычным сінтаксісам.

> ***Танічнае вершаскладанне*** — сістэма вершаскладання, у аснове якой — аднолькавая колькасць моцных, або апорных, націскаў у вершаваных радках. Колькасць жа ненаціскных складоў паміж націскнымі можа быць рознай.

> ***Мастацкая дэталь*** — выяўленчая і выразная падрабязнасць, рыса або элемент прадмета, партрэта, інтэр'ера, пейзажу і іншага літаратурнага твора, якая нясе значную ідэйна-эмацыянальную і сэнсавую нагрузку.

Сінтаксіс паэтычнага твора больш складаны за сінтаксіс празаічнага тэксту. Да паэтычнага сінтаксісу найперш адносяцца рытарычныя фігуры, розныя віды і формы стылістычных (або сінтаксічных) фігур: у вершаваных творах сустракаюцца градацыя, недаказ, паралелізм, разнастайныя паўторы (анафара, эпіфара, шматпрыназоўнікавасць, шматзлучнікавасць) і інш.

**Вершы «Мора», «Вера беларуса», «Мае думкі».** У вершы **«Мора»** (1905), які мае падзагаловак «Рэвалюцыя народная», паэтка стварыла алегарычны малюнак рэвалюцыйнай барацьбы. Вобраз бурнага мора ўвасабляе стыхію народнага бунту, гневу і рашучасці:

Мора вуглем цяпер стала,
Мора з дна цяпер гарыць,
Мора скалы пазрывала,
Мора хоча горы змыць.

Вобразы неба і нябеснага трона сімвалізуюць месцазнаходжанне абагоўленага цара. Пры гэтым у вершы не закладзены антырэлігійныя ідэі. Бой паміж «морам» і «небам» апісваецца паэтэсай як смяротны, але неабходны, жаданы, чым сцвярджаецца адпаведная эстэтыка гераічнага і ўзвышанага ў змаганні.

У вершы Цёткі «Мора» можна адзначыць дынамізм, эмацыянальнасць, узнёсласць, якія дасягаюцца праз паўторы, схільнасць да



Правообладатель Национальный институт образования

гіпербалізацыі, наяўнасць адпаведных вобразаў і метафар, выкарыстанне гукапісу.

У вершы **«Вера беларуса»** (1905) створаны вобраз народа-змагара. У творы сцвярджалася думка, што беларусы «людзьмі стануць»:

Веру, братцы: людзьмі станем,
Хутка скончым мы свой сон…

Цётка ўскладала пэўныя надзеі на рэвалюцыю, чакала, што ў XX стагоддзі абуджаныя грамадзяне напішуць новы, справядлівы закон. Паэтка падрэслівала волю, загартаванасць, непераможную сілу народа. У тым ліку праз паўтор займенніка «мы» Цётка акцэнтавала ўвагу на еднасці, аб'яднанасці розных людзей адной мэтай:

Бачу, братцы, мы не з карт,
Мы не з гіпсу, мы — з камення,
Мы — з жалеза, мы — са сталі…

Верш, у якім удала выкарыстана градацыя, узмоцненая паўторамі, завяршаецца заклікам:

Цяпер, братцы, мы з граніту,
Душа наша з дынаміту,
Рука цвёрда, грудзь акута,
Пара, братцы, парваць пута!

Верш «Вера беларуса» ўспрымаецца адначасова і як разважанне аўтара, і як палымяны заклік да дзеяння, да станоўчых пераўтварэнняў.

У вершы **«Мае думкі»** (1905—1906) праз зварот да зразумелых чытачу вобразаў (напрыклад, зерне, рэчка) Цётка выказвала сваю любоў да Радзімы, выяўляла імкненне служыць людзям:

Хацела б быць зярном пшаніцы,
Упасць на ніўкі вёскі,
Зазалаціцца, без мятліцы
Даць хлеб смачнейшы трошкі.

Самаадданае жаданне быць карыснай свайму народу, Радзіме гучыць і ў наступных радках:

Думаць усюды аб народзе,
Родны край усюды сніць…



Правообладатель Национальный институт образования

Аднак словы персаніфікаванага ветру, якімі заканчваецца твор, гучаць з некаторым песімізмам, што ўказвае на пэўныя сумненні лірычнай гераіні і яе адпаведны душэўны стан.

> ***Персаніфікацыя (увасабленне)*** — разнавіднасць метафары, якая заключаецца ў наданні чалавечых уласцівасцей рэчам, прадметам і з'явам прыроды.

Такім чынам, у разгледжаных вершах Цёткі выказваецца занепакоенасць лёсам Бацькаўшчыны і выяўляецца адметны паэтычны стыль.

> ! **Літаратурныя сувязі.** Грамадскую дзейнасць Цёткі і яе мужа згадаў Максім Гарэцкі ў рамане «Віленскія камунары». У паэзіі Цёткі і Якуба Коласа маюць падабенства лірычныя героі: іх мары вызначаюцца канкрэтнасцю, рэалістычнасцю.

1. Якія тэмы і праблемы ўздымаюцца ў вершах «Мае думкі», «Вера беларуса», «Мора»? Дакажыце, што на гэтыя вершы Цёткі паўплывала фальклорная традыцыя.
2. Знайдзіце ў вершы «Вера беларуса» гіпербалы, якія паказваюць народную сілу. Для чаго аўтар выкарыстала іх у творы-закліку? Які тэмп верша ў фрагменце з гіпербаламі — хуткі, энергічны або ўрачысты, запаволены? Якія знакі прыпынку ўказваюць на тэмп?
3. Параўнайце эмоцыі, якія перадаюцца ў першай («Хацела б быць…») і другой («Альбо ветрам абярнуся…») частках верша «Мае думкі». Прасачыце, якімі часцінамі мовы пераважна выражаецца настрой твора. Як ён змяняецца ад пачатку да фіналу верша?
4. Прааналізуйце верш Цёткі «Мора» паводле алгарытму аналізу паэтычнага твора, прапанаванага на старонках 133—134. Звярніце ўвагу на выкарыстанне ў гэтым вершы сінтаксічных сродкаў выразнасці.
5. Зборнік Цёткі «Скрыпка беларуская» быў падпісаны псеўданімам Гаўрыла з Полацка. Як гэты псеўданім указвае на сувязь творчасці пісьменніцы са спадчынай Францыска Скарыны, Сімяона Полацкага, Францішка Багушэвіча? Паразважайце, чаму Алаіза Пашкевіч узяла такое літаратурнае імя.
6. Пазнаёмцеся з песнямі на словы Цёткі. Уявіце, што вы — прадзюсар, якому прапанавалі падрыхтаваць музычную кампазіцыю для сучаснай моладзі, створаную на вершы пісьменніцы. Які тэкст і па якіх крытэрыях вы выбераце? Якім чынам вы будзеце дзейнічаць: возьмеце гатовы трэк, прапануеце кавер або створыце новую песню? Як будзеце папулярызаваць кампазіцыю?

Апавяданне «Асеннія лісты»



Правообладатель Национальный институт образования

# Ядвігін Ш.

(1869—1922)

? **1.** Узгадайце, што такое алегорыя. **2.** Якія прыклады алегарычных твораў вы можаце назваць?

У 1877—1878 гадах Ядвігін Ш. вучыўся ў прыватнай школе, арганізаванай у доме Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча яго дачкой Каміляй. А калі ўжо быў даволі вядомы, даваў карыстацца сваёй бібліятэкай Янку Купалу, заахвочваў маладога аўтара да творчасці.



Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі) нарадзіўся 4 студзеня 1869 года ў маёнтку Добасна (цяпер Кіраўскі раён Магілёўскай вобласці).

Неўзабаве сям'я будучага літаратара пераехала на Міншчыну. Антон Лявіцкі скончыў Мінскую гімназію і недавучыўся на медыцынскім факультэце Маскоўскага ўніверсітэта, бо за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях быў зняволены, трапіў у Бутырскую турму, дзе пераклаў з рускай мовы апавяданне Усевалада Гаршына «Сігнал».

Пасля вызвалення Ядвігін Ш. здаў экзамен на аптэкарскага практыканта і прайшоў стажыроўку ў маскоўскай аптэцы. Быў памочнікам правізара ў мястэчку Радашковічы, што недалёка ад Карпілаўкі — фальварка Лявіцкіх, а таксама займаўся камерцыйнай справай. Планаваў паставіць п'есу «Злодзей», а на збор ад спектакля — адкрыць бальніцу, але пастаноўка не была дазволена.

! **Літаратурныя сувязі.** З чацвярых дзяцей Ядвігіна Ш. (тры хлопчыкі і адна дзяўчынка) менавіта дачка Ванда стала яго аднадумцам. З 13 гадоў яна друкавалася ў газеце «Наша ніва». Ванда перапісвалася з Максімам Гарэцкім і іншымі тагачаснымі літаратарамі. Замуж яна выйшла за палітычнага дзеяча і публіцыста Язэпа Лёсіка, роднага дзядзьку Якуба Коласа. А Янка Купала, для якога Ядвігін Ш. быў першым чытачом п'есы «Паўлінка», стаў хросным бацькам яго ўнучак — Люцыі і Алесі. Так Ядвігін Ш. парадніўся са славутымі беларускімі песнярамі.



Правообладатель Национальный институт образования

Ядвігін Ш. вёў актыўнае грамадскае і літаратурнае жыццё, карыстаўся павагай сярод літаратараў. Пісьменнік працаваў сакратаром, загадчыкам літаратурнага аддзела «Нашай нівы», тэхнічным рэдактарам — у часопісах «Саха» і «Лучынка». Пастаноўку п'есы «Злодзей» (1892) Ядвігіна Ш. забаранілі, а яе рукапіс згубіўся. Першае апавяданне празаіка на беларускай мове «Суд» было надрукавана ў газеце «Наша доля» ў 1906 годзе. Пісьменнік — аўтар паэмы (вершаванага апавядання) «Дзед Завала», зборнікаў апавяданняў «Бярозка» (1912) і «Васількі» (1914), артыкулаў, баек, незавершаных «Успамінаў» (1921) і інш.

**Навукоўцы гавораць.** Дачка Антона Лявіцкага Ванда распавядала, што ў маладосці пісьменнік закахаўся ў Ядвігу Шабуневіч з Радашковічаў. Нягледзячы на расстанне, былая каханая назаўсёды засталася ў сэрцы аўтара, а яе імя і прозвішча далі жыццё псеўданіму — Ядвігін Ш.

Перагружанасць работай, складаныя матэрыяльныя і жыллёвыя ўмовы сталі прычынай цяжкай хваробы пісьменніка (сухоты). У 1922 годзе Ядвігін Ш. памёр удалечыні ад сям'і, якая засталася за мяжой (ва Усходняй Беларусі), у Вільні, дзе і быў пахаваны на могілках Росы.

### Уклад у развіццё літаратуры

1. Ядвігін Ш. з'яўляецца аўтарам першага беларускамоўнага рамана ў нашай літаратуры (праўда, раман «Золата» няскончаны).
2. У творчасці Ядвігіна Ш. (апавяданнях-імпрэсіях) яскрава выявіліся рысы імпрэсіянізму: у апавяданнях выпадковае і прыватнае дамінуюць над галоўным і агульным. У творах адлюстроўвалася не гісторыя, а імгненне, таму тэксты набывалі сэнсавую шматмернасць і трымаліся на недагаворанасці і намёках.
3. Пісьменнік узбагаціў скарбонку малых жанраў беларускай прозы (празаічныя байкі, алегарычныя, рэалістычныя, псіхалагічныя апавяданні, навелы).
4. Творчасць празаіка (разам з творчасцю Янкі Купалы, Якуба Коласа і інш.) адыграла значную ролю ў станаўленні беларускай літаратурнай мовы.

1. Напішыце невялікае паведамленне «Цікавыя звесткі пра Ядвігіна Ш.», афарміце цытаты. Зрабіце спіс крыніц, якімі вы карысталіся, узяўшы за ўзор спіс выкарыстаных крыніц у канцы вучэбнага дапаможніка.
2. Вызначце, якія біяграфічныя факты маглі паўплываць на творчасць пісьменніка.



Правообладатель Национальный институт образования

## Апавяданне «Дуб-дзядуля»

Гаворачы пра адметнасць творчай манеры і стылю Ядвігіна Ш., неабходна адзначыць, што гэты аўтар валодаў талентам навеліста. Пісьменнік абапіраўся на фальклорныя і народна-бытавыя сюжэты, імкнуўся да псіхалагічнага аналізу ў паказе герояў, прыводзіў філасофскія абагульненні, выкарыстоўваў алегорыі і сімвалы, ужываў няўласна-простую мову, быў схільны да лірызму, сатыры і гумару, звяртаў увагу на вострыя сацыяльныя праблемы.

У філасофскіх апавяданнях Ядвігіна Ш. алегорыя выступала ў якасці пэўнага літаратурнага прыёму, які даваў магчымасць паразважаць над унутранай сутнасцю чалавека, жыцця... Хутчэй за ўсё, у гэтым выявіла сябе абвостранае бачанне ўсяго чалавечага шляху ў яго адзінстве, у непарыўнай сувязі ўсіх часоў... Вынайдзеная мастацкая форма алегорыі, іншасказання з'ўлялася адным са шляхоў у агульным рэчышчы літаратуры, якая ставіла перад сабой задачу... адкрыць селяніну вочы на складаны навакольны свет, каб ён ведаў праўду часу *(Паводле Віктара Каваленкі. «Міфапаэтычныя матывы ў беларускай літаратуры»)*.

Ядвігін Ш. напісаў апавяданне «Дуб-дзядуля» ў 1909 годзе. У гэтым алегарычным творы пісьменнік выявіў сябе майстрам лірычнай прозы, злучыў фальклорныя і ўласныя аўтарскія прыёмы.

Маналог Дуба-дзядулі, пошукі вады, падзеі да і пасля сну героя-апавядальніка маюць глыбокі філасофскі сэнс, пададзены чытачу ў іншасказальнай форме. Праблема сэнсу і каштоўнасці чалавечага існавання — цэнтральная ў апавяданні. У алегарычна-сімвалічным ключы Ядвігін Ш. асвятляе цяжкае жыццё свайго сучасніка, найперш селяніна, спрабуе знайсці шляхі паляпшэння сітуацыі, гаворыць пра лёс усяго беларускага народа, падкрэслівае вялікае значэнне культуры і традыцый для будучыні. Пісьменнік сцвярджае веру ў новае, абапіраецца на нацыянальныя і агульначалавечыя каштоўнасці.



Ядвігін Ш. звяртаецца да прыёму персаніфікацыі. Чалавечымі рысамі надзелены Дуб-дзядуля — характэрны для фальклору вобраз, які традыцыйна ўвасабляе мудрасць, моц, дабрыню, жыццёвую сілу, трываласць, даўгавечнасць, стойкасць. У старажытнасці існавала павер'е, што ў гэтым дрэве знаходзяцца душы памерлых продкаў.



Правообладатель Национальный институт образования

Дуб-дзядуля эмацыянальна расказвае пра сваё жыццё апавядальніку ў яго сне-сімвале: «Ляцелі годы, як вашы ляцяць дні, — змяняліся вякі, як вашы годы, — а я стаяў і рос, рос і стаяў — крапчэў... Зрываліся не раз буры, — як пад тапаром, шмат нашых клалася, але тыя, што асталіся, — яшчэ вышэй падымаліся. <...> Так вякі ішлі, аж мінула ўсё, — аж прыйшло і на тое, што з тутэйшых даўнейшых астаўся, як відзіш, адзін я». Сярод іншага дадзеная цытата — прыклад імкнення да паказу псіхалагічнага стану персанажаў. Дуб-дзядуля просіць героя-апавядальніка паліць вадой свае «бедныя карэньчыкі». Аднак замест жывой вады, вобраз якой узнікае ў творы, узрушаны герой сутыкаецца з азёрамі поту, слёз і крыві, а таксама персаніфікаванымі вобразамі Працы, Бяды і Цярпення.

Твор мае выразную сувязь з такім жанрам, як прытча, што дазваляе гаварыць аб прытчавай аснове апавядання. Маналог Дуба, напрыклад, можа быць растлумачаны як павучальны. Дуб-дзядуля, прадстаўнік тутэйшых, трымаўся традыцый роднага краю, супрацьстаяў нягодам, калі яго суседзі і сваякі загінулі. Дуб, які застаўся адзін, імкнуўся пакінуць пасля сябе новае пакаленне, што працягне справу продкаў і захавае бясцэнную спадчыну — Бацькаўшчыну. Дзеля гэтага і неабходна апантана шукаць «жывую ваду» — сродак, які дапаможа ў гэтай справе.

> ***Прытча*** (прыпавесць) — невялікі алегарычны аповед павучальнага характару, які, у адрозненне ад байкі, не мае традыцыйных умоўных персанажаў.

Фінал твора сімвалічны. Пакуль апавядальнік спаў і ў сне шукаў такую патрэбную ваду, прайшла бура і паваліла Дуба-дзядулю. Але праз некалькі гадоў з-пад яго «вылезлі» тры дубочкі. У гэтым бачацца спадзяванні аўтара на будучыню, вера ў перамогу новага над старым, дабра над злом, указанне на бясконцасць і цыклічнасць жыцця, у якім усё мае свой час, месца і сэнс.

1. Назавіце характэрныя рысы творчасці Ядвігіна Ш. Адказ праілюструйце прыкладамі з прачытанага твора.
2. Пералічыце вобразы-сімвалы, ужытыя ў апавяданні Ядвігіна Ш. «Дуб-дзядуля».
3. Патлумачце алегарычны сэнс твора. Перакажыце яго ад 3-й асобы, напрыклад, ад імя поля.
4. Ці актуальнае, на вашу думку, апавяданне «Дуб-дзядуля» сёння? Абгрунтуйце адказ.



Правообладатель Национальный институт образования

5. Уявіце, што вы мастак у выдавецтве. Вам неабходна падрыхтаваць вокладку для кнігі Ядвігіна Ш. «Дуб-дзядуля». Зрабіце эскіз або апішыце словамі ідэю вокладкі, якая адлюстроўвала б ключавы эпізод твора.
6. Параўнайце апавяданне «Дуб-дзядуля» Ядвігіна Ш. з апавяданнем Якуба Коласа «Крыніца», якое вывучалася ў V класе. Знайдзіце агульныя і адрозныя рысы.
7. Беларускі даследчык Аляксей Рагуля піша: «У апавяданні “Дуб-дзядуля” створаны абагульнены вобраз беларускай сацыяльнай прасторы. “Край блакітных азёр” з’яўляецца перш за ўсё краем азёр салёнага поту, горкіх слёз і крыві. Сэнс жыцця новага пакалення заключаецца ў тым, каб адшукаць у глыбінных пластах нацыянальнай душы (культуры) крыніцы жывой вады і напаіць ёй парасткі новага жыцця». Ці згодны вы з такой інтэрпрэтацыяй апавядання? Чаму?

# Янка Купала

(1882—1942)

**1.** Успомніце, што вы ведаеце пра Янку Купалу. Чаму яго называюць класікам беларускай літаратуры? **2.** Працытуйце радкі з твораў паэта.

З любой вандроўкі Янка Купала прывозіў не сувеніры, а звычайныя каменьчыкі. Памятаў, адкуль кожны з іх, любіў перабіраць. З часам у мінскім асяроддзі інтэлігентаў распаўсюдзілася гэта мода. Напрыклад, дома ў Петруся Броўкі таксама захоўвалася падобная калекцыя каменьчыкаў.



Іван Луцэвіч, якога мы больш ведаем як Янку Купалу, быў тым чалавекам, які ў многім прадвызначыў шляхі развіцця беларускай культуры ў XX і XXI стагоддзях. Гэта ўнікальная асоба, якая стварыла самабытную прастору ў сусвеце прыгожага пісьменства.

Янка Купала перажыў цяжкія часы: перыяд нацыянальнага адраджэння на стыку XIX і XX стагоддзяў, Першую сусветную вайну, тры рэвалюцыі, Грамадзянскую вайну, складаны час станаўлення савецкай улады, пачатак Вялікай Айчыннай вайны.



Правообладатель Национальный институт образования

Іван Дамінікавіч Луцэвіч нарадзіўся ў вёсцы Вязынка, што недалёка ад Заслаўя, 7 ліпеня 1882 года. Бацькі пісьменніка арандавалі маёнткі ў розных мясцінах і часта пераязджалі. Атрымаўшы пачатковую адукацыю, Іван Луцэвіч мусіў заняцца гаспадаркай, бо памёр бацька.

Першыя вершаваныя спробы былі па-польску, але знаёмства з Ядвігіным Ш. перавярнула свядомасць будучага паэта: «Гэта была для мяне вялікая падзея, бо я ўпершыню сутыкнуўся з чалавекам, які не толькі пісьменнік, якога друкуюць, але і піша па-беларуску». Пасля выхаду першага зборніка «Жалейка» (1908) Купалу запрасілі на працу ў «Нашу ніву».

> **З успамінаў.** «У тыя часы Янка Купала меў сталую працу ў бібліятэцы-пажычальні Даніловіча (пажычальня — грамадская бібліятэка, у адрозненне ад хатняй або прыватнай. — *Аўт.*), а ў “Нашай ніве” меў дапаможную працу… за перагляд і падгатоўку вершаў у “Нашу ніву” меў месца ў канторы для свайго раскладнога ложка… і пенсію» *(Вацлаў Ластоўскі. «Успаміны аб Янку Купалу»)*.

У хуткім часе паэт з’ехаў у Пецярбург, дзе навучаўся на агульнаадукацыйных курсах А. Чарняева (1909—1913). Жыў у кватэры прафесара Бранiслава Эпімах-Шыпілы. Калі ў кватэру прафесара прыходзілі госці, то, паводле ўспамінаў Паўліны Мядзёлкі, «заўсёды з нецярплівасцю чакалі прыходу Янкі Купалы. <…> Не вельмі гаваркі ў часе шумных спрэчак, заўсёды сур’ёзны, Янка Купала ўважліва прыслухоўваўся да выказаных думак, час ад часу падаючы кароткія і трапныя заўвагі».

У вольныя вечары наведваў тэатры, рыхтуючыся да ўласнага драматургічнага дэбюту: у Пецярбургу былі напісаны драматычная паэма «Сон на кургане» (1910), п’есы «Паўлінка» (1912) і «Раскіданае гняздо» (1913).

У 1913—1915 гадах Янка Купала быў рэдактарам газеты «Наша ніва». Потым з’ехаў у Маскву, дзе ў пачатку 1916 года ажаніўся з Уладзіславай Станкевіч.

Перыяд паміж Кастрычніцкай рэвалюцыяй 1917 года і пачаткам Другой сусветнай вайны стаў адным з самых нялёгкіх у жыцці паэта. Гэта быў час, калі востра паўстала пытанне прыняцця або непрыняцця новых парадкаў. Усе гістарычныя падзеі Янка Купала ўспрымаў як адданы Беларусі чалавек. У гэты час на Радзіме адна за адной змяняліся ўлады, а Купала заставаўся верным ідэі незалежнасці Беларусі, каб беларусы маглі «людзьмі звацца».



Правообладатель Национальный институт образования

У творчасці Янкі Купалы перыяды аптымізму змяняліся днямі дэпрэсій і сумненняў, вынікам якіх з'явіліся алегарычныя творы «Сон», «Млечны Шлях», «Спадчына», «Паяздджане» і інш. У аўтабіяграфіі 1919 года, дасланай Яўхіму Карскаму, Купала пісаў: «У душы маёй быў вечна нейкі пякельны разлад».

**З успамінаў.** «Ён, ад прыроды надзелены ўжо замкнутым характарам, яшчэ больш замкнуўся ў сабе, схаваўся ў нейкую зверхнюю халоднасць і, я сказаў бы, нават жорсткасць» *(Вацлаў Ластоўскі. «Успаміны аб Янку Купалу»)*.

У 1920—1930-я гады Янка Купала актыўна займаўся грамадскай працай: быў адным з ініцыятараў стварэння Беларускага драматычнага тэатра, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Інстытута беларускай культуры, удзельнічаў у Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі (1926). За ўклад у літаратуру Янка Купала ў 1925 годзе атрымаў званне «Народны паэт БССР» і стаў першым, хто так быў ушанаваны.

«Народны паэт» — гэта ганаровае званне, якое прысвойвалася паэтам за асаблівыя заслугі ў паэтычнай дзейнасці, напісанне высокамастацкіх твораў, значны ўклад у айчынную літаратуру і шырокае грамадскае прызнанне. Пасля Янкі Купалы гэта званне атрымалі Якуб Колас (1926), Пятрусь Броўка (1962), Аркадзь Куляшоў (1968), Максім Танк (1968), Пімен Панчанка (1973), Ніл Гілевіч (1991), Рыгор Барадулін (1992).

У 1930-я гады нязгода са спыненнем беларусізацыі вылілася ў практыку «ўнутранай эміграцыі» — паэт на нейкі час перастаў пісаць.

Восенню 1941 года Янка Купала разам з жонкай пераехаў у Татарстан, куды быў эвакуіраваны Саюз пісьменнікаў БССР. Адтуль ён адзін накіраваўся ў сваё апошняе падарожжа ў Маскву. Адправіў жонцы тэлеграму, што даехаў добра і ўдакладніў адрас: гасцініца «Масква», нумар 414. 28 чэрвеня 1942 года Янка Купала ўпаў у лесвічны пралёт у гасцініцы і разбіўся. А 30 чэрвеня не стала яго маці Бянігны Іванаўны. Пісьменнік не дажыў да свайго 60-гадовага юбілею некалькі дзён.

У гэты час Мінск быў акупаваны, таму паэта пахавалі на Ваганькаўскіх могілках у Маскве. У 1962 годзе прах Янкі Купалы быў перавезены ў Беларусь і змешчаны побач з магілай яго маці на Вайсковых могілках у Мінску.



Правообладатель Национальный институт образования

### Уклад у развіццё літаратуры

1. Янка Купала асэнсаваў і з вялікай мастацкай сілай увасобіў у слове трагедыю народа, якому адмаўлялі ў праве называцца нацыяй і мець дзяржаўнасць. А песняр абвясціў гэта права, пішучы пра беларускі народ як пра цэласнасць.

2. Янка Купала абуджаў чалавечую годнасць сялян, ён заклікаў «людзьмі звацца» беларусаў, якія былі ўпэўнены, што нічога ў жыцці змяніць нельга. Паэт і вершамі, і ўласным прыкладам паказаў чытачам, што жыццё можна змяніць, калі прыкласці намаганні. Яго раннія нашаніўскія вершы займелі надзвычайны розгалас з прычыны агульнай рэвалюцыйнай сітуацыі ў Расійскай імперыі, у склад якой тады ўваходзіла тэрыторыя Беларусі.

3. Тэму сялянскага жыцця, якую Францішак Багушэвіч раскрываў на рэальна-побытавым узроўні, Янка Купала ўзняў да філасофскага абагульнення. З сялянскага паэта ён вырас у паэта нацыянальнага.

4. Янка Купала — апявальнік выключнага, таму сярод яго герояў шмат людзей надзвычайнага лёсу: да вядомых у літаратуры вобразаў беззямельнага, сіраты, жабрака ён дадаў рамантычныя вобразы бунтара, які паўстае супраць сацыяльных абставін, і апантанага чалавека, якога не разумее народ (паэма «Сон на кургане»).

5. Паэзія класіка надзвычай багатая ў эстэтычным плане: хоць па светаадчуванні Янка Купала — паэт-рамантык, у яго творах ёсць праявы не толькі рамантызму (верш «Цару неба й зямлі», паэма «Курган»), але і неарамантызму (паэма «Магіла льва»), і сімвалізму (верш «Паязджане», паэма «Адвечная песня»).

6. Як драматург Купала даў узоры драмы («Раскіданае гняздо»), камедыі («Паўлінка»), трагікамедыі («Тутэйшыя»). Распрацаваў новы для беларускай літаратуры жанр — драматычную паэму.

1. Арганізуйце конкурс па пошуку інфармацыі на самы рэдкі факт пра жыццё і творчасць Янкі Купалы. Пераможцаў вызначце па намінацыях: «Самы нечаканы біяграфічны факт», «Самы рэдкі літаратурны факт», «Самы цікавы музычны факт» і інш.
2. Прыдумайце праект сучаснага помніка Янку Купалу. Якія вобразы, на вашу думку, абавязкова трэба ў ім выкарыстаць? Што яны будуць сімвалізаваць? З якога матэрыялу лепш выканаць кампазіцыю? Дзе яна можа быць устаноўлена?
3. Дакажыце, што Янка Купала — класік беларускай літаратуры.



Правообладатель Национальный институт образования

## П’еса «Раскіданае гняздо»




Тытульны ліст п’есы Янкі Купалы «Раскіданае гняздо» (1919)

«Раскіданае гняздо» — адзін з твораў беларускай літаратуры, які заключае ў сабе ідэю нашаніўскага адраджэння. Ад самага свайго выхаду ў свет і да нашага часу гэта п’еса прыцягвае ўвагу даследчыкаў, чытачоў і гледачоў. У чым жа загадка «Раскіданага гнязда»?

Твор мае сімвалічную назву і рэалістычны сюжэт. Максім Гарэцкі ў кнізе «Гісторыя беларускае літаратуры» адзначаў: «Змест для драмы аўтар узяў з рэальнага жыцця, але кожны вобраз і кожную гутарку зрабіў сімвалічнымі». Раскіданае гняздо — гэта сімвал раскіданай Бацькаўшчыны, народнага раз’яднання. Да часу напісання п’есы Янка Купала ўжо звяртаўся да сімвалізму ў іншых творах (напрыклад, драматычная паэма «Сон на кургане»).

**Пафас і змест п’есы. Асноўныя сюжэтныя лініі.** Найбольш верагодна, што ў аснове сюжэта ляжыць сямейная трагедыя роду Луцэвічаў: продкі Янкі Купалы таксама страцілі сваю зямлю. Адзін з заснавальнікаў беларускай філалогіі Яўхім Карскі адзначаў, што сюжэт «Раскіданага гнязда» «пераносіць нас у дарэвалюцыйны перыяд, калі дастаткова выразна выявіліся прычыны, якія выклікалі знакамітую ўспышку 1905 года і знайшлі падтрымку з часам галоўным чынам у нізах, з боку рабочага класа і сялянства: гэта — незадаволенасць зямельнымі адносінамі, беспрацоўем нізоў і парушэннем агульначалавечых адносін паміж асобамі рознага полу і грамадзянскага стану».

**Навукоўцы гавораць.** «Драма Янкі Купалы “Раскіданае гняздо” мае некалькі ўзроўняў прачытання: аўтабіяграфічны, які адсылае чытача да гісторыі роду Луцэвічаў; нацыянальны, які распавядае гісторыю пошукаў беларусамі страчанай Бацькаўшчыны; універсальны, які дазваляе бачыць у лёсе сям’і Зяблікаў лёс чалавецтва, што згубіла свой шлях у незразумелым, хаатычным свеце» *(Марына Казлоўская)*.

Падзеі ў творы пачынаюцца ўлетку 1905 года ў хаце Зяблікаў, а заканчваюцца ўвосень таго ж года на рэштках гэтай хаты — «рас-



Правообладатель Национальный институт образования

кіданага гнязда». Паніч, які прыехаў аднекуль з-за мяжы, пачынае праз суд зганяць сялян з зямлі, якой яны мелі права карыстацца, плоцячы пану аброк («чынш»).

Сярод асноўных праблем драмы — праблема зямлі і свабоды, магчымасці чалавека заявіць пра сябе як асобу, канфлікт пакаленняў. Твор мае ярка выражаны гуманістычны і сацыяльны пафас, філасофскі падтэкст.

***Пафас*** (ад грэч. *pathos* – 'пакута, натхненне, запал') — эмацыянальны змест мастацкага твора, пачуцці і эмоцыі, якія аўтар укладвае ў тэкст, чакаючы суперажывання чытача. У залежнасці ад пачуццяў, якія перажывае чытач, пафас бывае сентыментальны, гераічны, рамантычны, трагічны, сатырычны і інш.

Янка Купала паказаў сваіх герояў як вартых павагі людзей, «хоць і мужыкоў». Яны вызначаюцца сваёй высакароднасцю (Лявон), моцнымі пачуццямі (Марыля і яе дачка Зоська), выключнымі здольнасцямі да мастацтва (Данілка), уменнем пераконваць іншых (Старац і Незнаёмы). Усіх іх аб'ядноўвае настойлівасць і ўпартасць у дасягненні пастаўленай мэты. Паніч, разбэшчаны малады чалавек, які зняславіў Зоську, наадварот, не выглядае высакародным і супрацьпастаўляецца сялянам.

Сюжэтныя лініі «Раскіданага гнязда» звязаны з пошукамі ўласнай дарогі ў жыцці і рэпрэзентуюцца рознымі персанажамі. Лявон прадстаўляе самы тупіковы шлях: самагубства. Яно не вырашае праблему, а нараджае новыя. Старац прапануе выхад, які прымаецца абсалютнай большасцю Зяблікаў, — вандраваць па свеце. Незнаёмы кліча на Вялікі сход, шукаць сваю долю. Гэтай дарогай ідуць толькі Сымон і Зоська.

Які з гэтых трох шляхоў быў найбольш блізкім для самога драматурга? Адказ на гэта пытанне трэба шукаць у лірыцы. Янка Купала ў перыяд 1913—1918 гадоў пісаў вершы, у якіх узнік вобраз сходу («Калі пачнуць», «На сход», «У дарозе», «Час!» і інш.).

**Жанравыя і кампазіцыйныя асаблівасці.** П'еса «Раскіданае гняздо» была напісана ў 1913 годзе, але надрукавана толькі ў 1919-м. Адным з першых на твор адгукнуўся Змітрок Бядуля і паставіў пытанне пра жанравую прыналежнасць. У крытычным артыкуле ён

***Трагедыя*** — п'еса, заснаваная на непрымірымым канфлікце паміж моцнай высакароднай асобай і абставінамі, якія не даюць ёй магчымасці рэалізавацца. Гэты канфлікт мае глыбокі філасофскі змест, актуальны характар у палітычных, сацыяльных або духоўных адносінах.



Правообладатель Национальный институт образования

адзначаў: «Што тычыцца “Раскіданага гнязда” Янкі Купалы, дык мы тое самае скажам, што гэта скарэй усяго паэма, чымся драма. Лірыка і сімволіка гэтага, бясспрэчна, мастацкага твора вытрымана болей гарманічна, як ва ўсіх другіх творах нашага паэта.

***Драма*** — п’еса з вострым канфліктам сацыяльнага або побытавага характару, які развіваецца ў пастаянным напружанні, адрозніваецца ад трагедыі тым, што ў драме героі маральна перамагаюць абставіны.

Чытаючы “Раскіданае гняздо”, атрымліваеш такое ўражанне, як бы пад акампанемент чуластрунных гусляў сівы дзед-баечнік у стылі Баяна пяе дзіўную песню і чаруе грамаду людзей...»

Пазней даследчыкі называлі гэты твор сацыяльна-бытавой драмай, трагедыяй, паэмай-драмай. У кожнага з навукоўцаў было абгрунтаванне для жанравага вызначэння твора.

! **З успамінаў.** «Не задавальняючыся тымі ведамі, якія давалі яму (Купалу. — *Аўт.*) курсы Чарняева, ён цэлымі днямі праседжваў у бібліятэках, а вечарамі, не раз прапускаючы заняткі на курсах, хадзіў у тэатры. Купала заканчваў пісаць “Паўлінку” і, рэч вядомая, мусіў вывучаць драматычнае мастацтва» *(Актрыса, пісьменніца Паўліна Мядзёлка. «Сцежкамі жыцця»)*.

Калі ўважліва прааналізаваць «Раскіданае гняздо», можна заўважыць, што ў творы ўдала спалучаюцца два віды канфліктаў: канфлікт сацыяльнага характару, як у драме, і канфлікт паміж асобай і абставінамі, як у трагедыі. У цэнтры п’есы — драма адной сям’і, пазбаўленай зямлі. Знешні разлад праецыруецца на ўнутрысямейныя адносіны: кожны з Зяблікаў робіць свой выбар. Адначасова мы заўважаем, што ў алегарычнай форме Янка Купала паказаў розныя шляхі аднаўлення роднага гнязда — Бацькаўшчыны, а ў фінале з’яўляецца Незнаёмы, які кліча на Вялікі сход. Фактычна канфлікт твора выходзіць за межы бытавога і набывае агульначалавечае гучанне. Менавіта гэты талент адначасовай перадачы дзеяння адразу ў двух планах — знешнім, відавочным і сімвалічным, філасофскім — адрознівае добрага драматурга ад геніяльнага мастака.

П’еса вызначаецца лірызмам. Пятро Васючэнка ў свой час прапаноўваў аналізаваць драматургічныя творы Янкі Купалы ў неадрыўнай узаемасувязі з яго лірыкай, успрымаючы іх як адзін тэкст. Такі падыход дае магчымасць адказаць на шматлікія пытанні пра сэнсавае напаўненне вобразаў і ідэйны ўзровень твора.



Правообладатель Национальный институт образования

Такім чынам, «Раскіданае гняздо» — гэта лірычная драма, якая мае адзнакі трагедыі.

Жанравыя асаблівасці тлумачаць і спецыфіку кампазіцыі. Адным з першых, хто заўважыў гэта, быў вучоны і метадыст Іван Замоцін, які сцвярджаў, што ў «Раскіданым гняздзе» няма традыцыйнага драматычнага развіцця: «...у п'есе няма яскрава выражанай завязкі, кульмінацыйнага ўздыму дзеяння і яго развязкі», «няма выразнай драматургічнай кампазіцыі», але ёсць «шэраг сцэн, звязаных адной тэмай». Класічныя элементы кампазіцыі знаходзім у межах разгляду сюжэтных ліній, звязаных з пэўнымі героямі, або ў межах асобных актаў і з'яў п'есы — у сувязі з дамінаваннем таго або іншага героя (напрыклад, Лявон — галоўная дзейная асоба ў першым акце, а Зоська — у другім і г. д.).




Афіша спектакля «Раскіданае гняздо». Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі

Тым не менш «Раскіданае гняздо» вызначаецца кампазіцыйнай зладжанасцю, якую падкрэсліваюць сюжэтныя паўторы, што ўзмацняюць уражанне чытачоў і гледачоў ад трагічных падзей у п'есе. Так, у VI з'яве (акт першы) Зоська апісала свой сон — своеасаблівае прадбачанне таго, з чым сутыкнецца сям'я далей. Зяблікі прыходзяць «у нейкую харошую краіну», сустракаюць праваднікá святога Пятра і святога Спаса, а потым трапляюць у рай за свае пакуты: «Годзе вам на зямлі пакутаваць, прыйшла ўжо пара са мной вам разам панаваць! Святы Пётра, — тут паказаў ён на гэнага, што нас вёў, — будзе над вамі апеку мець на векі вечныя...» Пазней гэта сітуацыя паўтарылася ў новым варыянце: на рэштках хаты з'явіўся Незнаёмы і клікаў таксама ісці наперад, да лепшай долі. Падобнае відавочна і ў абставінах, калі Лявон імкнуўся знайсці справядлівасць у судзе, але не знайшоў, як пазней і яго старэйшы сын. Сымон зразумеў, што трэба шукаць новую Бацькаўшчыну. Спрабавала прайсці незайздросны лёс бацькі Зоська, але яе ўратавалі людзі. Паўтарылі пуцявіны і Старац з Незнаёмым, якія паклікалі за сабой Зяблікаў.

Адзначаная кампазіцыйная гарманічнасць абумоўлена таксама скразным вобразам-сімвалам дарогі як гістарычнага шляху беларусаў, на якім паўтараюцца пэўныя сюжэты, сустракаюцца падобныя героі, на новым узроўні вырашаюцца драматургічныя канфлікты.



Правообладатель Национальный институт образования

**Літаратурныя сувязі.** «Знешні, сацыяльны канфлікт паміж сялянскай сям'ёй і панам, які традыцыйна лічыўся ключавым у драме Янкі Купалы "Раскіданае гняздо", невыпадкова вынесены аўтарам па-за межы сцэнічнага дзеяння. Наступства гэтага канфлікту (разбурэнне хаты) з'яўляецца штуршком для развіцця асноўнага, унутранага канфлікту. <...> Драма ідэй, якую перажываюць героі "Раскіданага гнязда", набліжае іх да дзейных асоб п'ес пра сучаснасць Генрыка Ібсена[1], а паліфанічны спосаб арганізацыі сістэмы персанажаў лучыць твор беларускага аўтара з драматургіяй Антона Чэхава. Жаданне і немагчымасць вярнуць Сусвету страчаны сэнс праз увасабленне свайго ідэалу будучыні прыводзіць герояў Янкі Купалы да глыбокага разладу з сабой і светам, да адчування татальнай адзіноты, страху быцця, таго настрою, якім поўняцца п'есы Станіслава Пшыбышэўскага[2]» *(Марына Казлоўская)*.

**Вобразная сістэма.** Вобразны свет драмы, па вызначэнні Яўхіма Карскага, уяўляе сабой не канкрэтных людзей, узятых з натуры, а «вынашаныя ў глыбіні душы паэтавай персанажы». Янка Купала прадстаўляе своеасаблівыя тыпы людзей — носьбітаў пэўных ідэй і ўстановак.

Адным з самых загадкавых з'яўляецца вобраз **Старца**. Даволі часта яго разглядалі як увасабленне прымірэння з бядой і на гэтай аснове праводзілі паралелі з вобразам Лукі ў п'есе Максіма Горкага «На дне». Але паміж гэтымі двума персанажамі назіраецца істотная розніца.

Першая фраза, якую мы чуем з вуснаў Старца, супярэчыць ідэі прымірэння: «Так, так, пані гаспадыня! Заўсёды бяда бяду вядзе, але ніколі не трэба здавацца. Ліха перамелецца, і ўсё добра будзе». І амаль у фінале: «Ох, вялікі свет, мой сынку! Куды я толькі ні хадзіў, нідзе канца яму не знайшоў, не бачыў і не чуў. <...> Цэлы свет — хата мая, усе людзі — радня мая, уся зямелька — поле маё роднае. <...> Ганьба таму чалавеку, што рукі апусціць, як перавяслы, і чакае, пакуль сама доля к яму прыйдзе ў хату і папросіцца, каб прыняў яе з ласкі свае!» Гэтыя словы сведчаць пра асаблівы тып светаўспрымання: задавальненне малым і ўхваленне пазітыўных змен. Старац выступае носьбітам народнай маралі, скіраванай на ўменне слухаць і спачуваць іншым.

---

[1] Генрык Ібсен (1828—1906) — сусветна вядомы нарвежскі драматург, заснавальнік «новай драмы».

[2] Станіслаў Пшыбышэўскі (1868—1927) — польскі пісьменнік.



Правообладатель Национальный институт образования

**Незнаёмы** таксама заклікае да змен і паказвае мадэль пошукаў лепшай долі праз згуртаваную барацьбу: «Склікаецца сход вялікі, і ўсе браты і сёстры павінны на гэны сход з'явіцца. <...> Хто самаходзь не пойдзе, над тым пракляцце завісне, бо на сходзе жыццё мільёнаў будзе важыцца, а ў такіх вялікіх справах і адзін чалавек можа сабой сюды ці туды перацягнуць». Гэты персанаж мае схематычны характар. У пэўнай ступені ён выконвае функцыянальную ролю вестуна. Разам з тым ён не проста паведамляе пра смока-ўпыра, сход, а падштурхоўвае, матывуе людзей на актыўныя дзеянні, падказвае Сымону новы выхад са становішча.

У сям'і Зяблікаў старэйшае пакаленне — Лявон і Марыля — разыходзіцца ў шляхах вырашэння праблем. **Лявон** упарта змагаецца за кавалак зямлі. Калі разумее бессэнсоўнасць сваіх высілкаў, накладвае на сябе рукі. Пры гэтым пакідае старэйшаму сыну наказ — «праўды шукаць не тапаром, а розумам».

**Марыля** займае пасіўную пазіцыю — чакае. Яна цяжка хварэе ў самым пачатку драмы і не можа падняцца з ложка, але, калі гіне Лявон, вымушана ўстаць. Даследчыца Ванда Бароўка адзначала: «Марыля цярплівая, міласэрная, пабожная, самаахвярная, прадбачлівая... належыць да тыпу людзей, якія звыкліся з выпрабаваннямі і стаічна іх пераносяць, якім наканаваны гераізм цярплівасці». Сымону Марыля раіць клапаціцца пра штодзённае існаванне, а не пра перамогу праўды: «Усё ж такі, як бы там сабе ні было, а нам трэба думаць, як далей жыць. Паняволі мусім сабе даваць якую раду. Гэтага, сынок, мала, што ты загадаў перацягнуць сюды ламаццё з поля. Грызці яго не будзем».

**Сымон** жа, які разам з Зоськай і Данілкам увасабляе маладое пакаленне, не можа прымірыцца з маці. Гэта бунтар, спачатку стыхійны, а потым ідэйны. На папрок маці, што можа нарабіць бяды, бо ідзе супраць закону, ён адказвае: «Не процi закону, а проці нашых згубіцеляў — крывапрысяжных сведак і проці тых, што гэтых сведак падкупілі іх жа крывавымі медзякамі. Вось такім проці хачу ісці!»

Сымон здольны на адчайныя ўчынкі: спачатку імкнецца выйграць судовую справу з панічом, потым хоча пабудаваць будку і там перазімаваць з сям'ёй, бо вясной можа ўсё перамяніцца. Але ўсе яго пачынанні марныя. Урэшце Сымон падпальвае двор паніча — і ідзе на Вялікі сход. Словы Незнаёмага пра гэты сход, пра чаканне яго дзеянняў з боку соцень, тысяч, мільёнаў людзей ляглі ва ўрадлівую



Правообладатель Национальный институт образования

глебу. Сымон гатовы не толькі кінуць сваё раскіданае гняздо, але і цягнуць «па Бацькаўшчыну» за сабой Зоську. І гэта яму ўдаецца.

Хоць **Зоська** і падпарадкоўваецца старэйшаму брату, але яна абсалютна іншая натура. Гэты вобраз пададзены ў псіхалагічным развіцці. Зоська — рамантычная асоба, здольная заўважаць прыгожае ў свеце і захапляцца ім. Спачатку мы бачым, што ў адносінах з панічом, роднымі яна праяўляе паганскае светабачанне, калі верыць, што душа чалавека, незалежна ад здзейсненага на зямлі, пераселіцца ў рай. Менавіта таму спрабуе паўтарыць учынак бацькі. На шчасце, да яе своечасова прыходзіць разуменне іншага.

Літаратуразнавец Алесь Макарэвіч адзначаў: «Кахаючы паніча, Зоська аказваецца паміж вогненнымі берагамі бурлівай ракі. Імкнучыся наблізіцца то да аднаго, то да другога з гэтых берагоў, яна заўважае, што іх полымя настолькі моцна яе абпальвае, што яна, каб усё ж узысці на гэтыя берагі, вымушана ўбрацца ў «вопратку»-абарону. <...> Зоська выкарыстоўвае самае прыдатнае, як ёй здаецца, адзенне: блюзнерства[1], гульні перад роднымі. <...> Першапачаткова яна адчувае сябе ў ім калі не няўтульна, то не надта дыскамфортна. Але тут пачынаецца самае небяспечнае для Зоські: раздваенне асобы, якое падводзіць яе да двурушніцтва, усвядомленага і прыгожа афармленага ў кантэксце яе высокіх поглядаў на свет». Урэшце гэта вядзе да краху яе ўзвышаных надзей і памкненняў.

Бадай, самы неадназначны вобраз «Раскіданага гнязда» — чатырнаццацігадовы падлетак **Данілка**. Гэта тыповы для нашаніўскай літаратуры вобраз адоранага самародка, здольнага да мастацтва. Яго любімы занятак — змайстраваць скрыпку, каб сваёй музыкай уздзейнічаць на людзей. Данілка ў пэўнай ступені супрацьпастаўлены Сымону, бо не здольны вырашаць праблемы, не гатовы рызыкаваць, як старэйшы брат: «І што гэты Сымон думае з сваёй рызыкай? Ужо аж мяне пачынае злосць на яго разбіраць». Данілка — дваістая асоба. Ён хоча ісці разам з маці жабраваць, каб быць вольным, але адначасова гатовы пакланіцца пану, бо мае да яго «важны інтарэс».

Максім Гарэцкі, характарызуючы «Раскіданае гняздо», адзначаў: «...дзейныя асобы ў драме гавораць не простаю, звычайнаю моваю, а паэтычнаю, сімваліка-вобразнаю, часам нават музыкальна-размеранаю і заўсёды ахопленаю купалаўскім лірызмам. Усё гэта складае

---

[1] *Блюзне́рства* — богаадступніцтва, бязбожжа.



Правообладатель Национальный институт образования

вялікія мастацкія вартасці твора, але разам з тым вымагае ад паэта такой жа высокай ідэйнай стараны, такой жа сілы ў паказанні і з'ясненні духовага (духоўнага. — *Аўт.*) замыслу драмы, бо йначай усё паэтычнае хараство будзе безгрунтоўным і малацэнным».

! Слоўнік мовы Янкі Купалы складаецца з 8 тамоў і ўтрымлівае больш за 21 тысячу слоў.

**Сцэнічнае ўвасабленне п'есы.** Драма «Раскіданае гняздо» мае даўнія традыцыі сцэнічнага ўвасаблення. Упершыню гэты твор быў пастаўлены Фларыянам Ждановічам у Першым беларускім таварыстве драмы і камедыі 10 ліпеня 1917 года.

Заснавальнік трупы і рэжысёр увасобіў на сцэне вобраз Сымона, Вера Тарасік — Марылі, Рамуальд Жакоўскі — Старца. Ролю Лявона ў першай пастаноўцы выканаў брат Фларыяна Ждановіча Антон (А. Крыніца), выкліканы з Арла.



Сцэна са спектакля «Раскіданае гняздо» (рэж. Б. Луцэнка). Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага

З таго часу п'еса ўваходзіла ў рэпертуар Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа ў Віцебску, Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага ў Мінску, Нацыянальнага акадэмічнага ўкраінскага драматычнага тэатра імя Марыі Занькавецкай у Львове і іншых прафесійных тэатраў. Акрамя таго, «Раскіданае гняздо» шмат разоў ставілася на сцэнах розных аматарскіх тэатраў Беларусі і за яе межамі.

! **Літаратурныя сувязі.** Тэма пошукаў шчасця, праўды, лепшай долі ўвасоблена не толькі ў драматычных, але таксама ў вершаваных і празаічных творах. Францішак Багушэвіч тэму пошукаў праўды раскрыў у паэме «Кепска будзе!». Якуб Колас у паэме «Новая зямля» і Іван Мележ у рамане «Людзі на балоце» бачылі шлях да лепшай долі ў здабыцці зямлі і волі. Вельмі выразна матыў «раскіданага гнязда» паказаны ў рамане Кузьмы Чорнага «Пошукі будучыні».



Правообладатель Национальный институт образования

1. Чаму можна сцвярджаць, што п’еса «Раскіданае гняздо» мае выражаны сацыяльна-філасофскі і гуманістычны змест?
2. У чым асаблівасць сюжэта п’есы? Вызначце асноўныя сюжэтныя лініі.
3. Назавіце праблемы, што закранаюцца ў творы. Якія шляхі прапануе Янка Купала для іх вырашэння? Ці ёсць сярод іх найлепшы? Абгрунтуйце думку.
4. Якія групы вобразаў можна вылучыць у п’есе?
5. Чым праўда Сымона адрозніваецца ад праўды Зоські?
6. Раскрыйце ролю вобраза Старца ў драме.
7. Дзеля чаго, на вашу думку, аўтарам быў уведзены вобраз Незнаёмага?
8. Што (каго) сімвалізуюць у драме: сям’я Зяблікаў; разбураная хата; крыж, які ставіць Сымон на магіле бацькі; кветкі ў руках і ў вянку Зоські; скрыпка, якую ладзіць Данілка; жабрачыя торбы, якія шые Марыля, носіць Старац? Абагульніце меркаванні і вызначце, што сімвалізуе назва твора.
9. У чым заключаюцца жанравыя адметнасці «Раскіданага гнязда»?
10. Уважліва разгледзьце афішу спектакля паводле п’есы Янкі Купалы. Прыдумайце сваю афішу. Што на ёй павінна быць адлюстравана? Чаму?
11. Звярніцеся да фотаздымка спектакля «Раскіданае гняздо». Як вы думаеце, што за сцэна на ім паказана? Наколькі акцёрам (Марыля — Вольга Клебановіч, Сымон — Аляксей Шадзько, Зоська — Аксана Лясная) удалося перадаць драматызм сітуацыі?
12. Па магчымасці пазнаёмцеся з пастаноўкай (тэлепастаноўкай) спектакля паводле «Раскіданага гнязда». Паразважайце, чаму б вы параілі (або не параілі) свайму сябру пайсці на спектакль.
13. Інсцэніруйце ўрывак з п’есы «Раскіданае гняздо», які вы лічыце адным з ключавых у творы.

*Тэорыя літаратуры*

## Выяўленне аўтарскай пазіцыі ў драматычным творы

Традыцыйна лічыцца, што лірыка з’яўляецца самым выразным спосабам аўтарскага самавыяўлення, другое месца займаюць эпічныя творы, а трэцяе — творы драматычныя.



Правообладатель Национальный институт образования

Адным з дзейсных спосабаў выражэння аўтарскай пазіцыі ў старажытным тэатры быў хор, які заўсёды знаходзіўся на сцэне.

У часы панавання класіцызму функцыю хору перанялі акцёры-рэзанёры, якія не прымалі непасрэднага ўдзелу ў ходзе п’есы, аднак каментавалі дзеянне, давалі маральную ацэнку ўчынкам персанажаў, вучылі і настаўлялі іх.

Праз рэплікі дзейных асоб маглі раскрывацца не толькі характары персанажаў, але і гістарычны, сацыяльны, культурны падтэкст. Часам дыялогі выглядалі як эпічная размова, якая нагадвала хутчэй паведамленне гледачу, а не ўдзельнікам сцэнічнага дзеяння. Такія п’есы называліся эпічнымі.

З XVII стагоддзя і да нашага часу драматургі пастунова пазбаўляліся ад эпічнасці ў п’есах, усё часцей выкарыстоўвалі апасродкаваныя спосабы выяўлення аўтарскай пазіцыі, хаваючыся за маскамі сваіх персанажаў і свядома прапануючы чытачу і гледачу своеасаблівую гульню «знайдзі мяне».

Тэарэтык літаратуры родам з Беларусі Барыс Корман спецыяльна займаўся пытаннем выяўлення аўтарскай пазіцыі ў п’есе. Паводле яго меркавання, у драме асноўнае значэнне маюць рэплікі персанажаў, якія выражаюць іх дзеянні, волевыяўленні, унутраную дынаміку характараў, а аповед, расказванне гісторыі (рэмаркі, лірычныя адступленні) успрымаюцца як другарадны элемент, які не мае такой высокай значнасці, як словы герояў. У драме няма вялікай колькасці сродкаў для перадачы думак і пачуццяў. У гэтым праяўляюцца яе абмежаванні. Часта драматург фіксуе асаблівасці паводзін герояў у рэмарках. У сувязі з гэтай спецыфікай драмы як роду літаратуры аўтар можа перадаваць сваю пазіцыю: 1) праз размяшчэнне і суадносіны частак; 2) праз маўленне дзейных асоб.

Такім чынам, сучасныя літаратуразнаўцы вылучаюць такія спосабы выяўлення аўтарскай пазіцыі ў драматычным творы: рэплікі, мову персанажаў і структурную пабудову п’есы. Акрамя таго, драматург выяўляе сябе праз рэмаркі, інструкцыі для рэжысёра, спіс дзейных асоб, іх імёны і характарыстыкі, назву твора. Аднак гэтыя інструменты не з’яўляюцца настолькі значнымі, як само дзеянне, дыялогі дзейных асоб і кампазіцыя.

1. Прасачыце, якім чынам выяўляецца аўтарская пазіцыя ў драме «Раскіданае гняздо».

2. Чаму рэжысёру спектакля важна добра разумець аўтарскую пазіцыю?



Правообладатель Национальный институт образования

# *Якуб Колас*

(1882—1956)

**1.** З якімі творамі (урыўкамі з твораў) Якуба Коласа вы знаёміліся раней?
**2.** Што вам вядома пра жыццёвы і творчы шлях пісьменніка?

Даследчыкі заўважылі, што ў творах, напісаных Якубам Коласам, няма ніводнай адмоўнай гераіні.



З лістапада 1882 года ў засценку Акінчыцы Мінскага павета ў сялянскай сям'і нарадзіўся Якуб Колас (Канстанцін Міцкевіч).

З 1883 года сям'я Міцкевічаў жыла ў леснічоўцы Ласток, а з 1890 года — у леснічоўцы Альбуць. Канстанцін Міцкевіч вучыўся ў пачатковай школе ў Мікалаеўшчыне, пасля — у Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. З 1902 па 1906 год Якуб Колас працаваў настаўнікам на Палессі: спачатку ў вёсцы Люсіна (цяпер Ганцавіцкі раён), а потым — Пінкавічы (Пінскі раён). Зімою 1906—1907 гадоў пісьменнік жыў у сваякоў у леснічоўцы Смалярня. Там ён без афіцыйнага дазволу адкрыў прыватную школу. Некаторы час Якуб Колас працаваў у рэдакцыі газеты «Наша ніва».

За ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе, арганізаваным у 1906 годзе, пісьменнік адбываў турэмнае зняволенне ў мінскім астрозе ў 1908—1911 гадах. У 1913 годзе Якуб Колас узяў шлюб з настаўніцай пінскай чыгуначнай школы Марыяй Каменскай. Разам яны пражылі больш за 30 гадоў, мелі трох сыноў.

Падчас Першай сусветнай вайны Якуб Колас скончыў Аляксандраўскае ваеннае вучылішча (Масква), служыў у запасным палку ў Пярмі, накіроўваўся на Румынскі фронт, затым як настаўнік быў вызвалены ад вайсковай службы. Пэўны час пісьменнік працаваў педагогам і школьным інструктарам у Абаяні і яго ваколіцах (Курская вобласць Расіі).



Правообладатель Национальный институт образования

Якуб Колас вярнуўся ў Мінск у 1921 годзе. Пісьменнік супрацоўнічаў з Народным камісарыятам асветы, Інстытутам беларускай культуры, вёў заняткі ў Беларускім педагагічным тэхнікуме, чытаў лекцыі на настаўніцкіх курсах у Слуцку, выкладаў беларускую мову ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

**З успамінаў.** «Запомніць усіх сваіх вучняў яму (Якубу Коласу. — *Аўт.*) было не пад сілу. Раз ці два на год мы падыходзілі да класнага стала, і Колас стаўляў у заліковыя кніжкі "здавальняюча", амаль нічога не пытаючыся. Нам толькі здавалася, што ён помніць і ведае ўсіх, бо неяк па-хатняму цёпла і прытульна было на яго лекцыях, быццам вёў іх не настаўнік, а калі не бацька, дык нехта вельмі прыветлівы са старэйшых сваякоў. Дый Канстанцін Міхайлавіч ахвотна замяняў лекцыі чытаннем толькі што напісаных твораў. Затое мы вучылі методыку мовы найбольш старанна, каб не ашукаць і яго, і саміх сябе» *(Максім Лужанін. «Колас расказвае пра сябе»)*.

У 1926 годзе Якубу Коласу было прысвоена званне народнага паэта БССР. Таксама ў 1920—1930-я гады пісьменнік шмат перакладаў з польскай, украінскай, рускай моў.

У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны ва ўсесаюзнай газеце «Правда» на беларускай мове быў апублікаваны верш Якуба Коласа «Шалёнага пса — на ланцуг!», дзе аўтар заклікае: «На меч перакуйце ваш плуг». У часы фашысцкай акупацыі паэт эвакуіраваўся з Беларусі, жыў у Клязьме (пад Масквой), Ташкенце, Маскве. На вайне загінуў сярэдні сын пісьменніка. У 1944 годзе творца вярнуўся ў вызвалены Мінск.

У пасляваенныя гады Якуб Колас быў абраны дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР, членам Усесаюзнага камітэта па дзяржаўных прэміях у галіне літаратуры і мастацтва, старшынёй Беларускага камітэта абароны міру. Двойчы (у 1946 і 1949 гадах) Якубу Коласу была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР.

Памёр Якуб Колас 13 жніўня 1956 года за сваім рабочым сталом.

Значную частку жыцця пісьменнік прысвяціў навуковай, грамадска-палітычнай і культурнай дзейнасці. Класік беларускай літаратуры Якуб Колас быў акадэмікам і віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук БССР, прымаў удзел у рабоце літаратурнага аб'яднання «Полымя», іншых пісьменніцкіх арганізацый, усесаюзных з'ездаў савецкіх пісьменнікаў, Міжнародным кангрэсе пісьменнікаў у абарону культуры (1935, Парыж) і інш.



Правообладатель Национальный институт образования

**Уклад у развіццё літаратуры**

1. Якуб Колас — адна з ключавых асоб у гісторыі беларускай культуры. Яго літаратурная і навуковая дзейнасць істотна паўплывала на развіццё сучаснай беларускай мовы. Пісьменнік пакінуў творы, якія ўжо не адным пакаленнем чытачоў прызнаюцца бясспрэчнай класікай.

2. Якуб Колас — стваральнік ліра-эпічных паэм «Новая зямля» і «Сымон-музыка», якія ўвайшлі ў залаты фонд айчыннай літаратуры. Некаторыя даследчыкі прылічваюць гэтыя паэмы да нацыянальнага эпасу беларусаў.

3. Пісьменнік узбагаціў беларускую лірыку вершамі («Ручэй», «Родныя вобразы», «Хмаркі», «На рэчцы зімою» і інш.), якія не страчваюць сваёй актуальнасці. Некаторыя з іх загучалі як песні: «Роднаму краю» (кампазітар Ігар Лучанок), «Каханне» (кампазітары Уладзімір Мулявін, Ігар Лучанок) і інш.

4. Народны пісьменнік паўплываў на развіццё як буйных, так і малых жанраў беларускай прозы (трылогія «На ростанях», зборнік «Казкі жыцця», апавяданні «Малады дубок», «Нёманаў дар» і інш.).

5. Якуб Колас — адзін са стваральнікаў методыкі выкладання беларускай мовы і літаратуры, аўтар кніг «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» (1909) і «Методыка роднай мовы» (1926).

1. Падрыхтуйце рэферат «Асноўныя вехі жыццёвага і творчага шляху Якуба Коласа». Прытрымлівайцеся наступнай структуры: тытульная старонка, уступ, асноўная частка, заключэнне, спіс выкарыстанай літаратуры, дадаткі (ілюстрацыі, схемы, прэзентацыі, аўдыяфайлы і інш.).
2. Акрэсліце значэнне творчай спадчыны Якуба Коласа для беларускай культуры.
3. Складзіце хіт-парад «Пяць песень на словы Якуба Коласа». Патлумачце ваш выбар. Прааналізуйце літаратурныя і музычныя вартасці дзвюх песень са складзенага вамі хіт-парада.

## Трылогія «На ростанях»

***Творчая гісторыя мастацкага тэксту*** — аднаўленне працэсу напісання твора з тым, каб удакладніць сацыяльна-псіхалагічныя і біяграфічныя перадумовы творчай працы, зразумець канкрэтна-гістарычны сэнс твора ў яго завершанай форме.

**Гісторыя напісання твора.** Трылогія «На ростанях» складаецца з наступных частак: «У палескай глушы» (1921—1922), «У глыбі Палесся» (1926—1927) і «На ростанях» (1948—1954) і мае цікавую творчую гісторыю.



Правообладатель Национальный институт образования

Над трылогіяй аўтар працаваў больш за 30 гадоў з перапынкамі. Першыя яе дзве часткі лічацца аповесцямі, трэцяя называецца і аповесцю, і раманам. Мяркуецца, што задума гэтага твора з'явілася ў Якуба Коласа яшчэ падчас яго працы настаўнікам у палескай вёсцы Люсіна.

Як кніга аповесць «У палескай глушы» ўпершыню ўбачыла свет у Вільні ў 1923 годзе і была падпісана псеўданімам Тарас Гушча. У 1955 годзе трылогія «На ростанях» выйшла асобным выданнем. Аб'яднанне трох кніг не было механічным: іх знітоўвалі герой, падзеі і інш. Пры гэтым аўтар уносіў праўкі ў раней выдадзеныя часткі. Некаторыя вынікі тэксталагічных даследаванняў літаратурнай спадчыны пісьменніка прапанаваны ў 20-томным зборы твораў Якуба Коласа (2007—2012).

Трылогія «На ростанях» (ці асобныя яе часткі) перакладалася на замежныя мовы: балгарскую, харвацкую, нямецкую, польскую, румынскую, рускую, украінскую, чэшскую, эстонскую і інш. Па матывах трылогіі быў зняты мастацкі фільм «Першыя выпрабаванні» (1960—1961, рэжысёр Уладзімір Корш-Саблін, «Беларусьфільм», аўтары сцэнарыя: Аркадзь Куляшоў і Максім Лужанін), а Алесем Звонакам была напісана п'еса «Навальніца будзе».

> **Навукоўцы гавораць.** Аснову творчай гісторыі літаратурнага твора складае гісторыя тэксту. У гэта паняцце ўключаюцца фактары, якія паўплывалі на ўзнікненне твора — ад задумы да завяршэння. Крыніцамі творчай гісторыі звычайна выступаюць лісты аўтара, успаміны, планы твора, яго накіды, чарнавікі, карэктуры, прыжыццёвыя выданні і іншыя матэрыялы «творчай лабараторыі» пісьменніка *(Паводле Андрэя Грышуніна)*.

**Першая частка** трылогіі расказвае аб прыездзе маладога настаўніка Андрэя Лабановіча ў глухую палескую вёску Цельшына. Ён знаёміцца з жыццём палешукоў, іх побытам, норавамі.

Якуб Колас паказвае, як галоўны герой цешыцца з прыроды, шмат разважае, спрабуе разабрацца са сваімі думкамі, жаданнямі і парываннямі, падтрымлівае стасункі з сябрамі, сутыкаецца з мясцовай інтэлігенцыяй, калегамі, займаецца навучаннем дзяцей, перажывае розныя пачуцці. Адносна невялікая колькасць падзей кампенсуецца разгорнутым паказам душэўнага стану галоўнага героя, што робіць аповесць унутрана дынамічнай, прымушае чытача сачыць за духоўным развіццём персанажа, яго атачэннем. Падзеі, апісаныя ў першай частцы, адбываюцца прыкладна ў 1902—1904 гадах.



Правообладатель Национальный институт образования



*А. Дзямарын.* Ілюстрацыя да трылогіі Якуба Коласа «На ростанях» (1968)

**У другой частцы трылогіі — аповесці «У глыбі Палесся»** — Андрэй Лабановіч уключаецца ў грамадскае жыццё, прымае ўдзел у сялянскіх хваляваннях, узаемадзейнічае з падпольнай рэвалюцыйнай арганізацыяй у Пінску. Дзеянне гэтай часткі адбываецца ў 1904—1905 гадах.

У **трэцяй кнізе** трылогіі аўтар знаёміць чытача з нелегальным настаўніцкім з'ездам, роллю ў ім Андрэя Лабановіча, раскрывае рэакцыю ўлад на гэта мерапрыемства. Вынікамі такой актыўнасці Андрэя Лабановіча робяцца страта працы, жыццё на радзіме і ў Вільні, зварот да літаратурнай дзейнасці, суд і турма.

Трылогія «На ростанях» — аўтабіяграфічны твор, што падкрэсліваў і сам Якуб Колас. Вопыт работы пісьменніка ў школах на Палессі, яго грамадска-палітычная і культурная дзейнасць у 1900-х гадах, суд і зняволенне — усё гэта паслужыла матэрыялам, які быў творча выкарыстаны аўтарам.

> **!** Падчас напісання мастацкага твора адбываецца непазбежная «перапрацоўка», перастварэнне прататыпа, таму яго не варта цалкам атаясамліваць з літаратурным персанажам. У аднаго персанажа можа быць некалькі прататыпаў.

**Аповесць «У палескай глушы».** Многія героі гэтага твора, як і Андрэй Лабановіч, маюць сваіх прататыпаў, што зноў жа падкрэслівае рэальную аснову тэксту. Напрыклад, прататып Андрэя Лабановіча — сам Якуб Колас, прататып Ядвісі — Ядвіга Баранцэвіч (у шлюбе Бахенская), Саханюка — Уладзімір Дылеўскі, Турсевіча — Аляксандр Фурсевіч і г. д. Пры гэтым імёны і прозвішчы некаторых персанажаў зменены, а некаторых — не (напрыклад, бабка Мар'я). Узгадваюцца ў творы таксама рэальныя тапонімы і мікратапонімы[1] Сяльцо, Целяшоў дуб, Завітанкі, Ганцавічы і інш.

> ***Прататып*** — асоба, якая рэальна існавала і паслужыла аўтару правобразам (мадэллю) для стварэння літаратурнага персанажа.

[1] *Тапо́нім* — назва пэўнага геаграфічнага аб'екта (вёскі, горада, ракі, гары); *мікратапо́нім* — від тапоніма, які называе мясцовы аб'ект унутры тапоніма (балота, луг, возера, ставок, паша).



Правообладатель Национальный институт образования

Назва вёскі Цельшына перагукваецца з Люсіна, дзе настаўнічаў Якуб Колас. Некаторыя прозвішчы, дадзеныя персанажам, таксама характэрныя для адпаведных палескіх мясцін (Круглы, Нырка і інш.).

Пісьменнік стварыў **вобраз Андрэя Лабановіча** — беларускага інтэлігента, шукальніка ісціны і сэнсу жыцця. Малады настаўнік паходзіў з сялян і ў той жа час па сваім сацыяльным статусе належаў да інтэлігенцыі. Лабановіч, які імкнуўся вывучаць жыццё палешукоў, — асоба неабыякавая. Невыпадкова галоўнага героя хвалюе, для чаго чалавек жыве на Зямлі. З гэтым пытаннем настаўнік звяртаецца да розных персанажаў і збірае іх адказы. Бабка Мар'я выказваецца так: «Не, панічок, не ведаю! Каб вы запыталіся ў дрэва, чаму яно расце, дык хіба ж бы яно вам адказала? Так і я не магу адказаць вам. Жывем, покі жывецца, бо жывы ў зямлю не палезеш, а прыйдзе смерць, тады пахаваюць». Гэтыя словы паказваюць пазіцыю чалавека, цесна звязанага з прыродай. Іншы падыход прапаноўвае Турсевіч, таксама педагог: «Чалавек жыве дзеля дабра, для служэння праўдзе, каб ствараць нейкія вартасці жыцця і каб быць карысным для іншых». Андрэй Лабановіч мае і сваё меркаванне на гэты конт.



Ядвіга Бахенская з мужам Канстанцінам (1906)

Згаданы герой працуе сумленна, старанна, імкнецца па-сапраўднаму адукаваць давераных яму вучняў. Гэта відаць і падчас іспытаў. Аўтарам паказана, як па-рознаму вучні падрыхтаваны да экзамену. Найперш на свае веды і ўменні абапіраюцца прадстаўнікі Лабановічавай школы, але побач з імі знаходзяцца і іншыя, некаторыя з якіх чакаюць падказкі ад сваіх настаўнікаў, што нават выліваецца ў махлярства.

Апісанні, а таксама дыялогі і паводзіны галоўнага героя дапамагаюць убачыць яго вобраз цэласна. Андрэй Лабановіч паглыблены ў сябе, змагаецца з сумненнямі. Якуб Колас неаднаразова засяроджвае ўвагу чытача на думках настаўніка: «Перад ім (Лабановічам. — *Аўт.*)



*Я. Кругер.* Партрэт Якуба Коласа (1923)



Правообладатель Национальный институт образования

устаў вобраз панны Ядвісі. “Не, брат: не ведаеш ты, чым мне мілая гэтая глуш, ды я табе пра гэта не скажу”, — думаў Лабановіч». Гэта дазваляе аўтару выявіць тую напружаную барацьбу, якая ішла ў сэрцы галоўнага героя. Мы не можам назваць цельшынскага настаўніка і выключна ўзорным, бо ён не змог абмінуць некаторых спакус жыцця. Такая акалічнасць, з аднаго боку, выяўляе Андрэя Лабановіча жывым, а з другога — гаворыць пра складанасці, якія выпадаюць на долю маладога чалавека і якія не заўсёды лёгка бывае пераадолець.

Востра стаіць у творы пытанне ўзаемаадносін **народа** і **інтэлігенцыі**. Сяляне прытрымліваюцца старых звычаяў і забабонаў, пры гэтым выяўляецца іх мудрасць, маральнасць. Інтэлігенцыя ж, якая, здавалася, павінна фарміраваць пэўныя ідэалы, паказвае сябе не заўсёды з лепшага боку. Напрыклад, Саханюк хоча забраць ссыпку[1], якая, паводле дакументаў, належыць яму, але фактычна і згодна з логікай прызначана Лабановічу.

Таксама нельга сказаць, што мясцовае кіраўніцтва добра ставіцца да сялянства. У гэтай сітуацыі неадназначнай выглядае пазіцыя айца Кірыла, які негатыўна выказваецца пра сялян і ў той жа час стараецца ім дапамагаць, шкадуе іх. Аднак памкненні маладога настаўніка палепшыць становішча палешукоў у апаведнасці са сваімі ўяўленнямі пра дабро і зло не заўсёды даюць запланаваны вынік. Калі Лабановіч спрабуе спыніць бойку двух мужыкоў і разабрацца з іх сваркай «цывілізавана», усё завяршаецца паражэннем. Канфлікт не толькі не ліквідуецца, але зноў выбухае з яшчэ большай сілай і мае горшыя, чым звычайна, наступствы.

У творы неаднаразова гучыць слова «глуш», якое адлюстравана нават у назве аповесці. Пры гэтым размова ідзе не толькі пра глуш знешнюю (правінцыяльны край), але і пра глуш у пераносным значэнні (духоўную).

Якуб Колас стварыў у аповесці і цікавыя **жаночыя вобразы**. Сялянскую мудрасць, падмацаваную цяжкім жыццёвым вопытам, увасабляе бабка Мар’я. Яна стараецца дапамагчы настаўніку, падказаць яму лепшы спосаб выхаду з сітуацыі. Бабка Мар’я мае і пэўны аўтарытэт у вяскоўцаў: яна ўмее шаптаць.

Не пакідае абыякавым Андрэя Лабановіча старэйшая дачка пана падлоўчага Ядвіся, якую аўтар апісвае наступным чынам: «Габрыня

---

[1] *Ссы́пка* — тут: сродкі, сабраныя цельшынцамі на ўтрыманне настаўніка.



Правообладатель Национальный институт образования

зараз жа выйшла і хутка вярнулася з сястрой, стройнаю чарняваю дзяўчынаю, гадоў шаснаццаці, з тонкімі, прыгожа абрысаванымі брывамі. Выраз яе цёмных акруглых вачэй часта змяняўся: то ў іх іскрыўся вясёлы смех і нахіл да жартлівасці, то адбівалася нейкае засмучэнне і тая сталасць, што рабіла ўражанне, быццам дзяўчына многа перадумала і перажыла».

Сапраўды, лёс Ядвісі быў не самы просты. Яе бацька быў жорсткім чалавекам, яна страціла маці. Узаемаадносіны Ядвісі і Лабановіча выглядаюць даволі рамантычна, але ў выніку маладыя людзі не звязваюць свае лёсы.

Таксама выклікалі цікавасць у маладога настаўніка завітанкаўская прыгажуня панна Людміла і спакойная сталая панна Марына. Але для героя Ядвіся застаецца «найпрыгажэйшай кветкай Палесся». Пачуцці да яе — адна з прычын, што падштурхоўваюць Андрэя Лабановіча з'ехаць з Цельшына.

**Майстэрства Коласа-празаіка.** Важную ролю ў аповесці адыгрывае і прырода, якая не толькі ўзрушвае сэрца, перадае душэўны стан персанажаў, але і стымулюе да разваг: «Ад балот патыхала нейкім невыразным смуткам, ціхім жалем веяла ад аднатонных малюнкаў палескіх куткоў, дзе ўсё ж такі жыццё стварала своеасаблівыя формы і, нягледзячы на ўбоства, мела сваю павабнасць і хараство, свой твар, поўны тужлівага задумення. Але гэтыя малюнкі тамілі вочы і засмучалі сэрца, і чалавек мімаволі стараўся знайсці нешта такое, на чым можна было б адпачыць і заспакоіцца.

Пазіраючы на гэтыя балоты-пустэлі, Лабановіч часамі пачуваў у сэрцы нейкую адарванасць ад жыцця і свету, як бы гэты свет сышоўся тут клінам, і туга па тым, з чым ён разлучыўся, пачынала забіраць яго душу».

Таксама Якуб Колас імкнуўся адлюстраваць так званы «палескі каларыт»: сюды можна аднесці і адпаведныя краявіды, і звычаі, і ўклад жыцця.

Такім чынам, у аповесці «У палескай глушы» пісьменнік паказвае псіхалагічны стан персанажаў. Гэтаму спрыяюць і багатая мова, характэрная для твора Якуба Коласа, і мастацкая



Прырода Палесся



Правообладатель Национальный институт образования

дэталізацыя. Аповесць распавядае не толькі пра акалічнасці жыцця на Палессі пачатку XX стагоддзя, адпаведны перыяд гісторыі Беларусі, асаблівасці настаўніцкай прафесіі, але і пра сталенне маладога чалавека, які паўстае перад выбарам — не заўсёды простым і часта праблематычным. Верагодна, і па гэтай прычыне жыццёвы і духоўны шлях Андрэя Лабановіча застаецца актуальным для розных пакаленняў чытачоў.

> **Літаратурныя сувязі.** Якуб Колас пакінуў багатую эпісталярную спадчыну, якая расказвае шмат цікавага пра самога аўтара, адпаведны гістарычны перыяд, узаемаадносіны ў тагачасным літаратурным асяроддзі. Пісьменнік перапісваўся з Янкам Купалам, Максімам Лужаніным, Петрусём Броўкам, Сяргеем Гарадзецкім, Міхасём Лыньковым і многімі іншымі. У некаторых пісьмах Якуба Коласа гаворыцца і пра яго творы, напрыклад: «Лабановіч — мой двайнік. Выдуманага ў яго паводзінах і характары нічога няма». Альбо: «...я стараўся абудзіць у сваіх вучнях крытычныя адносіны да рэчаіснасці» *(З ліста Якуба Коласа да Ф. М. Логаша).*

1. Раскажыце пра гісторыю стварэння трылогіі «На ростанях».
2. Якія праблемы ўзнімаюцца ў аповесці «У палескай глушы»?
3. Якім вы ўяўляеце галоўнага героя аповесці? У адказе выкарыстайце цытаты з твора.
4. Што чытаў Андрэй Лабановіч? З кім сябраваў? Як гэта яго характарызуе?
5. Андрэя Лабановіча асабліва хвалявала адно філасофскае пытанне. Якое? Ці згодны вы з меркаваннем героя па гэтым пытанні? Як бы вы на яго адказалі?
6. Раскажыце пра гісторыю ўзаемаадносін Ядвісі і Лабановіча. Ці кахалі яны адно аднаго?
7. Ці магла б Ядвіся перашкодзіць здзяйсненню мар Лабановіча?
8. Як паводзіў сябе Андрэй Лабановіч з іншымі дзяўчатамі? Як гэта характарызуе героя?
9. Паразважайце, якім чынам праяўляе сябе Лабановіч як чалавек і як настаўнік. Які чалавек, на вашу думку, можа стаць добрым настаўнікам? Ці валодае Лабановіч такімі якасцямі?
10. Як здавалі экзамен вучні Андрэя Лабановіча? Як паказваецца галоўны герой у параўнанні з калегамі?
11. Якой прадстаўлена інтэлігенцыя ў творы? Якімі праблемамі яна жыве?



Правообладатель Национальный институт образования

**12.** Як Андрэй Лабановіч ставіўся да культурнай спадчыны палешукоў, іх побыту, забабонаў?

**13.** Героі аповесці неаднаразова кажуць пра «глуш». Што ўкладае ў гэта паняцце аўтар? Паразважайце, наколькі небяспечная «глуш» для чалавека.

**14.** Якуб Колас падкрэсліваў аўтабіяграфічнасць вобраза Андрэя Лабановіча. Наколькі апраўдана ставіць знак роўнасці паміж Якубам Коласам і Андрэем Лабановічам? Разгледзьце палатно работы Якава Кругера. Ці можа гэты партрэт служыць ілюстрацыяй да аповесці «У палескай глушы»? Чаму?

**15.** Уявіце, што Андрэй Лабановіч завёў блог. Якім падзеям, думкам, перажываннем былі б прысвечаны публікацыі ў ім? Ад імя Андрэя Лабановіча напішыце з нагоды яго ад'езду з Цельшына невялікі пост, які раскрываў бы ўнутраны стан персанажа.

**16.** Даследуйце майстэрства Якуба Коласа як празаіка. Знайдзіце ў творы прыклады: 1) псіхалагізму; 2) багацця мовы; 3) мастацкай дэталізацыі.

**17.** Раскрыйце ролю апісанняў прыроды ў творы.

**18.** У друкарні падрыхтавалі праект вокладкі календара, прысвечанага творчасці Якуба Коласа. Уявіце, што вы адказны за выпуск. Ці дапусцілі б вы дадзеную вокладку да друку? Знайдзіце памылкі і выпраўце іх (звяртайце ўвагу на фотаздымак, змест, арфаграфію, дарэчнасць ужывання знакаў прыпынку).




Паэма «Сымон-музыка»



Правообладатель Национальный институт образования

# *Максім Багдановіч*

(1891—1917)

**1.** Якія творы Максіма Багдановіча вы чыталі і вывучалі раней? **2.** Узгадайце сімвалы, выкарыстаныя паэтам у творах.

Як паэт Максім Багдановіч быў заўважаны не адразу. Ён некалькі разоў дасылаў сшыткі сваіх вершаў у рэдакцыю газеты «Наша ніва», але рэдактар Аляксандр Уласаў адпраўляў іх у архіў. Выпадкова творы прачытаў таленавіты крытык Сяргей Палуян, які стаў шчыра бараніць вершы Максіма Багдановіча.



Максім Багдановіч — адна з самых цікавых і загадкавых асоб у гісторыі беларускай літаратуры. Ён быў з тых першаадкрывальнікаў, хто фарміраваў напрамкі развіцця літаратурнага працэсу пачатку XX стагоддзя і моцна паўплываў на далейшае развіццё прыгожага пісьменства Беларусі, хоць з дваццаці пяці гадоў свайго жыцця ён толькі пяць пражыў на Радзіме.

Нарадзіўся Максім 9 снежня 1891 года ў Мінску. У гэты час бацька будучага паэта працаваў загадчыкам і настаўнікам Мінскага гарадскога пачатковага вучылішча. У кватэры пры вучылішчы і нарадзіўся Максім (цяпер гэта вуліца Багдановіча, 25). Пазней сям'я пераехала ў Гродна ў вялікі драўляны дом. Сёння там размяшчаецца Музей Максіма Багдановіча, які ўваходзіць у комплекс Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея.



Музей Максіма Багдановіча ў Гродне

Калі хлопчыку было пяць гадоў, памерла яго маці — Марыя Апанасаўна. Бацька Адам Ягоравіч вельмі балюча перажываў гэту трагедыю. Для догляду за дзецьмі ён запрасіў



Правообладатель Национальный институт образования

з Адэсы сваю малодшую сястру Марылю і пераехаў з сям'ёй у Ніжні Ноўгарад, а потым — у Яраслаўль.

> **!** **З успамінаў.** Адам Ягоравіч Багдановіч, бацька паэта, пісаў пра Максіма: «Па складзе свайго характару, мяккага і жаночага, па весялосці свайго нораву, жывасці, спагадлівасці і ўражлівасці, па паўнаце і мяккасці назіранняў, па сіле ўяўлення, пластычнасці і разам маляўнічасці прадуктаў яго творчасці ён усё больш нагадваў сваю маці, асабліва ў дзяцінстве. <...> Яго паэтычны талент ёсць дарэнне яго маці, у ёй самой драмаўшае ў неразвітым стане».

Максім вучыўся ў Ніжагародскай мужчынскай гімназіі, а таксама ў Яраслаўлі — у гімназіі, Дзямідаўскім юрыдычным ліцэі. Яшчэ падчас вучобы ў Ніжнім Ноўгарадзе захапіўся вершаскладаннем і вывучэннем беларускай культуры. У 1906 годзе хросная маці Вольга Сёмава выпісала яму беларускія газеты: спачатку — «Нашу долю», а пазней — «Нашу ніву». А ўжо ў 1907 годзе ў «Нашай ніве» з'явілася алегарычнае апавяданне Максіма Багдановіча «Музыка», пазней — вершы «Над возерам», «Вадзянік», «Лясун», «Возера». Друкаваліся яго творы і ў газеце «Голас», а таксама ў іншых выданнях.

> **!** **З успамінаў.** Калега Багдановіча па Яраслаўскай гімназіі Дзіядор Дзябольскі згадваў дзіўную асаблівасць памяці Максіма Багдановіча: ён мог імгненна завучваць на памяць і прозу, і паэзію, але яму цяжка давалася вывучэнне замежных моў (зрэшты, гэта спрыяла сяброўству з дасведчанымі ў мовах паненкамі Какуевымі).

Пасля заканчэння ліцэя ў 1916 годзе Максім перабраўся ў Мінск. У гэты час ён быў ужо цяжка хворы на сухоты, але ўладкаваўся працаваць сакратаром губернскай харчовай камісіі. У вольны час выязджаў у прытулкі для дзяцей бежанцаў, працаваў у бібліятэцы, наведваў вечарыны «Беларускай хаткі». У лютым 1917 года на грошы сяброў паехаў лячыцца ў Ялту, але гэта не дапамагло.

Ноччу 25 мая 1917 года ў поўнай адзіноце Максім Багдановіч памёр. На пахаванні не прысутнічаў ніхто з родзічаў, бо Максім не жадаў нікога турбаваць сваімі праблемамі і не пакінуў адраса, дзе жыў у Ялце. У 1924 годзе беларускія паэты Уладзімір Дубоўка, Анатоль Вольны (Ажгірэй), Андрэй Александровіч адшукалі магілу паэта, пазней на ёй быў устаноўлены помнік.



Правообладатель Национальный институт образования

**Уклад у развіццё літаратуры**

1. Максім Багдановіч — адзін з пачынальнікаў філасофскай лірыкі ў гісторыі беларускай літаратуры.

2. Увёў у беларускую жанравую сістэму класічныя формы (трыялет, рандо, санет і інш.), якія вельмі арганічна ўпісаліся ў нацыянальную літаратуру.

3. Адкрыў у беларускай паэзіі новыя тэмы, матывы, вобразы, напрыклад тэму горада.

4. Праз пераклады твораў рускай, украінскай, французскай, нямецкай і іншых літаратур даў магчымасць беларускаму чытачу пазнаёміцца з сусветнай класікай. Багдановіч вельмі любіў паэзію Верлена, выдатна перакладаў яе і сам ствараў мастацкія тэксты, блізкія эстэтыцы імпрэсіянізму.

5. Быў адным з пачынальнікаў беларускай прозы. Аўтар такіх эпічных твораў, як «Апокрыф», «Апавяданне аб іконніку і залатару» і інш.

6. Адзін з пачынальнікаў прафесійнай літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства. Яго літаратурна-крытычныя працы «Глыбы і слаі», «Забыты шлях», «Кароткая гісторыя беларускай пісьменнасці да XVI сталецця», «За тры гады» і іншыя дагэтуль з'яўляюцца неацэннай крыніцай для даследчыкаў беларускай літаратуры.

1. Успомніце характарыстыкі летапіснага жанру. Карыстаючыся даведнікамі, энцыклапедыямі, інтэрнэт-рэсурсамі (тэкстамі і відэаматэрыяламі), складзіце летапіс жыцця Максіма Багдановіча. Змясціце ў ім тлумачэнні назваў, прадметаў, рэалій пачатку XX стагоддзя, якія могуць быць невядомыя вучням у XXI стагоддзі.
2. Як ушаноўваецца памяць Максіма Багдановіча? Як яго вобраз увасоблены ў творах мастацтва?

## Паэзія Максіма Багдановіча

Адзіным прыжыццёвым зборнікам вершаў Максіма Багдановіча быў «Вянок» (1913), што з'явіўся ў выдавецтве Марціна Кухты. Першапачатковая назва — «Кніжка выбраных вершаў». Назва «Вянок» і прысвячэнне Сяргею Палуяну прапанавана Вацлавам Ластоўскім, калі зборнік быў ужо ў друку. Загалоўкам аўтар быў задаволены.

Па сутнасці «Вянок» — філасофская кніга, у якой узнаўляюцца факты стварэння культурнай спадчыны Беларусі («Летапісец», «Пера-



Правообладатель Национальный институт образования

пісчык»), увасоблены вобраз горада (цыкл «Места»), згадваюцца міфы і старыя паданні (цыкл «У зачарованым царстве»), асэнсоўваюцца праблемы жыцця і смерці («Жывеш не вечна, чалавек...», «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...») і інш.



Тытульная старонка зборніка «Вянок» Максіма Багдановіча з дарчым надпісам Нюце Гапановіч (1913)

Адной з асноўных праблем, якія асэнсоўваў Максім Багдановіч, была праблема прызначэння мастака і мастацтва, паэта і паэзіі. У напісаным яшчэ ў Яраслаўлі вершы **«Песняру»** (1910) сфармулявана творчае крэда паэта: паэзія павінна быць «як звон», каб дайсці да душы кожнага чалавека, а паэт павінен «з сталі каваць, гартаваць гібкі верш», абрабляць і ўдасканальваць свой твор, каб «слабы верш» не разбіўся аб цвёрдыя сэрцы. Лірычны герой звяртаецца да тых, хто робіць першыя спробы ў творчасці («брат малады»), каб не забывалі, што гэта вялікая праца, бо недасканалы верш не зможа крануць зачарсцвелага чытача, няздатнага да ўспрымання прыгажосці.

! Нюта Гапановіч — муза юнага Максіма. Дзяўчына была абаяльная, дасціпная, вельмі адораная ў галіне матэматыкі. Прыхільнікі-гімназісты кідалі ёй у фортку букеты. Вучылася ў Маскве, дзе пазнаёмілася з малодшым братам Максіма Львом Багдановічам, які падчас Першай сусветнай вайны вазіў з сабой запіскі ад Нюты з просьбамі знайсці кніжку па матэматыцы, дапамагчы рашыць складанае ўраўненне. Максім прысвяціў Нюце Гапановіч аўтарскія пераклады «Зеленя» *(Паводле архіўных матэрыялаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі).*



Паэт не абмяжоўваўся дэкларацыямі і заклікамі. Сам чытаў шмат твораў сусветнай літаратуры, актыўна вывучаў гісторыю. Бачыў сваё прызначэнне ва ўзбагачэнні тэматыкі беларускай літаратуры і засваенні новых форм. Пры гэтым еўрапейскія літаратурныя традыцыі асэнсоўваліся ім у адпаведнасці з прынцыпам: «Прыгожае — вышэй за ўсё». Паэт імкнуўся праз пераклады сусветнай класікі (вершы



Правообладатель Национальный институт образования

Фрыдрыха Шылера, Генрыха Гейнэ, Поля Верлена, Аляксандра Пушкіна і інш.) спасцігнуць чароўны свет паэзіі і данесці яго да беларусаў. Менавіта з лёгкай рукі Максіма Багдановіча на беларускай мове вельмі арганічна загучалі трыялеты, тэрцыны, рандо, пентаметры, гекзаметры і інш.

Паэт лічыў дасканаласцю гармонію формы і зместу. Багдановіча часта называлі паэтам «чыстае красы», бо ў творчасці ён вітаў культ прыгажосці. Змітрок Бядуля ў артыкуле «Натхненне і гармонія» адзначаў: «За кароткі час сваёй творчасці ён (Багдановіч. — *Аўт.*) выведаў тайну гармоніі, вывучыў карты роднай красы і вянкамі вясновых паэтычных кветак аздобіў ніву беларускага адраджэння». Разуменне асветніцкай місіі твораў Максіма Багдановіча прыйшло не адразу. Яго пачатковыя тэксты першы рэдактар «Нашай нівы» Аляксандр Уласаў і Ядвігін Ш. называлі «дэкадэнтшчынай». Толькі з цягам часу прыйшло разуменне, што «чыстая краса» Максіма Багдановіча добра ўкладаецца ў місію асветы і адраджэння нацыянальнай самабытнасці.

Дастаткова часта крыніцай натхнення і ўзорам прыгажосці для Максіма Багдановіча станавілася далёкае мінулае Беларусі («Летапісец», «Перапісчык», «Кніга», «Безнадзейнасць», «Слуцкія ткачыхі»).

Верш **«Кніга»** (1912) быў напісаны пад уражаннем наведвання музея ў Вільні. У гэтым творы пададзены вобраз кнігі — Псалтыра, «пакрытага няжорсткай бурай кожай». Максім Багдановіч прэзентуе свайму чытачу даўнюю кнігу як адну з найвялікшых матэрыяльных і нематэрыяльных каштоўнасцей роднай зямлі. Лірычны герой імкнецца спазнаць не толькі знешнюю прыгажосць кнігі, яе афармленне («перачытаў радкі кірыліцы прыгожай»), пах («і воску з ладанам прыемны пах пачуў»), але і спасцігнуць унутраную прыгажосць «псальмы слічнай», якая пераносіць у чароўны свет слоў. Ён лічыць, што менавіта гэта магія здольна даць радасць душы.

У вершы выяўляецца важны кампанент эстэтычнай сістэмы Максіма Багдановіча: магчымасць узвышэння чалавека праз пазнанне прыгожага і высокага («Як радасна далей спяшыць душа мая!»). Толькі гармонія знешняга і ўнутранага можа зрушыць глыбіні чалавечай душы. Важнасць маральных і эстэтычных каштоўнасцей падкрэсліваецца, калі лірычны герой згадвае, што кніга, якую ён трымае, «спісана» дзякам Гапонам «дзеля душы».



Правообладатель Национальный институт образования

> ***Акцэнтны верш*** — від рыфмаванага танічнага верша, заснаваны на роўнай колькасці націскаў (акцэнтаў) у радку.

Увага да дэталей (падрабязнае апісанне кнігі, указанне на перапісчыка, час і месца стварэння) дае адчуванне рэальнасці таго, што апісана. Акцэнтны верш перадае своеасаблівы ўнутраны маналог лірычнага героя і мае ўрачыста-ўсхваляваны характар.

> **!** **Публіцысты гавораць.** «Багдановіч — паэт паўтонаў. Свае фарбы ён бярэ з пабляклых старадаўных тканін, з малюнкаў святых кніг, пісаных многа сот лет таму назад на пергаменце, з засохшых красак родных палёў» *(Антон Навіна (Антон Луцкевіч). «Максім Багдановіч (у дзясятыя ўгодкі смерці яго)»).*

Яшчэ адзін вобраз манаха-перапісчыка паўстае ў вершы **«Летапісец»** (1912). Гэты твор, які адкрывае цыкл «Старая Беларусь» у зборніку «Вянок», напісаны пад уражаннем наведвання Радзімы ў 1911 годзе. Верш уяўляе сабой маналог чалавека, які на працягу ўжо двух гадоў не толькі капіруе летапіс «з даўнейшых граматак пра долю Магілёва», але і дадае тое, што бачыў:

...Так рупная пчала
Умее ў соты мёд зыбраць і з горкіх кветак,
І бачанаму мной — я годны веры сведак.
Хай тыя ведаюць, што з'явяцца па нас,
Ўсю праўду пра жыццё у наш і пройшлы час.

Гэта робіцца, каб зафіксаваць для нашчадкаў найбольш важныя факты, «што думалі, чаго жадалі мы тады, // За што змагаліся, як баранілі веру». У гэтым выпадку можна правесці паралелі паміж аўтарам і яго лірычным героем. Максім Багдановіч быў у нейкай ступені летапісцам сваёй эпохі і свайго краю: карпатліва фіксаваў гісторыю, імкнучыся захаваць для будучага не толькі падзеі, але і тыя пачуцці, якія перажываў сам і якія ахоплівалі яго сучаснікаў. Менавіта праз гэтыя нябачныя ніці чалавек мусіць адчуваць еднасць пакаленняў, сваю сувязь з мінулым.



*М. Антакольскі.* Летапісец (1889)



Правообладатель Национальный институт образования

Асноўны ў вершы матыў гістарычнай памяці, які выразна выявіўся ў жаданнях лірычнага героя («Хай зведаюць усё патомкі праз паперу!») і яго перакананнях («І людзі зведаюць аб прадзедах сваіх, // Аб горы, радасцях і аб прыгодах іх...»). Максім Багдановіч сцвярджаў, што любыя змены ў будучым, адраджэнне немагчымы без ведання мінулага: «Вы, літары, цяпер нанова ўсё збудзілі!»

***Александрыйскі верш*** — верш з радкамі, папарна аб'яднанымі мужчынскімі і жаночымі рыфмамі, напісаны шасцістопным ямбам з цэзурай (паўзай) пасля трэцяй стапы. Назву такі верш атрымаў ад папулярнага ў XII стагоддзі «Рамана пра Аляксандра Македонскага».

«Летапісец» напісаны александрыйскім вершам з мэтай стылізацыі пад старажытны дакумент і стварэння ў чытача эфекту прысутнасці. Атмасфера Сярэдневякоўя перадаецца і праз эпіграф з верша Янкі Купалы «З мінуўшых дзён».

! **Навукоўцы гавораць.** Даследчыца Вольга Шынкарэнка слушна заўважала: «Значнасць для нашчадкаў працы летапісца падкрэсліваецца шырокім эпічным гучаннем, шматлікімі адухаўленнямі, градацыямі, анафарамі, пададзенымі ў форме паралелізмаў, разгорнутых параўнанняў і інш.».

Узорам грамадзянскай і філасофскай лірыкі Максіма Багдановіча з'яўляецца верш **«Мяжы»** (1914). Здаецца, што гэта апісанне меж, якія зрабілі адных жабракамі, а іншых — багатымі; меж, якія прымусілі чалавека баяцца і бясконца працаваць на іншых. Тут сапраўды створана бязрадасная карціна сацыяльнай няроўнасці, якая распаўсюдзілася на «ўвесь абшар зямлі», і вайны («Шнуры штыкоў па ўсёй зямлі // Гараць, як дзікае хаценне»). Верш быў напісаны ў год пачатку Першай сусветнай вайны, і, безумоўна, гэта падзея адбілася на светаадчуванні паэта, які цяжка перажываў за беларусаў, што аднымі з першых адчулі на сабе жахі вайны.

Разам з тым, як слушна заўважае Алесь Макарэвіч, у гэтым вершы «Максім Багдановіч звяртае ўвагу на філасофскі аспект праблемы "жыццё чалавека і межы ў душы гэтага чалавека, у яго існаванні". Паэт вызначае, што "вольныя прасторы святой зямлі" чалавек раздзяліў межамі дзеля таго, каб самому схавацца ў гэтых межах, ірвах, тынах; ён баіцца прастору, яму хочацца схавацца ў нары, але там ён становіцца "зласлівым, бессардэчным, хцівым, такім здрадлівым"».



Правообладатель Национальный институт образования

У фінале верша «Мяжы» выразна адчуваецца зварот да ўнутранага свету асобы:

Так многа ёсць паўсюль багацтва і красы,
А людзі нішчацца у голадзе, у зморы
Ад беднаты, ад цемнаты,
Бо скрозь — мяжы, бо скрозь — платы.

У творы вобраз мяжы таксама ўвасабляе разбуральнае імкненне чалавека адмежавацца ад праблем, нежаданне іх вырашаць. Межам супрацьпастаўлена вольная прыродная стыхія:

Нязмерны вольныя прасторы
Святой зямлі, — а чалавек
Мяжы, ірвы, тыны рабіў за векам век,
Хаваўся ў іх, як ліс у норы,
І жыў пужлівы сам — адзін,
Дрыжачы, як лісцё асін...

Тут можна правесці паралелі з вершам Максіма Багдановіча «Народ, Беларускі Народ!..», дзе паэт заклікае чытача зразумець, адчуць сэрцам прыніжэнне і цемнату народа, які «не пушчалі з ярма», чыю душу «абакралі, — // У ёй нават мовы няма», таму абрабаваны беларус зрабіўся «сляпы, быццам крот».

Сама форма верша «Мяжы» (няроўныя абрывістыя радкі, неўпарадкаваная рыфмоўка) знешне нагадвае рваныя межы «абшару зямлі» і перадае ўнутраную дысгармонію лірычнага героя. Чытач мусіць увесь час як бы пераадольваць перашкоды, праз нешта пераступаць.

Максім Багдановіч паказваў вынікі ўнутранага і знешняга бязладдзя, неўладкаванасці і дэгуманізацыі свету, але пры гэтым быў упэўнены, што няма і не будзе альтэрнатывы жыццю.

Верш **«Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...»** — узор позняй лірыкі Максіма Багдановіча, напісаны ў 1915 годзе пад уражаннем ад навін з палёў Першай сусветнай вайны. Твор уяўляе сабой лірычную мініяцюру, у якой выявіўся талент паэта спалучаць жыццёвае з высокім, уменне бачыць чалавека як зямную і касмічную істоту. Беларускі літаратуразнавец Уладзімір Гніламедаў адзначаў: «Гэта своеасаблівы эталон Багдановічавай чалавечнасці, адбітак яго погляду на свет. Верш красамоўна сведчыць пра душэўную шырыню аўтара, яго адкрытасць, здольнасць на эмацыянальны водгалас, на суперажыванне».



Правообладатель Национальный институт образования

Па форме «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...» — верш — маналог лірычнага героя, які разгортваецца як своеасаблівая філасофская канцэпцыя:

Хто мы такія?
Толькі падарожныя, — папутнікі сярод нябёс.
Нашто ж на зямлі
Сваркі і звадкі, боль і горыч,
Калі ўсе мы разам ляцім
Да зор?



Сузор'е Геркулес. Ілюстрацыя з часопіса «Как и почему»

У гэтым фінальным пытанні адначасова падкрэсліваецца, што ў палёце да зор — перад вечнасцю — чалавек мусіць пазбавіцца ад зла, зберагчы сябе і іншых ад болю і горычы.

! Сузор'е Геркулес можна назіраць над Беларуссю ў ліпені.

Гэты свабодны верш (верлібр) амаль пазбаўлены слоўных упрыгожванняў. Знешняя фармальная прастата твора падкрэслівае глыбіню думкі пра сэнс чалавечага існавання. У чарнавых запісах Максіма Багдановіча захаваўся аўтограф з працягам, але, хутчэй за ўсё, аўтар сам адкінуў лішняе, каб сканцэнтраваць увагу чытача на галоўным.

Максім Багдановіч пражыў кароткае, але поўнае незвычайных адкрыццяў жыццё. Яго творчасць трывала ўвайшла ў гісторыю беларускай літаратуры. Кранальныя творы Максіма Багдановіча дагэтуль з цікавасцю чытаюць не толькі ў Беларусі. Ён даўно ўжо выйшаў за межы нацыянальнай літаратуры і ператварыўся ў зорку сусветнай велічыні.

Творчасць мастака слова стала крыніцай натхнення такіх кампазітараў, як Мікалай Аладаў, Анатоль Багатыроў, Уладзімір Мулявін, Ігар Палівода, Аляксей Туранкоў, Эдзі Тырманд. Увасобілі вобраз Максіма Багдановіча скульптары Леў Гумілеўскі і Валяр'ян Янушкевіч, мастакі Іван Рэй, Валянцін Волкаў, Янка Раманоўскі, Монас Манасзон.



Правообладатель Национальный институт образования

**Літаратурныя сувязі.** Верш Максіма Багдановіча «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...» паводле філасофскай заглыбленасці і разважлівасці набліжаны да яго ж твора «Жывеш не вечна, чалавек», вершаў Алеся Гаруна «Ідуць гады», Анатоля Вярцінскага «Жыццё даецца, каб жыццё тварыць...», Максіма Танка «Шчасце».

Плённа працягваюцца традыцыі паэта ў асваенні новых жанравых форм. Напрыклад, у сучаснай літаратуры майстрам верлібра прызнаны Максім Танк («Ты яшчэ толькі намёк на чалавека...»), у гэтым жанры напісаны таксама творы Пімена Панчанкі, Анатоля Вярцінскага, Янкі Сіпакова, Алеся Разанава.

1. Назавіце эмоцыі, адчуванні, якія пакінулі вершы Максіма Багдановіча. У якой ступені гэтыя перажыванні звязаны з тэкстам, а ў якой — з вашым жыццёвым вопытам? Ці можна сказаць, што паэзія абуджае пачуцці?
2. Якія тэмы закранаў у паэзіі Максім Багдановіч? Як вы думаеце, чаму менавіта іх?
3. Што азначае паняцце «паэзія “чыстае красы”»? Якія ў яе мэты — сацыяльныя або эстэтычныя?
4. Раскажыце пра погляды Максіма Багдановіча на прызначэнне паэта ў грамадстве.
5. Ці падобныя паміж сабой лірычныя героі з вершаў паэта? Адказ падмацуйце прыкладамі.
6. У чым, на ваш погляд, праяўляецца агульначалавечае і нацыянальнае ў творчасці Максіма Багдановіча?
7. У іншай рэдакцыі верша «Летапісец» паэт вядзе аповед не ад першай асобы. Паразважайце, чаму аўтар змяніў асобу лірычнага героя на «я».
8. Верш «Мяжы» ўпершыню быў надрукаваны ў 1915 годзе ў газеце «Наша ніва». Даследчыкі творчасці Максіма Багдановіча сцвярджаюць, што апошнія 8 радкоў твора былі зняты царскай цэнзурай. Дагэтуль тэкстолагам не ўдалося аднавіць гэты ўрывак. Як вы думаеце, пра што напісаў паэт?
9. Прыдумайце праект папулярызацыі творчасці Максіма Багдановіча сярод падлеткаў Беларусі. Якія творы паэта вы выбераце? Чаму? Спецыялістаў з якіх галін вы запросіце ў сваю каманду? Якіх спонсараў, інфармацыйных партнёраў падключыце? Якія анлайн- і афлайн пляцоўкі задзейнічаеце? У якой форме прапануеце аўдыторыі азнаёміцца са спадчынай вялікага паэта (электронныя гульні, квесты, рэклама, турыстычныя маршруты, аўкцыёны ведаў, інфармацыйныя базы, элементы дапоўненай рэальнасці)? Па якіх крытэрыях будзеце ацэньваць паспяховасць сваёй працы?



Правообладатель Национальный институт образования

10. Пазнаёмцеся з алгарытмам аналізу паэтычнага твора і прыкладам аналізу верша «Летапісец», змешчанымі пасля тэмы «Максім Багдановіч». Выканайце паводле ўзору аналіз верша «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...».

11. Разгледзьце скульптуру Марка Антакольскага. Карыстаючыся інтэрнэт-рэсурсамі, удакладніце, які летапісец увасоблены мастаком. Што вы ведаеце пра гэтага славянскага хранолага?

«Страцім-лебедзь»

12. Вывучыце на памяць верш Максіма Багдановіча «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...».

## *Тэорыя літаратуры*

### Верлібр і вольны верш

Верлібр узнік у XIX стагоддзі ў амерыканскай і еўрапейскай літаратурах. Шырокае распаўсюджанне атрымаў у паэзіі XX стагоддзя. Самы вядомы з пачынальнікаў гэтага жанру ў беларускай літаратуры — Максім Багдановіч («Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...», «Ты доўга сядзела за сталом...», «Халодная, ясная ноч...» і інш.). Традыцыі Максіма Багдановіча па стварэнні верлібраў былі пераняты сучаснымі аўтарамі. Верлібр часцей за ўсё выкарыстоўваецца ў творах філасофскай і інтымнай лірыкі.

***Верлібр***, або **свабодны верш** (ад фр. *vers libre* — ‘свабодны верш’), — верш, у якім адсутнічаюць рыфма і чаргаванне націскных і ненаціскных складоў.

У верлібры кожны вершаваны радок можа ўтрымліваць розны парадак чаргавання націскных і ненаціскных складоў і розную іх колькасць, часам адсутнічае і рыфма. Тым не менш гэта сістэма характарызуецца рытмічнасцю, толькі рытмы змяняюцца і змешваюцца ў творы. Інтанацыяй, інтанацыйнымі і сэнсавымі паўторамі забяспечваецца аднароднасць рытмічнай арганізацыі верша.

Часам верлібр адносяць да празаічных твораў, але гэта не зусім дакладна, бо графічны падзел аўтарам на радкі, рытмічная арганізацыя даюць устаноўку на ўспрыманне твора як вершаванага. Таксама для верлібра характэрна багацце і гнуткасць паэтычнага сінтаксісу — адмысловых рытарычных фігур (сінтаксічны перыяд, а таксама пералічэнне, супастаўленне, супрацьпастаўленне).



Правообладатель Национальный институт образования

Верлібр яшчэ называюць свабодным вершам — і з гэтай прычыны яго часта атаясамліваюць з вольным вершам. Вольны верш мае пэўныя адрозненні ад свабоднага.

***Вольны верш*** — від рыфмаванага сілаба-танічнага верша з няроўнай колькасцю стоп у радку.

Такая форма не прадугледжвае захаванне страфічнай будовы (слупкоў) і перадае размоўную інтанацыю, дыялагічнасць. Часта вольным вершам пішуцца байкі, таму яго яшчэ называюць **баечным вершам**.

Вольны верш атрымаў распаўсюджанне ў XVIII стагоддзі ў рускай паэзіі (Міхаіла Ламаносава, Міхаіла Хераскава і інш.). У беларускай літаратуры вольны верш выкарыстоўвалі Максім Танк, Кандрат Крапіва, ЭдуардВаласевіч, Уладзімір Корбан і іншыя паэты.

1. Што абазначаюць паняцці «верлібр» і «вольны верш»?
2. Напішыце ўласны верлібр, які пачынаўся б радком «Халодная, ясная ноч...».

## Алгарытм аналізу паэтычнага твора

1. Час і абставіны напісання твора.
2. Пачуцці і эмоцыі, якія выклікае твор.
3. Асацыяцыі, звязаныя з творам (з якімі творамі асацыіруецца тэкст? з якімі сітуацыямі? з якімі гукамі, колерамі, выявамі, пахамі, адчуваннямі?).
4. Тэма (пра што напісаны твор?).
5. Ідэя (якую думку аўтар хацеў данесці гэтым творам?).
6. Назва (чаму твор мае такую назву?).
7. Жанр (верш — грамадзянскай, філасофскай, інтымнай, пейзажнай лірыкі; раманс, песня, балада, байка, паэма або інш.).
8. Кампазіцыя (якія часткі вылучаюцца ў творы? змена якіх эмоцый рухае лірычнае перажыванне?).
9. Мастацкія вобразы. Сімвалы, дэталі, пейзаж (калі ёсць).
10. Лірычны герой (як паказаны?).
11. Выяўленчыя сродкі (тропы — эпітэты, метафары (у тым ліку ўвасабленне, метанімія, сінекдаха), параўнанні, алегорыі; гіпербала,



Правообладатель Национальный институт образования

літота; паэтычны сінтаксіс — паўторы, рытарычныя звароты, пытанні, воклічы, антытэза, сінтаксічны паралелізм).

12. Мова твора (лексіка — запазычанні, устарэлыя словы, наватворы, эмацыянальна афарбаваныя словы; фразеалогія; марфалагічны склад — частотнасць ужывання часцін мовы).

13. Гукавое аблічча твора (алітарацыя[1], асананс[2]).

14. Метрычная будова. Вершаваны памер (ямб, харэй; дактыль, амфібрахій, анапест), рыфма (мужчынская, жаночая). Цвёрдая форма (санет, трыялет, рандо, танка), вольная форма (верлібр).

15. Асабістае меркаванне пра твор.

## Аналіз верша «Летапісец» Максіма Багдановіча

**Час і абставіны напісання твора.** У 1911 годзе збылася мара Максіма Багдановіча: ён прыехаў у Беларусь і па запрашэнні братоў Луцкевічаў амаль усё лета пражыў у фальварку Ракуцёўшчына каля Маладзечна. Пад уражаннем ад доўгачаканай сустрэчы з родным краем Багдановіч напісаў цыкл вершаў «Старая Беларусь» (Яраслаўль, 1912), куды ўвайшоў і твор «Летапісец».

**Пачуцці і эмоцыі, якія выклікае твор.** Пасля першага прачытання верш выклікае задумлівы настрой, захапленне багаццем беларускай даўніны, наводзіць на ўспаміны пра далёкіх продкаў.

**Асацыяцыі, звязаныя з творам.** Твор асацыіруецца з манастырскай цішынёй, скрыпам гусінага пяра, пахам васковай свечкі, шумам марскіх хваль, нагадвае мастацкія палотны пра мінуўшчыну. Матывам старога сасуда (гаршчок з зернем, бутэлька з лістом) тэкст паяднаны з санетам Максіма Багдановіча «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...», а лірычны герой падобны да героя яго ж верша «Перапісчык». Таксама, магчыма, «граматкі пра долю Магілёва» нагадваюць Магілёўскую хроніку (летапісцы Трафім Сурта і Юры Трубніцкі).

**Жанр, тэма, ідэя.** Філасофскі верш «Летапісец» прысвечаны тэме гістарычнай памяці. Атмасфера Сярэдневякоўя перадаецца і праз эпіграф з верша Янкі Купалы «З мінуўшых дзён». У ім сцвярджаецца

---

[1] *Алітара́цыя* — паўтарэнне аднолькавых зычных гукаў у вершаваным творы.

[2] *Асана́нс* — паўтарэнне аднолькавых галосных гукаў у вершаваным творы.



Правообладатель Национальный институт образования

думка пра гранічную важнасць захавання гістарычнай спадчыны, бо гэта робіць нямарнымі жыцці і дасягненні людзей папярэдніх эпох, дазваляе ўстанавіць сувязь паміж пакаленнямі.

**Назва.** У загалоўку лірычны герой названы паводле роду дзейнасці, а не па імені. Такім чынам паказаны абагульнены вобраз руплівых, як пчолы, збіральнікаў, якія карпатліва занатоўваюць памятныя даты нашай гісторыі.

**Кампазіцыя.** Паводле кампазіцыі верш складаецца з дзвюх сэнсавых частак: 1) праца летапісца: «Старанна літары малыя выводжу...»; 2) аповед пра прынесеную морам бутэльку: «Так мора — ў Гданску я чуваў — прымчыць вадой». Прасочваецца выразная паралель: як праз многія гады людзям у рукі трапіў ліст ад загінуўшых маракоў, гэтаксама захаваецца і апынецца ў руках нашчадкаў праца летапісца.

**Мастацкія вобразы.** Перад намі праходзіць шмат вобразаў — як даўніх (войтаў, лаўнікоў, райцаў, паспольства, каралёў), так і сучасных лірычнаму герою (манах-летапісец, рыбакі, якія выцягнулі бутэльку з мора). Гэта не заўжды вядомыя героі, як у сярэдневяковай літаратуры, а звычайныя людзі — так Максім Багдановіч сцвярджае самакаштоўнасць жыцця любога чалавека, які варты таго, каб яго памяталі. Праз паперу летапісца і паперу ў бутэльцы праступае вобраз самой гісторыі.

Заўважныя таксама вобразы, звязаныя з воднай стыхіяй, — вады і мора (паўтараюцца тройчы). Вобразы мора, вады, ракі ў паэзіі часта перадаюць імклівы бег часу.

**Лірычны герой.** Лірычны герой верша — немалады ўжо чалавек, які пад старасць шукае духоўнага прытулку ў сценах манастыра, прысвячае сябе складанню летапіснага зводу. Ён адначасова падобны і да манаха-перапісчыка Антонія — складальніка зборніка цытат і афарызмаў «Пчала» (XI стагоддзе), і да згаданых магілёўскіх летапісцаў.

Твор багаты на **выяўленчыя сродкі.** Эпітэты ў пачатку верша характарызуюць летапісца: яны апісваюць яго як «годнага веры сведку», што па-манаску сціпла ставіцца да ўласнай працы, называе сваё пісанне «няхітрым». Разнастайнасць занатаваных манахам гістарычных звестак паказана праз паралельныя (падобныя) сінтаксічныя канструкцыі і шматзлучнікавасць:

...Пра войтаў, лаўнікоў, і райцаў, і паспольства,
Пра розных каралёў, і бітвы, і пасольства,
Што тут чынілася у даўнія гады,
Што думалі, чаго жадалі мы тады...



Правообладатель Национальный институт образования

**Мова твора.** Паэт пераважна карыстаецца агульнаўжывальнай лексікай. У творы прысутнічаюць запазычанні з польскай («войтаў», «лаўнікоў», «райцаў», «паспольства») і рускай («дзяла», «патомкі») моў. Пры гэтым вядома, што Магілёўская хроніка была напісана папольску і па-руску.

Аўтар актыўна ўжывае антонімы. Напрыклад, шырокі ахоп падзей паказаны не толькі праз спалучэнне «ад слова і да слова», а і антанімічнымі эпітэтамі «і добрыя яго, і кепскія дзяла». Антытэза «мёд» — «горкія кветкі» ўтварае выслоўе, якое стала крылатым: «Так рупная пчала ўмее ў соты мёд зыбраць і з горкіх кветак». Праз антонімы «забудзецца, умрэ, сплыве» — «устане, ажыве», «забылі» — «збудзілі», «знайдуць», «зведаюць» супастаўлена мінуўшчына і сучасны лірычнаму герою перыяд.

Асобную групу складае лексіка, звязаная з пісьмом («летапіс», «пішу», «вываджу», «спісваю», «пісанне», «ліста», «паперу», «літары»), дзе слова «літары» паўтараецца ў пачатку і канцы тэксту, семантычна (сэнсава) закальцоўваючы верш. Названыя словы пераклікаюцца з загалоўкам твора, семантычна пацвярджаюць яго. Паколькі твор мае скразны матыў хуткага бегу, цякучасці часу, то ён пабудаваны на дзеясловах і дзеяслоўных формах: іх у тэксце больш за сорак.

Прааналізуем **метрычную будову** верша:

Душой стаміўшыся ў жыццёвых цяжкіх бурах,
_ _′ _ _′ _ _ V _ _′ _ _′ _ _′ _
Свой век канчаю я ў манастырскіх мурах...
_ _′ _ _′ _ _ V _ _ _ _′ _ _′ _

Назіраем шасцістопны ямб, пасля трэцяй стапы ў кожным радку — паўза. Рыфма парная: чаргуюцца дзве жаночыя («бурах» — «мурах») і дзве мужчынскія («пішу» — «вываджу»). Падобны верш выкарыстоўваўся ў XII стагоддзі ў творах-перайманнях з антычнасці — так званых александрыях, таму ён называецца александрыйскім. Гэта стылізацыя набліжае верш Максіма Багдановіча да старажытных тэкстаў, перадае дух эпохі.

**Асабістае меркаванне пра твор.** Твор «Летапісец» дазваляе чытачу трапіць у сівую даўніну, адчуць важнасць ведання сваіх каранёў, наводзіць на разважанні пра сэнс чалавечага існавання, ролю асобы ў гісторыі.



Правообладатель Национальный институт образования

# Алесь Гарун

(1887—1920)

**1.** Назавіце творы пра Радзіму і родную мову, вывучаныя вамі ў папярэдніх класах. **2.** Якія вершы называюць філасофскімі?

Алесь Гарун быў вельмі добры шахматыст. Гуляў адзін супраць некалькіх супраціўнікаў і амаль заўсёды выйграваў.



Алесь Гарун (Аляксандр Прушынскі) нарадзіўся 11 сакавіка 1887 года ў фальварку Новы Двор (цяпер гэта межы Мінска) у сям'і рабочага. У пяць гадоў навучыўся чытаць, а ў сем пайшоў вучыцца ў прыходскае вучылішча, а потым — у мінскую школу рамесных вучняў. Пэўны час працаваў у майстэрнях і на прадпрыемствах Мінска.

У 1904 годзе ўвайшоў у партыю сацыялістаў-рэвалюцыянераў, стаў актыўным агітатарам сярод моладзі. На гэты час прыпадае пачатак самастойнай літаратурнай дзейнасці. У 1905—1906 гадах напісаў дагэтуль не знойдзеныя некалькі вершаў — зваротаў да моладзі і працоўных («Чаму так, скажэце, жывецца на свеце?» і інш.).

У 1907 годзе за сваю актыўную дзейнасць быў арыштаваны ў мінскай падпольнай друкарні, а ў 1908 годзе высланы ў Сібір. Жыў у Іркуцкай губерні, займаўся сталярнай і цяслярнай працай. З 1914 года працаваў вадалівам на рацэ Лене, у гэты час займаўся зборнікам «Матчын дар», рукапіс якога восенню 1914 года даслаў у Вільню. У 1915 годзе пераехаў у Бадайбо (Іркуцкая вобласць) працаваць на залатых капальнях кампаніі «Лензолата», там пазнаёміўся і пасябраваў з Язэпам Лёсікам.

У 1917 годзе Алесь Гарун вярнуўся ў Мінск і актыўна ўключыўся ў грамадскую працу, хоць моцна падводзіла здароўе. Быў абраны членам Цэнтральнага камітэта Беларускай сацыялістычнай грамады, сустаршынёй I Усебеларускага кангрэса, старшынёй Часовага



Правообладатель Национальный институт образования



БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

Газета «Беларускі шлях» (1918)

беларускага нацыянальнага камітэта, рэдагаваў газету «Беларускі шлях», працаваў у дзіцячых прытулках.

У апошнія гады жыцця Алесь Гарун цяжка хварэў на сухоты. Змітрок Бядуля адзначаў, што ў апошні год паэт амаль не выходзіў з кватэры. «Жывыя казкі» яму прыходзілася пісаць у ложку, бо сядзець за сталом было цяжка. Блізкім сябрам удалося ўгаварыць Алеся Гаруна кінуць працу і паехаць лячыцца за мяжу. Гэта было апошняе падарожжа паэта. 28 ліпеня 1920 года Алеся Гаруна не стала. Ён пахаваны ў Кракаве на Ракавіцкіх могілках.

**Уклад у развіццё літаратуры**

1. Стварыў шматпланавы зборнік паэзіі «Матчын дар», у якім звернута ўвага на найважнейшую праблему: самавызначэнне народа, а таксама на мінуўшчыну з мэтай адраджэння былой славы беларусаў.

2. Пашыраў тэматычныя абсягі беларускай прозы, смела спалучаў фантастычную і рэалістычную плыні (у апавяданні «У Панасавым сяле»), не баяўся жанравых пошукаў.

3. Аўтар зборніка п’ес для дзіцячага тэатра «Жывыя казкі», у якіх удала спалучаюцца народныя фантастычныя традыцыі з арыгінальнымі аўтарскімі знаходкамі.

1. Складзіце ланцужок дзеясловаў, якія паэтапна ахарактарызавалі б жыццёвы шлях Алеся Гаруна. Пракаментуйце, чаму вы выбралі менавіта гэтыя лексічныя адзінкі.
2. Знайдзіце інфармацыю, якія таленты былі ў Алеся Гаруна. Паразважайце, якім чынам уплывае на літаратурную творчасць разнапланавасць заняткаў чалавека.
3. Выкажыце ўласныя версіі пра паходжанне псеўданімаў Аляксандра Прушынскага (І. Жывіца, А. Навадворскі, А. Сумны, А. Гарун). Ці падобным шляхам ідзе ўзнікненне сучасных нікнэймаў[1]? Чым яны, на вашу думку, адрозніваюцца ад творчых псеўданімаў?

---

[1] *Нікнэ́йм* (англ. — ‘мянушка’) — імя або псеўданім, якім карыстальнікі называюць сябе ў інтэрнэце.



Правообладатель Национальный институт образования

## Паэзія Алеся Гаруна

Як сталы пісьменнік Алесь Гарун сфарміраваўся далёка за межамі Беларусі — у Сібіры. Самым значным яго здабыткам з'яўляецца адзіны прыжыццёвы зборнік вершаў «Матчын дар», які мае падзагаловак «Думы і песні» і прысвечаны маці паэта. Гэта кніга павінна была ўбачыць свет яшчэ ў 1914 годзе, але Першая сусветная вайна затрымала выданне на чатыры гады. «Матчын дар» з'яўляецца амаль поўным зборам твораў паэта нашаніўскага перыяду і адначасова пачаткам новага этапу развіцця беларускай літаратуры — паслянашаніўскага адраджэння. Зборнік вызначаецца разнастайнасцю інтанацый, шчодрасцю вобразнага свету, выяўленчых сродкаў і багаццем рытмічных форм.




Вокладка зборніка Алеся Гаруна «Матчын дар» (1918)

Янка Купала, які ў 1916 годзе, уражаны падзеямі Першай сусветнай вайны, перастаў пісаць вершы, у 1918 годзе атрымаў ад Максіма Гарэцкага кнігу Алеся Гаруна «Матчын дар» і быў настолькі ўзрушаны, што вярнуўся да літаратуры.

Некаторыя вершы для зборніка «Матчын дар» дапрацоўваліся аўтарам. І адзін з іх — **«Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...»** — напісаны яшчэ ў 1910 годзе. Першапачаткова верш называўся «Беларусам у чатырохлецце "Нашай нівы"».

Ужо з самага пачатку праз сяброўскі, свойскі зварот («Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...») лірычны герой не імкнуўся ўзвысіцца, а размаўляў са сваім чытачом — простым беларусам — на роўных:

Ты, мой брат, каго зваць Беларусам,
Роднай мовы сваёй не цурайся;
Як не зрокся яе пад прымусам,
Так і вольны цяпер не зракайся.

Твор закранае шмат тэм і праблем грамадска-палітычнага характару. Асноўны матыў верша — вызваленча-патрыятычны; паэт асэнсоўваў праблемы нацыянальнага самавызначэння і барацьбы з прыгнётам. Прычыны беднасці і сацыяльнай неўладкаванасці аўтар бачыў



Правообладатель Национальный институт образования

у тым, што «госцікі-герцы[1]» бессаромна разрабавалі Беларусь. Тым не менш лірычны герой верыць у магчымасць адраджэння, бо народ, які змог захаваць самае дарагое — родную мову, — не зможа загінуць. Менавіта захаванне гэтай спадчыны, гэтага нацыянальнага кода павінна прывесці да адраджэння Беларусі і дапамагчы заслужыць пашану сярод іншых народаў.

**Навукоўцы гавораць.** «З паэтаў “Нашае нівы” назавём перш за ўсё А. Гаруна, ад каторага наша пісьменнасць можа шмат чаго спадзявацца. Лёгкасць і мілазычнасць верша, рупная шліфоўка яго, новае і вельмі пекнае счэпліванне рыфм — усё гэта дужа аздабляе яго паэзію. У дзе якіх творах спатыкаецца (сустракаецца. — *Аўт.*) сіла і сціснутасць мовы. Глаўна ж тое, што пры ўсім гэтым А. Гарун ні да каго іншага не падобны, што ён не зрабіўся нічыім “падгалоскам”. Гэта зарука, што нашы надзеі на яго талент не пойдуць намарна» *(Максім Багдановіч)*.

Узор філасофскай лірыкі ў творчасці Алеся Гаруна — верш **«Ідуць гады»**, які ўяўляе сабой своеасаблівы дыялог паміж дзвюма асобамі пра сэнс жыцця. Гэта вечнае пытанне, адказ на якое шукае кожны чалавек. Верш мае ярка выражаны элегічны характар і пабудаваны на траістасці, як і шмат іншых тэкстаў Алеся Гаруна, твораў вуснай народнай творчасці.

Ідэя верша ў тым, каб паказаць, што жыццё — няспынны працэс («Ідуць гады, ідуць гады, // І з імі ўсё на свеце. // Сягоння ты, а йшлі дзяды, // А заўтра пойдуць дзеці»), які заключаецца ў гармоніі з навакольным светам і атрыманні асалоды для сябе і іншых. Філасафічнасць паэтычнага слова мастака натуральна спалучалася з высокім гуманізмам яго твораў.

Алесь Гарун быў гуманістам. Лірычны герой у вершы «Праводзіны» выпраўляў брата на вайну, абяцаў яму дагледзець яго сям’ю ў выпадку смерці і прасіў за... ворагаў:

Будзе праціўнік пабіты ляжаць, —
Ты пашкадуй яго, брат!
Раны завяжаш, паможаш устаць, —
Й ён чалавек і салдат.

[1] *Ге́рцы* — махляры, марнатраўцы.



Правообладатель Национальный институт образования

Алесь Гарун быў таксама выдатным празаікам і драматургам. Яго проза абапіралася на нацыянальныя традыцыі і ўзбагачала скарбніцу беларускага прыгожага пісьменства новымі формамі і тэмамі. У сваіх апавяданнях («Першы снег», «Пан Шабуневіч», «Маладое», «Чалавек без крыві», «Свята», «П’ера і Каламбіна» і інш.) закранаў філасофскія пытанні выжывання асобы ва ўмовах сацыяльнага ўціску, нацыянальнага бяспраўя. Часта пісьменнік узнімаўся над часам і канкрэтным месцам, разважаючы над агульначалавечымі праблемамі.

Для дзяцей быў напісаны зборнік п’ес «Жывыя казкі», куды ўвайшлі «Хлопчык у лесе», «Шчаслівы чырвонец» і «Дзіўны лапаць, або Не ўсё тое порах, што ў пораху ляжыць». У драматычных творах аўтар змог спалучыць народныя казачныя набыткі з уласнымі літаратурнымі знаходкамі. Алесь Гарун стварыў вобразы, якія адпавядаюць беларускім ідэалам справядлівасці і прыгажосці.

Паэт пражыў складанае, поўнае трагедый жыццё. Яго творчасць вызначалася шматпланавасцю. Максім Гарэцкі ў «Гісторыі беларускае літаратуры» адзначаў: «Яго (Алеся Гаруна. — *Аўт.*) паэзію спарадзілі мукі душы...; гэта — не пісанне для другіх, не творчасць для чужога вока і для свае прыемнасці, а гэта — балючыя развагі паэта з самім сабою, жаданне ўцішыць боль, запісанае на паперу для самога сябе». Аналізуючы рытміка-інтанацыйную і моўна-стылёвую характарыстыку верша «У прыпар», Максім Гарэцкі зрабіў заўвагі, якія ў поўнай меры можна аднесці да ўсёй творчасці паэта: «Спачатку кароткія... аднаслоўна-трывожныя, як перад гразою, радкі, якія спараджаюць гром».

Літаратурная спадчына Алеся Гаруна, у якой шмат увагі надавалася асэнсаванню гісторыі, агульначалавечым праблемам (свабодзе, справядлівасці, месцу чалавека ў свеце, міласэрнасці), актуальная і да нашага часу. Паэт дае ўзоры мужнасці, самаахвярнасці і годнасці.

**Літаратурныя сувязі.** Грамадзянскае гучанне твора «Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...» пераклікаецца паводле ідэйнага напаўнення з вершамі Уладзіміра Караткевіча — «Беларуская песня», Любы Тарасюк — «Імя Айчыны». Філасофская лінія блізкая да выказанага Максімам Багдановічам.

1. Вызначце асноўныя матывы творчасці Алеся Гаруна.
2. Якія запаветы пакінуў нам Алесь Гарун? Наколькі актуальныя вершы паэта сёння? Чаму?



Правообладатель Национальный институт образования

3. Да якога віду лірыкі можна аднесці прачытаныя вамі вершы: інтымнай, грамадзянскай, філасофскай або пейзажнай?
4. Прывядзіце прыклады мастацкіх сродкаў у вершах «Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...», «Ідуць гады». Якую ролю яны адыгрываюць у тэксце?
5. Складзіце для сваіх аднакласнікаў віктарыну па творчасці Алеся Гаруна.
6. Параўнайце верш «Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...» з творамі Уладзіміра Караткевіча «Беларуская песня» і Любы Тарасюк «Імя Айчыны» паводле ідэі.

## Пытанні і заданні для паўтарэння і падагульнення

1. Назавіце беларускіх паэтаў пачатку XX стагоддзя, якіх вы ведаеце.
2. Якія празаічныя творы сталі знакавымі ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя?
3. Каго з беларускіх драматургаў першых дзесяцігоддзяў XX стагоддзя вы можаце назваць?
4. Ці можна сцвярджаць, што на пачатку XX стагоддзя ў Беларусі пачала актыўна развівацца літаратурная крытыка? Чаму?
5. Назавіце мадэрнісцкія і авангардысцкія плыні, якія аказалі ўплыў на беларускую літаратуру першай трэці XX стагоддзя.
6. Якія мэты мае публіцыстыка? Якія — літаратура? У чым заключаецца публіцыстычнасць твораў Цёткі? Прывядзіце прыклады.
7. Якія рысы вылучаюць тэксты Ядвігіна Ш. сярод твораў аўтараў-сучаснікаў?
8. У чым заключаецца ідэйны сэнс п'есы Янкі Купалы «Раскіданае гняздо»?
9. Што вылучае вобраз Андрэя Лабановіча сярод герояў аповесці Якуба Коласа «У палескай глушы»?
10. Які з вершаў Максіма Багдановіча вам найбольш падабаецца? Ці можа гэты верш стаць песняй? Чаму?
11. Паразважайце, чаму патрыятычныя вершы нарадзіліся ў Максіма Багдановіча і Алеся Гаруна, якія доўгі час былі адарваныя ад Радзімы. Ці адчуваеце вы сябе беларусам далёка ад Радзімы?
12. Параўнайце асноўныя моманты жыццёвага і творчага шляху Якуба Коласа і Янкі Купалы з дапамогай табліцы. Дадайце неабходныя звесткі.


Правообладатель Национальный институт образования

| | Янка Купала | Якуб Колас |
|---|---|---|
| Сапраўднае імя | ... | ... |
| Месца нараджэння | ... | ... |
| Паходжанне | з сям'і дробнага шляхціца | ... |
| На якой мове пачаў пісаць | на польскай | на рускай |
| Род літаратуры | ... | майстар эпічных жанраў |
| Мастацкі напрамак, прадстаўлены ў творчасці | ... | рэалізм |
| Галоўны герой | у разладзе з рэчаіснасцю | у гармоніі з рэчаіснасцю |

## БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА 1920—1930-х ГАДОЎ

**1.** Прыгадайце падзеі, якія адбываліся ў гісторыі Беларусі ў 1920—1930-я гады.
**2.** Чаму гэты перыяд называюць міжваенным?

Беларуская літаратура 1920—1930-х гадоў існавала ў складаных грамадска-палітычных абставінах. Напачатку яе плённаму развіццю спрыяла абвешчаная ў краіне палітыка беларусізацыі, што вы́клікала з'яўленне пісьменніцкіх арганізацый, фарміраванне новых ідэйна-эстэтычных прынцыпаў, абнаўленне літаратурных традыцый. Затым гэты рух быў запаволены сумнавядомымі падзеямі 1930-х гадоў, калі пісьменніцкая і выдавецкая дзейнасць ускладнілася пад уздзеяннем знешніх абставін. Разгледзім падзеі гэтага этапу больш падрабязна.

**Літаратурныя аб'яднанні.** Літаратура ў 1920-я гады была неверагодна папулярнай сферай дзейнасці: маладых аўтараў ведалі ў твар, іх фотаздымкі змяшчалі на вокладках кніг. Адзін з першых творчых саюзаў, якія ўтварыліся на пачатку 1920-х гадоў, — **Усебеларускае аб'яднанне паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк»** (1923—1928). Сябрамі «Маладняка» сталі каля 500 чалавек з розных гарадоў Беларусі і замежжа. Заснавальнікі арганізацыі: Міхась Чарот, Анатоль Вольны, Алесь Дудар, Андрэй Александровіч, Адам Бабарэка, Язэп Пушча.



Правообладатель Национальный институт образования

Прынцыпы адлюстравання рэчаіснасці, па якіх лёгка пазнаць удзельнікаў «Маладняка», можна звесці да наступных: 1) адмаўленне ад былой культурнай спадчыны; 2) вера ў камуністычны лад і служэнне дзяржаве; 3) апяванне энергіі моладзі і светлай будучыні.

> **!** У «Маладняку» крытычна ставіліся да традыцыі і выступалі супраць творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа. Даведаўшыся пра гэта, Янка Купала паставіўся да пазіцыі маладнякоўцаў паблажліва, а Якуб Колас пакрыўдзіўся і напісаў апавяданне «Трыумф» з падзагалоўкам «Прыяцельскі шарж».

Многія з пісьменнікаў-пачаткоўцаў не разбіраліся ў літаратуры, і аб'яднанне вымушана было выдаваць не толькі мастацкія кнігі, але і даведнікі з тлумачэннямі і прыкладамі паэтычных жанраў, вершаваных памераў. Але многія таленавітыя аўтары адчувалі, што яны эстэтычна і светапоглядна перараслі «Маладняк». Да таго ж не ўсе прызнавалі новую інтэрнацыянальную ідэю класавай салідарнасці працоўных важнейшай за традыцыйную рамантычную ідэю нацыянальнага адраджэння. Усё гэта выклікала раскол у «Маладняку». У 1928 годзе аб'яднанне «Маладняк» было рэарганізавана ў **Беларускую асацыяцыю пралетарскіх пісьменнікаў** (БелАПП). Сябрамі асацыяцыі сталі Пятрусь Броўка, Платон Галавач, Аркадзь Куляшоў, Паўлюк Трус, Валянцін Таўлай і інш. Праіснавала асацыяцыя да 1932 года.

**Беларускае літаратурна-мастацкае згуртаванне «Узвышша» (1926—1931).** Былыя маладнякоўцы Язэп Пушча, Кузьма Чорны, Кандрат Крапіва, Адам Бабарэка і Уладзімір Дубоўка ўтварылі новае аб'яднанне. Да іх далучыліся браты Андрэй Мрый (Шашалевіч) і Васіль Шашалевіч, а таксама Лукаш Калюга. Упершыню ў беларускай літаратуры аб'яднанне адбылося па эстэтычных прычынах. Адна з яго мэт — стварэнне арыгінальнай беларускай літаратурнай школы праз высокую культуру мовы і арганічнае спалучэнне традыцый з наватарствам.

> **!** **Навукоўцы гавораць.** «Маладнякоўцы ўдзячна карысталіся купалаўскай тропікай, лічачы самым важным у яго творчасці рэвалюцыйныя матывы, і не надавалі ніякага значэння больш канцэптуальным момантам, у той час як у творах узвышаўцаў няма выразнага пераймання на ўзроўні вобразна-метафарычных і метрычных сродкаў, затое знайшло сваё месца ўвасабленне ідэі нацыянальнай самабытнасці» *(Жанна Капуста)*.


Правообладатель Национальный институт образования



Беларускае літаратурна-мастацкае згуртаванне «Узвышша».
У першым радзе *злева направа*: Язэп Пушча, Адам Бабарэка, Уладзімір Дубоўка, Кузьма Чорны, Кандрат Крапіва; у другім радзе: Максім Лужанін, Сяргей Дарожны, Антон Адамовіч, Тодар Кляшторны, Змітрок Бядуля, Уладзімір Жылка, Васіль Шашалевіч, Пятро Глебка (Мінск, 1928)

**Літаратурнае аб'яднанне «Полымя» (1927—1932)** згуртавала вакол сябе і класікаў — Янку Купалу, Якуба Коласа, Уладзіслава Галубка, Цішку Гартнага, і маладзейшых аўтараў, былых маладнякоўцаў — Міхася Чарота, Міхася Зарэцкага, Анатоля Вольнага, Алеся Дудара. Яны падтрымлівалі дзяржаўную пралетарскую ідэалогію, выступалі за развіццё літаратурнай крытыкі і за шанаванне культурнай спадчыны.

У 1932 годзе пастановай урадавага органа Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый БССР» была спынена дзейнасць усіх літаратурных аб'яднанняў і ўтворана адзіная арганізацыя — **Саюз пісьменнікаў БССР**. З гэтага моманту і да канца 1980-х гадоў літаратурны працэс у Беларусі быў цэнтралізаваны.

**Паэзія 1920-х гадоў.** Паэзія развівалася ў дзвюх ідэйна-мастацкіх плынях: 1) традыцыйная (Уладзімір Жылка, Тодар Кляшторны, Наталля Вішнеўская, Яўгенія Пфляўмбаум, Зінаіда Бандарына). Узорам была творчасць нашаніўцаў (Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі і Максіма Багдановіча); 2) пралетарска-рэвалюцыйная (Міхась Чарот, Алесь Дудар, Андрэй Александровіч і інш.). Літаратура адпавядала афіцыйнай ідэалогіі Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, у ёй выяўляліся культ рэвалюцыі, жыццесцвярджальны пафас, гарадская тэма, ігнараванне лірычных пачуццяў, антырэлігійнасць.



Правообладатель Национальный институт образования

Эстэтычна пралетарска-рэвалюцыйныя вершы мелі адзнакі авангардызму: 1) антытрадыцыяналізм («маладнякізм» супрацьпастаўляўся «адраджанізму» нашаніўцаў); 2) антыэстэтызм (натуралістычныя вобразы ў творах Змітрака Бядулі, ранняга Аркадзя Куляшова); 3) складанасць і цьмянасць вобразаў і тропаў (у творчасці Язэпа Пушчы, Змітрака Бядулі, Уладзіміра Дубоўкі); 4) эвалюцыя паэта-прарока ў паэта-суразмоўца (Уладзімір Дубоўка, Андрэй Александровіч, Язэп Пушча).

**Навукоўцы гавораць.** «...Паэтычная сістэма, створаная беларускімі аўтарамі 20-х — пачатку 30-х гг. XX ст., істотна адрозніваецца ад папярэдняй, "нашаніўскай", паэтычнай сістэмы ў фармальна-стылістычных адносінах. У аснове новай сістэмы была павышана ўвага да формы літаратурнага твора. Беларускія паэты пачалі надаваць большае значэнне рыфмоўцы, рытміцы, сінтаксісу, лексіцы, вобразнасці, графічнай форме твораў, а таксама выкарыстанню аўтарскіх неалагізмаў» *(Віктар Жыбуль)*.

**Проза 1920-х гадоў.** Пры асэнсаванні гістарычных падзей пачатку XX стагоддзя пісьменнікі падзяліліся на дзве групы: адны імкнуліся растлумачыць і апраўдаць помсту прыгнятальнікам (Змітрок Бядуля, маладое пакаленне); іншыя — зафіксаваць у мастацкіх вобразах элементы «аджылай» свядомасці (Максім Гарэцкі).

Старэйшыя пісьменнікі прытрымліваліся пазіцый гуманізму, а для маладзейшага пакалення сацыяльнае было важней за індывідуальнае. Для прозы гэтага часу характэрны стварэнне вобраза «новага чалавека» (Кузьма Чорны, Міхась Зарэцкі, Кандрат Крапіва, Міхась Лынькоў, Платон Галавач), акцэнт на гераізме, знешніх эфектах, перавага прыгодніцкага сюжэта, што спрыяла экранізацыі. Так, першы беларускі мастацкі фільм «Лясная быль» (1926) быў зняты паводле твора Міхася Чарота «Свінапас». У гэты час былі завершаны першыя беларускія раманы[1] (Цішка Гартны «Сокі цаліны»; Міхась Зарэцкі «Сцежкі-дарожкі»), Якуб Колас напісаў дзве аповесці з будучай трылогіі — «У палескай глушы», «У глыбі Палесся».

Упершыню ў беларускай літаратуры XX стагоддзя з'явілася рабочая (Міхась Лынькоў) і эміграцкая (Максім Гарэцкі) тэматыка.

**Паэзія 1930-х гадоў.** Паэзіі гэтага часу ўласціва наяўнасць рыфмаваных лозунгаў з ужываннем дзеясловаў загаднага ладу, наўмыс-

---

[1] Раман «Золата» Ядвігіна Ш. так і застаўся недапісаным, таму яго часам называюць аповесцю.



Правообладатель Национальный институт образования

ная бадзёрасць, перабольшанасць пачуццяў («Трэба ўмець і шпалы кахаць, і цалаваць семафор» (Паўлюк Шукайла)). Папулярны жанр — песня-марш, распаўсюджаная форма верша — разбіўка «лесвічкай». У выніку адной з літаратурных дыскусій 1930-х гадоў была незаслужана прызнана шкоднасць псіхалагізму ў паэзіі. Гэта значыць, аўтарам прапаноўвалася не заглыбляцца ў псіхалогію лірычнага героя, а абапірацца на рэальныя факты.

Для пісьменнікаў арганізоўвалі паездкі па краіне — і чакалася, што ўбачанае хутка адлюструецца ў новых творах, але гэта часта аслабляла мастацкія вартасці тэкстаў. Напрыклад, у 1933 годзе, каб напісаць пра «перавыхаванне» чалавека працай, пісьменніцкая дэлегацыя наведала адкрыццё Беламорканала.

У выніку падзей 1930-х гадоў была парушана пераемнасць паміж пакаленнямі аўтараў у літаратурным працэсе, і гэта змяніла літаратурны ландшафт: звузіліся тэматычныя абсягі твораў, збяднеў арсенал мастацкіх метадаў, школ і плыняў, беларускае слоўнае мастацтва стала пастунова страчваць заваяваныя пазіцыі. Такія змены былі звязаны з трагічным часам, калі былі высланы за межы рэспублікі альбо загінулі некалькі дзясяткаў маладых пісьменнікаў Савецкай Беларусі.

Паступова ў літаратуру прыходзіла новае пакаленне савецкіх паэтаў, якія выраслі ў СССР (Аркадзь Куляшоў, Пімен Панчанка, Мікола Аўрамчык, Анатоль Вялюгін і інш.).

**Проза 1930-х гадоў.** Проза гэтага часу была палітызавана. Уласцівая беларускай літаратуры цікаўнасць да «маленькага чалавека» адступала: былі запатрабаваны партыйна-класавыя ацэнкі рэчаіснасці, таму творы пачалі больш нагадваць журналісцкія рэпартажы. Спачатку літаратары адлюстроўвалі класавую барацьбу, а пазней перайшлі да асэнсавання «парушэнняў сацыялістычнай законнасці» і «памылак партарганізацый». У гэтыя гады сталі папулярнымі вытворчыя аповесці і раманы.

> ***Вытворчы раман*** — літаратурны твор, у цэнтры якога знаходзіцца прафесіянал, што рашае вытворчыя задачы.

Вясковая тэматыка рэалізоўвалася пераважна ў творах пра калектывізацыю. Былі запатрабаванымі і жанры масавай літаратуры (напрыклад, палітычны дэтэктыў з элементамі антыўтопіі і фантастыкі), і творы для дзяцей (Янка Маўр). Беларуская гісторыя знаходзіла цэласнае адлюстраванне ў творчасці Максіма Гарэцкага, якая пэўны час замоўчвалася. Спадчына класіка вярнулася да чытача толькі ў другой палове XX стагоддзя.



Правообладатель Национальный институт образования

У 1930-я гады ў Германіі да ўлады прыйшлі фашысты, таму ў беларускай літаратуры, як і ў іншых літаратурах гэтага часу, пачалі з'яўляцца антыфашысцкія творы.

У гэты час у літаратуры ўмацоўвалася паэтыка сацыялістычнага рэалізму: асабістае ў характары героя тлумачылася як праяўленне агульнага; сацыяльнае было важней за індывідуальнае.

**Літаратура Заходняй Беларусі.** У сакавіку 1921 года быў падпісаны Рыжскі мірны дагавор, у адпаведнасці з якім тэрыторыя Беларусі была падзелена на дзве часткі: Заходнюю (пад уладай Польшчы) і Усходнюю (пад уладай СССР). Палітычным, эканамічным і культурным цэнтрам Заходняй Беларусі была Вільня (цяпер — у складзе Літвы).

У першай палове 1920-х гадоў многія дзеячы беларускай культуры жылі там пастаянна (Антон Луцкевіч, Францішак Аляхновіч, Ядвігін Ш.), некаторых туды закінула ваеннае і рэвалюцыйнае бязладдзе (Максім Гарэцкі, Уладзімір Жылка, Леапольд Родзевіч, Ігнат Канчэўскі, Уладзімір Самойла).

Большасць публіцыстаў і пісьменнікаў выступалі ў сваіх творах за дзяржаўную незалежнасць непадзельнай Беларусі (Ігнат Канчэўскі, Уладзімір Самойла).

Менавіта ў Вільні ў 1920 годзе Максім Гарэцкі напісаў грунтоўнае даследаванне «Гісторыя беларускае літаратуры», у якім быў прааналізаваны цэласны літаратурны працэс Беларусі ад даўніны да сучасных аўтару дзён. Гэты тэкст стаў асновай беларускага літаратуразнаўства. Мастацкія творы самога Гарэцкага сталі пачаткам заходнебеларускай прозы, акрамя вечных, ён звяртаўся і да ўласнабеларускіх тэм («У 1920 годзе», «Усебеларускі з'езд 1917 года»). Пішучы пра часы прыгонніцтва, пісьменнік падкрэсліваў не толькі сацыяльную аддаленасць паноў, шляхты ад народа, але і іх нацыянальнае рэнегацтва[1].

У паэзіі пачатку 1920-х гадоў апявалася нацыянальнае адраджэнне (Казімір Сваяк, Макар Краўцоў). А Уладзімір Жылка за сапраўдную каштоўнасць лічыў хараство і ствараў тонкія «інтэлігенцкія» вершы. Асэнсоўваючы гісторыю Беларусі, паэт адзначаў, што ў ёй перыяды ўзлёту натуральна чаргуюцца з перыядамі заняпаду. Як і Максім Багдановіч, ён пісаў урбаністычную[2] лірыку, напрыклад «Вершы аб Вільні» са зваротам «О, Вільня, крывіцкая Мекка!».

---

[1] *Рэнега́цтва* — паводзіны рэнегата, адступніка, чалавека, які здрадзіў сваім ідэалам і прынцыпам.

[2] *Урбаністы́чны* — гарадскі, які мае адносіны да горада.



Правообладатель Национальный институт образования

Драматургію літаратуры Заходняй Беларусі складалі асобныя драматычныя абразкі Максіма Гарэцкага, камедыі і драма «Пакрыўджаныя» Леапольда Родзевіча, а таксама п'есы Францішка Аляхновіча, пабудаваныя на аснове фальклорных ды местачковых сюжэтаў і моднай «новай драмы» Генрыка Ібсена (п'еса Аляхновіча «Няскончаная драма»).

! У 2011 годзе рэжысёр Тэатра юнага гледача Уладзімір Савіцкі пра свой спектакль «Пан міністр» па п'есе Францішка Аляхновіча сказаў так: «У гэтым творы няма станоўчага персанажа... <...> Такія персанажы ўзнікаюць на зломе часу, калі ўсё неўладкавана, калі згублены арыенціры і зніжаны планкі».

У другой палове 1920-х гадоў у літаратуру прыйшло новае пакаленне паэтаў, якое адстойвала сваю беларускасць насуперак польскім уладам і салідарызавалася з Савецкай Беларуссю: Міхась Машара, Міхась Васілёк, Валянцін Таўлай, Палачанка. У іх творах панавалі матывы свабоды народа, заклікі да вызвалення.

Крытыка і літаратуразнаўства існавалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў форме публічных лекцый, юбілейных артыкулаў з нагоды дня нараджэння або смерці пісьменніка.

У 1930-я гады, пасля польскіх рэпрэсій у дачыненні да беларускіх палітычных партый і суполак, а таксама пасля атрымання звестак пра падзеі на Усходзе, пісьменнікі Заходняй Беларусі падзяліліся паводле сваіх перакананняў на адраджэнцаў-дэмакратаў (Антон Луцкевіч, Уладзімір Самойла, Міхась Машара) і камуністаў (Піліп Пестрак, Валянцін Таўлай, Максім Танк, Анатоль Іверс). У другой палове 1930-х гадоў лідарам заходнебеларускай паэзіі стаў Максім Танк, чыя лірыка хутка дасягнула еўрапейскага ўзроўню.

! **З успамінаў.** Змораны, позна вярнуўся з літаратурнага вечара дамоў. Чытаў «Спатканне», «Да дня», «У маршы», а на «біс» — «Акт першы». Калі падхапілі мяне студэнты і пачалі падкідаць... На вечары былі амаль усе віленскія беларусы, шмат прадстаўнікоў польскай, яўрэйскай, літоўскай інтэлігенцыі і асабліва шмат моладзі — студэнтаў, гімназістаў *(Паводле Максіма Танка. «Лісткі календара»)*.

Нягледзячы на мяжу, паміж Заходняй і Савецкай Беларуссю існавала сувязь, абумоўленая працэсамі нацыянальнай кансалідацыі.



Правообладатель Национальный институт образования

На заходнебеларускую тэматыку пісалі беларускія савецкія пісьменнікі — Янка Купала, Якуб Колас, Уладзімір Дубоўка, Алесь Дудар, Янка Нёманскі.

**Значэнне літаратуры Заходняй Беларусі для беларускага літаратурнага працэсу**

1. Першае беларускае філасофскае эсэ «Адвечным шляхам» напісаў філосаф Ігнат Канчэўскі (Абдзіраловіч[1]). У ім аўтар упершыню дакладна вызначыў нацыянальны характар беларуса, памежнае становішча краіны паміж Усходам і Захадам, сказаў пра ўласны шлях Беларусі.

2. Арыштаваны польскай контрразведкай Алесь Салагуб першы ў заходнебеларускай літаратуры звярнуўся да турэмнай тэматыкі і стварыў вобраз палітвязня, да якога потым звярталіся Максім Танк і Валянцін Таўлай.

3. Змянілі аблічча беларускай літаратуры творы віленскага перыяду Максіма Гарэцкага (рэалізм), драматургія Леапольда Родзевіча (мадэрнізм) і Францішка Аляхновіча («новая драма»), паэзія Уладзіміра Жылкі (рамантызм, сімвалізм), творчасць Вацлава Ластоўскага (неарамантызм) і Максіма Танка (рамантызм, авангардызм).

Такім чынам, феномен літаратуры Заходняй Беларусі праіснаваў дваццаць гадоў і даў падставы сцвярджаць, што літаратурны працэс развіваўся адэкватна грамадска-палітычнай сітуацыі, а самі творы адлюстроўвалі памкненні і мары заходніх беларусаў.

! «Але самае важнае — якая ў Савецкай Беларусі расце вялікая і сапраўдная літаратура! Аж зайздросна. Бо ў нас не толькі няма ў каго павучыцца, але з кім у ахвоту падужацца. Сёння Заходняя Беларусь — мяшок, завязаны паліцэйскім бізуном... дзе з-за адсутнасці свежага паветра пачынае гаснуць усякае святло — нават лучына» *(Максім Танк. «Лісткі календара»)*.

Пісьменнікі Заходняй Беларусі сачылі за падзеямі беларусізацыі пачатку 1920-х гадоў у Савецкай Беларусі, і многіх гэта натхніла на пераезд (напрыклад, так зрабілі Максім Гарэцкі, Вацлаў Ластоўскі, Уладзімір Жылка, Францішак Аляхновіч). Але беларусізацыя хут-

[1] Філосаф і пісьменнік Ігнат Канчэўскі, прачытаўшы «Дзве душы» Максіма Гарэцкага, дзе галоўным героем з'яўляецца Ігнат Абдзіраловіч, узяў сабе за псеўданім яго прозвішча.



Правообладатель Национальный институт образования

ка згарнулася. У 1930-я гады многія з гэтых пісьменнікаў сталі ахвярамі рэпрэсій.

Разгледзім адрозненні ва ўмовах існавання беларускай літаратуры ва Усходняй (Савецкай) і Заходняй Беларусі.

| Заходняя Беларусь (цэнтр — Вільня) | Усходняя (Савецкая) Беларусь (цэнтр — Мінск) |
|---|---|
| **Погляды на будучыню Беларусі** | |
| 1. Знаходзячыся фактычна пад юрысдыкцыяй Польшчы, многія пісьменнікі выступалі за тое, каб Беларусь была **незалежнай дзяржавай** (Вацлаў Ластоўскі, Максім Гарэцкі, Уладзімір Жылка).<br>2. Пісьменнікі — члены Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (Максім Танк, Валянцін Таўлай) падтрымлівалі **Савецкую Беларусь** | 1. За існаванне Беларусі як **незалежнай дзяржавы** былі пісьменнікі-нашаніўцы (Янка Купала, Якуб Колас). Да іх далучыліся некаторыя маладыя аўтары (Уладзімір Дубоўка, Міхась Чарот).<br>2. Пасля ўтварэння СССР маладзейшае пакаленне пісьменнікаў (маладнякоўцы) падтрымлівала ўладу **Савецкай Беларусі** |
| **Эстэтычныя погляды і вядучыя ідэі** | |
| 1. Літаратура працягвала патрыятычную лінію нашаніўскага часу, служыла змаганню супраць польскіх улад.<br>2. Рэвалюцыйны рамантызм (Максім Танк, Міхась Васілёк).<br>3. Рэалізм і экзістэнцыяльнае светаадчуванне (Максім Гарэцкі).<br>4. Адраджэнскія погляды (Уладзімір Жылка, Міхась Машара, Ігнат Канчэўскі) | 1. Літаратура служыла дзяржаўнай палітыцы новай беларускай рэспублікі.<br>2. Рэвалюцыйны рамантызм і неарамантызм (Міхась Зарэцкі).<br>3. Рэалізм і мадэрнісцкія плыні (сімвалізм, экспрэсіянізм, імпрэсіянізм і інш.) у творах сяброў літаратурных арганізацый («Маладняк», «Узвышша»).<br>4. Патрабаванне ўніфікацыі эстэтычных напрамкаў і вымушаны пераход усіх творцаў да сацыялістычнага рэалізму ў 1930-я гады |

1. Якія літаратурныя аб'яднанні з'явіліся ў 1920-я гады? У чым адрозненне мастацкіх прынцыпаў прадстаўнікоў гэтых аб'яднанняў?
2. Чаму ў пачатку 1930-х гадоў літаратурныя аб'яднанні адначасова зніклі? Якая арганізацыя замяніла іх?
3. Які ўплыў на літаратуру зрабіў сацыялістычны рэалізм?



Правообладатель Национальный институт образования

4. Правядзіце міні-даследаванне «Літаратары з маёй малой радзімы, якія пачалі свой творчы шлях у 20—30-я гады XX стагоддзя».

5. Намалюйце эмблемы (лагатыпы) для літаратурных аб'яднанняў 1920—1930-х гадоў. Якія сімвалы вы выкарыстаеце і чаму?

6. Што было агульнага ў эстэтычных і грамадска-палітычных поглядах пісьменнікаў Заходняй і Усходняй Беларусі?

# *Максім Гарэцкі*

(1893—1938)

**1.** Падумайце, якія адрозненні маюць філасофская, інтэлектуальная, гістарычная і ваенная проза. **2.** Патлумачце значэнне слова «хутар». Чым хутар адрозніваецца ад вёскі?

Максім Гарэцкі раней за замежных пісьменнікаў «страчанага пакалення» (напрыклад, Рэмарка) напісаў мастацка-дакументальныя творы пра вайну, але аўтар быў рэпрэсіраваны і забыты на паўстагоддзя. А праз 100 гадоў пасля Гарэцкага менавіта за мастацка-дакументальныя творы беларуская літаратура атрымала сваю першую Нобелеўскую прэмію.



Максім Гарэцкі нарадзіўся 18 лютага 1893 года ў вёсцы Малая Багацькаўка ў беднай сялянскай сям'і. Але бацькі пастараліся яго вывучыць: пасля Вольшынскай двухкласнай школы і настаўніцкіх класаў, якія давалі права вучыць грамаце дзяцей, ён быў прыняты ў Горацкае каморніцка-агранамічнае вучылішча на казённы кошт. У час вучобы дэбютаваў з літаратурным творам — апавяданнем «У лазні» (1913).

У 1914 годзе пачалася Першая сусветная вайна, і Гарэцкі падаў заяву аб залічэнні ў «вольнапісаныя» ў войска Расійскай імперыі, часткай якой у той час была Беларусь. На фронце быў цяжка паранены. Акрыяўшы пасля ранення, зноў трапіў на фронт — ужо ў званні прапаршчыка.



Правообладатель Национальный институт образования

У першы перыяд творчасці (1913—1914) Максім Гарэцкі замацаваў у беларускай літаратуры сацыяльна-псіхалагічнае апавяданне, у якім акцэнтаваў станоўчыя моманты сялянскага жыцця: пісьменнік праводзіў героя ад негатыўнай ацэнкі традыцыйнага вясковага жыцця да веры ў тое, што навука і культура выведуць беларускую вёску з цемры. Максім Гарэцкі першым сказаў пра неабходнасць берагчы нацыянальную інтэлігенцыю.

Галоўны герой ранніх твораў — адукаваны хлопец, які сутыкаецца з вясковым асяроддзем, цёмнымі і абыякавымі да свайго жыцця людзьмі. Герой, выхадзец з вёскі, перажывае дваістасць сітуацыі: ён ужо не свой сярод сялян і яшчэ не свой у горадзе. Асваенне магчымасцей інтэлектуальнай, філасофскай прозы пачалося цыклам «Што яно?». Пры гэтым філасофскае паказвалася ва ўзаемасувязі з сацыяльна-палітычным: закаснелае грамадства, якое баіцца ўсяго новага, наўрад ці здатнае да пошукаў ісціны, пазнання чалавека і прыроды.

**Навукоўцы гавораць.** «Найперш... у даробак беларускай літаратуры Максім Гарэцкі, поплеч з Якубам Коласам, стварыў тып беларускага інтэлігента — чалавека рэфлексуючага» *(Людміла Корань. «Дынаміка жанравых структур у беларускай прозе XX ст.»)*.

Пісьменнік звярнуўся да твораў гістарычнай тэматыкі: паказаў, як беларусы змагаюцца за незалежнасць, і асуджаў здраду нацыянальным інтарэсам.

У драматызаванай аповесці «Антон» пісьменнік прапанаваў узор сацыяльнай аналітыкі. Не проста паказаў сюжэтныя калізіі, але патлумачыў вытокі трагедыі, як канкрэтная рэчаіснасць прывяла галоўнага героя да дэфармаваных уяўленняў пра жыццё і справядлівасць.

У творчасці пісьменнік хутка прыйшоў да паяднання двух літаратурных метадаў — рэалістычнага і мадэрнісцкага (лірыка-экспрэсіўнага).

У 1917 годзе цяжка захварэў і быў дэмабілізаваны ў Смаленск для лячэння. Пачаў супрацоўнічаць з мясцовымі газетамі. У 1918 годзе разам з Янкам Купалам Максім Гарэцкі быў слухачом факультэта гісторыі мастацтваў смаленскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута, але вучыцца не змог з-за недахопу часу.

У другі перыяд творчасці (1915—1918) вельмі змяніліся герой і пафас твораў Максіма Гарэцкага. У ранніх тэкстах герой верыў у сілу



Правообладатель Национальный институт образования

асветы, бачыў перспектыву, якая падсвечвалася аўтарскім аптымізмам. Цяпер героямі сталі ахвяры вайны — і пісьменнік засяродзіўся на тыповых характарах.

Максім Гарэцкі прыйшоў да высновы, што герой, нават ахвяра сацыяльнага ладу і злой людской волі, сам адказны за свае ўчынкі і справы. Творчасць гэтага перыяду, які супадае па часе з Першай сусветнай вайной, прасякнута антываенным пафасам.




Вокладка кнігі Максіма Гарэцкага «Гісторыя беларускае літэратуры» (1920)

У 1919 годзе пераехаў у Вільню разам з рэдакцыяй газеты «Звязда» і ў гэтым жа годзе ажаніўся з настаўніцай Віленскай Беларускай гімназіі Леанілай Чарняўскай. У іх нарадзілася двое дзяцей.

У пачатку 1920-х гадоў пісьменнік быў удзельнікам многіх гурткоў і, адпаведна, быў знаёмы з іх кіраўнікамі і ўдзельнікамі — Антонам Луцкевічам, Францішкам Аляхновічам. У 1923 годзе Гарэцкі разам з сям'ёй атрымаў у Варшаве дазвол на пераезд у БССР. Сям'я жыла ў Мінску і Горках.

У трэці перыяд (1919—1923) пісьменнік шмат займаўся навукова-метадычнай дзейнасцю і стварыў «Гісторыю беларускае літэратуры», на якую абапіраліся ўсе наступныя пакаленні літаратуразнаўцаў.

> **Навукоўцы гавораць.** «Ведама: дрэнна крытыка такая, што крытыкуе не творы, а аўтара. <...> Што значыць крытыкаваць творы? Па-мойму, крытыкаваць — значыць шукаць таго ж, чаго шукаў аўтар, і рабіць думку яго яснейшай чытачу...» *(Максім Гарэцкі)*.

У прозе гэтага перыяду (культавая аповесць «Дзве душы» і інш.) раскрывалася тэма рэвалюцыі, новай улады і яе стаўлення да беларусаў. Галоўны герой Ігнат Абдзіраловіч — сялянскі сын, які яшчэ немаўляткам быў падменены на панскага сына, свайго равесніка. У творы паказваецца эвалюцыя поглядаў героя, які не змог прыняць ідэалогію рэвалюцыйнай барацьбы, бо яна прыводзіла да гвалту, жорсткасці і бессэнсоўнай гібелі людзей.

У чацвёрты, савецкі, перыяд (1923—1937) пісьменнік завяршыў адзін з першых дакументальных твораў у беларускай літаратуры — «На імперыялістычнай вайне». Вайна ўпершыню была паказана з пунк-



Правообладатель Национальный институт образования

ту гледжання яе радавога ўдзельніка. У «Сібірскіх абразках» пісьменніка найбольш хвалявала пытанне абароны нацыянальных інтарэсаў беларусаў: ці можна захаваць сваю культуру без дзяржаўнасці? «Сібірскія абразкі» — незавершаны цыкл апавяданняў і замалёвак, дзе закранаецца тэма беларускіх перасяленцаў у Сібіры. Гарэцкі ў 1926 годзе ездзіў збіраць матэрыял для гэтага цыкла і новага твора — «Камароўскай хронікі» — у далёкі Благавешчанск.




Вокладка аповесці Максіма Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне» (1925)

У сваёй галоўнай кнізе «Камароўская хроніка» ў летапіснай дзённікавай манеры і ў форме перапіскі Максім Гарэцкі знітаваў пабытавае жыццё герояў і грамадска-палітычныя падзеі.

У рамане-хроніцы «Віленскія камунары» Максім Гарэцкі развіў думку, якая была агучана яшчэ ў аповесці «Дзве душы», а таксама паказаў, што людзі ў глыбінцы не разумелі рэвалюцыі, а экскурс у гісторыю роду Мышкаў выявіў вытокі трагедыі беларускага народа.

Развітальны твор Максіма Гарэцкага «Скарбы жыцця» — гэта і філасофская прыпавесць, і пісьменніцкая споведзь, і прароцтва. Аўтабіяграфічны апавядальнік, як і пісьменнік у час напісання твора, знаходзіўся на мяжы жыцця і смерці. А таму асноўнымі ў «Скарбах жыцця» сталі такія філасофскія матывы, як вечнасць, шлях, маўчанне, холад, небыццё і збавенне, што стылёва набліжала тэкст да своеасаблівага галашэння. Ён завяршаецца так: «Браму скарбаў сваіх зачыняю. Цану рэчам пазнаў. Людзей да самых глыбінь уведаў. Жыццём даражыць навучыўся».

У 1938 годзе Максім Гарэцкі быў рэпрэсіраваны, а яго творы, якія да 1930 года актыўна выдаваліся, чыталіся і разглядаліся ў навучальных установах, былі ўзорам для пісьменнікаў-пачаткоўцаў, аказаліся забароненымі на некалькі дзесяцігоддзяў. Толькі ў 1960-я гады яго творчасць пачала вяртацца ў літаратурны працэс: з'яўляліся кнігі навукоўцаў Дзмітрыя Бугаёва, Алеся Адамовіча, Міхася Стральцова, прысвечаныя творчасці і лёсу пісьменніка. Сёння Максім Гарэцкі з'яўляецца бясспрэчным класікам беларускай літаратуры, але яго ўплыў на развіццё айчыннай культуры мог бы быць непараўнальна большы.



Правообладатель Национальный институт образования

**Уклад у развіццё літаратуры**

1. Максім Гарэцкі стварыў канцэпцыю беларускага нацыянальнага характару, прааналізаваўшы спецыфіку беларускай самаідэнтыфікацыі.

2. Заснаваў традыцыю філасофскай, інтэлектуальнай, гістарычнай, ваеннай прозы (з антываенным пафасам і асуджэннем вайны). Даў беларускай літаратуры першыя ўзоры сацыяльна-псіхалагічнага апавядання.

3. У адрозненне ад многіх сваіх сучаснікаў змог па-мастацку асэнсаваць рэвалюцыю і савецкую ўладу з беларускіх пазіцый і выказаць гэта ў творах.

4. Пачаў асэнсоўваць тэму бяспраўнасці чалавека. Напісаў адзін з першых у Савецкай Беларусі лагерных дзённікаў («Лявоніус Задумекус»).

5. Максім Гарэцкі «стаў заснавальнікам гісторыка-літаратурнай канцэпцыі і прынцыпаў навуковага даследавання літаратуры мінулага, заснавальнікам школьнага і акадэмічнага літаратуразнаўства» *(Зоя Мельнікава).* Большасць навуковых ідэй Максіма Гарэцкага была скарыстана яго паслядоўнікамі, часта без спасылкі на забароненага аўтара.

6. Як Аляксандр Герцэн і Мікалай Чарнышэўскі сфармулявалі галоўныя пытанні для рускай культуры ў XIX стагоддзі — «хто вінаваты?» і «што рабіць?», так Максім Гарэцкі сфармуляваў галоўнае пытанне для беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя — «за што?».

1. Чаму для пісьменніка важна менавіта асуджэнне вайны?
2. Якія тэмы і жанры Максім Гарэцкі распрацаваў адным з першых у беларускай літаратуры?
3. Як класік ацэньваў рэвалюцыю? Чаму?
4. Чаму творы Максіма Гарэцкага, напісаныя ў 1930-я гады, былі надрукаваны толькі ў 1960-я?
5. Які ўклад пісьменнік унёс у беларускую літаратурную крытыку?

## Апавяданне «Літоўскі хутарок»

**Аўтабіяграфічнасць апавядання.** У апавяданні «Літоўскі хутарок» (1915) расказваецца пра падзеі Першай сусветнай вайны і раскрываецца яе антычалавечная сутнасць на прыкладзе сям'і Яна Шымкунаса. Максім Гарэцкі быў удзельнікам ваенных дзеянняў і, у адрозненне ад некаторых пісьменнікаў-сучаснікаў (напрыклад, італьянскіх або расійскіх футурыстаў), якія цынічна апявалі вайну, разумеў яе як найвялікшую трагедыю, пасля якой існаванне чалавека і дзяржавы



Правообладатель Национальный институт образования

не можа быць ранейшым. Апавяданне стала ўзорам сацыяльна-псіхалагічнай прозы.

Пры гэтым пісьменніку вайна была важная не толькі як тэма твораў. Ён, відавочна, разважаў пра тое, як трэба пісаць пра яе, якая роля пісьменнікаў у стварэнні вобраза вайны і яе ўдзельнікаў. У аглядавай працы «Беларуская літаратура пасля "Нашае нівы"» (1928) Максім Гарэцкі пісаў: «Дагэтуль не даследавана пытанне, як беларускія паэты і пісьменнікі прынялі імперыялістычную вайну. А ў сувязі з гэтым пытаннем цікава было б прасачыць у сусветнай гісторыі літаратуры, як наогул уплывае на літаратурную творчасць вайна, рэвалюцыя і ўсякая вялікая катастрофа ў жыцці людзей»[1].

Асабістыя ваенныя ўражанні Максіма Гарэцкага несумненна давалі яму матэрыял для творчасці. Але праца пісьменніка-інтэлектуала якраз і заключалася ў тым, каб ад апісальнасці і сюжэтнасці ўзняцца да асэнсавання вайны і яе значэння для беларусаў і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей, чые жыцці закраналіся ваеннымі падзеямі і чые дзяржаўныя і нацыянальныя інтарэсы не бараніліся.

**Трагізм лёсу герояў.** У апавяданні пісьменнік паказаў, як Першая сусветная паўплывала на жыцці мірных жыхароў, ён адлюстраваў жах і бруд вайны, якая перамалола лёсы ні ў чым не вінаватых людзей. На ціхім хутары жыла сям'я Шымкунасаў: Ян, яго жонка Даміцэля, дочкі Монця і Ядвіська. Сыны Шымкунаса пайшлі ў вялікі свет: Блажыс служыў апошні год у войску, а Дамянік працаваў у шахтах.

Спачатку гаспадару не верылася, што вайна зачэпіць іх хутар: «Няго тут на маім родным полі, блізка хаты маёй страляць будуць? І тутака ляжаць будуць забітыя? Не, не можа таго быць! А то што ж тады? — во праз што млела сэрца ў старога». Пацію прыходзіла хваляванне за сваю гаспадарку, якая карміла сям'ю: «Баюся, што хлеб сабраць не паспею. Збяру ў гумно, што ёсць, а прыйдуць свае ці чужыя — і спаляць».

У хуткім часе высветлілася, што ў цэнтры баявых дзеянняў і нейтралітэт немагчымы, і ветлівая камунікацыя з салдатамі не гарантуе спакою: «Ян нікога не разумее. Учора ён раздарыў шмат хлеба і сала. Так, па-хрысціянску, без грошай. І прыемна самому было. Яму і цяпер не шкода. Толькі нашто ўсё руйнуюць. Прыкрасць».

---

[1] Праз 4 гады пасля смерці Гарэцкага яго ідэю пра супастаўленне ўсіх твораў пра вайну рэалізаваў Эрнэст Хэмінгуэй у анталогіі «Людзі на вайне» (1942), прыйшоўшы да гэтай думкі незалежна ад беларускага аўтара.



Правообладатель Национальный институт образования

Сыходзілі расійскія салдаты, пачыналася кайзераўская акупацыя. У выніку гаспадарка Яна Шымкунаса амаль знішчана, жонка аслепла, сын Блажыс паранены, дачку Монцю згвалцілі ворагі.

Расійскае войска наступала, але потым зноў сыходзіла, і хутар чакала кароткая передышка, каб у чарговы раз чарговае войска прыйшло і абрабавала, прынізіла, знішчыла людзей і маёмасць.

**Антываенная скіраванасць твора.** Праз жыццё маленькага хутара пісьменнік паказаў разбуральнае дзеянне вайны, калі не працуюць законы, калі няма праўды. Паводле Максіма Гарэцкага, вайна — гэта вялікая катастрофа, пасля якой ніхто не зможа застацца ранейшым: ні ўдзельнікі франтавых падзей, ні жыхары акупаваных тэрыторый. Вайна знішчыла ў людзях індывідуальнае, асабістае, яны ўсе пераўтварыліся ў функцыі: вайскоўцы бачыліся як безаблічныя фігуркі, безыменных забітых за ногі скідвалі ў брацкія магілы, а мірныя жыхары разглядаліся як бясплатная крыніца ежы і рэчаў. А калі ў людзях не бачыць асоб, то і павагі да іх няма, і іх жыццё абясцэньваецца. Чалавек страчвае кантроль над сваім жыццём і робіцца ахвярай сітуацыі. Таму напрыканцы твора жыхары хутара адчувалі сябе «як пакінутыя на загубу»: без перспектывы, без будучыні.

**Навукоўцы гавораць.** «У заслугу маладому пісьменніку трэба паставіць і тое, што ён ці не адным з першых у беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя закрануў надзвычай актуальную і палітычна вострую тэму — прэтэнзіі акупантаў на нацыянальную выключнасць» *(Міхась Мушынскі. «Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі»)*.

Максім Гарэцкі зафіксаваў расісцкія погляды германскіх салдат і афіцэраў, паказаўшы, што яны лічылі мясцовае насельніцтва «заняпалым народам», а сваю культуру — вышэйшай.

**Чалавек і абставіны ў творы.** Галоўным ідэйна-сэнсавым цэнтрам апавядання, паводле літаратуразнаўца Міхася Мушынскага, з'яўляецца сюжэтная калізія пра згвалтаванне Монці.

Гэта падзея паказала, наколькі людзі бездапаможныя перад жахлівымі абставінамі. Цнатлівая, выхаваная ў адпаведнасці з хрысціянскай мараллю, Монця ўжо ніколі не зможа быць ранейшай. Яна знайшла падтрымку ў маці і святара, але пачала сумнявацца ў сваёй веры, калі казала пра тое, што лепей бы ёй памерці, чым пераажыць такія катаванні, што яна не хоча магчымае дзіця: «Бог дасць дзіва, і ўсё абыдзецца так, як Богу заўгодна. — А калі не будзе дзіва? Не магу я маліцца і жыць не хачу».



Правообладатель Национальный институт образования

Максім Гарэцкі свядома ўвёў у твор згадку пра Боскае заступніцтва за нявінных ахвяр, на той момант ён лічыў, што няшчасныя людзі павінны знайсці ўратаванне на зямлі, а не на небе. І маці, і святар успрынялі здарэнне з Монцяй як жахлівае, але нібыта абстрактнае выпрабаванне, хоць у гвалце заўжды вінаваты гвалтаўнік. Максім Гарэцкі падкрэслівае віну чалавека за злачынствы, забойствы і разбурэнні.

**Літаратурныя сувязі.** Апавяданне «Літоўскі хутарок» і аповесць «На імперыялістычнай вайне» аказалі ўплыў на Васіля Быкава, таксама, як лаканічнасць формы і нервовая дваістасць герояў былі блізкія Міхасю Стральцову *(Паводле Таццяны Багарадавай)*.

1. Якая першая рэакцыя жыхароў хутара на навіны пра вайну?
2. Як мясцовыя жыхары і салдаты (рускага і нямецкага войскаў) ставяцца адзін да аднаго?
3. Вызначце ролю кунігаса (святара) у жыцці хутара.
4. Як і з якой мэтай пісьменнік апісвае знешнасць Монці і Ядвісі?
5. Што ў жыцці хутаран залежала ад іх саміх, а што — не?
6. Вылучыце мастацкія дэталі твора, якія ўказваюць на бесчалавечнасць вайны.
7. Прыдумайце альтэрнатыўны (іншы) фінал твора.
8. Растлумачце, чаму падчас вайны салдаты бесчалавечна абыходзіліся з мірнымі жыхарамі, абясцэньвалі іх жыцці. Ці ўсе яны былі злымі людзьмі ў мірны час? Падумайце, ці спрыяе вайна злачынству.
9. Выканайце заданне «Хвіліна маўлення» па творчасці Максіма Гарэцкага.

Аповесць «Дзве душы»

## Тэорыя літаратуры

### Аўтабіяграфізм і дакументалізм

***Аўтабіяграфізм*** і ***дакументалізм*** — выяўленне ў мастацкіх творах фактаў з асабістага жыцця пісьменніка (аўтабіяграфізм) або згадванне ў творах рэальных падзей з жыцця людзей ці гісторыі пэўнай краіны, выкарыстанне рэальных фактаў, а таксама дакументаў (дакументалізм).



Правообладатель Национальный институт образования

У аўтабіяграфічных творах (мемуары, дзённікі) і тэкстах дакументальных жанраў (летапісы, хронікі, жыціі, перапіска, нарысы, мастацкія біяграфіі, інтэрв'ю) падзеі, людзі і мясцовасці выступаюць пад сваімі рэальнымі найменнямі.

Адзін з першых беларускіх аўтабіяграфічных твораў XX стагоддзя — нарыс Цёткі «Успаміны з паездкі ў Фінляндыю».

> **!** «Выпечаны румянец на твары, кашаль сухі і схварэлае цела адразу людзям кажуць пра маю цяжкую хваробу. Пасажыры ахвотна ўступаюць месца. У вачах іх я бачу, што шкадуюць маёй маладосці. Закрываю вокі. Не хачу відзець іх жаласці, бо веру, што ашукаю ваш жаль, людзі добрыя, што змагу (перамагу. — *Аўт.*) цябе, смерць лютая, а цвёрдае жыццё вазьму ў свае рукі і буду з яго працы доўгую нітку быцця, унізваючы, як белымі перламі, працавітыя дні неслухмянай долі...» *(Цётка. «З дарогі»).*

Часта цікавасць грамадства да дакументальнай літаратуры ўзрастала ў складаныя гістарычныя перыяды, на зломе эпох, калі ўзнікала неабходнасць асэнсаваць, адрэфлексаваць значныя падзеі, выпрацаваць стаўленне грамадства да іх.

Часам узнікненне дакументальнага тэксту было абумоўлена спецыфікай таленту аўтара, асаблівасцямі яго біяграфіі. Так, напрыклад, фіксаваў заходнебеларускія рэаліі ў дзённіку «Лісткі календара» Максім Танк. Ядвігін Ш. асэнсоўваў ва «Успамінах» спецыфіку навучання ў школе Камілы Марцінкевіч, дачкі Дуніна-Марцінкевіча. Насычанае грамадскае жыццё актрысы і пісьменніцы Паўліны Мядзёлкі дало нашай літаратуры ўспаміны «Сцежкамі жыцця».




Вокладка зборніка «Я з вогненнай вёскі...» Алеся Адамовіча, Янкі Брыля, Уладзіміра Калесніка (1983)

Першыя дакументальныя творы належаць Максіму Гарэцкаму. Самыя вядомыя ў свеце беларускія дакументальныя тэксты — кнігі Алеся Адамовіча, Янкі Брыля, Уладзіміра Калесніка пра спаленыя вёскі і творы нобелеўскай лаўрэаткі Святланы Алексіевіч.

У дакументальны зборнік «Я з вогненнай вёскі» Алеся Адамовіча, Янкі Брыля, Уладзіміра Калесніка ўвайшлі ўспаміны выжыўшых жыхароў вёсак, спаленых фашыстамі падчас Вялікай Айчыннай вайны: аповеды пра вынішчэнне беларусаў, спаленне сем'яў, расстрэлы.



Правообладатель Национальный институт образования

Беларускія дакументальныя творы прысвечаны розным тэмам: ад лёсаў жанчын на вайне, трагедый сведкаў чарнобыльскай аварыі да прыватнага жыцця класікаў і нават літаратурных містыфікацый.

Вацлаў Ластоўскі

Фантас-тычная аповесць

1. Ці могуць спалучацца ў творы мастацкія і дакументальныя элементы? Паразважайце над наступным пытаннем: «Дакументальны твор — гэта абсалютная праўда або не?».
2. Чаму рэальныя людзі ў аўтабіяграфічных або дакументальных творах могуць выступаць пад псеўданімамі або ініцыяламі?
3. Для якіх навук маюць каштоўнасць аўтабіяграфічныя і дакументальныя творы?

# *Змітрок Бядуля*

(1886—1941)

**1.** Звярніце ўвагу на гады жыцця пісьменніка. Як называлася Беларусь на працягу гэтых гадоў? **2.** З якімі творамі аўтара вы знаёміліся?

У сям'і будучага пісьменніка ўсе валодалі нейкім рамяством. Маці шыла каптуры, дзед Лейзар рабіў меднае начынне — імбрыкі[1], конаўкі[2], чарпакі, місы. Ды і Змітрок Бядуля вучнем падзарабляў разьбой па дрэве. Выразаў для аднакласнікаў пеналы, скрынкі, нават цацачныя скрыпачкі.

Змітрок Бядуля (Самуіл Плаўнік) нарадзіўся 23 красавіка 1886 года ў сям'і балагола — возчыка на лесасплаве. Жыла сям'я на Вілейшчыне, у вёсцы Пасадзец.



Бацькі аддалі хлопчыка вучыцца ў пачатковую школу, а пазней — у семінарыю.

Шкаляры сталаваліся ў мясцовых жыхароў. За сямю сем'ямі быў «замацаваны» вучань, і ён па днях тыдня харчаваўся ў кожным доме.

[1] *Імбрык* — медны чайнік.
[2] *Конаўка* — кубак з ручкай.



Правообладатель Национальный институт образования

Ра́біна з хлопца не атрымалася: падзарабляючы напісаннем асабістых лістоў ад дзяўчат да жаніхоў, ён наслухаўся рамантычных гісторый і стаў складаць уласныя вершы, прысвечаныя неіснуючай дзяўчыне Мірыям: «Ты мне даражэй за жыццё. Ты — маё неба. Ты — мая зямля. Ты — маё шчасце. Ты звіла навекі гняздо ў маім сэрцы. Мірыям... Мірыям... Я гляджу на зоркі і думаю, што гэта твае вочы. Я слухаю песні салоўкі і думаю, што гэта твой голас». Чуткі пра запісы юнага паэта дайшлі да духоўнага інспектара семінарыі, у якой не ўхвалялася не тое што пісаць — нават чытаць свецкія кнігі. Гэта паслужыла нагодай да выключэння Самуіла.

Хлопец вучыўся самастойна — дома і ў бібліятэцы, падзарабляў хатнім настаўнікам. У дарослым узросце пісьменнік валодаў некалькімі мовамі (беларускай, нямецкай, рускай, ідыш, старажытнаяўрэйскай, крыху польскай), быў вельмі адукаваным чалавекам. У 1902 годзе, падвучыўшыся ў бацькі, малодшы Плаўнік пайшоў працаваць канторшчыкам на лесараспрацоўкі.

Праз дзесяць гадоў Змітрок Бядуля накіраваўся ў Вільню. Якраз на гэты час прыпаў росквіт яго таленту.

! Першы апублікаваны ў «Нашай ніве» твор пісьменніка «Пяюць начлежнікі» (1910) — імпрэсіянісцкі.

У 1913 годзе ў Пецярбургу, у выдавецтве «Загляне сонца і ў наша аконца», выйшаў яго зборнік лірычных імпрэсій «Абразкі». Калі ў 1914 годзе Купала ўзначаліў «Нашу ніву», Змітрок Бядуля стаў адказным сакратаром рэдакцыі.

У 1915 годзе ён вымушаны быў пераехаць у Мінск. Пачалася Першая сусветная вайна — і Бядуля ўладкаваўся ў Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, зняў кватэру, дзе на два гады прытуліў Максіма Багдановіча.

Падчас рэвалюцыі таленавіты лірык друкаваўся ў газеце «Вольная Беларусь». У гады нямецкай акупацыі Беларусі (1915—1918) Бядуля друкаваўся ў газеце «Беларускі шлях», а пры польска-савецкай вайне рэдагаваў часопіс «Беларускае жыццё».

У савецкі час Змітрок Бядуля супрацоўнічаў з газетай «Савецкая Беларусь» і быў рэдактарам аднаго з першых дзіцячых часопісаў «Зоркі». Выданне стала лагічным працягам той працы, якую праводзіла Цётка ў «Лучынцы» — Змітрок Бядуля актыўна друкаваў у



Правообладатель Национальный институт образования

часопісе ўласныя творы для дзяцей, уключаў тэксты пазнавальнага, выхаваўчага зместу Янкі Купалы, Якуба Коласа, Міхася Чарота, Янкі Журбы, таксама песні з нотамі, гульні, народныя казкі, загадкі, прыказкі.

З 1926 года пісьменнік загадваў краязнаўча-этнаграфічным часопісам «Наш край» пры Інстытуце беларускай культуры. У 1923 годзе Змітрок Бядуля ўвайшоў у новастворанае літаратурнае аб’яднанне «Маладняк», а пазней — ва «Узвышша». Пасля роспуску літаратурных аб’яднанняў быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў БССР.




Вокладка дзіцячага часопіса «Зоркі» (1921)

**Літаратурныя сувязі.** У 1921 годзе Якуб Колас прысвяціў Змітраку Бядулю адну са сваіх «Казак жыцця» — «Кучаравае дрэва». Назва была звязана са знешнасцю Бядулі і яго каранямі. Кучаравае, адрознае ад іншых дрэва з твора Якуба Коласа гаворыць: «Так сталася. Я тут вырасла. Сокі гэтай зямлі, куды ўрасло маё карэнне, пераліліся ў сэрца маё і ў думкі мае, і гучаць яны ў песнях маіх...»

Вялікая Айчынная вайна прымусіла пісьменніка пакінуць Беларусь. Ён апынуўся ў Саратаўскай вобласці, дзе нарэшце злучыўся з сям’ёй, якая з’ехала раней. Здароўе падводзіла — і ў 1941 годзе ва Уральску падчас аднаго з пераездаў, даганяючы цягнік, Змітрок Бядуля памёр ад інфаркту. Хавалі пісьменніка акцёры Другога беларускага дзяржаўнага тэатра (сёння Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа (Віцебск)), якія гастралявалі недалёка: яны ўрачыста чыталі яго творы каля труны.

**Уклад у развіццё літаратуры**

1. Як Максім Багдановіч праз адаптацыю еўрапейскага вопыту жанрава ўзбагачаў беларускую паэзію, так Бядуля — жанры беларускай прозы.
2. Змітрок Бядуля даў нацыянальнай літаратуры ўзоры мадэрнісцкіх твораў.
3. Бядуля і Багдановіч надалі беларускай літаратуры «адзнаку інтэлігентнасці, культ пачуцця» *(Віктар Каваленка).*
4. Пісьменнік стаў распрацоўшчыкам беларускай літаратурнай казкі («Мурашка-палашка», «Скарб»). Позняя творчасць Змітрака Бядулі ў гэтым



Правообладатель Национальный институт образования

жанры ўзнімалася да высокага філасофскага абагульнення, глыбокага разумення быцця («Сярэбраная табакерка»).

5. Мова твораў Змітрака Бядулі была настолькі апрацаваная і багатая, што само існаванне яго тэкстаў паўплывала на плённае развіццё беларускай літаратурнай мовы.

1. Паводле відэаматэрыялаў інтэрнэту ўстанавіце: а) што для пісьменніка значыла дата 23 верасня 1910 года; б) на якіх мовах пачынаў пісаць Змітрок Бядуля; в) якую дапамогу ён аказваў бежанцам падчас Першай сусветнай вайны; г) чаму ў краязнаўчым музеі горада Уральска (Казахстан) ёсць экспазіцыя, прысвечаная Змітраку Бядулю?
2. Здыміце ўласны відэаролік-апытанку «Што ведаюць вучні пра Змітрака Бядулю?».
3. Якія літаратурныя жанры распрацоўваў Змітрок Бядуля?
4. Назавіце напрамкі тагачаснай еўрапейскай мастацкай літаратуры, што аказалі ўплыў на творчасць пісьменніка.

Лірычныя мініяцюры

## Апавяданне «Бондар»

Эвалюцыя творчасці Змітрака Бядулі ішла паралельна з усёй літаратурай: калі фарміраваліся малая проза, апавяданне, потым аповесць і раман, у Змітрака Бядулі з'яўляліся абразкі і імпрэсіі (зборнік «Абразкі»), затым навелы і апавяданні (зборнік «Дэлегатка»), аповесці («Салавей»), а пазней і раман («Язэп Крушынскі»). Абразкі, імпрэсіі і навелы Змітрака Бядулі далі падмурак для станаўлення беларускага апавядання, а пасля — і аповесці, і рамана.

***Абразок*** — замалёўка са слаба разгорнутым сюжэтам або бессюжэтная, у якой узмоцнены вобразна-экспрэсіўны пачатак, паяднаны змест выказвання і настраёвасць.

***Імпрэсія*** — невялікі празаічны або вершаваны твор, у якім карціна жыцця адлюстроўваецца як момант, выхаплены з гісторыі, які суправаджаецца выражэннем эмоцый, пачуццяў і імгненных уражанняў аўтара.

Змітрок Бядуля прыйшоў у слоўнае мастацтва падчас станаўлення новай беларускай літаратуры, якая вялікімі тэмпамі наганяла страчанае ў двухсотгадовай адсутнасці друку на роднай мове. Нацыянальная адметнасць беларускага слова нараджалася не толькі з фальклорнай спадчыны, але з творчага ўзаемадзеяння з суседнімі літаратурамі.



Правообладатель Национальный институт образования

> ***Навела*** — апавядальны жанр, які характарызуецца напружаным, драматычным дзеяннем, лаканічным паказам не столькі знешніх падзей, колькі перажыванняў і настрою персанажаў, нечаканым фіналам.

У гэтых працэсах сваімі творамі актыўна ўдзельнічаў Змітрок Бядуля.

Апавяданне «Бондар»[1] з'явілася ў 1920 годзе ў газеце «Беларусь». У ім выявіўся талент Бядулі-апавядальніка. У творы спалучыліся лірычны пачатак (напрыклад, рытмізаваная паралельная структура сказаў, шчодрасць на выяўленчыя сродкі) і эпічная форма (напрыклад, строгае следаванне структуры сюжэта). Трэба адзначыць сціпласць тэксту, якая надае твору рысы прыпавесці. Пісьменнік строга адабраў і захаваў толькі тыя элементы гісторыі, без якіх немагчыма перадаць яе трагізм. Кожная частка, абзац, сказ, слова працуюць на выяўленне задумы, ідэі.

Гэта апавяданне не толькі пра бондарства, але пра мастацтва і мастака. Пра ахвярнасць, якой патрабуе высокае майстэрства; апантанасць, без якой немагчыма развіць талент; сэнс жыцця, што бачыцца ў выяўленні прыгажосці. Пра супрацьстаянне звычайнасці, будзённасці і натхнення, хараства.

Змітрок Бядуля прымушае чытача задумацца аб прызначэнні мастацтва ў жыцці чалавека, аб тым, што «краса і ёсць той спажытак дзеля душы» (Максім Багдановіч), што жыццё без прыгажосці бывае няпоўным. Момант, калі бондар прыступае да работы, аўтар апісвае так: «Цуд пачынаецца». У гэтым імкненні сцвердзіць не ўтылітарны, а духоўны сэнс мастацтва пісьменнік блізкі да Максіма Багдановіча («Апокрыф») і Якуба Коласа («Сымон-музыка»), якія ўвасобілі тэму мастака і мастацтва ў творах пра музы́ку.

Твор «Бондар» — гэта аповед пра не зразуметага ў высокіх памкненнях чалавека, якога не зламала абыякавасць аднавяскоўцаў, і адначасова наіўнага чалавека, што паверыў у асаблівую чуйнасць да хараства мясцовай пані. Яе чэрствасць і абыякавасць, пагарда да высілкаў бондара асабліва моцна ранілі прафесійную годнасць Данілы, абразілі яго. Пра гэта сведчыць такая мастацкая дэталь — народны ўмелец нават пагрэбаваў узяць грошы за работу. Гэты драматычны момант абгрунтаваны з псіхалагічнага пункту гледжання, аўтар рыхтуе да яго чытача ад пачатку апавядання, кантрасна супастаўляючы

---

[1] *Бо́ндар* — чалавек, які займаецца вырабам ёмістасцей і посуду з дрэва.



Правообладатель Национальный институт образования




Афіша спектакля «Бондар». Народны студэнцкі тэатр «Зеркало»

апісанне радасці, захаплення ад творчасці і ўтылітарна-побытавы погляд эстэтычна неразвітых людзей на выніки гэтай творчасці.

Навакольны свет чакае ад бондара практычнай карысці — зручнага, лёгкага, якаснага посуду. Суседзяў Данілы і пані мала цікавіць багатае духоўнае жыццё майстра. Бондар жа засяроджаны на сваім унутраным адчуванні жыцця і прыгажосці, ён пакутуе, што яго душэўныя парыванні да «чыстай красы», імкненне да мастацкай дасканаласці не запатрабаваны.

У творы паказана вясковая рэчаіснасць, пры гэтым мова пісьменніка-інтэлігента літаратурная — адшліфаваная, як бондаравы вырабы. Талент Бядулі выявіўся ў гранічна дакладным адборы слоў, у абсалютнай дарэчнасці словаўжывання, у невычэрпнасці сэнсавых адценняў, якія перадаюцца трапнымі эпітэтамі, яркімі параўнаннямі, народнай фразеалогіяй, багатай сінаніміяй і антаніміяй. У творах, падобных да гэтага, фарміраваліся асновы сучаснай беларускай літаратурнай мовы, таму мова апавядання і сёння ўспрымаецца як сучасная.

**!** **Літаратурныя сувязі.** Тэмай мастака і мастацтва апавяданне Змітрака Бядулі «Бондар» блізкае да яго ранейшых твораў «Велікодныя яйкі», «Музыка», да паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка», што была напісана ў 1911—1925 гадах. Іх аб'ядноўвае галоўны герой — таленавіты, адораны ад прыроды просты чалавек.

1. Якую назву вы далі б твору Змітрака Бядулі «Бондар»?
2. Разгледзьце афішу студэнцкага тэатра. Якія яе элементы дакладна адпавядаюць зместу твора? Як вы ўяўляеце галоўнага героя?
3. Сфармулюйце тэму і галоўныя праблемы, узнятыя ў апавяданні.
4. Складзіце кластар «Сувязь вобраза Данілы з іншымі персанажамі». Пракаментуйце, якія адносіны звязваюць герояў.
5. Падумайце, як аўтар ставіцца да адоранасці, таленту: як да падарунка лёсу або як да выпрабавання. Абгрунтуйце вашу думку.


Правообладатель Национальный институт образования

6. Выберыце найбольш дакладныя характарыстыкі мовы пісьменніка ў апавяданні «Бондар»: 1) апрацаваная літаратурная; 2) вусна-размоўная; 3) багатая на дэталі; 4) ускладненая аднароднымі членамі сказа; 5) упрыгожаная складанымі сінтаксічнымі канструкцыямі. Абгрунтуйце свой выбар прыкладамі з тэксту.
7. Якая, на вашу думку, мараль апавядання «Бондар»?
8. Чаму вяскоўцы ставіліся да майстра насцярожана?
9. Карыстаючыся алгарытмам аналізу празаічнага твора, раскажыце пра апавяданне «Бондар». Зверце адказ з прапанаваным ніжэй прыкладам аналізу. З якімі пунктамі вы згодны? Якія варта дапоўніць?

## Алгарытм аналізу празаічнага твора

1. Час і абставіны напісання твора, задума.
2. Тэма (пра што напісаны твор?).
3. Праблема (якія важныя пытанні ставяцца ў творы?).
4. Ідэя (якую думку аўтар хацеў данесці гэтым творам?).
5. Назва (чаму тэкст мае такую назву?).
6. Жанр (навела, прыпавесць, апавяданне, аповесць, раман).
7. Пафас (гераічны, трагічны, сентыментальны, рамантычны, драматычны, гумарыстычны, сатырычны).
8. Кампазіцыя (якія часткі вылучаюцца ў творы? як яны звязаны?).
9. Сюжэт (пралог, завязка, развіццё дзеяння, кульмінацыя, развязка, эпілог; лірычныя адступленні, пейзажныя замалёўкі, часавыя перастаноўкі, устаўныя эпізоды).
10. Героі твора (прататып, знешні воблік, характар, учынкі, мова героя, характарыстыка — аўтарская і дзейнымі асобамі).
11. Мастацкія сродкі (тропы — метафары, метаніміі, сінекдахі, сімвалы, мастацкія дэталі, сродкі сінтаксічнай выразнасці, сродкі гукавой выразнасці).
12. Мова твора (лексіка — прафесіяналізмы, дыялектызмы, запазычанні, устарэлыя словы, наватворы, эмацыянальна афарбаваныя словы; фразеалогія; сінтаксіс — будова сказаў, няўласна-простая, простая мова, дыялогі, палілогі).
13. Асабістае меркаванне пра твор.



Правообладатель Национальный институт образования

## Аналіз апавядання «Бондар» Змітрака Бядулі

**Час і абставіны напісання твора, задума.** Упершыню апавяданне надрукавана ў сакавіку 1920 года ў газеце «Беларусь», якая выходзіла ў Мінску. Псеўданім Ясакар, якім падпісаны твор, азначае «чорная таполя». Паміж нашаніўскім перыядам і часам нацыянальнага адраджэння пісьменнік спрабаваў сябе ў мініяцюрах.

Адкуль у інтэлігенцкім асяроддзі, у якім апынуўся малады пісьменнік, магла з'явіцца задума твора пра вясковага ўмельца? Па-першае, Змітрок Бядуля паходзіў з простай сям'і, яму з дзяцінства была знаёма праца з дрэвам. Па-другое, на пачатку стагоддзя змяніліся агульныя падыходы да чалавека: яго самарэалізацыя стала звязвацца не толькі з грамадскай актыўнасцю, але і з творчасцю. Адсюль асаблівая ўвага да таленту, таямніц рамяства, натхнення, унутраных перажыванняў чалавека.

**Тэма, праблема, ідэя.** Апавяданне «Бондар» прысвечана тэме мастака і мастацтва. У ім перададзены шматлікія грані таленту бондара. Прыгадаем, як Даніла дзівіцца на свае інструменты, «як на любых дзяцей», або выбірае дрэва для будучых вырабаў, як вязе ў панскі двор «бялюткія, як малако, як пена марская, гучныя, як шкло, пасудзіны», «зграбныя, лёгкія, як бы жывыя».

На першы погляд, твор раскрывае праблему класавай няроўнасці. Пані пагардліва ставіцца да ўмельца, яна абыякавая да яго старанняў, не здольная ацаніць талент (пагрэбавала нават выйсці і зірнуць на набытыя вырабы). У такія моманты абясцэньвалася не толькі работа бондара, але і яго асоба. Гэта зрабіла бессэнсоўнай працу, штурхнула майстра на сацыяльнае дно. Аўтар звяртаецца і да праблемы непаразумення паміж бондарам, чалавекам здатным, з далікатным духоўным светам, і вяскоўцамі, на якіх ён глядзеў, «як на няўдалыя цабэркі з крывых, нязграбных клёпак або як на шурпатыя драўляныя лыжкі».

Ідэя выяўлена праз **назву твора**. Значэнне слова «бондар» у ім пашыраецца да значэння слова «мастак». Напачатку гэта проста ўмелец, які робіць драўляны посуд. Але паводле разгортвання сюжэта можна ўбачыць, як рамяство ў залатых руках Данілы пераўтвараецца ў сапраўднае мастацтва — «вялікую сілу», кажучы словамі аўтара. У беларускай літаратуры мастак часцей за ўсё паўстае ў вобразе музыкі — і Змітрок Бядуля прыгадвае гэты матыў, апісваючы працу



Правообладатель Национальный институт образования

Данілы: яго пасудзіны гралі, «як скрыпкі», кожную ён «пробаваў рукамі на звон. Яна выдавала свой асабісты голас. Лёгка было падабраць з іх новы, па-свойму цікавы, музычны інструмент... Нашто тут патрэбны струны, ноты, пышныя абставіны багатых салонаў, калі ўсё прыгожае відаць і ў прастаце і шчырасці?».

**Жанр, пафас.** «Бондар» — гэта апавяданне: празаічны твор грунтуецца на адным эпізодзе, раскрываецца характар аднаго персанажа, прасочваецца адна лінія аповеду. Пафас твора трагічны: у фінале таленавіты майстар гіне, не зразуметы нікім, акрамя сваёй жонкі.

**Сюжэт і кампазіцыя.** Змітрок Бядуля паслядоўна прытрымліваецца структуры сюжэта, дзеліць твор на пяць частак: 1) экспазіцыю — аповед пра сям'ю Данілы і яго драўляныя вырабы, якімі той славіўся ў наваколлі; 2) завязку пра тое, як пані замовіла посуд; 3) развіццё дзеяння — апісанне працы бондара; 4) кульмінацыю — сцэну ў панскім маёнтку; 5) развязку — духоўнае спусташэнне майстра і развітанне з ім. У пейзажных замалёўках можна заўважыць лірычныя элементы абразка, імпрэсіі: «Сонца засумавала разам з ім. Поле снежнае непрытульным зрабілася. Хвоі пад сівымі зімовымі шапкамі шапацелі аб вялікім Данілавым горы. Увесь яркі абшар пакрыла жалоба...»

**Героі твора.** Пісьменнік не дае апісання знешнасці Данілы, Аўдоцці, суседзяў — ён характарызуе персанажаў праз іх уменні, учынкі, узаемаадносіны, перажыванні. Так, у старога бондара былі залатыя рукі, ён славіўся на цэлую ваколіцу сваімі вырабамі, «песціў у сваім сэрцы агромную радасць творчасці», атрымліваючы ад яе «шчырае шчасце». Ён быў маўклівы і не вельмі далікатны, але сэрца бондара поўнілася прыгажосцю, а галава — новымі задумамі.

Пісьменнік эмацыянальна раскрывае вобраз Аўдоцці — жанчыны з «простым, добрым і падатлівым сэрцам». Падчас працы Даніла знаходзіўся нібыта ў цэнтры сусвету, і толькі яго жонцы — своеасаблівай «планеце» ў гэтай сістэме — было дазволена кружыць вакол сонца, бо яна добра разумела бондара і магла ацаніць яго вырабы. Аўдоцці, што ценем прысутнічала за спінай майстра, перадалося яго адчуванне прыгажосці. Калі яна галасіла па сваім нябожчыку, «гора пачало выліваться ў прыгожыя словы сумных прычытанняў», а «суседкі слухалі, слёзы выціралі і дзівіліся, адкуль такі гладкі язык у заўсёды маўклівай Аўдоцці».

Данілавымі вачамі чытач бачыць пані — «не мужыцкага роду асобу, а з таго гатунку людзей, што ўсё ведаюць». У сваіх спадзяваннях



Правообладатель Национальный институт образования

бондар надзяляў яе неіснуючымі якасцямі: «Звычайнае, простае вока бачыла б у гэтых пасудзінах звычайныя і простыя рэчы. Звычайнае вока лічыла б дзяцінствам урачыстае свята Данілавага сэрца. Звычайнае вока часта глядзіць на золата і думае, што гэта камень. Звычайнае вока не захапляецца парывамі вялікай душы, не блішчыць агнём шчырага падзякавання вялікаму майстру. У пані з двара незвычайнае вока. Яна ўгледзіць дарагі скарб там, дзе ён папраўдзе ёсць».

**Мастацкія сродкі.** Тэкст багаты на эпітэты, якія ўдакладняюць, аздабляюць асноўны сэнс. Разгледзім фрагмент: «...бачыў *мастацкім* вокам *старога* майстра ў *нямых* кавалках дрэва *гаварлівыя*, *пявучыя*, *вабныя* сваёй зграбнасцю і грацыяй начоўкі, вядзёркі і лыжкі». Вельмі трапныя ў творы параўнанні. Найперш яны тычацца паказу інструментаў («дзівіцца на іх (інструменты), *як на любых дзяцей*»; «хіліцца над інструментамі, *нібы хоча іх цалаваць*»; «інструменты блішчаць, *як неба ў яркі дзень*»; «навостраны, як брытвы, адпаліраваны, *як люстэркі*»).

Аўтар месцамі «разгортвае» аповед шматлікімі эпітэтамі, паўторамі. Твор фактычна пабудаваны на сінтаксічным паралелізме: «Шліфоўка інструментаў — рэч і *не простая, і не звычайная*. Трэба ведаць, які брусок — *ці цвёрды, ці мяккі, ці гладкі, ці крупчаты* — падыходзіць да кожнага начыння. Трэба ведаць, як *трымаць* брусок, колькі разоў і як *плюнуць* на яго. Трэба цяміць, як *шараваць — ці наўскос, ці проста, ці памалу, ці хутка, ці моцна* прыцïскаць, *ці памаленьку*, каб было акурат у меру».

Затым пісьменнік «згортвае» тэкст да кароткага сказа, як бы канцэнтруючы, акумулюючы змест. Напрыклад: «Пасля гэтага здарэння Даніла стаў маўклівым і панурым. Бондарства ён закінуў». Увесь вялікі свет адоранага чалавека абрынуўся — і гэта ўкладзена ўсяго ў тры словы, што прымушае чытача спыніцца, асэнсаваць гэты трагічны злом.

Узмацняе псіхалагізм і мастацкая дэталь: успомнім, у якую труну паклалі майстра — «шурпатую і нязграбную». Гэта прымусіла Аўдоццю галасіць, выявіла яе вялікае гора. Перад з’яўленнем бондара ў панскім доме як прадказанне нечага благога паказаны верабей, «хітрун і падшывалец», які «апаганіў чысценькі, бялюткі цабэрак», «нахабна выкпіў чыстыя пачуцці гэтых людзей». І сапраўды, прыём пані быў халодны і абразлівы. І зноў з дапамогай мастацкай дэталі Змітрок Бядуля абмалёўвае крыўду і абражаную годнасць бондара,



Правообладатель Национальный институт образования

калі той атрымаў заробак: «Як ашпараныя, выскачылі з панінай кухні Даніла і Аўдоцця. Пані нават не зацікавілася глянуць на пекную работу Данілы. Заплаціла, не таргуючыся, і гэтым справа скончылася. Грошы ён кінуў ля ганка, выйшаўшы на двор. Употайку ад яго іх падняла Аўдоцця».

**Мова твора.** Мова твора — узорная, літаратурная. Зрэдку ў тэксце сустракаюцца ўстойлівыя выразы («жыў прыпяваючы», «залатыя рукі», «проста з моста», «памятаць, як свае пяць пальцаў»), бо аповед ідзе пра вясковае жыццё. Нашмат часцей — сінонімы («выйшла *як найлепш, як найпякней, як найскладней*»), антонімы (Аўдоцця была адзінай *разумніцай*, а суседзі — *неразумнымі*).

У тэксце пераважаюць простыя ўскладненыя сказы, што робіць яго лёгкім для ўспрымання, чыстым ад залішніх упрыгожанняў. Паназіраем, як пісьменнік дабіваецца эмацыянальнага ўздзеяння. Гэта не толькі падбор лексікі, але і будова сказаў, дзе мастак слова шырока ўжывае аднародныя члены: «Ці ж можна словамі перадаць, як Даніла падбіраў *клён, бярозу, дуб, асіну* на *цабэркі, вёдры, начоўкі і лыжкі, арэшнік* на абручы з сваіх лепшых запасаў?» Такія доўгія пералікі паўсюдна сустракаюцца ў творы, яны дазваляюць чытачу да драбніц зразумець працу бондара: «Даніла выбірае *гэблі, скоблі, разцы, нажы, далаты, сякеры і сякеркі,* гладзіць і мацае іх рукамі, пільна да іх прыглядаецца, адкідае злосна адзін інструмент, зноў за яго бярэцца, сумняваецца, разважае, нюхае жалеза, прыцмоквае губамі, ківае галавой і нешта мармыча сабе пад нос».

Асобна стаіць апісанне самога стварэння вырабу. Завязаныя ў адзін вялікі сказ, нагрувашчваюцца, удакладняючы адзін аднаго, дзеясловы: «адкінуць», «мусіць увайсці ў стос», «забыцца», «думаць і думаць», «меркаваць і меркаваць», «маляваць», «бачыць», «абмазгоўваць», «рабіць».

**Асабістае меркаванне пра твор.** Апавяданне Змітрака Бядулі «Бондар» напісана сто гадоў таму назад, і жыццё беларусаў з таго часу значна змянілася. Тым не менш і сёння праблемы, узнятыя ў творы, вельмі актуальныя. Гэта і ўнікальнасць унутранага свету таленавітага чалавека, і яго адносіны з людзьмі, далёкімі ад мастацтва, і нематэрыяльная каштоўнасць прыгожага. «Бондар» — твор пра трагедыю мастака, адарванага ад народнай грамады праз адданасць сваёй справе, узор дасканалай моўнай інструментоўкі празаічнага тэксту.



Правообладатель Национальный институт образования

# Уладзімір Дубоўка

(1900—1976)

**?** **1.** Якія віды лірыкі вы ведаеце? **2.** Прыгадайце вершы грамадзянскай лірыкі, якія вы ўжо вывучалі. Чым яны адметныя?

Уладзімір Дубоўка плённа займаўся мовазнаўствам. У 1928 годзе ў часопісе «Узвышша» ён апублікаваў свой праект напісання літар ***дз*** і ***дж***. Прапаноўваў замяніць рускае ***ё*** на беларускае ***ӧ*** (напрыклад, *ӧн, цӧплы, вӧска*), а таксама ўвесці літару ***ї*** для перадачы спалучэння ***й*** + ***і*** (*їхні, їм, ручаїна*).

| | Друкаваныя | | Рукапісныя | |
|---|---|---|---|---|
| | вялікія | малыя | вялікія | малыя |
| Дз |  |  |  |  |
| Дж |  |  |  |  |



Уладзімір Дубоўка правёў у Беларусі, на Пастаўшчыне, толькі дзіцячыя і падлеткавыя гады. Ён нарадзіўся 15 ліпеня 1900 года. З шасцігадовага ўзросту працаваў, дапамагаў па гаспадарцы. Крыху вучыўся ў школе. У 1915 годзе бацькі, уцякаючы ад вайны і беспрацоўя, пераехалі ў Маскву. Там Дубоўка атрымаў адукацыю, уключыўся ў расійскі літаратурны рух. Гэтай адарванасцю ад Беларусі лёс Дубоўкі нагадвае лёс Багдановіча.

Паэт атрымаў выдатную літаратурную адукацыю (Вышэйшы літаратурна-мастацкі інстытут імя В. Я. Брусава), займаў важныя дзяржаўныя пасады пры ўрадзе СССР, прадстаўляючы Беларусь і яе інтарэсы.

Першая публікацыя пісьменніка з'явілася ў 1921 годзе. Ён быў адным з актыўных удзельнікаў беларускага літаратурнага працэсу 1920-х гадоў: спачатку ў літаратурным аб'яднанні «Маладняк», а потым ва «Узвышшы». Чатыры гады «ўзвышэнства» былі самымі плённымі.



Правообладатель Национальный институт образования

**З успамінаў.** «У вёсцы я чуў толькі беларускую мову, вось чаму мне так запала яна ў душу і сэрца. Некаторыя дзівяцца: “Вы ніколі не вучыліся ў беларускіх школах, пражылі бадай усё жыццё за межамі Беларусі, а мову ведаеце”. Як жа яе не ведаць, калі яна родная! Як жа яе не любіць...» *(Уладзімір Дубоўка. З кнігі «О Беларусь, мая шыпшына»).*

Дзякуючы сваёй працы Уладзімір Дубоўка выдатна ведаў беларускую культуру (напрыклад, ён уваходзіў у камісію па ўкладанні зборніка народных песень для школ і хораў). У Маскве наведваў літаратурныя вечарыны і быў асабіста знаёмы з Сяргеем Ясеніным і Уладзімірам Маякоўскім, цікавіўся творчасцю ўкраінскіх аўтараў Паўло Тычыны, Уладзіміра Сасюры, Максіма Рыльскага, ведаў прыбалтыйскую літаратуру.

Паэт перажываў за Беларусь, раздзеленую ў 1921 годзе на Усходнюю і Заходнюю. У творах паўставаў супраць уціску, з якім сутыкнуліся беларусы ў заходняй частцы, што была пад уладай Польшчы. Рэквіем па канкрэтных ахвярах узрастаў да абагульнення, якое вельмі кантраставала з афіцыйным аптымізмам, бадзёрасцю і захапленнем стваральнай працай, прынятымі тады ў літаратуры. Выказваў трывогу адносна сацыяльных пераўтварэнняў (напрыклад, калектывізацыі і г. д.), несумленнасці некаторых пісьменнікаў («без душы багата скрыпак», «няхай скрыпка не будзе прададзена чорту»).

З 1926 года Дубоўка займаўся адказнай і прэстыжнай працай у Маскоўскім Крамлі: перакладаў на беларускую мову тэксты новых савецкіх законаў. Ажаніўся з Марыяй Кляўс у 1927 годзе, праз год у іх нарадзіўся сын Альгерд, якога яны страцілі падлеткам (кампанія прыяцеляў знайшла снарад і закінула яго ў вогнішча, загінулі ўсе).

У 1930 годзе Уладзімір Дубоўка быў арыштаваны за публікацыю ў віленскім часопісе «Беларуская культура» верша «За ўсе краі, за ўсе народы свету». Даследчык Дзмітрый Бугаёў лічыў гэты патрыятычны твор Дубоўкі блізкім да купалаўскага верша «Перад будучыняй», напісанага ў пачатку 1920-х гадоў. Пасля, падчас высылак, паэт не пісаў, але засвоіў каля дваццаці рабочых спецыяльнасцей.

Толькі ў 1958 годзе пасля рэабілітацыі Дубоўка вярнуўся ў Маскву і працягнуў займацца літаратурай. Але самая значная частка яго творчасці — тое, што ён напісаў з 1921 па 1930 год. У 1976 годзе Уладзімір Дубоўка памёр у Маскве.

Разам з Юркам Гаўруком Уладзімір Дубоўка заснаваў беларускую перакладчыцкую школу. Вельмі каштоўнай спадчынай паэта сталі пераклады: санеты Шэкспіра, паэмы Байрана. Для апрацоўкі выбіраліся



Правообладатель Национальный институт образования



Уладзімір Дубоўка
і Юрка Гаўрук (1926)

тэксты, якія Уладзімір Дубоўка напаўняў новым зместам, актуальным або для яго асабіста, або для літаратурнага працэсу. Напрыклад, пераклаў блізкую яму па настроі паэму Байрана «Шыльёнскі вязень» («Не выкрасліць ніхто слядоў тых дзён, // Яны тыранству вечны шлюць праклён»), а ў перакладзе 66-га санета Шэкспіра выказаў хутчэй стаўленне самога Дубоўкі да сучаснай яму культурнай сітуацыі: «І мастакоў нізкапаклонны зброд, // І недарэк мастацтвазнаўцаў з імі, // І ісціну, якой затулен рот, // І зло, што верхаводзіць над усімі. // Стамлёны ўсім, сумую па труне...»

**Уклад у развіццё літаратуры**

1. Уладзімір Дубоўка стварыў лепшыя ўзоры камбінаванай паэмы («паэмы-камбайна») — «Кругі», «І пурпуровых ветразей узвівы», «Штурмуйце будучыні аванпосты!». Уводзіў у структуру паэм устаўныя фрагменты (казкі, нататкі, лісты, пераклады).

2. Увёў у беларускую мову шмат слоў: некаторыя прыдумаў сам («лятуценне», «адлюстроўваць», «ажыццяўленне», «мэтазгодна», «спадабанка»), некаторыя ўзяў з дыялектаў — і праз яго творчасць яны прыжыліся ў літаратурнай мове («апантаны», «наканаваны», «нелюдзь», «пройма», «петраць», «агораць», «ашчаперыць», «водар», «дойлід», «збочыць», «знічка», «імклівасць», «непрыдатны», «талака»). Шмат зрабіў для абнаўлення паэтычнага сінтаксісу.

3. Ствараў казкі паводле народных матываў. Пісаў творы для дзяцей («Як Алік у тайзе заблудзіўся», «Кветкі — сонцавы дзеткі», «Як сінячок да сонца лётаў»).

4. Уладзімір Дубоўка стаў адным са стваральнікаў беларускай школы мастацкага перакладу. Пераклаў на беларускую мову 154 санеты Уільяма Шэкспіра, а таксама творы Джорджа Байрана: некалькі вершаў з цыкла «Яўрэйскія мелодыі», паэмы «Шыльёнскі вязень», «Бронзавы век», містэрыю «Каін». Пераклад трох частак паэмы Джорджа Байрана «Чайльд Гарольд» страчаны ў 1930-я гады.

5. У літаратуразнаўстве апярэдзіў свой час: прапанаваў канцэпцыю шматмоўнай літаратуры Беларусі. Гэта канцэпцыя будзе прынята ў беларускім літаратуразнаўстве толькі ў пачатку 1990-х гадоў.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Чаму, на вашу думку, лёс Уладзіміра Дубоўкі часта параўноўваюць з лёсам Максіма Багдановіча?
2. Уладзімір Дубоўка пісаў крытыку Дзмітрыю Бугаёву, аўтару першай манаграфіі па творчасці паэта: «Ці не маглі б вы сказаць крыху больш пра мае пераклады?» Чаму Дубоўка лічыў пераклады надзвычай важнай часткай сваёй творчасці?
3. Чаму найбольш плённымі аказаліся першыя дзевяць гадоў ад пачатку творчасці Уладзіміра Дубоўкі?

## Паэзія Уладзіміра Дубоўкі

Віртуознае паэтычнае майстэрства Уладзімір Дубоўка паказаў ужо ў сваёй першай кнізе «Строма» (1923): там дамінавалі лірычны пейзаж, вытанчаная музычнасць вершаванага радка, «нервовы» рытм, часам няроўны, нечаканы, і складаная асацыятыўнасць, за якую літаратурныя крытыкі то хвалілі, то папракалі паэта.



Вокладка зборніка Уладзіміра Дубоўкі «Строма» (1923)

Наступныя кнігі («Трысцё» (1925), «Там, дзе кіпарысы» (1925), «Credo» (1926), «Наля» (1927)) былі тыпова «маладнякоўскія» і па факце (паэт у той час быў удзельнікам «Маладняка»), і па эстэтыцы.

У ранняй творчасці Уладзіміра Дубоўкі адзначаліся «маладнякоўская пафаснасць і рамантыка, малады камсамольскі запал ва ўслаўленні Кастрычніцкай рэвалюцыі і новай, савецкай, явы, перавага ўсхваляваных, бадзёрых, але часта прызвычаена-ўмоўных і нібы “аголеных” эмоцый», — пісаў літаратуразнавец Дзмітрый Бугаёў.

**Навукоўцы гавораць.** Кніга Уладзіміра Дубоўкі «Наля» прысвечана Налі (Настассі) Маркавай — сапраўднай музе аўтара, якая была паэткай, удзельніцай магілёўскага філіяла «Маладняка». У 1929 годзе яна выйшла замуж і разам з мужам з’ехала ў Ленінград (цяпер Санкт-Пецярбург, Расія) *(Паводле Ірыны Багдановіч)*.

Паступова паэт перарос маладнякоўскую эстэтыку і разам з калегамі ў 1926 годзе заснаваў літаратурнае аб’яднанне «Узвышша».


Правообладатель Национальный институт образования

Менавіта ў гэты час ён напісаў свае самыя значныя творы — паэмы «Кругі», «І пурпуровых ветразей узвівы», «Штурмуйце будучыні аванпосты!», найбольш арыгінальныя і найменш ацэненыя сучаснікамі.

У творах аўтар вельмі часта звяртаўся да асобных момантаў літаратурнай барацьбы таго часу, адлюстроўваў пераход сялянскай краіны да калектывізацыі і індустрыялізацыі, звяртаўся і да тэмы беларускай мінуўшчыны, прыроды, кахання, але разумеў, якія тэксты будуць больш запатрабаваныя чытачамі і крытыкамі: «Што пісаць пра каханне вершы, // госіздат друкаваць не будзе».

**!** Любімыя метафары Уладзіміра Дубоўкі звязаны са словамі «пялёсткі», «дзіды», «кляновае лісце», «летуценні».

Лірызм быў сутнасцю яго паэтычнага таленту, адсюль прыхільнасць да народнай песні, напеўнасць вершаў. Некаторыя свае творы называў «мелодыямі». Шэдэўр патрыятычнай лірыкі **«О Беларусь, мая шыпшына»** (1925) — своеасаблівая малітва за Беларусь: амаль у кожнай страфе лірычны герой сцвярджаў, што Беларусь будзе заўсёды («У ветры дзікім не загінеш»), што ніякія перашкоды не знішчаць яе («Ніколі пройме з дзікім ветрам // не развіваць дзявочых кос»; «Варожасць шляху не зачыніць»). Па-маладому самаўпэўнена ў творы абвяшчалася, што «ў перашкодах дух расце». У гэтым вершы, які ў 1920-я гады быў візітнай карткай паэта, Дубоўка дасягнуў выключнай дасканаласці паэтычнай формы. У тэксце паяднаны самаахвярная пяшчота («Пялёсткамі тваімі стану»), рамантызм, адданасць («На дзіды сэрца накалю»), халоднасць сучаснасці («Тваіх вачэй — пад колер сталі»), Камуна Свету як даніна часу і цёмнае прароцтва («чарнобылем[1] не зарасцеш»).

Уладзімір Дубоўка разумеў мастацтва як адлюстраванне хараства, прыгажосці жыцця. Калі ў 1920-я гады паэты ў асноўным пісалі ўзнёслыя творы пра новую рэчаіснасць, Дубоўка казаў яшчэ і пра гармонію, дабро і праўду.

Лірычнае светаадчуванне паэта выдатна перададзена ў пейзажна-філасофскім вершы **«Залатая асенняя раніца...»** (1922). Уладзімір Дубоўка прадэманстраваў майстэрства гукавога афармлення, лёгкасць паэтычнага радка: «Прытулі, прыхіні на апошняе // і згадай гэты

---

[1] *Чарно́быль* — палын.



Правообладатель Национальный институт образования

дзень залаты». Паэт упэўнена і творча абышоўся з мовай: у яго дзвіна[1] матылькоў «распаветрыцца», і берагі «беражыстыя». Сумны восеньскі час замірання прыроды запараleліўся з момантамі развітання ў чалавечым жыцці («Развітальная хваля найгоршая, // яна можа і сэрца спаліць») і адначасова натхніў лірычнага героя на светлыя, нават аптымістычныя думкі: «Не гаруй! Ты дарэмна заплакала: // я прыйду, я вярнуся ізноў. // Лёс для ўсіх не бывае аднакавы, // як для тых засмучоных лістоў».

> **!** У 1964 годзе Уладзімір Дубоўка пісаў крытыку Дзмітрыю Бугаёву пра верш «Залатая асенняя раніца»: «Калі я, у канцы 1957 года ў Сібіры, пачаў ператрасаць сваю бедную "Строму", дык сустрэўся з вершам "Мітусіцца лісцё па аселіцы, мітульжыннае, быццам дзвіна". Перарабіў яго, а фактычна на яго аснове напісаў новы верш, таго ж настрою. Дату паставіў тую самую».

Пасля рэабілітацыі Уладзімір Дубоўка вярнуўся ў літаратуру з новымі вершамі і апрацоўкамі фальклорных твораў. Трэба ўлічыць, што пакуль пісьменнік знаходзіўся далёка ад Беларусі, літаратура развівалася далей, і па вяртанні паэту трэба было «дагнаць» літаратурны працэс амаль за трыццаць гадоў. Гэта ў яго атрымалася, і ў 1962 годзе ён быў ушанаваны вышэйшай пісьменніцкай узнагародай таго часу — Літаратурнай прэміяй імя Янкі Купалы за кнігу паэзіі «Палеская рапсодыя». Але, заплаціўшы за сваю творчую смеласць трыццаццю гадамі жыцця, ён зрабіўся недаверлівым: нават у сяброўскіх размовах успамінаў з высылкі толькі гумарыстычныя выпадкі, у прыватных лістах быў асцярожны. Некаторыя эпізоды лагернага жыцця Уладзіміра Дубоўкі даследчыкі аднавілі па ўспамінах іншых пісьменнікаў у другой палове XX стагоддзя.

У нейкім сэнсе верш **«Родная мова, цудоўная мова!..»** (1966) з'яўляецца адначасова і выражэннем уласнага меркавання паэта, і асцярожным, правільным тэкстам. «Ты нашых думак уток і аснова!» — сцвярджаў лірычны герой, як і паэт, апантаны беларускай мовай. Паколькі сам Дубоўка жыў у натуральным беларускамоўным асяроддзі толькі ў дзяцінстве і падлеткавым узросце (праўда, нярэдка па справах, сяброўстве або сваяцтве бываў у Беларусі), то пасля пераезду ў Маскву галоўным носьбітам беларускай мовы для яго стала маці, а сама мова адпаведна — «Матчын дарунак ад самай калыскі» (параўнайце з назвай зборніка Алеся Гаруна «Матчын дар»).

---

[1] *Дзвіна́* — тут: плынь, воблака, сукупнасць.



Правообладатель Национальный институт образования

**З успамінаў.** «Мая маці была непісьменная, але мела ясны прыродны розум, вельмі добра ведала беларускую мову і, паўжыцця прыжыўшы ў Маскве, гаварыла толькі па-беларуску. <...> Вось чаму я маю поўную падставу называць беларускую мову — матчынай мовай» *(Уладзімір Дубоўка)*.



Уладзімір Дубоўка з маці і сынам Альгердам (1932)

Але калі лірычны герой паэта прызнаваўся, што беларуская мова «мне заўсёды была дапамогай, // дзе б і якой ні хадзіў я дарогай», то тут шляхі героя і самога паэта нібыта разыходзяцца, таму што свой прысуд Дубоўка атрымаў якраз за творчасць на беларускай мове. Інакш склаўся лёс у яго паплечнікаў, якія спынілі ўдзел у літаратурным працэсе і з’ехалі з Беларусі, — Янкі Бобрыка, Наталлі Вішнеўскай, Арыны Глінскай, Зінаіды Бандарынай. Постаць жа самога Дубоўкі была вельмі значная ў беларускай літаратуры 1920-х гадоў, і яго творчасць не магла застацца незаўважанай.

Пакуль лірычны герой пафасна пераконваў чытачоў, што «Кожнай драбнічкай ты (беларуская мова. — *Аўт.*) варта пашаны, // кожнае слова вякамі створана», сам Дубоўка-авангардыст і яго сябрыпаплечнікі значна ўзбагацілі сінтаксіс беларускай мовы, а таксама вельмі смела карысталіся яе граматычнымі магчымасцямі (нечаканыя прыналежныя прыметнікі («дэльфінавы», «аўтаравы»), нязвыклыя формы ступеней параўнання («сіньшы»)), словаўтваральнымі і лексічнымі сродкамі мясцовых гаворак («адляйцаць», «ажыргаць», «астрыжонак», «брыж», «буталь», «водзыўкі», «зблоціць», «калюжа», «лактаць», «нажутка», «пагурачак», «разыгранка»).

**Літаратурныя сувязі.** «Творчасць Уладзіміра Дубоўкі тых гадоў аказала плённы ўплыў на развіццё беларускай літаратуры, у першую чаргу паэзіі. П. Глебка, М. Лужанін, як яны не раз пасведчылі, а таксама П. Трус, С. Дарожны, Я. Бобрык, М. Дубовік, часткова Ю. Лявонны і некаторыя іншыя знаходзіліся на арбіце непасрэднага паэтычнага прыцягнення Дубоўкі, паэзія якога вабіла маладзейшых таварышаў высокай культурай мовы і слова, верша, рытму, рыфмы, палымянай любоўю да Беларусі» *(Дзмітрый Бугаёў)*.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Назавіце, якія адкрыцці ў літаратуры зрабіў майстар слова.
2. Акрэсліце значэнне хараства і гармоніі ў творчасці паэта. З якім аўтарам гэта яднае Уладзіміра Дубоўку?
3. Знайдзіце анафары ў вершы «Родная мова, цудоўная мова!..». З якой мэтай яны ўжыты?
4. Вылучыце з тэксту прароцтвы, зробленыя ў вершы «О Беларусь, мая шыпшына» асабіста для аўтара і наогул для краіны.
5. Апішыце настрой, які пануе ў вершы «Залатая асенняя раніца...», з дапамогай трох колераў, трох эмоцый, трох гукаў прыроды.
6. Высвятліце значэнне слоў, якія ўвёў у беларускую мову Уладзімір Дубоўка. Зрабіце вывад пра ўплыў развіцця прыгожага пісьменства на фарміраванне літаратурнай мовы.
7. Складзіце кросенс з фотаздымкаў, якія асацыіруюцца з вершамі Уладзіміра Дубоўкі. Растлумачце, якія радкі натхнілі вас на падбор пэўных ілюстрацый.

   *Кросенс* — табліца-загадка з малюнкамі (звычайна на 9 ячэек). Рашыць кросенс — знайсці сэнсавую сувязь паміж малюнкамі і адгадаць агульнае для іх паняцце (імя, назву твора) (гл. прыклад кросенса на верш Максіма Багдановіча «Летапісец»).




8. Вывучыце на памяць верш Уладзіміра Дубоўкі «О Беларусь, мая шыпшына».

## Тэорыя літаратуры

### Мастацкія тропы

Найбольшая колькасць мастацкіх тропаў сустракаецца ў паэзіі. Яны ўзбагачаюць мову твора, дазваляюць найбольш удала раскрыць вобраз, перажыванне праз тонкія адценні пераносных значэнняў.

> ***Мастацкі троп*** — слова або выраз, ужытыя ў пераносным значэнні, калі адна з'ява характарызуецца праз рысы, якасці, уласцівасці іншай з'явы.



Правообладатель Национальный институт образования

Тропы падзяляюцца на **простыя** (параўнанне, эпітэт) і **складаныя** (метафара, метанімія, сінекдаха, увасабленне, аксюмаран, гіпербала, літота, іронія, алегорыя, гратэск, эўфемізм і інш.).

***Метанімія*** — від тропа, у якім назва адной з’явы (прадмета) замяняецца на другую паводле іх унутранай або знешняй сувязі і незалежна ад іх падабенства.

Метанімія сустракаецца ў мове, калі назва мясцовасці, памяшкання ці ёмістасці замяняе назву таго, што ўнутры іх; назва месца замяняе назву гістарычнай падзеі; назвай матэрыялу, расліны, рэчыва замяняюцца вырабы з іх.

*Дарога* яднае людзей,
хоць, праўда, на тэрмін кароткі.

*Уладзімір Дубоўка.*
*«Штурмуйце будучыні аванпосты!».*

Пад «дарогай» маюцца на ўвазе разам пераж ытыя падзеі, нястачы ці прыгоды ў дарозе.

Суседзяць пад дахам адным
*сярмяга, жакетка* і *футра.*

*Уладзімір Дубоўка.*
*«Штурмуйце будучыні аванпосты!».*

Назва адзення абазначае чалавека, і таму маецца на ўвазе чалавек у сярмязе (бедны), чалавек у жакетцы (заможны) і чалавек у футры (багаты).

***Сінекдаха*** — разнавіднасць метаніміі, у якой назвы паняццяў, з’яў, прадметаў замяняюцца іншымі на падставе іх колькасных суадносін (напрыклад, частка ў значэнні цэлага і наадварот, адзіночны лік у значэнні множнага і наадварот).

Таксама сінекдахай могуць лічыцца выпадкі, калі слова, якое абазначае родавае паняцце, замяняе відавое і наадварот.

У наступнай цытаце слова ў адзіночным ліку «чалавек» выступае ў якасці слова ў множным ліку «людзі»:

*Чаму у песнях вашых нестае*
*адной маленькай справы — чалавека?*
Хіба пачуцці ўсе яго, мае
не закранаюць вашыя павекі?

*Уладзімір Дубоўка. «Кругі».*



Правообладатель Национальный институт образования

***Увасабленне***, або **персаніфікацыя**, — разнавіднасць метафары, у якой рэчам, прадметам і з'явам прыроды надаюцца чалавечыя ўласцівасці.

Аўтар персаніфікуе час, і яго рух бачыцца апавядальніку такім павольным, нібыта ў сне.

Тут адбываліся бойкі не раз,
тут *задрамаў*, затрымаўшыся, *час*.

*Уладзімір Дубоўка. «Кругі».*

***Гіпербала*** — троп, якім абазначаецца рэзкае перабольшанне якіх-небудзь уласцівасцей чалавека, прадмета або з'явы з мэтай звярнуць увагу на гэтыя ўласцівасці і выявіць стаўленне пісьменніка да іх.

Гіпербалізацыя адбываецца звычайна ў кантэксце, таму часта спалучаецца з іншымі тропамі:

Ні на пяску, ні на каменні
ушчэнт не выпетрае зерне:
узыдзе, ўсходы будуць з плёнам,
з адзінак вырастуць *мільёны*...

*Уладзімір Дубоўка.*
*«Ніколі праўда не ўмірае».*

Тут метафара «вырастуць мільёны» (пра зерне, што не загіне «на пяску» і «на каменні») уключае гіпербалу, выражаную колькасным лічэбнікам. Перабольшанне заключаецца ў тым, што «з адзінак», некалькіх зярнят, з'явяцца мільёны ўсходаў. З дапамогай гіпербалізацыі паэт сцвярджае надзею на справядлівасць, лепшую будучыню.

***Эўфемізм*** — троп, што замяняе іншым словам, спалучэннем такое выслоўе, якое выглядае няёмка, груба альбо непрыстойна.

Часам эўфемізмы не згладжваюць знявагу ці крытыку, а іранічна падкрэсліваюць негатыў. Тут апанент названы благім чалавекам:

*Ты спечаны з дрэннага цеста,*
што дыхае злосцю прамова.

*Уладзімір Дубоўка. «Штурмуйце будучыні аванпосты!».*



Правообладатель Национальный институт образования

Гіём Апалінэр

Уладзімір Жылка

Язэп Пушча

1. Устанавіце адпаведнасць паміж прыкладамі і назвамі тропаў (эпітэт, увасабленне, метанімія, сінекдаха, гіпербала): 1) «На Беларусі // Пчолы *як гусі*»; 2) «На гары на *крутой*, на *абвітай ракой*»; 3) «Адна *рачулка* ў чаратах // *Бурчыць, варочаецца* гнеўна»; 4) «Свет трымаўся на *ўдаве*»; 5) «Застагналі *вёскі* і *сёлы*».
2. Прывядзіце прыклады вывучаных тропаў у творах беларускіх паэтаў пачатку ХХ стагоддзя.

# Кандрат Крапіва

(1896—1991)

? **1.** Згадайце, з якіх твораў Кандрата Крапівы крылатыя выразы: «Бывае, праўда вочы коле...», «Другі баран ні “бэ” ні “мя”, а любіць гучнае імя». Да якога жанру належаць гэтыя творы? У чым яго адметнасць? Ці знаёмы вы з тэкстамі аўтара іншых жанраў? **2.** Успомніце, якія творы называюць сатырычнымі. У чым іх адрозненне ад гумарыстычных? **3.** Чаму Кандрат Крапіва абраў менавіта такі псеўданім?

Вучні і зараз карыстаюцца «Беларуска-рускім слоўнікам», пяцітомным «Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы», рэдактарам якіх быў Кандрат Атраховіч (Кандрат Крапіва) — вядомы байкапісец, драматург і навуковец.



Кандрат Крапіва (Кандрат Атраховіч) нарадзіўся 5 сакавіка 1896 года ў вёсцы Нізок на Уздзеншчыне. Школьную адукацыю будучы пісьменнік атрымаў у вясковай школе, затым — у вучылішчах ва Уздзе, Стоўбцах і Койданаве (цяпер Дзяржынск). У Кандрата была выдатная памяць: сучаснікі ўспаміналі, што яму дастаткова было раз прачытаць альбо пачуць нешта — і ён мог паўтарыць. Магчыма, гэта дазволіла хлопцу экстэрнам здаць экзамены на народнага настаўніка. Але спраўдзіцца марам працаваць з вучнямі не ўдалося: адна за адной



Правообладатель Национальный институт образования

грымелі войны, рэвалюцыі — і кожная пакінула след у лёсе будучага класіка.

У 1915 годзе Кандрат Атраховіч быў прызваны ў царскую армію, у 1916 годзе трапіў на Заходні, затым на Румынскі фронт. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі быў дэмабілізаваны як настаўнік і вярнуўся на Радзіму, уладкаваўся ў школу вёскі Каменка на Уздзеншчыне. Тут ажаніўся са сваёй зямлячкай з вёскі Нізок Аленай Махнач, з якой пражыў 45 гадоў, выгадаваў чацвярых дзяцей.

У 1920—1923 гадах зноў трапіў на службу, толькі ўжо ў Чырвоную Армію. Пасля дэмабілізацыі, папрацаваўшы вясковым настаўнікам, Кандрат Атраховіч пераехаў у Мінск.

У літаратуру Кандрат Крапіва прыйшоў бліжэй да 1920-х гадоў, калі ў літаратуразнаўчых спрэчках акрэсліліся «дзве мастацкія плыні — нацыянальна-адраджэнская і пралетарска-рэвалюцыйная» *(Ірына Багдановіч)*.

Пачынаў пісьменнік як лірык — мастак «сусветнай тугі», нават лічыў сатыру нечым несур'ёзным. Але з гадамі прыйшло жаданне «ўмяшацца ў жыццё і тое-сёе паправіць» — і адкрыўся талент «пякучкі-крапівы»: у байках, паэмах, артыкулах аўтар даў бой ворагам усяго беларускага.

Адным з першых зборнікаў гумару і сатыры Кандрата Крапівы стала кніга «Асьцё», што ўбачыла свет у бібліятэчцы «Маладняка». Таксама Кандрат Крапіва выступаў супраць звароту старэйшых пісьменнікаў да сівой даўніны і навамодных захапленняў формай маладнякоўцаў. Згодна павевам савецкага часу пільную ўвагу ён надаваў развенчванню «рэлігійных забабонаў». У 1930-я гады — «перагібам» у калектывізацыі: «Лозунг кінуў ён такі: // «Ці калгас, ці Салаўкі» (паэма «Хвядос — Чырвоны нос»).



Зборнік сатыры і гумару «Асьцё». Кніжка «Маладняка» (1925, № 6)

Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта загадваў аддзелам у часопісе «Полымя рэвалюцыі» (цяпер часопіс «Полымя»). У верасні 1939 года ўдзельнічаў у паходзе ў Заходнюю Беларусь, затым — у вайне з Фінляндыяй. На Вялікую Айчынную вайну Крапіва трапіў з першага ж яе дня — у рэдакцыю газеты «Чырвонаармейская праўда»,



Правообладатель Национальный институт образования

потым — газеты «За Савецкую Беларусь». У ваенны перыяд паэт выкрываў фашысцкую ідэалогію (вершы «Фрыцавы трафеі», «Біблія людаеда»), сцвярджаў маральную перавагу савецкага чалавека (драма «Проба агнём»).

З 1943 года перайшоў рэдактарам у сатырычную газету-плакат «Раздавім фашысцкую гадзіну», якая пасля вайны стала часопісам «Вожык». У гэтым выданні і працягваў рэдактарскую дзейнасць да 1947 года.

Пасля 1947 года Кандрат Кандратавіч прыйшоў у навуку — абараніў кандыдацкую, доктарскую дысертацыі, загадваў сектарам мовазнаўства ў Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва, затым узначаліў Інстытут мовазнаўства Акадэміі навук БССР, а ў 1956 годзе стаў віцэ-прэзідэнтам акадэміі. У 1982—1989 гадах лінгвіст працягваў працу ў якасці навуковага супрацоўніка-кансультанта.

Кандрату Крапіве былі адмераны лёсам доўгія 95 гадоў, яму наканавана было перажыць жонку, дзяцей і амаль усе войны XX стагоддзя.

Творчасць Кандрата Крапівы была ацэнена высокімі ўзнагародамі: драматург стаў тройчы лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР: у 1941 годзе — за сатырычную камедыю «Хто смяецца апошнім», у 1951-м — за лірычную камедыю «Пяюць жаваранкі», у 1971-м — за комплекс прац у галіне беларускай лінгвагеаграфіі. У 1974 годзе стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы — за фантастычную камедыю «Брама неўміручасці». У 1956 годзе Кандрату Крапіве было прысвоена званне народнага пісьменніка БССР.

**Уклад у развіццё літаратуры**

1. Крапіва, абапіраючыся на жанравыя набыткі Францішка Багушэвіча, Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Альгерда Абуховіча, Ядвігіна Ш., стаў адным з самых таленавітых распрацоўшчыкаў жанру байкі на беларускім матэрыяле. Адметнасцю яго байкі сталі з'явы і персанажы беларускай рэчаіснасці (Парсюк, Баран, Каршун, Цецярук, Заяц), дэталізацыя і канкрэтызацыя месца, падзеі, вобраза. Сучасныя аўтары, якія працягваюць традыцыі байкапісання, шукаюць новыя формы. Гэта мікрабайкі, байкі цвёрдай формы (напрыклад, у форме санета), байкі, напісаныя традыцыйным страфічным вершам, байкі без маралі і інш.

2. Ва ўмовах існавання *тэорыі бесканфліктнасці* адстойваў каштоўнасць, вартасць драматычных жанраў (артыкул «Канфлікт — аснова п'есы»).



Правообладатель Национальный институт образования

3. Несумненным дасягненнем Крапівы сталі творчыя набыткі ў галіне драматургіі (камедыі «Хто смяецца апошнім», «Мілы чалавек», «Брама неўміручасці»).

4. Першыя яго вопыты ў прозе былі больш папулярныя, чым у паэзіі. Праз настраёвыя апавяданні, замалёўкі аўтар падышоў да напісання аднаго з самых моцных раманаў той пары — «Мядзведзічы», які пазней падштурхнуў Івана Мележа да напісання «Палескай хронікі».

1. Карыстаючыся даведачнымі матэрыяламі і тэкстам артыкула, падрыхтуйце ў групах віртуальнае інтэрв'ю з пісьменнікам «Крапіва расказвае пра сябе» (4-5 пытанняў з адказамі). Пастарайцеся пазбягаць агульнавядомых фактаў. Прадэманструйце аднакласнікам.
2. Прыгадайце або прачытайце ў слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў, што такое «тэорыя бесканфліктнасці».

Кандрат Крапіва — байкапісец

## Камедыя «Хто смяецца апошнім»

**Эпоха Крапівы ў нацыянальнай драматургіі.** Драматургія Кандрата Крапівы даўно стала візітнай карткай беларускай культуры, бо п'есы нашага славутага земляка дзякуючы іх актуальнасці і запатрабаванасці ставіліся і ставяцца шматлікімі тэатрамі.

Подступы да сатырычнай п'есы былі закладзены яшчэ ў ранняй творчасці пісьменніка, калі ён звярнуўся да жанру байкі. Адлік непасрэдна драматургічнай дзейнасці Кандрата Крапівы пачаўся з 1934 года, калі была надрукавана яго псіхалагічная драма «Канец дружбы». Затым была створана драма да 20-годдзя рэвалюцыі «Партызаны», некалькі камедый («Хто смяецца апошнім», «Мілы чалавек», «Брама неўміручасці»). Ваеннай тэме прысвечаны п'есы «Проба агнём», «Людзі і д'яблы». Лепшай з пасляваенных лічыцца лірычная камедыя «Пяюць жаваранкі».

Спадчына Крапівы-камедыёграфа грунтуецца на трох «кітах»: ідэйным змесце, дакладнай адпаведнасці форме і тэхнічнай дасканаласці тэксту.

Ідэйны змест прадугледжвае злабадзённасць праблематыкі, пазачасавасць ідэй, выказаных у творы, наяўнасць падтэксту.

Дакладная адпаведнасць форме мае на ўвазе наступнае: 1) асновай п'ес з'яўляецца канфлікт; 2) персанажы выразна падзяляюцца на групы, паміж якімі гэты канфлікт адбываецца; 3) камічная сітуацыя



Правообладатель Национальный институт образования

робіцца асноўнай формай выяўлення характараў; 4) твор адпавядае законам сцэнічнага мастацтва — падзеі адбываюцца ў межах аднаго сюжэта і месца, хутка змяняюць адна адну, чуецца жывая гаворка, аўтар дакладна абмалёўвае абстаноўку ў рэмарках, прытрымліваецца лаканізму ў рэпліках (прынцып «нічога лішняга, нічога няяснага»).

Тэхнічная дасканаласць тэксту дасягаецца праз інтрыгуючы сюжэт, разгортванне гісторыі праз паступовую дэталізацыю ад пачатку да канца п’есы, абагульненне і адначасовую індывідуалізацыю ў паказе герояў, нацыянальны каларыт, багацце лексікі і фразеалогіі.

**Актуальнасць камедыі «Хто смяецца апошнім».** Камедыя «Хто смяецца апошнім» была апублікавана ў 1939 годзе і тады ж пастаўлена Беларускім дзяржаўным тэатрам (цяпер — Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы). Спектакль быў прымеркаваны да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве і стаў сапраўднай падзеяй у гісторыі савецкага тэатральнага мастацтва, бо ў ім ігралі зоркі беларускай сцэны: Лідзія Ржэцкая, Стэфанія Станюта, Барыс Платонаў, Глеб Глебаў. Гэта быў час, калі побач з пампезнымі парадамі, святочнаўзнёслымі фільмамі пра калгаснае і прамысловае будаўніцтва, дэманстрацыяй дасягненняў савецкага гаспадарання жыў страх простага чалавека нечакана стаць «ворагам народа». Менавіта гэту атмасферу падазронасці і няпэўнасці, росквіту карумпаванасці і беспакаранасці новых гаспадароў жыцця і вывеў у п’есе Кандрат Крапіва.

**Канфлікт у камедыі.** Асновай сатырычнай камедыі з’яўляецца сацыяльны канфлікт. Ён звязаны са зместам твора і адлюстраваным у ім грамадска-палітычным асяроддзем. У камедыі «Хто смяецца апошнім» асноўны канфлікт адбываецца на трох узроўнях.

1. Канфлікт **паміж героямі** на сцэне. Гэта канфлікт паміж групай Гарлахвацкага і групай Левановіча.

2. Канфлікт паміж **героямі** і **гледачамі** (чытачамі). Аўдыторыя таксама своеасабліва ўдзельнічае ў п’есе — смехам адмаўляе паводзіны і мараль сатырычных герояў.

3. Канфлікт **героя** і **асяроддзя**, якому ён супрацьстаіць. Аўтар і гледачы (чытачы) знаходзяцца нібыта ў нейтральнай пазіцыі: назіраюць збоку за барацьбой Тулягі з асяроддзем, у якім той апынуўся.

**Тэма і праблема.** Каштоўнасць твора заключаецца не толькі ў адпаведнасці свайму часу, але і ў пазачасавасці ідэі. П’еса, па сутнасці, пра людзей сціплай разумнай праўды і людзей грубай хлуслівай сілы. Пра гістарычны лёс беларуса падчас грамадскіх пераўтварэнняў,



Правообладатель Национальный институт образования

які ўвасоблены ў вобразе з гаваркім прозвішчам: «Я і на свет нарадзіўся Тулягам. І дзяды, і прадзеды мае былі Тулягі». Твор таксама пра мужнасць змагацца са страхам, бесчалавечнасцю сістэмы, якую ўвасабляюць Гарлахвацкі і Зёлкін, і перамагаць гэты страх. А яшчэ пра чалавечнасць і адданасць вучоных сваёй справе. Не кожная п'еса магла быць дапушчана да пастаноўкі ў савецкім тэатры, таму аўтар закладвае самыя вострыя думкі ў падтэкст.

**Аўтарская пазіцыя.** У драматычных жанрах не прадугледжаны аўтарскі тэкст, як гэта адбываецца ў прозе або паэзіі, бо гавораць толькі персанажы. Аўтар жа прысутнічае апасродкавана. Так, у драматычным творы аўтарская пазіцыя выяўляецца праз: 1) назву твора; 2) размяшчэнне і суадносіны частак твора; 3) рэмаркі; 4) дзейных асоб, сітуацыі, у якія аўтар ставіць сваіх герояў; 5) мову персанажаў, дэталізацыю і іншыя выяўленчыя сродкі.

**Назва** твора ўтрымлівае частку вядомай прыказкі «Добра смяецца той, хто смяецца апошнім», якая бытуе ў фальклоры многіх народаў свету. Яна азначае, што не трэба заўчасна святкаваць перамогу — варта пачакаць канчатковых вынікаў. Так што назва твора — гэта перасцярога такім, як Гарлахвацкі.

**Размяшчэнне і суадносіны частак твора.** Акты п'есы пастаўлены аўтарам у такой паслядоўнасці, каб гледачу (чытачу) быў добра зразумелы асноўны сюжэт і парадак падзей: ад першай сустрэчы з галоўнымі героямі да развязкі. Пры гэтым з рэплік герояў мы даведваемся пра тое, што адбылося да моманту дзеяння. Гэта і «подзвігі» Гарлахвацкага на мінулым месцы працы, і гісторыя яго прызначэння дырэктарам інстытута, і паводзіны Анны Паўлаўны, і дэталі, якія выдаюць Тулягу.

**Рэмаркі.** Праз кароткія рэмаркі можна прасачыць не толькі ход дзеяння, але і ўбачыць, як камедыёграф характарызуе персанажаў. Пра маладую і гарэзлівую Веру Крапіва піша: «В е р а *(стаўшы ў позу, гаворыць урачыста-дураслівым тонам)*. Прывітанне галоўнаму далакопу, ахавальніку скарбаў старой бабулі-зямлі!» Няўпэўненасць Тулягі падкрэслівае такім чынам: «Т у л я г а *(адважыўся)*. Дзіўнае здарэнне, ведаеце... Іду гэта я па вуліцы, раптам абганяе мяне нейкі чалавек. Абганяе і... *(Не адважваецца сказаць.)*» Аўтарскія ацэнкі відаць і ў апісанні паводзін Зёлкіна: то ён «нячутна ўваходзіць» і «аглядае калідор», то, «наморшчыўшы лоб, стараецца прыпомніць (адрас Чарнавуса. — *Аўт.*), потым дастае з кішэні блакнот і паспешна гартае».



Правообладатель Национальный институт образования

Разгледзім канфлікт паміж **групамі дзейных асоб** і тыя **сітуацыі**, у якія аўтар ставіць сваіх герояў. Да першай групы можна аднесці тых, хто выражае пазіцыю аўтара (Веру, Чарнавуса, Левановіча), да другой — карыкатурна абмаляваных герояў (дырэктара інстытута, Анну Паўлаўну, яго навушніка Зёлкіна і сакратарку Зіначку).

Вобразы савецкіх вучоных абмаляваны даволі традыцыйна — яны бяссрэбранікі, шчырыя людзі, сціплыя, адданыя працаўнікі на ніве навукі.

Чарнавус — прафесар інстытута геалогіі, выдатны спецыяліст у сваёй галіне. Ён аўтар рукапісу, які стаў вынікам плённай шматгадовай працы. Нягледзячы на высокі аўтарытэт сярод беларускіх і маскоўскіх калег, ён вельмі просты і непрыдзірлівы чалавек, які клапоціцца пра тых, хто побач. За гэта прафесара паважаюць і супрацоўнікі, і тэхнічны персанал. Вучоны мае ўласнае меркаванне, ва ўсім даходзіць да сутнасці, таму Гарлахвацкаму цяжка яго падпарадкаваць. Драматург ставіць Чарнавуса ў складаную сітуацыю абгавору, паклёпу з боку Гарлахвацкага і Зёлкіна. Герой выходзіць з гэтага выпрабавання з дапамогай сваіх паплечнікаў.

Вера — памочніца Чарнавуса. Яна маладога веку, але ўжо навуковы супрацоўнік. Відавочна, у яе добрыя перспектывы ў геалогіі. Яе прага справядлівасці, прынцыповасць, энергічны характар ураўнаважваюць спакойную разважлівасць Чарнавуса. Дзяўчына горача падтрымлівае свайго настаўніка, непакоіцца пра яго кнігу, звяртаецца па дапамогу ў партком. Веру аўтар паставіў у сітуацыю чалавека, які вымушана назірае за несправядлівасцю ў дачыненні да абылганых калег, перад якім стаіць выбар — змаўчаць або дзейнічаць.

Партыйны лідар Левановіч, як гэтага патрабаваў час напісання п'есы, увасабляе лепшыя чалавечыя якасці: ён дасведчаны, разумны, уважлівы, сумленны. Менавіта Левановіч удала разбіраецца ў сітуацыі, што склалася ў інстытуце, і ў фінале саркастычна выкрывае шкодніцкую дзейнасць Гарлахвацкага. Яго пазіцыя ў творы самая моцная: ён мае і аўтарытэт, і ўладу нешта змяніць.

Твор належыць да напрамку сацыялістычнага рэалізму, і аўтар натуральна ўводзіць у дзеянне «людзей з народа». Камедыя была задумана пра добра вядомае Крапіве навуковае асяроддзе, дзе героі не рабочыя і не сяляне, але ён увёў вобразы дворніка Нічыпара і прыбіральшчыцы цёці Каці, якія надзелены такой мудрасцю, кемлівасцю, дасціпнасцю, што па выразнасці часам выглядаюць ярчэй за прафесуру. Яны пастаўлены аўтарам у пазіцыю знешніх аб'ектыўных


Правообладатель Национальный институт образования

назіральнікаў за падзеямі, якія ацэньваюць іншых персанажаў з пункту гледжання народнай маралі.

Гарлахвацкі, Зёлкін, Зіначка, Анна Паўлаўна. Гэта група персанажаў утварае сабою другі лагер — апанентаў аўтара, тых, чые жыццёвыя прынцыпы выкрывае драматург.



Кадр з мастацкага фільма У. Корш-Сабліна «Хто смяецца апошнім» (1954)

Самы яркі персанаж, вядома, Гарлахвацкі. Кандрат Крапіва сабраў у яго вобразе адмоўныя якасці — і невуцтва, і кар’ерызм, і напышлівасць, і подласць, і ліслівасць, і хітрасць, і драпежніцтва, і тупасць, і нявернасць. Першымі распазнаю́ць яго сутнасць дасціпныя і назіральныя цёця Каця і Нічыпар, прычым па самых драбніцах — манеры абстаўляць кабінет, непарадку на стале, ганарыстым выглядзе. Крапіва на працягу камедыі паступова змяняе, здавалася б, абсалютна выйгрышную для дырэктара сітуацыю на ганебную. У гэтым сэнсе Гарлахвацкі падобны да герояў баек Крапівы «Ганарысты Парсюк», «Дыпламаваны Баран».

Стасункі з Зёлкіным таксама дакладна характарызуюць дырэктара інстытута. Толькі няшчыры чалавек будзе трымаць каля сябе такога навушніка і падхаліма, плеткара і паклёпніка. Зёлкін добра інфармаваны не толькі пра калег, але і пра стасункі начальніка з балбатлівай прыгажунькай Зіначкай і, не грэбуючы, карыстаецца абставінамі сабе на карысць.

Адзіны клопат Анны Паўлаўны — жонкі Гарлахвацкага — матэрыяльны прыбытак. Яе стаўленне да мужа таксама ўласніцкае: яна сочыць за ім, шукае нагоды пасварыцца, дбае пра свае інтарэсы. У гэтай пары абодва вартыя адно аднаго. У Анны Паўлаўны пазіцыя дваістая: яна быццам бы ахвяра мужавай нявернасці, але паводле ходу дзеяння бачна, што ёй важней выгоды, якія дае пасада мужа, чым шчырасць яго пачуццяў.

Асобна стаіць вобраз Тулягі. На фоне падзей разгараецца ўнутраны, душэўны канфлікт Тулягі, які, нягледзячы на пагрозу «выкрыцця» яго як палкоўніка Падгаецкага, усё ж прымае рашэнне высмеяць некампетэнтнага кіраўніка.



Правообладатель Национальный институт образования

Вобраз Тулягі вельмі жывы, чалавечны, хоць і абмаляваны з гумарам. Гэты вобраз, бадай, самы складаны ў п’есе. З аднаго боку, Туляга прадстаўляе групу станоўчых персанажаў, бо ён, дасведчаны вучоны, шчыры чалавек, спрыяе выкрыццю прайдзісвета Гарлахвацкага. З другога — ён няўпэўнены, мае няцвёрды характар, паддаецца ўсеагульнаму страху, пагаджаецца на падман. Герой «туляецца» ад аднаго лагера да другога, шукаючы паратунку. Пры гэтым Кандрат Крапіва выступае на баку Тулягі, спачувае яму, дае чытачам магчымасць зразумець яго базабароннасць, небяспечную пазіцыю «ворага народа» пад цяжарам выдуманых абвінавачванняў Гарлахвацкага.

Безыменны чалавек у форме НКУС, сам таго не жадаючы, наганяе страху на ўсіх супрацоўнікаў — і яго прысутнасць стварае атмасферу ўсеагульнай падазронасці, бяспраўя.

> ***Гаваркое прозвішча*** — мастацкі прыём, пры якім прозвішча персанажа перадае галоўную рысу яго характару, маральныя якасці або асаблівасці знешнасці.

Завяршаючы агляд дзейных асоб, адзначым, што ў Кандрата Крапівы як майстра камедыі прадуманы падбор імёнаў: яны вельмі інфарматыўныя, бо празрыста намякаюць гледачу на характар персанажа. Можна сказаць, што прозвішчы герояў гаваркія.

**Раскрыццё характараў у творы.** П’еса выканана ў адпаведнасці з законамі сцэнічнага мастацтва. Крапіва плённа выкарыстоўваў **камічныя сітуацыі** для выяўлення характараў сваіх герояў, напрыклад, Гарлахвацкага і Зіначкі, калі іх застаюць разам у кабінеце дырэктара; сведчанне Нічыпара на дваровага сабаку Цюліка, што нібыта знайшоў костку «свінячага маманта».

Выключна трапна намаляваны персанажы: Зёлкін «ходзіць на мяккіх лапах ды прыслухоўваецца», Туляга вечна азіраецца. Вобразы раскрываюцца і праз **прыём паступовай дэталізацыі**: з кожным паваротам сюжэта мы больш даведваемся пра Гарлахвацкага і яго мінулае («А было ж раней — Гарлахвацкаму банкеты, Гарлахвацкаму авацыі, Гарлахвацкі мог любога ў бараноў рог скруціць»), а нахабны нораў прайдзісвета раскрываецца мацней («...каб Туляга і нават сам Чарнавус былі тут у мяне на паслугах... на іх спінах у вялікія вучоныя ўехаць. Хрыбеціны ў іх моцныя, галовы разумныя, — няхай стараюцца, калі хочуць на свеце жыць...»).

У п’есе падзеі разгортваюцца дынамічна. Гэтаму спрыяе і лаканічнасць рэплік, і адпаведнасць тэксту законам вуснага маўлення. Багатая таксама **мова**, якая характарызуе персанажаў. Беларускі



Правообладатель Национальный институт образования

каларыт усесаюзна вядомаму твору надае мова дворніка Нічыпара і цёці Каці, якая іскрыцца выслоўямі («Новы поп, дык новае і маленне», «А таму раскоша тут, як шчупаку ў сажалцы»), іранічнымі заўвагамі («Баіцца, каб на цвёрдым мазалёў не панаседжваць») — у адрозненне ад штампаванай канцылярскай мовы таго ж Гарлахвацкага, багатай на русізмы («друг», «папа», «харошы», «дагаварыліся», «безабразіе», «пусцяковіна»), лозунгавасць («сацыяльнае зло», «сцяг навукі можам моцна трымаць», «каб гэта не лягло бруднай плямай на нашу ўстанову», «чыстка патрэбна») і пры гэтым няшчыра расквечанай памяншальна-ласкальнымі формамі («дзяўчуркі», «даражэнькі»).

**Сцэнічнае жыццё камедыі.** У 1951 годзе беларускае радыё арганізавала аўдыяспектакль па п’есе. Пасля прэм’еры 1939 года пастаноўка п’есы была адноўлена ў 1954 годзе Віктарам Галаўчынерам у Ташкенцкім рускім тэатры. Тады ж Уладзімірам Корш-Сабліным на студыі «Беларусьфільм» зняты мастацкі фільм «Хто смяецца апошнім», які стаў папулярным у перакладзе на рускую мову далёка за межамі Беларусі. У 1960-я гады камедыя пастаўлена Браслаўскім народным тэатрам, у 2010-я — Мінскім абласным драматычным тэатрам і Тэатрам-студыяй кінаакцёра, Мазырскім драматычным тэатрам імя І. Мележа.

Пісьменнік застаецца аўтарытэтам у сатырычнай літаратуры і зараз. Ні да Крапівы, ні пасля беларуская літаратура не дасягнула такой сілы сатыры, як у яго творах.



Сцэна са спектакля «Хто смяецца апошнім». Тэатр-студыя кінаакцёра

**Літаратурныя сувязі.** Пачаткам сатырычнай літаратуры на тэрыторыі Беларусі можна назваць творы палітычнай сатыры XVII стагоддзя «Ліст да Абуховіча» і «Прамова Мялешкі». Затым у беларускай літаратуры з’явіліся парадыйна-сатырычныя паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе». Камедыя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча «Пінская шляхта» працягнула гэтыя слаўныя традыцыі. Элементы сатыры заўважаюцца і ў камедыі Янкі Купалы «Паўлінка», і ў трагікамедыі «Тутэйшыя». У жанры сатырычнай камедыі працавалі таксама Андрэй Макаёнак, Мікола Матукоўскі, Аляксей Дудараў.

У 1929 годзе быў напісаны сатырычны раман Андрэя Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя» — адзін з самых злабадзённых мастацкіх дакументаў эпохі.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Знайдзіце сэнсавы ключ назвы — адкажыце, хто ў камедыі смяецца першым, а хто — апошнім.
2. Перакажыце сюжэт камедыі ў храналагічным парадку («Аднойчы ў навукова-даследчым інстытуце...»). Якія ёсць адгалінаванні асноўнай гісторыі (мікрасюжэты), звязаныя з вобразамі Чарнавуса, Тулягі, Анны Паўлаўны, Зіначкі?
3. Паміж кім разгараецца канфлікт?
4. Хто, на вашу думку, галоўны герой камедыі? Абгрунтуйце свой адказ.
5. Камедыя — звычайна вясёлы жанр. Прачытайце ў падручніку па гісторыі пра грамадска-палітычную атмасферу 1920—1930-х гадоў і паразважайце, ці вясёлыя падзеі на самай справе перадаюцца ў творы.
6. Паназірайце за маўленнем персанажаў п'есы. Як яно дапамагае ў раскрыцці характараў?
7. Якія вобразы п'есы выступаюць носьбітамі аўтарскай пазіцыі? Па якіх прыметах вы гэта вызначылі?
8. Звярніце ўвагу на імёны герояў у п'есе «Хто смяецца апошнім». Паспрабуйце вызначыць спосаб утварэння гаваркіх прозвішчаў (Гарлахвацкі, Туляга, Зёлкін, Чарнавус). Як у іх адлюстравана стаўленне камедыёграфа да герояў?
9. Праверце, наколькі добра вы зразумелі твор — прапануйце сябрам гульню «Пакажы жэстамі» («Яшчарка»), загадваючы герояў п'есы (паставай, жэстамі, мімікай). Старайцеся максімальна дакладна перадаць характар персанажа.
10. Выберыце ўрывак з п'есы «Хто смяецца апошнім» і інсцэніруйце яго. Чаму вы спыніліся менавіта на гэтым фрагменце?
11. Разгледзьце кадр з мастацкага фільма «Хто смяецца апошнім» (1954, рэжысёр Уладзімір Корш-Саблін, «Беларусьфільм») і сцэну са спектакля 2012 года. Параўнайце ў іх вобраз Гарлахвацкага. Якія рысы застаюцца нязменнымі? Чаму?
12. Як маглі б выглядаць старонкі Гарлахвацкага і Тулягі на платформах Facebook, «УКантакце», «Аднакласнікі»?
13. Карыстаючыся тэкстам і зместам артыкула, прааналізуйце камедыю згодна з алгарытмам аналізу драматычнага твора (гл. далей).
14. Выканайце заданне «Віктарына» па творчасці Кандрата Крапівы.
15. У чым значэнне творчасці Кандрата Крапівы ў развіцці беларускай драматургіі?



Правообладатель Национальный институт образования

## Сатырычная камедыя.
## Канфлікт у драматычным творы

Сатырычная камедыя паказвае характары і сітуацыі, у якіх тыповыя для грамадства якасці паўстаюць у падкрэслена-смешным, недарэчным выглядзе. Жанру ўласціва выкрывальная скіраванасць, звернутая да аздараўлення і паляпшэння грамадства. Характэрна наяўнасць станоўчага героя, які змагаецца з адмоўнымі персанажамі сродкамі камічнага — смехам (напрыклад, Нічыпар і цёця Каця). Часта такі твор заканчваецца шчаслівай для станоўчых персанажаў развязкай, як у творы «Хто смяецца апошнім».

***Сатырычная камедыя*** — разнавіднасць камедыі, у якой выкарыстаны сатырычныя сродкі выкрыцця грамадскіх заган (іронія, пародыя, сарказм, гіпербала, гратэск).

Замест сюжэта, які ўласцівы празаічным творам, у п'есе разгортваецца канфлікт, што звязвае паміж сабой усе кампаненты п'есы. Сацыяльны канфлікт — аснова сатырычнай камедыі.

***Канфлікт*** — супрацьстаянне, сутыкненне супрацьлеглых поглядаў дзейных асоб у літаратурным творы.

1. Да якога роду літаратуры адносіцца жанр сатырычнай камедыі?
2. Якія рысы сатырычнай камедыі праявіліся ў п'есе Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім»?

### Алгарытм аналізу драматычнага твора

1. Час напісання твора (абставіны напісання, задума, прыметы часу ў творы).
2. Тэма (пра што напісаны твор?).
3. Ідэя (якую думку аўтар хацеў данесці гэтым творам?).
4. Назва (чаму твор мае такую назву?).
5. Жанр (трагедыя, містэрыя, камедыя, трагікамедыя, драма, меладрама, вадэвіль, фарс).
6. Канфлікт (асноўны, другасныя).



Правообладатель Национальный институт образования

Андрэй Мрый

Сатырычны раман

7. Сюжэт і кампазіцыя (лінейная, кальцавая, мантажная, калажная, парадаксальная).

8. Характар развязкі (трагічная, камічная, драматычная).

9. Дзейныя асобы (знешнасць, матывы паводзін, мова герояў, самахарактарыстыка і ўзаемныя характарыстыкі герояў).

10. Аўтарская пазіцыя ў творы (аўтарскія ацэнкі, характарыстыкі, імёны персанажаў, рэмаркі, сітуацыі, у якія пастаўлены героі, дэталі; дэкарацыі і інтэр'еры).

11. Сцэнічнае жыццё твора (калі, кім, у якім тэатры пастаўлены?).

12. Асабістае меркаванне пра твор.

# *Міхась Зарэцкі*

(1901—1937)

? **1.** Успомніце, якія змены ў грамадстве прадугледжвала палітыка беларусізацыі 1920-х гадоў, якія падзеі адбываліся ў 1930-я гады. **2.** Узгадайце прычыны расколу «Маладняка» і ўтварэння аб'яднання «Полымя».

Кнігі Міхася Зарэцкага былі настолькі папулярныя, што чытачы часам выкрадалі іх з бібліятэк. Асабліва ім падабалася аповесць «Голы звер» — пра авантурыста і прайдзісвета Віктара Яроцкага *(З успамінаў сучаснікаў)*.



Уплыў творчасці пісьменніка на развіццё нацыянальнай літаратуры цяжка пераацаніць. Міхась Зарэцкі (Міхась Касянкоў) нарадзіўся 20 лістапада 1901 года ў сям'і вясковага дзяка ў вёсцы Высокі Гарадзец (цяпер Віцебская вобласць).

Дзяцінства прайшло на беразе Дняпра, у вёсцы Зарэчча, ад назвы якой пазней утварыўся яго псеўданім. Сям'я будучага пісьменніка была музычная — бацька не толькі любіў, але і пісаў музыку, кіраваў хорам, а маці выдатна спявала. Літаратуразнавец Міхась Мушынскі заўважыў, што ў дзяцінстве будучы пісьменнік умеў іграць на некалькіх інструментах.



Правообладатель Национальный институт образования

Напачатку хлопец пайшоў па бацькавым шляху: атрымліваў адукацыю ў духоўным вучылішчы, а затым — у семінарыі. Пасля служыў пісарам у войску на Арлоўшчыне (Расія). Вярнуўшыся дадому, вартаваў храм, каб матэрыяльна дапамагчы сям'і. У 18-гадовым узросце Міхась Касянкоў стаў вясковым настаўнікам, праз год — загадчыкам валаснога аддзела народнай асветы. Найбольшая ж колькасць чалавечых характараў прайшла перад вачамі пісьменніка падчас вайсковай службы ў 1920—1927 гадах, калі ён быў камісарам.

**З успамінаў.** Пісьменнік Ян Скрыган успамінаў пра Міхася Зарэцкага: «...Высокі і стройны, ён быў абавязкова відзён, але не ростам, а іменна вось гэтай сваёй асаблівай манерай трымацца: і свабодна, і разам з тым скавана. Гаворыць ён весела, ахвоча. <...> Хоча памагчы сабе жэстамі, але жэсты вельмі ж стрыманыя... І раптам, забыўшыся..., ён раскіне рукі і зарагоча так непасрэдна, што аж прысядзе. <...> Стрыманасць і непасрэднасць як бы вечна ваююць у ім».

Пра пачатак уласнай творчасці Міхась Зарэцкі пісаў так: «Першае апавяданне я пісаў у канцы 1921 года. <...> Гэта выйшла даволі нечакана і дзіўна. <...> Справа пачалася з таго, што я ўбачыў яркі і незвычайны сон, ураженне ад якога не пакідала на працягу месяца. Мне захацелася занатаваць гэтае ўражанне, і я стаў пісаць». У 1922 годзе ў газеце «Савецкая Беларусь» было апублікавана апавяданне «Спатканне». У 1925—1926 гадах выйшлі зборнікі апавяданняў «У віры жыцця», «Пела вясна», «Пад сонцам», «42 дакументы і Двое Жвіроўскіх». Дзякуючы ім пісьменнік стаў вядомым.



Вокладка зборніка апавяданняў Міхася Зарэцкага «Пела вясна» (1925)

У 1924 годзе аўтар увайшоў у літаратурнае аб'яднанне «Маладняк», пазней рэдагаваў аднайменны часопіс. У 1927 годзе Міхась Зарэцкі, як і Якуб Колас з Янкам Купалам, стаў адным з ініцыятараў утварэння літаратурнага аб'яднання «Полымя». У тым самым годзе пісьменнік наведаў Латвію, Чэхаславакію, Германію, Францыю разам з Цішкам Гартным і Міхасём Чаротам. Вучыўся малады празаік у Беларускім дзяржаўным універсітэце, адкуль вымушаны быў забраць дакументы ў сувязі з «лістом трох» (разам з Андрэем Александровічам



Правообладатель Национальный институт образования

і Алесем Дударом выступіў супраць актывістаў, якія збіраліся ўчыніць «грамадскі суд» над беларускамоўнымі студэнтамі).

Міхась Зарэцкі актыўна ўдзельнічаў у Першым Усебеларускім з’ездзе пісьменнікаў у 1934 годзе. Пасля забароны другой часткі рамана «Крывічы» ў жыцці майстра слова многае змянілася, бо ён быў выключаны з камуністычнай партыі. Працягваў пісаць, займаў пасаду загадчыка аддзела літаратуры і мастацтва ў Беларускай акадэміі навук. І ўсё ж ні талент, ні папулярнасць аўтара не засцераглі яго ад арышту ў 1936 годзе, падчас якога зніклі больш за тры тысячы старонак рукапісаў. У наступным годзе Міхась Зарэцкі быў рэпрэсіраваны. Праз дваццаць гадоў — рэабілітаваны і апраўданы па ўсіх пунктах абвінавачанняў.

**Уклад у развіццё літаратуры**

1. Міхась Зарэцкі — першы беларускі празаік, якому ўдалося звязаць у адно эпічную глыбіню і сур’ёзнасць сваіх твораў з яскравай белетрыстычнасцю. У яго тэкстах прыцягваюць і сюжэтнасць, і інтрыга, і псіхалогія героя, і гістарычна-сацыяльныя абставіны існавання персанажа.

2. Пачаўшы друкавацца з апавяданнямі маладнякоўскай пары, Зарэцкі здолеў за некалькі гадоў прыйсці да класічнай навелы, аповесці, сацыяльна-псіхалагічнага і гістарычнага раманаў.

3. Сярод пануючага рэалізму ў літаратуры пісьменнік адстойваў рамантызм як мастацкі напрамак, які найлепш дазваляе паказаць вобраз рэвалюцыянера ў змаганні з абставінамі лёсу.

4. Проза аўтара стала адным з узораў удалага выкарыстання псіхалагізму пры раскрыцці мастацкага вобраза.

5. У аповесці «Голы звер» Міхась Зарэцкі адным з першых у савецкай літаратуры вывеў у якасці галоўнага героя сацыяльны тып прайдзісвета, абываселя і цынічнага дзялка.

1. З дапамогай інтэрнэт-крыніц зрабіце электронную фотагалерэю, прысвечаную жыццёваму шляху пісьменніка. Пракаментуйце знойдзеныя вамі здымкі.
2. У якім з родаў літаратуры (эпас, лірыка, драма) засведчыў свой талент Міхась Зарэцкі?
3. Які літаратурны напрамак выбраў Міхась Зарэцкі і чаму?
4. У якіх празаічных жанрах пісаў аўтар?



Правообладатель Национальный институт образования

## Апавяданне «Дзіўная»

**Адлюстраванне псіхалогіі людзей з новым светапоглядам.** Знешняе падабенства тэматыкі апавяданняў пісьменніка да твораў іншых прадстаўнікоў літаратуры 1920—1930-х гадоў часта абмежавана агульнасцю тэмы.

Як пісьменнік рамантычнага напрамку Міхась Зарэцкі шмат увагі надаваў барацьбе пачуццяў, эмоцыям людзей. Пазнаць апавяданні Міхася Зарэцкага можна па наступных уласцівасцях:

1) праўдзівы паказ паслякастрычніцкай рэчаіснасці, сутыкненне вобразаў «учарашніх», «былых» (прадстаўнікоў зрынутага класа) і «новых» (будаўнікоў савецкай краіны); пераход герояў з катэгорыі ў катэгорыю;

2) сітуацыя складанага маральна-этычнага выбару для герояў; тэма ўнутранай ломкі асобы падчас стварэння новага грамадства; псіхалагічная заглыбленасць у матывы і наступствы ўчынкаў (гэта рыса потым найярчэй праявіцца ў беларускай літаратуры ў прозе Кузьмы Чорнага);

3) выразная гуманістычная скіраванасць, цвёрдае следаванне аўтара агульначалавечым, а не класавым каштоўнасцям, падзел герояў паводле ўмення і няўмення любіць, а не па прыналежнасці да пэўнага класа;

4) наяўнасць у творах любоўнай інтрыгі, складаных жаночых вобразаў; вострае ўспрыняцце праблемы ўзаемаадносін бацькоў і дзяцей;

5) адлюстраванне падзей праз асабіста перажытае і ўбачанае;

6) структураванасць сюжэта.




Тытульны ліст выдання аповесці «Голы звер» з дарчым надпісам аўтара Пятру Глебку (1926)

Міхась Зарэцкі вядомы не толькі як празаік, аўтар апавяданняў («Бель», «Ворагі», «Дзіўная», «Кветка пажоўклая»), аповесці («Голы звер») і раманаў («Вязьмо», «Сцежкі-дарожкі»), але і як выдатны нарысіст, літаратурны і кінакрытык, публіцыст і драматург, перакладчык.

**Драматызм лёсу Шумавай.** Апавяданне «Дзіўная» напісана ў 1920-я гады і прысвечана праблемам папулярнага на той час руху



Правообладатель Национальный институт образования

пазбаўлення жанок ад «іржавых пут сям'і», калі прапагандавалася адкрыццё дзіцячых дамоў, каб малыя змаглі стаць «новымі людзьмі» без «шкоднай» прывязанасці да бацькоў, а іх матулі — цалкам прысвяціць сябе працы.

У выніку самаразбуральнай дзейнасці галоўная гераіня апавядання Шумава аказваецца, як яна кажа, «без лішніх прывязанасцей» — гэта значыць пазбаўленай кахання Блонскага і любові ўласнага дзіцяці. Жыццё ў грамадскіх клопатах, у новых планах і пастаўленых партыяй задачах не здольна замяніць у ёй жанчыну на «маленькі шрубчык», а самі гэтыя планы і задачы выглядаюць злачыннымі. Прапагандысцкая дзейнасць Шумавай у жанаддзеле накіравана на адчужэнне дзяцей ад маці. І ў гэтай працы паступова, як шкодная праява «старога», у яе душы выпальваецца чалавечнасць. Празаік усё называе сваімі імёнамі ў рытарычных пытаннях — праз разважанні Блонскага аб Шумавай: «Што ж гэта, нарэшце? Фанатызм, вар'яцтва?»

> **!** Вобраз дзетдома прароча звязаны з лёсам сям'і Зарэцкага. Пасля арышту, каб адвесці небяспеку ад жонкі Марыі, ён узяў неіснуючую віну на сябе. І ўсё ж Марыя Іванаўна была асуджана — у выніку сын пісьменніка Слава і дачка Радаміра апынуліся на некалькі гадоў у дзіцячым прытулку.

**Маральная праблематыка. Асэнсаванне вечнага і часовага ў творы.** Агітатарская работа Шумавай дзівіць закаханага ў яе Блонскага. Магчыма, таму што Блонскі чуе нейкі «фальш у гэтых цвёрдых энергічных словах аб вызваленні жанчыны».

Каханне самой «дзіўнай» або каханне да яе — складанае, небяспечнае пачуццё. Міхась Зарэцкі ў многіх апавяданнях паказальна называе яго «хваравітай слабасцю», «назойлівым успамінам», «шалёнай страсцю», «ліпучымі путамі», «зеллем», «дрыгвянай багнай». Але ўважлівы чытач па роздуме бачыць абсалютна адваротнае — трапяткое і прынцыпова станоўчае стаўленне аўтара да любых праяў кахання і духоўнай блізкасці.

Душэўны канфлікт паміж любоўю да свайго дзіцяці і перакананнем у аджыласці, састарэласці інстытута мацярынства робіць Шумаву непаслядоўнай, эмацыянальна нестабільнай, а яе твар — «поўным вострай мукі, матчынай тугі».

Можна прасачыць, як зрэагавалі на заклікі Шумавай пазбавіцца ад сям'і жанчыны-дэлегаткі, перад якімі выступала галоўная гераі-



Правообладатель Национальный институт образования

ня, — яны «агнём загарэліся» супраць. Вачамі Блонскага аўтар глядзіць на твары дэлегатак, «змораныя, сумныя». Так пісьменнік без адкрытага маралізатарства даводзіць думку пра неадназначнасць дзеянняў маладых актывістак 1920-х гадоў, «дзівацтва» новага свету.



Удзел жанчын-працаўніц у абмеркаванні грамадскіх пытанняў (1920-я)

У творы расказваецца не толькі пра так званыя перагібы ў партыйным кіраўніцтве — яго ідэя шырэйшая. Гэта тэкст пра разбурэнне міжасабовых сувязей, заснаваных на агульначалавечых каштоўнасцях: любові, павазе, каханні, сімпатыі, прывязанасці, прычым у імя ілюзорнай ідэі сусветнага братэрства, абстрактнай свабоды. Парадокс у тым, што братэрства і свабода не могуць грунтавацца на раз’яднанні, падазронасці і абыякавасці да душэўных перажыванняў іншых.

**Партрэт** (фр. *portrait*) — апісанне знешняга выгляду, адзення, рухаў, позы літаратурнага персанажа. Асаблівасці партрэтнага апісання залежаць ад стылю пісьменніка.

**Майстэрства мастацкай дэталі. Псіхалагізм.** Адрозніваюць некалькі відаў мастацкай дэталі: партрэтную (дэталі знешнасці), славесную (лексіка персанажа), прадметную (апісанне фрагментаў навакольнага свету), пейзажную (дэталізацыя карцін прыроды), псіхалагічную (апісанне перажыванняў, унутранага стану).

Варта параўнаць партрэтныя дэталі, якія падае Міхась Зарэцкі на працягу твора. На першых старонках у Шумавай «вочы — яркія, вострыя, са шчырым вясёлым агеньчыкам», затым паказваецца, як яны «атуліліся цьмянай, сталёвай глыбінёй». Яна то раптам рассыпаецца «задорным іскрыстым смехам», то ўжо «праглынула смех, затурбавалася». У фінале зноў падкрэсліваецца кантраст паміж словамі і станам Шумавай: яе «твар разгарэўся, зардзеўся гарачай чырванню», і тут жа на ім з’явіўся «адбітак глыбокай агнёвай мукі, журбы». Гэтыя кантрасныя характарыстыкі працуюць на стварэнне «дзіўнага», супярэчлівага характару персанажа. Апісвае празаік і голас гераіні: «...пад гэтым сухім, троху мітынговым тонам ёсць нешта схаванае, палахліва затоенае». Тут дакладна выяўляецца псіхалагічная характарыстыка маладой асобы, дэталізуецца ўспрыманне яе Блонскім.



Правообладатель Национальный институт образования

У апавяданні багата дыялогаў, дзе праступае ўнікальнасць таленту Міхася Зарэцкага — уменне ў неразвітым, няпоўным сказе шмат выразіць. Такая мова персанажаў знешне выглядае як прымета дзелавых якасцей, рашучасці, знарочыстага практыцызму ў адносінах да жыцця. Ярка паказана бура, якая разыгрываецца ў душах Блонскага і Шумавай. Яна выяўляецца праз супярэчнасць паміж знешняй лёгкасцю, з якой яны кідаюць словы, і цяжкім унутраным станам, напружанасцю ад усведамлення іх сэнсу. Дарэчы, аўтар называе сваіх герояў толькі па прозвішчы, як гэта было прынята ў 1920-я гады, а адно аднаго яны ўвогуле не завуць па імені. Гэта дэталь указвае на перавагу ў грамадстве вытворчых адносін над асабістымі.

Прадметны свет прадстаўлены ў творы даволі лаканічна (гадзіннік, старасвецкае крэсла ў кабінеце Блонскага), а вось пейзажныя фрагменты ў дэталях паказваюць унутраны стан герояў. Паназіраем, як завіравала пачуццё паміж героямі і як «адгукаецца» гэта ў апісанні наваколля: «Вецер з шалёным выццём віўся па вуліцах. Падцікаўся з-за рога і ўраз налятаў, шкуматаў, сцёбаў па твары жменямі калючага снегу. Хацелася барзджэй перабегчы і схавацца ў цёмным прытульным пакоі. Блонскі і Шумава ішлі шыбка-шыбка, часам застраваючы да кален у сумётах, спатыкаючыся. <...> Горача стала і весела».

Вельмі дакладна адпавядае неадназначнаму стану і характару гераіні паказ вясны ў частцы, дзе Шумава чакае сустрэчы з сынам: «*Усміхнулася* вясна гулліва, сонечна. Так *усміхнулася*, што сівавалосая бабулька-зямля зусім *растала*, *захлібнулася з радасці*. <...> А потым *зарумзала*. Ды так *зарумзала*, так *загаласіла*, што ўвесь горад *шумам напоўніла*, *патокай слёз заліла*».

Паказваючы знаёмства герояў, аўтар падае дэталі паводзін Шумавай: «У кабінет, *не папытаўшыся*, увайшла жанчына. Ля парога спынілася, азірнула ўважна пакой. Угледзела Блонскага і падышла да яго *рэзкім крокам*. <...> На стол *бесцырымонна* партфель кінула». Падавалася б, гаспадара кабінета павінна раздражняць такая вольнасць, але Блонскаму раптам становіцца «пуста ў пакоі», калі Шумава сыходзіць — і чытач здагадваецца, што паміж людзьмі ўзнікла пачуццё. І сапраўды, далей увесь твор будзе асветлены каханнем: ужо «назаўтрага Блонскаму мінуты здаваліся за гадзіны, а гадзіны — за вечнасць», бо ён чакаў новай сустрэчы.

Асяроддзе, стан прыроды, нежывыя прадметы псіхалагічна ўздзейнічаюць на чытача не менш, чым учынкі. Зарэцкі выбірае найперш пачуццёвае ўздзеянне (на слых, дотык, смак, рух, адчуванне, эмоцыю): «шэра-ваўняныя згусткі змроку», «мяккія цені змроку», «аксамітная



Правообладатель Национальный институт образования

мякаць», «ціхая нерухомасць», «марудныя хвіліны». Тое ж можам сказаць пра метафарычнасць: «акунуў погляд», «варушыліся думкі», «гарэзна спляталіся», «балюча ўдарыў яркі свет». Яшчэ адна цікавая рыса светаадчування і светаапісання Зарэцкага — перадача супрацьлегласцей маруднага цяжкага руху і статыкі нерухомасці, парывістага, палётнага дзеяння і непаваротлівага бяздзеяння, гарачага, палкага чакання, жадання і застылай халоднай тугі.

**Літаратурныя сувязі.** Даволі рэдка ў беларускай прозе можна сустрэць вобраз маладой жанчыны, якая не была б ахвярай абставін, а сама «рабіла сваё жыццё». Да падобных можна найперш аднесці рамантычна абмаляваныя купалаўскія вобразы Паўлінкі з камедыі «Паўлінка», а таксама Бандароўны з аднайменнай паэмы, Зоські з драмы «Раскіданае гняздо», магчыма, і караткевічаўскіх Майку Раўбіч (раман «Каласы пад сярпом тваім»), жонку Грынкевіча з «Парома на бурнай рацэ». Калі казаць пра час, апісаны ў апавяданні «Дзіўная» Міхася Зарэцкага, дык «папярэднічаць» вобразу Шумавай будзе настаўніца пані Мар’я з аповесці Янкі Брыля «Сірочы хлеб», а «наследаваць» — гераіня апавядання Кузьмы Чорнага «Макаркавых Волька».

1. З якім надвор’ем, музыкай, колерам асацыіруецца ваш настрой пасля знаёмства з творам «Дзіўная»? Як вы думаеце чаму?
2. Пра што прымушае задумацца гэта апавяданне? Як вы мяркуеце, ці аднолькава чытачамі ўспрымаўся тэкст у 1920-я гады і сёння?
3. Адшукайце ў творы мастацкія азначэнні, якія характарызуюць Шумаву. Складзіце кароткае апісанне яе асобы.
4. Як апавядальнік ставіцца да ідэй, якія прапагандуе Шумава сярод жанчын? Якім чынам сёння ў грамадскай свядомасці адгукаецца прапаганда вобраза жанчыны, «вольнай ад іржавых пут»? Які сацыяльны інстытут разбураецца такім чынам?
5. Чыімі вачамі аўтар глядзіць на Шумаву? Што вы можаце сказаць пра гэтага героя? Ці асуджае ён галоўную гераіню?
6. Напішыце водгук на апавяданне. Раскрыйце ў водгуку наступныя пункты: 1) апісанне твора (назва, аўтар, год выдання); 2) агульнае ўражанне ад тэксту; 3) тэма апавядання; 4) асабістыя адносіны да герояў і падзей з тлумачэннямі; 5) самы запамінальны момант; 6) параўнанне з іншымі творамі; 7) значэнне тэксту для грамадства.
7. Прыдумайце лагічны эпілог да твора. Абмяркуйце ў класе, выберыце самы верагодны варыянт.
8. Выканайце заданне «Хвіліна маўлення» па творчасці Міхася Зарэцкага.

Апавяданне «Кветка пажоўклая»



Правообладатель Национальный институт образования

## Тэорыя літаратуры

### Псіхалагізм у мастацкім творы

«Мастацкую літаратуру справядліва называюць чалавеказнаўствам, бо пісьменнікі сапраўды часта заглядваюць у душу чалавека, імкнуцца зразумець, што адбываецца з ім, яго ўнутраным светам, чым выкліканы яго душэўныя хваляванні, асабліва калі парушаецца стары лад, асновы, нормы і традыцыі. У мастацкіх творах, як правіла, дэталёва апісваюцца сітуацыі, у якіх раскрываюцца мастацкія характары», — слушна заўважае даследчыца Валянціна Ткачук.

Стварэнне цэласнага характару ў мастацкім творы ідзе двума шляхамі. Па-першае, гэта адбываецца праз канструяванне ўнутранага свету асобы героя, так званую «плынь свядомасці» — асацыяцыі, матывы ўчынкаў, перажыванні, успаміны, уяўленні, што ў тэксце праяўляецца праз няўласна-простую мову. Па-другое, псіхалагічны партрэт вымалёўваецца праз вонкавае прадстаўленне персанажа — дэталей знешнасці, асаблівасцей паводзін, выказванняў, слоўнага партрэта, узаемадзеянняў з людзьмі і абставінамі. Напрыклад, вобраз Шумавай з апавядання «Дзіўная» псіхалагічна вывераны. Нягледзячы на пэўную абагульненасць і схематызм, у ім заключаны моцныя перажыванні, глыбока схаваныя эмоцыі. Ярка прадстаўлены і партрэт.

Вялікімі майстрамі псіхалагізму можна з поўным правам назваць Кузьму Чорнага і Івана Мележа. У творах Кузьмы Чорнага псіхалагізм, з аднаго боку, праяўляецца ў раскрыцці характару герояў, а з другога — тэксты ўключаюць чытача ў дзеянне, далучаюць да псіхалагічнай атмасферы твора, уздзейнічаюць на яго ўнутраны стан. У раманах Івана Мележа псіхалагізм іншага тыпу: пісьменнік валодае талентам з дапамогай трапнага слова, глыбокага роздуму, пейзажнай замалёўкі звяртацца да чалавечай душы і вылечваць яе.

***Псіхалагізм*** — мастацка-вобразнае адлюстраванне і выяўленне ў мастацкім творы ўнутранага жыцця асобы, што абумоўлена каштоўнасцямі аўтара, яго ўяўленнямі аб асобе і задумай, канцэпцыяй твора *(Паводле Зоі Мельнікавай)*.

1. Як вы разумееце паняцце «псіхалагізм» у мастацкай літаратуры?
2. У якіх вядомых вам творах выразна заўважаецца псіхалагізм?
3. Чаму псіхалагізм у часы Міхася Зарэцкага быў названы шкоднай з'явай?

Стэфан Цвейг



Правообладатель Национальный институт образования

## Пытанні і заданні для паўтарэння і падагульнення

1. Замацуйце біяграфічны матэрыял: разгледзьце стужку часу (гл. форзац) з гадамі жыцця пісьменнікаў перыяду 1920—1930-х гадоў. Хто з іх старэйшы? Малодшы?
2. Якую ролю ў гісторыі тагачаснай беларускай літаратуры адыгралі літаратурныя аб'яднанні?
3. Паразважайце, як разнастайнасць ідэйна-эстэтычных платформ літаратурных аб'яднанняў 1920—1930-х гадоў паўплывала на беларускую літаратуру: запаволіла або паскорыла яе развіццё. Растлумачце сваю пазіцыю.
4. На творчасць якіх беларускіх пісьменнікаў паўплываў мадэрнізм? Ці можна сказаць, што беларуская літаратура ў 1920-я гады была ўпісана ў агульнаеўрапейскі кантэкст?
5. Якія тэарэтычныя паняцці выклікалі ў вас найбольшую цяжкасць пры вывучэнні дадзенага раздзела? Паўтарыце іх. Назавіце прыклады лірычных, эпічных і драматычных твораў вывучанага перыяду.
6. Назавіце беларускія творы 1920—1930-х гадоў, у якіх галоўнымі персанажамі з'яўляюцца жанчыны. Ці ўсе гераіні станоўчыя?
7. Чаму Максіма Гарэцкага ставяць у адзін шэраг з класікамі беларускай літаратуры — Якубам Коласам, Янкам Купалам, Максімам Багдановічам? Як у творах пісьменніка паказаны падзеі Першай сусветнай вайны?
8. Максім Гарэцкі старэйшы за Міхася Зарэцкага ўсяго на 8 гадоў. Чаму, на вашу думку, іх проза прынцыпова адрозніваецца?
9. Як Змітрок Бядуля раскрывае праблему мастака і мастацтва ў апавяданні «Бондар»?
10. Якой эстэтычнай канцэпцыі прытрымліваўся ў творчасці Уладзімір Дубоўка? Да каго з паэтаў пачатку XX стагоддзя ён у гэтым блізкі?
11. Якія гістарычныя абставіны паказаны ў камедыі Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім»? Чаму твор застаецца папулярным і сёння? У чым значэнне п'есы для беларускай культуры?
12. Каго з пісьменнікаў 1920—1930-х гадоў вы маглі б назваць псіхолагам і чаму?
13. Падрыхтуйцеся да гульні «Хто/што я?». Напішыце на стыкерах назвы твораў, імёны персанажаў і прозвішчы пісьменнікаў. Размясціце ліст так, каб сябры бачылі, што на ім напісана, а вы — не. Паспрабуйце здагадацца, які твор, аўтар або герой вам выпаў, задаючы пытанні аднакласнікам. Яны могуць адказваць толькі «так» або «не».



Правообладатель Национальный институт образования

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПЕРЫЯДУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (1941—1945)

**1.** Прыгадайце падзеі, што адбываліся ў гісторыі Беларусі ў 1941—1945 гадах. **2.** Назавіце творы, прысвечаныя згаданаму перыяду, а таксама іх аўтараў.

Беларусь — краіна, якая перажыла мноства спусташальных войнаў. Асабліва пакутнай для нашай Радзімы стала Вялікая Айчынная вайна. Ад яе наступстваў залежаў лёс нацыі і кожнага чалавека. Гэты перыяд патрабаваў высокай духоўнай стойкасці, мужнасці і патрыятызму. У цяжкі час беларускі народ праявіў незвычайны гераізм у змаганні з ворагам. На акупаванай тэрыторыі не перапынялася літаратурна-мастацкае жыццё. Тут, асабліва ў партызанскіх зонах, пашыралася масавая паэзія, працягвалася дзейнасць прафесійных пісьменнікаў, якія сталі партызанамі або падпольшчыкамі: Анатоля Астрэйкі, Янкі Брыля, Антона Бялевіча, Міхася Васілька, Міколы Засіма, Анатоля Іверса, Ніны Тарас, Валянціна Таўлая.


СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ

ПАРТЫЗАНСКАЕ СЛОВА

ЛІСТОЎКА-ПЛАКАТ

ВЫДАННЕ ВІЛЕЙСКАГА АБКОМА КП(б) БЕЛАРУСІ

№ 2 МАЙ 1943 г.

ПАРТЫЗАНЫ, ПАРТЫЗАНЫ,
БЕЛАРУСКІЯ СЫНЫ!
ЗА НЯВОЛЮ, ЗА КАЙДАНЫ,
РЭЖЦЕ ГІТЛЕРЦАЎ ПАГАНЫХ,
КАБ НЕ ЎСКРЭСЛІ ВЕК ЯНЫ!

АДПОМСЦІ!

Дзе немца сустрэнеш,— забі!

Міхась МАШАРА

Лістоўка-плакат «Партызанскае слова» з Вілейшчыны (1943)

**Пісьменнікі — удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны.** У тыл ворага дастаўляліся беларускія газеты і часопісы «За Савецкую Беларусь», «Раздавім фашысцкую гадзіну», «За свабодную Беларусь», «Звязда», «Партызанская дубінка», «Партызанскае слова», «Чырвонаармейская праўда» і інш.

Актыўны ўдзел у выпуску гэтых выданняў прымалі Кандрат Крапіва, Міхась Лынькоў, Аркадзь Куляшоў, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка, Максім Танк, Пімен Панчанка, Васіль Вітка, Анатоль Астрэйка, Кастусь Кірэенка, Анатоль Вялюгін. Вершы беларускіх паэтаў перакладаліся на рускую мову. Акрамя публікацый, у перыядычным друку выйшлі асобныя кнігі перакладаў: «Беларусь в огне» (1943), «Стихи о Родине» (1941) Янкі Купалы, «Голос земли» (1942) Якуба Коласа, «Тебе, Беларусь» (1942) Пімена Панчанкі.

На тэрыторыі рэспублікі распаўсюджваліся рукапісныя лістоўкі, друкаваныя газеты, плакаты, якія выдаваліся партызанамі ў лясных



Правообладатель Национальный институт образования

друкарнях, падпольшчыкамі — у гарадскіх, а таксама завозіліся з-за лініі фронту (напрыклад, лістоўка Вілейскага абкама КП(б)Б «Партызанскае слова», плакат «Мы зноў з вамі!»).

У ваенны час многія пісьменнікі, што пачалі друкавацца ў 1920—1930-я гады, пайшлі на фронт.

Так, Анатоль Астрэйка падчас вайны быў адказным сакратаром сатырычнай газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну», двойчы накіроўваўся на акупаваную тэрыторыю Беларусі. Антон Бялевіч супрацоўнічаў у беларускім перыядычным друку, удзельнічаў у савецкім партызанскім руху на Віцебшчыне. Яго паэзіі ваеннага і пасляваеннага часу ўласцівы традыцыйна-фальклорная вобразнасць, народна-песенны лад, выразнасць мастацка-выяўленчых сродкаў, даступнасць лексікі, адкрытасць выказвання.




*П. Гаўрыленка.* Плакат «Мы зноў з вамі!» газеты «Савецкая Беларусь» (1943)

Мікола Сурначоў быў прызваны ў Чырвоную Армію ў 1941 годзе. Паэт удзельнічаў у абароне Каўказа, у вызваленні Беларусі, Украіны, Румыніі, Польшчы. Прайшоўшы амаль усю вайну, загінуў у ноч з 19 на 20 красавіка 1945 года пад Берлінам. Яго ваенная лірыка цалкам не захавалася, многія вершы згублены ў шпіталях, у баях. Засталіся ў асноўным творы, дасланыя сябрам і родным у лістах.



Супрацоўнікі рэдакцыі газеты «Савецкая Беларусь» (1942)



Правообладатель Национальный институт образования

Аднак яны, створаныя ў акопах, на рэдкіх прывалах, дзе не было часу не толькі адшліфаваць радок, але і пазначыць час і месца напісання, увайшлі ў скарбніцу беларускай паэзіі. Склалася так, што паэзія перажыла свайго аўтара — зборнікі Міколы Сурначова «На сурмах баравых» (1946), «Барвовая зара» (1959), кніга вершаў, лістоў і ўспамінаў «Акопны спеў» (1986) выйшлі пасля вайны.

Празаік і літаратурны крытык, аўтар цыкла раманаў «На перавале стагоддзя» Уладзімір Карпаў у 1920-я гады, падчас голаду на Паволжы, перабраўся з маці на Гомельшчыну, настаўнічаў, у 1941 годзе скончыў Мінскі педагагічны інстытут. У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у падпольным і партызанскім руху. Пасля вайны працаваў завучам у школе, а затым — у газетах «Савецкая Беларусь», «Літаратура і мастацтва», загадваў аддзелам прозы і крытыкі часопіса «Полымя».

На мемарыяльнай дошцы ў Доме літаратара ў Мінску ўвекавечаны імёны дваццаці шасці пісьменнікаў, што загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод іх — Змітрок Астапенка, Леанід Гаўрылаў, Рыгор Жалязняк, Алесь Жаўрук, Сяргей Крывец, Рыгор Мурашка, Алесь Пруднікаў, Мікола Сурначоў, Мікалай Сямашка і інш.

У гэты час проза існавала ў такіх жанравых формах, як апавяданне, памфлет, публіцыстычны артыкул.

Найбольш пашыраным жанрам прозы ў гады вайны было апавяданне. Патрыятызм, самаахвярнасць у барацьбе з ворагам, кемлівасць герояў у крытычных сітуацыях знайшлі сваё адлюстраванне ў творах Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Міхася Лынькова, Ільі Гурскага і інш.

***Памфлет*** — надзённы мастацка-публіцыстычны сатырычны твор, у якім выкрываюцца хібы грамадскага жыцця (палітычныя, культурныя, сацыяльныя) або заганы пэўных асоб.

Запамінальныя характары ў апавяданнях «Маленькая жанчына», «Бацька», «Аксёніны сляды», «Матчына благаславенне», «Прасторны дом», «Вялікае сэрца», аповесці «Заўтрашні дзень» паказаў Кузьма Чорны. Гэтыя творы вызначаюцца глыбокім псіхалагізмам у асэнсаванні вытокаў мужнасці і жыццястойкасці беларускага народа. Дзяўчына-падлетак («Маленькая жанчына»), трынаццацігадовы Максім («Матчына благаславенне»), Пархвен Катлубовіч («Вялікае сэрца») — кожны спазнаў асабістае гора: смерць родных,



Правообладатель Национальный институт образования

блізкіх або аднавяскоўцаў, але гэта не зрабіла іх жорсткімі, абыякавымі да жыцця. Кузьма Чорны засяродзіў увагу на трагічных момантах на шляху герояў, выявіў «асабістую крывавую драму», перажытую кожным. За лёсамі герояў пісьменніку бачыўся лёс народа, яго будучыня. У апавяданні «Маленькая жанчына» ён адзначыў: «І ўсё асабістае злілося ў кожнага ў адно з усімі». Пра тое, як праз жыццёвы шлях аднаго чалавека ў цяжкі для краіны час можа выявіцца гераічнае ў нацыянальным характары, яскрава сведчыць і вобраз Астапа (з аднайменнага апавядання Міхася Лынькова), які ў ХХ стагоддзі паўтарыў подзвіг Івана Сусаніна (завёў ворагаў у лес, на балота).

Вайна і дзеці — пашыраная тэма ў беларускай прозе ваеннага часу. Не варты звання чалавека той, хто нясе дзецям смерць і няшчасце. «Калі любіш сваіх дзяцей, дык нашто ж ты чужым згубу прынёс, каб цябе зямля не насіла?» — гаворыць адзін з герояў апавядання Кузьмы Чорнага «Смерць». Што рабіць, калі парушаюцца адвечныя законы жыцця — гінуць дзеці? Пра гэта можна, анямеўшы, у жалобе маўчаць або шукаць і знаходзіць словы, якія сведчылі б, даносілі боль і адначасова не адымалі надзеі на перамогу над злом.

Трагічныя матывы вызначаюць змест апавяданняў Міхася Лынькова «Васількі», «Дзіцячы башмачок», «Недапетыя песні», «Пацалунак», у якія шчымлівым адгалоскам уваходзяць асабісты боль і невымернае гора пісьменніка: фашысты расстралялі яго сына і жонку. Ваенныя творы Міхася Лынькова адметныя выключнай эмацыянальна-лірычнай усхваляванасцю.

Напісаныя на фальклорнай аснове апавяданні і навелы, што ўбачылі свет у зборніках Кузьмы Чорнага «Вялікае сэрца» і Міхася Лынькова «Астап», дасюль захоўваюць сваю мастацкую значнасць.

У ваенны час адбывалася сталенне творчых індывідуальнасцей: Іван Шамякін пачаў друкавацца ў першы год вайны ў армейскай газеце «Часовой Севера», там былі змешчаны яго нарысы і вершы. Першае апавяданне «У снежнай пустыні» было напісана ў 1944 годзе, напрыканцы вайны ім жа створана аповесць «Помста». Кузьма Чорны як вопытны таленавіты мастак слова прыхільна адгукнуўся пра апавяданне Івана Мележа «Сустрэча».

Менавіта Кузьме Чорнаму належыць першае ў беларускай літаратуры эпічнае асэнсаванне падзей вайны — раманы «Вялікі дзень», «Пошукі будучыні», «Млечны Шлях» і аповесць «Скіп’ёўскі лес». Эпічнаму голасу празаіка ўласцівы своеасаблівы тэмбр — з багаццем інтанацый, агульначалавечым гучаннем, якія робяць аўтара адметным.



Правообладатель Национальный институт образования

У сацыяльна-філасофскіх раманах Кузьма Чорны стварыў абагульнены вобраз беларускага народа, якому пагражала татальнае знішчэнне. Сваім чуйным сэрцам пісьменнік востра адчуваў небяспеку фашызму не толькі для суайчыннікаў, але і ўвогуле для чалавецтва.

**Патрыятычная публіцыстыка як самы аператыўны жанр ваеннай пары.** Актуальныя творы сталі з'яўляцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу. Палымяныя артыкулы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Кандрата Крапівы, Максіма Танка, Міхася Лынькова друкаваліся на старонках газет, гучалі па радыё, на мітынгах.

***Фельетон*** (ад фр. *feuille* — 'ліст, лісток') — жанр мастацкай публіцыстыкі, які мае пераважна сатырычную накіраванасць і спалучае надзённасць і насычаную вобразнасць, дакументальную дакладнасць і высокі эмацыянальны накал.

Выразную сатырычную накіраванасць мелі фельетоны Кузьмы Чорнага «Далікацтва каля вісельні», «Выхваляўся, выхваляўся ды і здох», якія склалі зборнік «Кат у белай манішцы».

У жанрах празаічнага памфлета і фельетона выступалі таксама Якуб Колас («Гітлер і чарадзей»), Кандрат Крапіва («Апошняя пасылка», «Ёлкі і палкі», «Наглядная геаграфія»). Пісьменнікі звярталіся да народа з заклікам знішчаць ненавіснага ворага. У франтавых перыядычных выданнях змяшчаліся выступленні, у якіх высмейваліся фашысты і іх памагатыя. У некаторых артыкулах («Народная нянавісць» Кузьмы Чорнага, «Тройка за тройкай» Міхася Лынькова і інш.) прыведзены факты ваеннага жыцця, дадзена вывераная народнай мараллю ацэнка.

Сатыра ваеннага часу, найперш вершаваная, развівалася разам з іншымі жанрамі. Напачатку плакатныя пародыі, фельетоны, байкі, сатырычныя вершы, прыпеўкі, эпіграмы насычаліся канкрэтнымі падрабязнасцямі, якія рабілі іх дакументальна дакладнымі. У сатырычным рэчышчы актыўна працавалі шматлікія беларускія паэты і празаікі (Пімен Панчанка, Максім Танк, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка, Анатоль Астрэйка, Максім Лужанін, Міхась Лынькоў, Кузьма Чорны, Валянцін Таўлай). Аднак асаблівая роля ў развіцці сатырыч-




Загаловачны комплекс газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну» (1944)



Правообладатель Национальный институт образования

ных жанраў належыць Кандрату Крапіве — аўтару дасціпных вершаў і баек і рэдактару газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». Тамсама працаваў Максім Танк, які змагаўся з ворагам сваёй пісьменніцкай «зброяй» — трапнымі подпісамі пад карыкатурай, сатырычным апавяданнем, фельетонам і палымянымі вершамі.

1. Якія літаратурныя жанры былі найбольш распаўсюджаны ў час Вялікай Айчыннай вайны і чаму?
2. Хто з беларускіх пісьменнікаў працаваў у гэтых жанрах?
3. Назавіце асаблівасці прозы ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Чым яны абумоўлены?
4. У чым была адметнасць ваеннай публіцыстыкі ў 1941—1945 гадах?
5. Прааналізуйце ілюстрацыі газеты і плакатаў, прапанаваныя раней. Ацаніце, як змест і афармленне сатырычнага выдання працуюць на рэалізацыю яго мэты.
6. Пазнайце на фотаздымку «Супрацоўнікі рэдакцыі газеты “Савецкая Беларусь”» аўтараў наступных твораў: апавядання «На пыльнай дарозе», аповесці «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў», сатырычнай камедыі «Хто смяецца апошнім». У каго з іх да пачатку Вялікай Айчыннай ужо быў вопыт напісання твораў пра вайну? Хто ўдзельнічаў у Першай сусветнай вайне?
7. Знайдзіце ў інтэрнэце фотакопіі выданняў ваенных гадоў «Партызанская дубінка», «Раздавім фашысцкую гадзіну», «Чырвоная змена» або газеты вашага горада. Акрэсліце іх тэматыку, звярніце ўвагу на афармленне.

## ГЕРОІКА-ПАТРЫЯТЫЧНЫ ПАФАС ВАЕННАЙ ЛІРЫКІ

Паэзія перыяду Вялікай Айчыннай вайны сцвярджала высокія ідэалы беларускага народа, якія фарміраваліся на працягу складанай шматвяковай гісторыі. Агітацыйная публіцыстычная лірыка была адрасавана салдатам-франтавікам, партызанам, падпольшчыкам, да якіх яна даходзіла праз франтавую газету, лістоўку, радыё. У гэты час з’яўляліся вершы-заклікі, пасланні, нават заклінанні: «Душою і сэрцам мы з вамі, героі», «На абарону», «Народу-барацьбіту», «Абаронцам роднай зямлі» Якуба Коласа; «Пісьмо землякам», «Помста» Петруся Броўкі; «Вастрыце зброю», «Падымайся, Беларусь!» Максіма



Правообладатель Национальный институт образования

Танка; «Мужайся», «Мы вернемся» Пятра Глебкі; «Змагайцеся адважна за Радзіму» Пімена Панчанкі.

У газеце «Правда» 24 чэрвеня 1941 года быў надрукаваны на беларускай мове верш Якуба Коласа «Шалёнага пса — на ланцуг». «Да зброі, народы раскутай краіны: // Разбойнік штурмуе наш дом! // Магутнаю рацццю, патокам адзіным // Абрушым на ворага гром!» — пісаў Якуб Колас. У той жа дзень гэты твор змясціла газета «Звязда», а побач — вершы «Смялей у бой!» Пятра Глебкі і «Мы пойдзем за праўду...» Антона Бялевіча.

Хрэстаматыйнымі сярод твораў заклікальна-эмацыянальнай формы з'яўляюцца таксама вершы Янкі Купалы «Беларускім партызанам» і «Зноў будзем шчасце мець і волю», якім уласціва кантраснае спалучэнне двух пачуццяў — любові да роднай зямлі і нянавісці да ворагаў, традыцыйныя вобразы-сімвалы, лірычна-песенная інтанацыя.

У цяжкую гадзіну выпрабаванняў абвастрылася любоў да Радзімы. Мабыць, у гісторыі нашай літаратуры не было перыяду, які пакінуў бы столькі твораў — зваротаў да маці-Беларусі, замілаваных вобразных выказванняў пра родны край (напрыклад, вершы Пімена Панчанкі «Краіна мая» (1942), Максіма Танка «Беларусь» (1944) і інш.). Любоў да Радзімы выяўлялася не толькі ў закліках да барацьбы з ворагам, але і ў напамінку пра захаванне найкаштоўнейшага нацыянальнага скарбу — роднай мовы.

У беларускай ваеннай паэзіі быў распаўсюджаны жанр гераічнай балады з моцным рамантычным пачаткам. У ім плённа працавалі Аркадзь Куляшоў («Балада аб чатырох заложніках», «Маці», «Камсамольскі білет», «Балада аб знойдзенай падкове»), Максім Танк («У завею»), Пімен Панчанка («Сямёра дачок», «Песня пра чатыры магілы»), Пятрусь Броўка («Смерць героя», «Кастусь Каліноўскі», «Надзя-Надзейка»), Пятро Глебка («Пасланец»), Анатоль Вялюгін («Балада аб уральскім танку»). Балада як ліра-эпічны жанр набліжаецца да паэмы. У ёй паказваюцца моцныя характары, адлюстроўваюцца напружаныя жыццёвыя сітуацыі. Вялікая Айчынная вайна давала мноства прыкладаў выключнага гераізму людзей. Гераічнае ў баладах выяўлялася не як адзінкавы факт, а як агульнанародная з'ява.

Літаральна на пачатку вайны Мікола Сурначоў напісаў славуты верш-баладу «У стоптаным жыце»:

Ніколі не ехаць
Хлапцу маладому
Да блізкага гаю,
Да роднага дому.



Правообладатель Национальный институт образования

Над ім асыпаюцца
Слуцкія краскі,
Абсмалены колас
Схіліўся да каскі.

Ляжыць ён, як віцязь,
У стоптаным жыце.
Маці спаткаеце, —
Ёй не кажыце…
*1941, Заходні фронт.*

**З успамінаў.** Як згадваў Мікола Аўрамчык, задума твора ўзнікла ў першыя дні вайны, калі маладыя студэнты, пакінуўшы Мінск, хаваліся ў жыце: «Сурначоў увесь час паўтараў: "Які быў ураджай!.. Як на пагібель…" Надвячоркам раптам прачытаў мне верш».

Гэты кароткі твор можна назваць выключным сярод пафаснай лірыкі таго часу. Паэт не першы звярнуўся да вобраза забітага салдата. Але менавіта ён дасягнуў пранікнёнага спалучэння глыбокай чалавечай жальбы і замілаванай спагаднасці прыроды. У адрозненне ад усіх балад падобнага зместу герой Сурначова не толькі не прасіў перадаць вестку родным, але і заклікаў не гаварыць маці пра яго смерць. Мікола Сурначоў, як і кожны сапраўдны паэт, стаў прарокам і прадказаў трагедыю ўсяго пакалення. Невыпадкова Аляксандр Твардоўскі перастварыў гэты мікрашэдэўр па-руску, і балада Міколы Сурначова стала вызначальнай, эпахальнай у славянскай паэзіі.

Яркім прыкладам паэзіі ваенных гадоў стала творчасць Пімена Панчанкі. Гэта лірыка суровай праўды, балючая споведзь пра перажытае ў віхуры грознага ліхалецця. Зборнікі «Дарога вайны» і «Далёкія станцыі» адлюстроўвалі няскораны дух беларускага народа, ідэю свабоды і надзею на вяртанне ў мірнае жыццё. У гэты час паэт напісаў высокамастацкі цыкл «Іранскі дзённік», у які ўвайшлі вершы «Сустрэча з бярозай», «Рамантыка», «Сон пра апошні залп» і інш.



Рукапісы Пімена Панчанкі ваенных гадоў, зборнік «Дарога вайны» (1943)



Правообладатель Национальный институт образования

! У 1944 годзе штаб, дзе служыў Пімен Панчанка, перакінулі ў Іран — і яшчэ два доўгія гады пасля вызвалення Беларусі паэт быў адарваны ад Радзімы. Думкамі, пачуццямі, клопатамі ён, аднак, знаходзіўся ў Беларусі. Удалечыні ад Радзімы ім быў створаны цыкл «Іранскі дзённік».

Паэтычныя творы не толькі пісаліся, але і выдаваліся на акупаванай ворагам тэрыторыі. У 1943 годзе супрацоўнікі слуцкай падпольнай газеты «Народны мсцівец» сабралі лепшыя вершы Анатоля Астрэйкі і выдалі асобным зборнікам пад назвай «Слуцкі пояс», які карыстаўся асаблівай папулярнасцю.

Беларуская літаратура часоў Вялікай Айчыннай вайны стала летапісам трагічных падзей нацыянальнай гісторыі і бессмяротнага подзвігу народа ў барацьбе з фашызмам. У творах пісьменнікаў знайшоў адлюстраванне нацыянальны характар беларуса.

## Пятрусь Броўка



Пятрусь Броўка нарадзіўся 25 чэрвеня 1905 года ў вёсцы Пуцілкавічы (цяпер Ушацкі раён). На старонках газеты «Чырвоная Полаччына» 18 жніўня 1926 года быў змешчаны яго першы верш «Ой, не шапчы, мая бярозка...». З гэтага часу пачынаецца дарога паэта ў вялікую літаратуру.

Паваротны момант у жыццёвай і творчай біяграфіі маладога аўтара — прыезд у Мінск і паступленне на вучобу ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта. У сталіцы Пятрусь Броўка стаў актыўным удзельнікам літаратурнага жыцця, увайшоў у літаратурнае аб'яднанне «Маладняк». Са зборніка «Гады як шторм» (1930) пачалася актыўная мастацкая дзейнасць паэта. Кніга сведчыла пра наследаванне асаблівасцей творчай манеры, вучобу ва Уладзіміра Маякоўскага, стылем якога захапляліся ў той час шматлікія маладыя творцы.

Асабліва значным крокам у паглыбленні эстэтыка-выяўленчага пачатку, лірычнага «я» аўтара стала кніга «Шляхамі баравымі». Пейзажныя вершы «Канец лета», «Дождж», «Мяцеліца», «Бор» і іншыя вылучаюцца ў даваеннай паэзіі вобразнай маляўнічасцю, прачу-



Правообладатель Национальный институт образования

ласцю, жывым настроем: «Прабіўшы плыні духаты // Пайшлі расліны ў рост… // І птушак жоўтыя раты // Лавілі неба з гнёзд. // Маланкі стрэламі ўстаюць, // У бубен сыпле гром… // І я, захоплены, стаю, // Абдожджаны кругом» («Дождж»).




Вокладка першага зборніка Петруся Броўкі «Гады як шторм» (1930)

Прыкметна ўзмужнеў талент Петруся Броўкі ў гады вайны. Яго вершы, як і творы іншых паэтаў, прасякнуты заклікамі да барацьбы і помсты. У азначэннях захопнікаў — «звяры», «драпежнікі шалёныя», «вырадкі-псы», «падлюгі» — чуецца заклік да бескампраміснага бою. Калі ворагі — нелюдзі, то і знішчаць іх трэба без усялякага шкадавання («Дрыжыце, падлюгі-фашысты!», «Помста»).

Асноўная тэма ваеннай лірыкі Петруся Броўкі — тэма Радзімы. Героі яго твораў — воіны-франтавікі, партызаны, іх сёстры, бацькі, каханыя — людзі, якім не сорамна глядзець у вочы маці-Радзіме, бо ўсе яны «сэрцам і душою» былі з ёй у цяжкую гадзіну, мужна абаранялі яе. Салдат, пачуцці якога раскрываюцца ў вершы «Рана», марыць хутчэй дайсці дадому, удыхнуць роднае паветра, зірнуць на дарагія сэрцу мясціны, каб зноў гнаць ворага і прыспешваць крокі да перамогі. Восем ран пакінула на яго целе вайна, але самая балючая — рана на целе паланёнай Радзімы. Загаіць яе здольна толькі вызваленне роднага краю і вяртанне на вольную зямлю: «Знаю, сціхнуў бы боль, // Каб чабору таго, // Каб тае медуніцы, // Каб паветра з бароў, // Што пад Мінскам у нас».

Упэўненасцю ў хуткай сустрэчы з роднымі мясцінамі поўніцца і верш «Байцам-беларусам», у якім арганічна знітаваны лёс воіна-салдата і ўсяго народа. Ідэя вынікае з радкоў, дзе гаворыцца, што герой нават са страчаным зрокам абыдзе паўсвету, але знойдзе шлях у свой родны край.

У беларускай літаратуры ваеннага часу шматлікія творы прысвечаны подзвігам партызан. Верш-балада Петруся Броўкі «Кастусь Каліноўскі» распавядае пра падзеі адначасова ў легендарным і рэальным планах. Герой верша — канкрэтны чалавек, вясёлы калгасны трактарыст Каліна. Калі пачалася вайна, ён пайшоў у партызаны. «Сілай магутны, душою агністы», як сама помста, прыходзіў туды,



Правообладатель Национальный институт образования

дзе вораг чыніў здзек і расправу. Тым і заслужыў герой пашану ў народа, таму і празваны быў паводле імені славутага паўстанца, абаронцы людзей простых.

Праз легендарнасць подзвігу героя паэт перадае ўсенародны характар партызанскай барацьбы. Як агню баяцца ворагі Каліны, а людзі любяць і славяць яго, расказваюць легенды. У час грозных выпрабаванняў для народа, як сведчыць беларускі фальклор, на яго абарону становяцца вялікія продкі. Каліна з'яўляецца абаронцам як беларускіх маці (яны «праз доўгія, сумныя вёсны ткуць пояс квяцісты герою на кроснах»), дзяўчат (яны «збіраюць яму васількі на кашулю»), так і беларускай зямлі, Радзімы наогул. Так праяўляецца патрыятычны пафас.

Трагедыйным і антываенным зместам прасякнута балада «Надзя-Надзейка». Тужліва-журботная мелодыя жалейкі праходзіць праз увесь твор, які ўспрымаецца як песня-плач па загубленай ворагам маладосці беларускай дзяўчыны: «Травы абсыплем чыстай слязою, // Чыстай слязою, // Быццам расою. // — Надзя-Надзейка!.. — кліча жалейка». Балада заснавана на фальклорных вобразах і параўнаннях: белая бяроза, горачка-гора, песні-вяснянкі, горкія слёзы і іншыя, што падкрэсліваюць пратэст супраць жудаснай вайны, якая ўчыніла гвалт і здзек, растаптала каханне. У заключных радках верша гучыць матыў адплаты ворагу: «Ходзіць па лесе, пушчах, дубровах // Хлопец разгневаны, хлопец суровы: // — Скора вярнуся // Разам з сябрамі, // Грукнем маланкамі // Ды перунамі, // Выпечам змеяў жалезам калёным, // Неба ачысцім, хмары разгонім...»

У ваенныя гады Пятрусь Броўка напісаў некалькі эпічных твораў, сярод якіх вылучаецца паэма «Беларусь» — паэтычны маналог аб Радзіме. У ёй яскрава паўстае вобраз роднага краю — прыгожай зямлі са слаўнай мінуўшчынай. Адметны ў паэме зварот да падзей гістарычнай даўніны, калі вырашаўся лёс беларускага народа, яго свабоды і будучыні. Паэт згадаў Скарыну, Вашчылу, агульныя перамогі беларусаў, рускіх, украінцаў пад Грунвальдам, на Чудскім возеры, выгнанне Напалеона. Шмат пакут, войнаў, чужынцаў зведала беларуская зямля, але яе шляхамі «вярнулася ворагаў мала дамоў», бо на працягу ўсёй гісторыі народ Беларусі не стаў на калені, не скарыўся. Паэт упэўнены, што як некалі былі пераможаны «псы-рыцары» і французскія ваякі, так і ў гады Вялікай Айчыннай вайны будуць выгнаны з роднай зямлі фашысцкія захопнікі. Твор напісаны з эмацыянальнай пранікнёнасцю і патрыятычным пафасам.



Правообладатель Национальный институт образования

Верш Петруся Броўкі **«Спатканне»** напісаны ў 1943-м — у самы цяжкі, пераломны ваенны год. Яго можна назваць салдацкай біяграфіяй — ён таксама прысвечаны тэме Радзімы і ўяўляе сабой маналог воіна, які праз пакуты ішоў да родных мясцін, дзе «ўсё дорага тут, // Люба, родна, прыгожа...». Звыклыя і дарагія сэрцу краявіды — поле, неба, «і лясы, і кусты» заўсёды жылі «ў душы» і «ў вачах» лірычнага героя і надавалі моцы ў самыя цяжкія моманты ваеннага ліхалецця: «Хіба мог я калі // Хоць на момант забыцца? // Вамі жыў я // І ў сэрцы хацеў зберагчы. // Мне званілі штодня // З-пад Ушачы крыніцы, // Хвалі Нёмна будзілі // Не раз уначы».



*В. Бялыніцкі-Біруля.* Зноў зацвіла вясна (1947)

За плячыма салдата «больш чым кладзі салдацкай... нямала... тугі»: цяжкія ваенныя дарогі, гора, пакуты і жах, смерць сяброў. Усё гэта адбілася на яго знешнасці: выпрабаванні «як срэбрам, // Абсыпалі мне галаву...». Але, нягледзячы ні на што, у героя была адна мэта — вярнуцца ў родны край: «Я ўставаў // І ішоў па ваеннай дарозе. // Верыў — дома мне быць, // Дабрыду, дажыву...»

З баямі ён дайшоў да бацькоўскай зямлі, знаёмых з дзяцінства мясцін, якія з цяжкасцю пазнаў: там, дзе некалі кіпела жыццё, салдат убачыў сляды вайны. Гэта перажыванне паэт перадаў з дапамогай эпітэтаў, малюючы «засмучаныя хаты» і «здратаваныя нівы». Сэрца воіна сціснулася ад болю, запалала агнём помсты: «Гляньце ў сэрца маё, — // Я прынёс яго з бою, // На агні яго можна // Мячы гартаваць». Верыцца, што не супакоіцца воін, пакуль не дачакаецца канчатковай перамогі над ворагам, бо гэта яго святы абавязак перад народам і Айчынай — адпомсціць «за крыўду і боль», «За сябе і за вас, // І за гэтую грушу, // Што з абвугленым голлем // Стаіць ля акна».

Салдат збіраецца ў дарогу, яго «кліча Буг», але ён верыць у шчаслівае вяртанне, калі «перамога // над усёю краінаю // Ўстане зарой» і зноў, як і раней, зазвоняць «з-пад Ушачы крыніцы», будзе шапацець «трысцё па-над Сожам» і гарэць «у пажарах бяроз лістападаўскі шлях».



Правообладатель Национальный институт образования

Шматлікія лірычныя вершы Петруся Броўкі ваеннага часу поўніліся надзеяй воінаў на сваю былую мірную працу. Традыцыйным нацыянальна-фальклорным матывам сяўбы ў творы «Будзем сеяць, беларусы!» паэт сцвярджаў няскоранасць беларускага народа, веру ў вечнае красаванне жыцця на роднай зямлі. Гэта тэма асабліва выразна гучала ў творах, напісаных у 1945 годзе. Адзін з іх з характэрнай назвай «Возьмем сеўні!..» прасякнуты радасцю вяртання да зямлі і стваральнай працы, выяўляе патрыятычны, светлы настрой героя, яго ўзрушанасць. Адметнасцю лірыкі Петруся Броўкі з'яўляецца адухаўленне прыроды, якая прымае актыўны ўдзел у жыцці чалавека, стварае агульную ўрачыстую атмасферу: «Грайце ж вы, вятры-гарністы, // Шмат герояў стрэнуць хаты, // Зернем чыстым, // Зернем чыстым // Загудзіць наш край багата».

Праз усю творчасць аўтара праходзіць паэтычны вобраз хлеба, які робіцца «галоўным героем» паэмы «Хлеб». Ён — сімвал вернасці мастака Бацькаўшчыне, яго юнацкім марам.

За кнігі паэзіі і прозу Пятрусь Броўка быў неаднаразова ўшанаваны літаратурнымі прэміямі і дзяржаўнымі ўзнагародамі. А ў 1966 годзе яму было прысвоена ганаровае званне народнага паэта БССР.

1. Назавіце асноўныя тэмы творчасці Петруся Броўкі. Ці абмяжоўваецца аўтар тэмай гераічнага змагання з ворагам?
2. Успомніце яго вершы «Кропля» і «Пахне чабор». Звярніце ўвагу на адлюстраванне ў іх пейзажных малюнкаў. Чаму споведзь пра першае каханне падаецца аўтарам праз сувязь з прыродай?
3. Прыгадайце вершы паэта, у якіх выяўляюцца яго патрыятычныя пачуцці («Калі ласка!», «Зямля Беларусі»). Як раскрываецца ў творах характар лірычнага героя, што яго непакоіць?
4. Чаму родная зямля і матчына мова — найвялікшы духоўны скарб для кожнага? Адказ падмацуйце цытатамі з твораў Петруся Броўкі.
5. Прааналізуйце верш Петруся Броўкі «Спатканне» згодна з алгарытмам аналізу паэтычнага твора на старонках 133—134.
6. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Вітольда Бялыніцкага-Бірулі «Зноў зацвіла вясна». Вызначце дэталі, якія ўказваюць на дакладны час, адлюстраваны ў творы. Якімі сродкамі аўтар перадаў асноўную думку, агульны настрой? Якія літаратурныя тэксты маюць ідэю, блізкую да твора выяўленчага мастацтва? Пацвердзіце цытатамі-прыкладамі.
7. Уявіце, што вам неабходна да Дня Перамогі зрабіць відэаролік з радкамі паэмы Петруся Броўкі «Беларусь». Які сцэнарый вы прапануеце?



Правообладатель Национальный институт образования

## Аркадзь Куляшоў



Аркадзь Куляшоў нарадзіўся 6 лютага 1914 года ў вёсцы Саматэвічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Цікавіцца паэзіяй і спрабаваць пісаць вершы пачаў у сямігадовым узросце. У 1926 годзе, калі яму, вучню Саматэвіцкай школы, было ўсяго 12 гадоў, у клімавіцкай газеце «Наш працаўнік» пад псеўданімам Аркадзь Дуда быў надрукаваны першы верш — «Ты мой брат» — на беларускай мове. У рэспубліканскім друку юны паэт выступіў з творамі ў 1927 годзе ў часопісе «Чырвоны сейбіт».

У 1928 годзе пасля заканчэння сямігодкі юнак паступіў у Мсціслаўскі педагагічны тэхнікум, пасябраваў з таленавітымі паэтамі-маладнякоўцамі — Змітраком Астапенкам і Юліем Таўбіным, якія вучыліся разам з ім.

> ! У 1928 годзе вядомы літаратурны часопіс Беларусі «Полымя» змясціў яго верш «Бывай...», прысвечаны Алесі Карыткінай — першаму юнацкаму каханню аўтара. Праз шмат гадоў, пасля значнай перапрацоўкі, твор быў пакладзены на музыку Ігарам Лучанком і стаў папулярнай песняй «Алеся» ансамбля «Песняры».

У 1930 годзе Аркадзь Куляшоў пераехаў у Мінск і стаў студэнтам літаратурнага факультэта Беларускага вышэйшага педагагічнага інстытута, дзе правучыўся да вясны 1933 года. У гэты час выйшаў першы зборнік вершаў маладога паэта «Росквіт зямлі».

Узяўшы імклівы старт, паэзія Аркадзя Куляшова набывала адметныя эстэтычныя якасці, разгортвала цікавыя тэмы. Самай прыкметнай з’явай у творчасці Куляшова даваеннага часу стала нізка вершаў пад назвай «Юнацкі свет», надрукаваная ў 1938 годзе. У зборнік увайшлі песня-паэма «У зялёнай дуброве», вершы «Воблака», «Ранак», «На сотай вярсце», «Магілёўская хмарка», «Плыла, цалавалася хмара з зямлёй», «Мая Бесядзь» і іншыя, у якіх малады творца, па меркаванні крытыкаў, знайшоў уласны адметны стыль. У гэтым цыкле ўзбагацілася палітра Аркадзя Куляшова — мастака, змянілася жанравая структура верша: паэт звярнуўся да дзённікава-нарысавай формы, сінтэзаваў пейзаж і побытавыя сцэны.



Правообладатель Национальный институт образования



КРАСНОАРМЕЙСКАЯ ПРАВДА

**Обсуждение поэмы Аркадия Кулешова „Сцяг брыгады“**

Вчера в редакции «Красноармейской правды» состоялось обсуждение новой поэмы белорусского поэта Аркадия Кулешова — «Сцяг брыгады» («Знамя бригады»).

«Сцяг брыгады» — это поэтический дневник непосредственного участника отечественной войны против немецко-фашистских захватчиков. В поэме с большой художественной силой показано, как население Белоруссии покидало родные города, села и деревни, на которые надвигались гитлеровские орды, какие муки переносят советские люди, оставшиеся в оккупированных гитлеровцами районах. Поэма ярко рассказывает о борьбе лучших сынов белорусского народа за освобождение родной земли.

В обсуждении поэмы приняли участие писатели Кожевников, Слободской, Стахович, поэт Твардовский, Бубенков и другие.

Отдельные главы поэмы будут печататься в «Красноармейской правде».

**Мастер своего дела**

Вкусные и сытные обеды готовит для бойцов повар красноармеец Василий Пустовойтов.

— Молодец наш повар, отличный мастер своего дела, — отзы-

Нататка ў газеце «Чырвонаармейская праўда» пра паэму Аркадзя Куляшова «Сцяг брыгады» (1943)

У гэты час аўтар прад’яўляў да сябе высокія патрабаванні, ён адчуваў, што яго паэтычнаму стылю не хапае натуральнасці і прастаты. «Разумею, што лепш за ўсё звярнуцца да народнай песні, да Янкі Купалы, да Якуба Коласа», — адзначаў ён у аўтабіяграфіі. У выніку такой працы стыль паэта набыў гарманічнасць, зладжанасць, і асабліва вялікая роля належыць у гэтым вуснай народнай творчасці, якую Аркадзь Куляшоў шырока выкарыстаў у даваеннай паэме «У зялёнай дуброве», падчас вайны — у паэмах «Сцяг брыгады» і «Прыгоды цымбал», а таксама ў лірычных вершах-баладах.

Вайна напаткала Аркадзя Куляшова на Хоцімшчыне. Вярнуўшыся ў Мінск, ён не застаў сям’і. Адступленне нашых войскаў, жорсткія налёты фашысцкай авіяцыі, незлічоныя людскія ахвяры на вуліцах палаючай сталіцы — усё гэта ўразіла паэта нечаканасцю і трагізмам. 24 чэрвеня 1941 года ён пакінуў ахоплены пажарам горад. «Як ад роднай галінкі дубовы лісток адарваны, // Родны Мінск я пакінуў, нямецкай бамбёжкаю гнаны», — напісаў Куляшоў у паэме «Сцяг брыгады». Паэт апрануў шынель, каб абараніць Радзіму ад ворага і прайсці разам з суайчыннікамі праз цяжкія выпрабаванні.

Аркадзя Куляшова накіравалі ў ваенна-палітычнае вучылішча пад Ноўгарадам. З ліпеня 1941 года ён працаваў на фронце ў армейскай газеце «Знамя Советов». Вялікай папулярнасцю карысталіся яго вершы і гумарыстычныя творы пра байца Аляксея Пятрова. Са снежня 1943 года і да вызвалення Беларусі паэт знаходзіўся ў Беларускім штабе партызанскага руху.

У гады Вялікай Айчыннай вайны змяніліся тэмы і вобразы куляшоўскай паэзіі. «Даў я ёй (сваёй песні. — *Аўт.*) боты і лыжку запхнуў за халяву, // Каб ні на крок не пасмела ад часу адстаць» — такія радкі Аркадзь Аляксандравіч напіша пазней у вершы «Размова з патомкам» (1952).

На старонках франтавога друку паэт расказваў пра суровую праўду змагання з фашыстамі: пра мужнасць і стойкасць байца на Бранскім фронце, якога фашысты на марозе аблілі вадой; пра безыменнага



Правообладатель Национальный институт образования

мінамётчыка, што на сваім участку стрымліваў наступленне фашысцкай дывізіі; пра дзяцей і сястру камандзіра партызанскай брыгады Міная Шмырова, расстраляных ворагамі, а таксама мужных беларускіх дзяўчат, якіх фашысты вывезлі ў Германію, але не змаглі зламаць духоўна.

> **З успамінаў.** «Дзень на перадавой, вечар у дарозе, ноч у зямлянцы, дзе пры цьмяным святле газоўкі пісаліся вершы, нарысы, артыкулы, заметкі. А раніцою ўсё гэта ўжо чыталася ў палках і на батарэях» — так пісаў пра работу франтавога журналіста рускі паэт Аляксей Суркоў.

У гады вайны паэт стварыў баладны цыкл пра подзвіг беларускага народа ў гады ліхалецця, у якім вылучаюцца вершы-балады «Млынар», «Над брацкай магілай», «Ліст з палону», «Маці», «Балада аб чатырох заложніках», «Балада аб знойдзенай падкове». Яны грунтуюцца на канкрэтных падзеях і адлюстроўваюць суровую біяграфію ваеннага пакалення, а таксама паказваюць крыніцу духоўнай сілы чалавека.

Верш «Маці» напісаны паводле народнай балады і прысвечаны самаахвярнасці, гатоўнасці маці ў любы момант засланіць дзяцей ад бяды і небяспекі. У цяжкім чаканні сына з паходу маці як сімвал жыцця пасеяла зярняты. Яны ўпалі на камень і не ўзышлі. Жанчына просіць палявую дарогу, каб тая задобрыла чэрствы камень. Але просьба не дапамагае. У эпілогу раскрываецца самаахвярнасць мацярынскай любові: «І тройчы такою кляцьбою // Той камень пракляла. // Стаў камень зямлёю, // Сама ж яна каменем стала... // На камні былым пры дарозе // Ўзыходзяць зярняты. // Вяртаецца сын па дарозе // З паходу дахаты».

Гэтак жа сурова і мужна вырашалася Аркадзем Куляшовым лірычная тэма кахання. У аснове верша «Ліст з палону» — гісторыя лёсу беларускай дзяўчыны, асуджанай на здзекі. Твор напісаны ад імя палоннай, якую вораг вывез у няволю. Дзяўчына разумела, якія пакуты яе чакаюць, яна трымалася мужна, «стала скупою на слёзы». Рака Днялро прыгадала ёй малюнкі шчаслівага мінулага, але яны перамяжоўваліся з жахлівай рэчаіснасцю. Васількі за акном не дарылі радасці, а нагадвалі гераіні пра пакутлівы лёс. У канцы верша гучыць своеасаблівы зварот — наказ воіну разлічыцца за ўсе пакуты. Падчас вайны размовы персанажаў з ветрам, ручаём, лесам з’явіліся ў радках паэта невыпадкова: яны неслі ў сабе спрадвечную патрэбу выплеснуць



Правообладатель Национальный институт образования

плач аб запалоненай чужынцамі зямлі. Гутаркі з роднай прыродай прасякнуты народным гневам і згадкамі помсты.

Верш **«Над брацкай магілай»** прысвечаны трагічным падзеям ваеннага часу. У абагульненым, пададзеным у тыповых рысах пейзажы паэт паказаў не тыя дэталі, што вылучаюць гэту мясціну сярод іншых, а такія, што робяць яе падобнай да іх: «Ёсць пад Старою Русаю руская вёска Лажыны. // Там, нібы ў Беларусі, і вербы растуць, і рабіны...» Руская вёска Лажыны стала для беларускіх воінаў такой жа дарагой, як і родныя паселішчы. Салдаты адстойвалі яе ад ворага з такой жа мужнасцю, з якой за беларускія вёскі змагаліся сыны іншых народаў.

Цэнтральная сцэна — пахаванне воінаў, што загінулі ў Расіі, далёка ад дому. Яны баранілі разам з «ленінградцамі, татарамі, узбекамі» родны край ад ворагаў і палеглі ў сырой зямлі. Паэт перажывае гібель сяброў, як смерць родных людзей — сыноў і братоў, што не паспелі надзівіцца з прыгажосці свету, далюбіць родных і блізкіх; яму баліць сэрца, што «не проста салдацкія косці // Засыпаем мы жвірам халодным, // а большае штосьці...». Зямля хавае жывыя вочы і вусны ваяроў, «на якіх пацалункі дзяцей і жанок не астылі», рукі, «якія дзяцей тых насілі», ногі, «якія паўсвету схадзілі». Верш уражвае эмацыянальнасцю і шчырасцю пачуцця: аўтар не паддаўся спакусе — гучнымі словамі ўхваліць подзвіг абаронцаў Радзімы, а звярнуў увагу на трагізм падзей, перадаў яго праз звыклую на вайне сцэну пахавання.

У творы гучыць тэма любові да зямлі, дзе герой нарадзіўся і вырас. Родны куток сімвалізуе не толькі малую радзіму, але і ўвесь край, з яго пожнямі, палямі, крыніцамі, пушчамі; край, які не месціцца ў мяшэчку з зямлёй, што салдаты, на жаль, так і не паспелі ўзяць з сабой: «Што ім жменька зямлі той? // Ты ўся ім патрэбна, Радзіма». Фальклорны матыў «зямелькі-талісмана» перарастае ва ўзнёслае прызнанне ў любові, сыноўняй вернасці і адданасці, ператвараецца ў абавязак адпомсціць ворагам: сыны розных народаў клянуцца «варожай крывёй // Напаіць беларускія рэкі». Паралельна ў вершы гучыць тэма дружбы, вайсковай супольнасці.

Інтанацыйная афарбоўка твора змяняецца ад жалобна-сумнай да строга напружанай. Гэтаму ў ліку іншага садзейнічае ўмела выкарыстаны аўтарам гукапіс: «ве**р**бы **р**астуць і **р**абіны», «**ж**аўцеюць п**р**ыго**ж**ыя к**р**аскі», «**рж**авеюць ва**р**о**ж**ыя каскі», «**с**лёзы **с**уровых **с**аромяцца... касак» і інш.



Правообладатель Национальный институт образования

У вершах пісьменніка ваеннага часу чуецца светлы, пранікнёны, узнёсла-балючы голас чалавека, грамадзяніна, байца. Героі яго твораў — асобы рэальныя і легендарныя, драматычныя і бессмяротныя. Яны аддаюць сваё жыццё за маральныя каштоўнасці ўсяго чалавецтва.

Ва ўмовах франтавога жыцця Аркадзь Куляшоў здолеў напісаць выдатныя мастацкія творы за незвычайна кароткі час. У верасні — кастрычніку 1942 года з'явілася паэма «Сцяг брыгады» — кніга пра байца, які зведаў горыч разгрому брыгады, страту баявых сяброў, але выйшаў з варожага акружэння разам з параненым камісарам. Твор, які дакладна выяўляў стан салдата, меў жыццёвую аснову, быў вельмі надзённы, таму і папулярны. За паэму «Сцяг брыгады» пасля вайны, у 1946 годзе, Аркадзь Куляшоў быў прызнаны лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР.

У паэме «Дом № 24» Аркадзь Куляшоў расказаў пра абуджэнне жыцця на папялішчах вайны, пра аднаўленне чалавечых душ, якія параніла ліхалецце.

Творы пра вайну Аркадзя Куляшова па-мастацку глыбока выяўляюць чалавечыя пакуты, боль, гора і знаходзяцца ў цеснай сувязі з ваеннай паэзіяй Пімена Панчанкі, Максіма Танка, Міколы Сурначова, Аляксандра Твардоўскага, Аляксея Суркова, Сяргея Нараўчатава, Канстанціна Сіманава, Міхаіла Ісакоўскага. Драматычныя, трагічныя і разам з тым гераічныя ў сваёй сутнасці, яны найлепшым чынам раскрылі ў Куляшове шматгранны талент чалавека, які здольны суперажываць з народам трагедыю фашысцкай навалы. У 1968 годзе Аркадзь Куляшоў атрымаў званне народнага паэта БССР.

1. Успомніце вершы Аркадзя Куляшова «Мая Бесядзь», «Спакойнага шчасця не зычу нікому…». Якія ідэалы адстойвае ў іх лірычны герой? Выкажыце ўласнае меркаванне, наколькі блізкія гэтыя ідэалы сучаснаму пакаленню, пакаленню вашых бацькоў.
2. Чаму паэт звяртаецца да філасофскага асэнсавання жыцця («Нябёсы — акіян, я знаў даўно…»)? Што яго хвалюе?
3. Акрэсліце тэматычныя абсягі паэзіі Аркадзя Куляшова ваеннай пары́.
4. Дакажыце, што твор Аркадзя Куляшова «Над брацкай магілай» з'яўляецца баладай. Якія фальклорныя матывы ў ім прасочваюцца?
5. Знайдзіце прыклады трагічнага і лірычнага ў баладзе Аркадзя Куляшова «Над брацкай магілай».
6. Падрыхтуйце паведамленне «Сродкі выражэння эмоцый у паэзіі Аркадзя Куляшова ваеннага часу».



Правообладатель Национальный институт образования

# Максім Танк



**Максім Танк** (Яўген Скурко) нарадзіўся 17 верасня 1912 года ў вёсцы Пількаўшчына (цяпер Мядзельскі раён Мінскай вобласці).

У час Першай сусветнай вайны бацьку мабілізавалі ў войска, а маці разам з сынам у 1914 годзе была змушана выехаць у эвакуацыю і пэўны час жыла ў Маскве. Там Яўген Скурко пайшоў у школу, пачаў чытаць першыя кнігі.

Калі ў 1922 годзе сям'я вярнулася на Радзіму, Беларусь была ўжо падзелена на Усходнюю і Заходнюю. З верасня 1923 года Яўген пачаў вучыцца ў польскай пачатковай школе ў вёсцы Шкленікова.

Восень 1926 года прывяла будучага паэта ў Вілейку, куды ён паступіў у трэці клас рускай прыватнай гімназіі, хоць сям'я не мела дастаткова грошай на далейшае навучанне сына. У аўтабіяграфіі паэт зазначаў: «Бацькі мае хацелі, каб я пайшоў вучыцца далей. Але непрыхільна на гэта глядзелі хатнія, баючыся лішніх расходаў у гаспадарцы. Маці плакала начамі, прасіла дзеда, каб пусціў мяне вучыцца ў Вілейку, дзе ў той час была сярэдняя школа. Стары згадзіўся. За лета, пасучы статак, я падрыхтаваўся да экзамену, які здаў і быў прыняты...»



Хата, дзе нарадзіўся Максім Танк, у вёсцы Пількаўшчына

Менавіта ў гімназіі настаўніца рускай мовы і літаратуры Аглаіда Венядзіктаўна Мажухіна прывіла Яўгену любоў да літаратуры, заахвоціла да творчасці. Там жа ён і зрабіў сваю першую літаратурную спробу — пераказаў у вершаванай форме легенду пра Шкленікоўскае возера, якую ведаў ад свайго дзеда Хведара; напісаў некалькі вершаў. Але ўжо ў 1928 годзе Яўгену Скурко давялося ехаць у Радашковічы і працягваць навучанне ў беларускай гімназіі, бо навучальная ўстанова ў Вілейцы была закрыта польскімі ўладамі.



Правообладатель Национальный институт образования

Пазней юнак падаўся здабываць веды ў Вільню. Апошнім месцам яго навучання стала руская гімназія імя А. С. Пушкіна.

Ужо на пачатку самастойнага жыццёвага шляху вясковы хлопец усвядоміў сябе беларусам і не мог прыняць паланізатарскай палітыкі тагачаснай польскай улады. Юнак выбраў цяжкі шлях падпольшчыка, каб разам з іншымі прынесці ў родны край вызваленне.

На танальнасць ранняй паэзіі Максіма Танка наклалі адбітак палітычная сітуацыя ў Заходняй Беларусі і асабісты лёс самога паэта: актыўны ўдзел у рэвалюцыйнай дзейнасці, арышты, турмы. Максім Танк як сапраўдны патрыёт уключыўся ў барацьбу з акупацыйным рэжымам Польшчы. Паэту верылася, што хутка народ скіне ярмо нявольніцтва, аб'яднаецца з усходнімі братамі. Свой настрой ён раскрыў у вершах зборніка «На этапах» (1936), канфіскаванага польскай паліцыяй. Захаваліся толькі нешматлікія экзэмпляры. Назва кнігі, якая пераклікаецца з загалоўкам часопіса «Кра́ты», што пісаўся ад рукі ў турме, патрыятычная: паэт славіў этапы барацьбы за волю, рыхтаваўся да яе і рыхтаваў іншых.

Максім Танк засяродзіўся на пошуках адказаў на самыя балючыя пытанні часу, на асэнсаванні актуальных грамадска-патрыятычных і сацыяльных праблем рэчаіснасці, глыбокім выяўленні душэўна-псіхалагічнага свету сучасніка. Усё гэта знайшло адлюстраванне ў вершах «Спатканне», «Паслухайце, вясна ідзе...», «На пероне», «Песня кулікоў» і інш.

У паэзіі Максіма Танка перыяду яго жыцця ў Заходняй Беларусі прысутнічалі і народныя матывы. На фальклорнай аснове грунтавалася першая паэма «Нарач» (1935). У хуткім часе паэт апрацаваў чутую ў дзяцінстве легенду пра Вяля («Сказ пра Вяля») і напісаў новую эпічную паэму «Журавінавы цвет». Гэтыя два буйныя творы і новыя вершы склалі аднайменны зборнік, які ўбачыў свет у 1937 годзе. У кнізе «Пад мачтай», якая выйшла ў 1938 годзе, Максім Танк паказаў сябе нацыянальным паэтам, сапраўдным майстрам мастацкага слова.

Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР у верасні 1939 года Максім Танк сустрэў вершам «Здарова, таварышы!». Падзея стала лёсавызначальнай для ўсяго беларускага народа: ён аб'яднаўся ў адной дзяржаве, за што вёў ахвярнае змаганне. Пра гэты дзень паэт марыў не раз. Ён бачыў яго з этапных дарог і турэмных камер. Верш напісаны ў форме прывітання і прасякнуты радасным настроем.



Правообладатель Национальный институт образования




Вокладка зборніка Максіма Танка «Вастрыце зброю» (1945)

Вялікая Айчынная вайна застала Максіма Танка ў Беластоку. Пасля эвакуацыі ў Саратаў паэт папрасіўся на перадавую і быў накіраваны ў газету «За Савецкую Беларусь» (Бранскі фронт).

У ваеннай лірыцы, сабранай у зборніках «Вастрыце зброю» і «Праз вогненны небасхіл» (1945), цэнтральны вобраз — Беларусь-партызанка, паланёная, але няскораная. Першыя вершы, якімі пачалася ваенная тэма ў творчасці паэта, мелі характар заклікаў. Такая форма непасрэднага звароту, публіцыстычнага маналогу найбольш адпавядала грозным і трагічным падзеям, на якія трэба было адгукнуцца неадкладна. «Не шкадуйце, хлопцы, пораху…» — наказваў Максім Танк беларускім партызанам. Гэтай формай верша-заклiку паэт будзе карыстацца і пазней. «Вастрыце і куйце зброю, // Браты мае і сябры!» — звернецца ён да воінаў, якія з цяжкімі баямі гналі ворага на захад.

Тэмы і вобразы твораў Максіма Танка вельмі разнастайныя. Большасць з іх вызначаецца публіцыстычнай накіраванасцю, высокім грамадзянскім пафасам. Нянавісць і гнеў да праклятага ворага, боль за пакуты народа, мужная вера ў перамогу — галоўныя матывы вершаў ваеннай пары. З вялікай любоўю намаляваны вобраз Радзімы, лёс якой хвалюе паэта. У вершы «Хмары з захаду» (1941) усё нагадвае паэту пра боль і пакуты Бацькаўшчыны: і заходнія вятры, якія быццам скардзяцца на гора, што напаткала Беларусь, і журавы, якія шукаюць выратавання ад пажараў родных вёсак, пералятаючы на ўсход. Птушкі напамінаюць, як родная зямля чакае сваіх сыноў і спадзяецца на іх. «Настане дзень баёў апошніх» — так з непахіснай верай у перамогу напісаў Максім Танк у вершы «Мы вернемся» (1941).

Матыў салдацкай дарогі, шляху да перамогі характэрны для ваеннай творчасці паэта. Лірычны герой, які «…можа, сотню раз прайшоў // па роднай старане» («Я, можа, сотню раз прайшоў…», 1941), марыць «у свой край вярнуцца песняй баявой. // Вярнуцца песняй у далёкі дом, // Слязой гарачай — да вясняных вод, // Вярнуцца сонцам і яго святлом. // Заззяць у сэрцы матак і сірот» («На брацкай зямлі», 1945).

У вершах ваеннага часу Максім Танк апяваў подзвіг беларускага народа, расказваў пра аднаўленне жыцця на руінах гарадоў і сёл.



Правообладатель Национальный институт образования

У гэты ж час ён услаўляў родную мову, заклікаў зберагчы яе, захаваць і перадаць наступным пакаленням.

Верш **«Родная мова»** (1943) напісаны ў крытычны для Радзімы час, калі «над спаленай хатай, над родным загонам, над будучыняй» стаяў «акрываўлены вораг з пятлёй». Твор з'яўляецца сапраўдным узорам патрыятычнай лірыкі, велічным гімнам роднаму слову.

Кожная з трох нонаў[1], або дзевяціраднковых строф, якімі напісаны верш, вобразна выяўляе пэўную грань патрыятычнага пафасу. Першая страфа — лірычны прачулы зварот да мовы, якая ўвабрала ў сябе цэлы свет: колеры «сузор'яў і сонечных цёплых праменняў», усе гукі — ад «птушынага шчэбету, шуму дубровы» да «грымучага ззяння бурлівых крыніц». На ўзроўні малітоўнасці выяўляецца думка пра багацце роднай мовы і яе вытокі, пра тое, што тварэц мовы — народ, што ў мове — яго гісторыя і традыцыі.

Другая страфа паказвае велічную моц роднага слова, якое, на думку паэта, з'яўляецца адной з тых магутных сіл, што здольны супрацьстаяць варожай навале. У гэтай частцы верш прамаўляецца як клятва вернасці Радзіме: «Няма такіх нетраў, глыбокага мора // І гор, праз якія б ты не правяла // Мяне на Радзіму...», якая была і штовек будзе вольнай.

У трэцяй страфе — жыццесцвярджальнай і аптымістычнай — гучыць ідэя бессмяротнасці беларускай мовы і народа, які павінен захаваць свой духоўны скарб і пранесці яго «святлом незгасальным у сэрцы сваім // Праз цемру і годы змаганняў суровых». Роднае слова валодае надзвычайнай сілай, бо можа шмат разоў прашумець вясновым дажджом, які не толькі ажывіць зямлю, але і ўзбагаціць душу: «Ізноў зазвініш ты у кожнай у хаце, // Цымбалам дасі іх сярэбраны гром // І вусны расквеціш усмешкай дзіцяці». Такім чынам, мова атаясамліваецца са сродкам і вялікай сілай выратавання беларусаў як народа, нацыі.

Паэзія Максіма Танка ўражвае разнастайнасцю тэм, вобразаў, форм, творчым засваеннем нацыянальнай паэтычнай традыцыі і наватарствам. І ўсё ж галоўныя тэмы, якія праходзяць праз усю яго творчасць, — Радзіма: гісторыя і яе адлюстраванне ў легендах і паданнях; праца, жыццё, мары, пачуцці людзей; маляўнічая прырода;

---

[1] *Но́на* (ад лац. *nona* — 'дзявятая') — складаная страфа з дзевяці радкоў; па аналогіі з тэрцэтам — трохрадковай страфой, катрэнам — чатырохрадкоўем, квінтэтам — пяцірадкоўем і г. д.



Правообладатель Национальный институт образования

родная мова. Тэма памяці з'яўляецца надзённай і гучыць не толькі ў вершах ваеннага часу, але і ў далейшай творчасці Максіма Танка.

У пасляваенныя дзесяцігоддзі талент паэта быў прызнаны: яму прысуджаны літаратурныя прэміі за зборнікі паэзіі. У 1968 годзе Максім Танк атрымаў ганаровае званне народнага паэта БССР.

1. Узгадайце вядомыя вам вершы Максіма Танка. Акрэсліце іх тэматыку і праблематыку.
2. Раскажыце (з выкарыстаннем звестак, атрыманых у IX класе) пра адметнасць творчага стылю Максіма Танка.
3. Ці можна гаварыць, што лірыка паэта перыяду Вялікай Айчыннай вайны мае пэўныя асаблівасці? У чым яны заключаюцца?
4. Даследчыкі мяркуюць, што ў вершы «Родная мова» сцвярджаецца нязломная духоўная сіла беларускага народа. Наколькі іх меркаванне слушнае? Аргументуйце сваю думку.
5. Прыгадайце творы беларускіх паэтаў, прысвечаныя роднай мове. Параўнайце іх з аднайменным вершам Максіма Танка.
6. Падрыхтуйце вуснае выказванне «Чым творчасць пісьменнікаў перыяду Вялікай Айчыннай вайны важная для гісторыі беларускай літаратуры?».
7. Разгледзьце фотаздымкі ваенных гадоў. Паразважайце, наколькі супадае іх атмасфера з агульным настроем лірыкі гэтага часу. Падбярыце да фотаздымкаў цытаты-ілюстрацыі з твораў беларускіх паэтаў.











Правообладатель Национальный институт образования

# Кузьма Чорны

(1900—1944)

**1.** Звярніце ўвагу на псеўданім пісьменніка. Прыгадайце, чаму яго выбраў Мікалай Раманоўскі. **2.** З якімі творамі Кузьмы Чорнага вы знаёмы?

Каб паступіць вучыцца, Кузьма Чорны адправіўся з роднай вёскі ў сталіцу. Так напісаў пра гэта падарожжа Іван Навуменка: «У 1923 г. Кузьма Чорны (ён ужо надрукаваў верш у часопісе «Іскры», дватры апавяданні) пехатой пайшоў у Мінск, каб паступіць вучыцца ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. І самае галоўнае: каб спраўдзіць або не спраўдзіць сваю пісьменніцкую долю».



Кузьма Чорны (Мікалай Раманоўскі) нарадзіўся 24 чэрвеня 1900 года ў засценку Боркі на Случчыне. Яго бацькі былі вымушаны пераехаць у вёску Цімкавічы, бо дзеці падраслі, а ў Борках не было школы.

Мікалай Раманоўскі атрымліваў адукацыю ў Цімкавіцкім народным вучылішчы, Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі (навучанне там было бясплатнае, а тым, хто добра вучыўся, плацілі стыпендыю). Два гады вучыўся на педагагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Мінску, але не скончыў яго. Маладому чалавеку даводзілася сумяшчаць вучобу з працай. Праз складанае матэрыяльнае становішча Мікалай Раманоўскі часам нават галадаў.

У Мікалая Раманоўскага было шмат псеўданімаў (Максім Алешнік, М. Біруля, Ігнат Булава з-пад Турава, Вясёлы, М. Сідарэўскі, Сусед-вясёлы і інш.), але ў выніку прыжыўся псеўданім, узяты ў гонар дзеда па матчынай лініі. Міхал Парыбак, таленавіты майстар-сурвэтнік, меў мянушку Чорны.

Пісьменнік-пачатковец Кузьма Чорны ўваходзіў у літаратурнае аб'яднанне «Маладняк», а калі яно перастала адпавядаць эстэтычным патрэбам творцы, стаў адным з заснавальнікаў і кіраўнікоў згуртавання «Узвышша», што сведчыць пра яго творчыя пошукі і няўрымслівасць.



Правообладатель Национальный институт образования



Кузьма Чорны ў рэдкалегіі часопіса «Узвышша» (1942).
На першым плане злева направа — Кузьма Чорны, Уладзімір Дубоўка,
Кандрат Крапіва; на другім — Адам Бабарэка, Язэп Пушча

Многія раннія творы Кузьмы Чорнага былі мадэрнісцкімі, імпрэсіяністымі, заснаванымі на псіхалагізме і, на першы погляд, з невыразным, размытым сюжэтам. У большасці з іх галоўная ўстаноўка — на ўнутраныя змены персанажаў, бо асноўная задача аўтара — паказаць перамены, што адбываюцца ў душы герояў, а не знешнія падзеі. Але такая актуальная для пачатку XX стагоддзя проза не была запатрабавана ва ўмовах панавання сацыялістычнага рэалізму і моцна крытыкавалася.

**Літаратурныя сувязі.** Маючы на ўвазе формы мастацкага выказвання, даследчыкі літаратуры справядліва параўноўваюць раннюю прозу беларускага класіка з творамі Вірджыніі Вулф, Джэймса Джойса, Уільяма Фолкнера.

У 1920-я гады выйшлі зборнікі Кузьмы Чорнага: «Апавяданні», «Срэбра жыцця» (1925), «Па дарозе», «Пачуцці», «Хвоі гавораць» (1926). У саміх назвах выяўлена пэўная лірычнасць.

«Праблема жывога чалавека займае мяне ўвесь час. Гэтае фактычна наватарства ў беларускай літаратуры прымушае шукаць новых формаў, працаваць над імі» *(Кузьма Чорны. «Аўтабіяграфія»)*.

З цягам часу пісьменнік перайшоў да традыцыйных рэалістычных твораў, што паспрыяла больш высокім ацэнкам яго тэкстаў з боку сучаснікаў. Празаік яшчэ да 1930 года марыў стварыць цыкл раманаў, у якім будзе маштабна адлюстравана ўся беларуская гісторыя на розных яе этапах. Але пад уплывам часу атрымалася так, што творы



Правообладатель Национальный институт образования

1930-х гадоў (напрыклад, раманы «Бацькаўшчына», «Трэцяе пакаленне», аповесць «Люба Лук'янская») вызначаюцца знарочыстай займальнасцю ў паказе супярэчлівых момантаў гісторыі, спрашчэннем сюжэтных момантаў на карысць ідэйных установак. Разам з тым і ў гэтых творах выяўляецца традыцыйны для Кузьмы Чорнага псіхалагізм.

**Літаратурныя сувязі.** Творчасць Кузьмы Чорнага часта параўноўваюць з прозай Фёдара Дастаеўскага. У абодвух аўтараў героі пастаянна перажываюць унутраныя зрухі, пераадольваюць спакусы. Паступова ж унутраны бунт і пошук прыводзяць персанажаў да разумення сябе самога і да разумення неабходнасці служэння людзям.

Кузьма Чорны перажыў Першую сусветную вайну, Лютаўскую і Кастрычніцкую рэвалюцыі, часы рэпрэсій. У 1932—1937 гадах Чорны быў галоўным літкансультантам кабінета маладога аўтара пры Саюзе пісьменнікаў БССР і дапамог стаць пісьменнікамі многім класікам (напрыклад, Івану Мележу). Усе адзначалі яго далікатнасць і ўважлівасць на гэтай пасадзе, а Ян Скрыган успамінаў: «Чорны слухаў так, што ты забываўся на сябе, на яго, на ўсё, што вакол цябе робіцца, а жыў толькі адчуваннем патрэбы падзяліцца з ім». У 1938 годзе творцу арыштавалі, абвінаваціўшы ў «польскім шпіянажы». Зняволенне моцна падарвала яго здароўе.

Таму Кузьма Чорны не быў на фронце, калі ішла Вялікая Айчынная вайна. Гэта акалічнасць аддаляла яго ад дэталёвай рэальнасці вайны, вымагала ад пісьменніка большай ступені мастацкай умоўнасці ў творах. Разам з тым гэта дазволіла выйсці за межы нейкіх канкрэтных падзей і сапраўды максімальна абагульнена выявіць народную трагедыю. Можна сказаць, што гэта заканамерна прывяло творцу да філасофска-мастацкага асэнсавання складаных гістарычных падзей, выхаду на новы пісьменніцкі ўзровень. У ваенны час мастак слова стварыў такія раманы, як «Вялікі дзень», «Пошукі будучыні», «Млечны Шлях».

**З успамінаў.** «Кузьма Чорны на партрэце маёй работы 1956 года ў мармуры абапіраецца на магутныя кісці рук, ён пра штосьці глыбока задумаўся. На твары — змешанае пачуццё трывогі і радасці за людзей. Мне цяжка бачыць фотарэпрадукцыі гэтай скульптуры таму, што больш чым каго іншага Кузьму Чорнага я сам уяўляю заўсёды такім, якім прывык бачыць за гады нашага вялікага сяброўства. Толькі тады мне і здаецца, што я хацеў, можа, і ў малой ступені, але выказаў сваю ўдзячнасць, якую адчуваў да яго за ўсё» *(Заір Азгур. «Пра людзей, якім я ўдзячны»)*.



Правообладатель Национальный институт образования



*З. Азгур.*
Пісьменнік
Кузьма Чорны

Да канца сваіх дзён хворы Кузьма Чорны пісаў творы. Апошні запіс у яго «Дзённіку»: «Божа, напішы за мяне мае раманы, хіба так маліцца, ці што?..» Памёр пісьменнік заўчасна ў 1944 годзе.

Кузьма Чорны стаў прызнаным класікам нашай літаратуры. Яго вобраз натхняў мастакоў. Скульптуру пісьменніка стварыў яго сябар — Заір Азгур. Партрэты Кузьмы Чорнага пісалі Іван Ахрэмчык, Янка Раманоўскі. Пакінулі цёплыя ўспаміны пра творцу яго сябры і калегі: Максім Лужанін, Іван Мележ, Піліп Пестрак, Мікола Хведаровіч, Іван Грамовіч. Міхась Тычына прысвяціў жыццю і творчасці пісьменніка аповесць «Вяртанне».

**Уклад у развіццё літаратуры**

1. Кузьма Чорны ствараў стылістычна багатыя мастацкія тэксты. Яго проза, натхнёная праграмай «Узвышша», вылучалася з кантэксту савецкай літаратурнай традыцыі. У зборніку ранніх апавяданняў творцы пад назвай «Пачуцці» выявіўся імпрэсіянізм. Для Кузьмы Чорнага галоўны быў не сюжэт, а перадача настрою, пачуццяў, уражанняў.

2. У часы агульнага панавання сацыялістычнага рэалізму філасофская прырода таленту дазволіла пісьменніку выйсці за межы сацыяльнага запыту і стварыць па-сапраўднаму глыбокія мастацкія тэксты з аналітычным псіхалагізмам.

3. Кузьма Чорны ў сваёй творчасці акрэсліў новыя шляхі развіцця беларускай літаратуры: стаў стваральнікам сацыяльна-псіхалагічнай і інтэлектуальна-філасофскай прозы. У яго атрымалася па-новаму адкрыць свету беларуса і беларускае жыццё.

4. Пісьменнік распрацоўваў буйны жанр, які толькі пачынаў сталець і замацоўвацца ў нашай літаратуры, — псіхалагічна-філасофскі раман.

1. На якія этапы можна ўмоўна падзяліць творчасць Кузьмы Чорнага?
2. У якіх жанрах працаваў пісьменнік?
3. Паразважайце над пытаннем Рыгора Крушыны ва «Успамінах пра Кузьму Чорнага»: «А ці не чорны лёс Кузьмы Чорнага?».
4. Што дае падставу лічыць Кузьму Чорнага класікам беларускай літаратуры?



Правообладатель Национальный институт образования

5. Чаму раннія творы пісьменніка не знайшлі падтрымкі ў большасці тагачасных крытыкаў?
6. Карыстаючыся матэрыяламі інтэрнэт-прасторы, распрацуйце віртуальную экскурсію «Па мясцінах Кузьмы Чорнага».

Апавяданне «Макаркавых Волька»

## Раман «Пошукі будучыні»



Вокладка кнігі Кузьмы Чорнага «Пошукі будучыні» (2001)

**«Пошукі будучыні» — буйны эпічны твор часоў вайны.** Гэта адзін з апошніх класічных раманаў Кузьмы Чорнага і ў той жа час першы раман пісьменніка, напісаны ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у якім яскрава праявіўся талент празаіка. У Кузьмы Чорнага атрымалася адлюстраваць беларускую гісторыю ў яе пераломныя моманты.

Раман «Пошукі будучыні» мае сацыяльна-філасофскі змест. З аднаго боку, у ім Кузьма Чорны падняў важныя **сацыяльныя** пытанні: войны, цыклічнасць гісторыі, неспрыяльныя ўмовы для жыцця беларусаў, пакуты і вымушанае ранняе сталенне дзяцей.

Пісьменніка хвалявала жыццё звычайнага беларуса, на долю якога выпала шмат выпрабаванняў. А з іншага боку, празаік-інтэлектуал здолеў выйсці на ўзровень **філасофскага** абагульнення адносна лёсу нашай краіны і яе жыхароў.

Цэнтральная праблема рамана — пошук героямі свайго шчасця. Нехта змагаецца за сваю будучыню сумленным шляхам (напрыклад, Нявада, Сымон Ракуцька), а іншыя дзеля сваіх мэт пераступаюць праз мараль і чалавечнасць (напрыклад, Паліводскі, Шрэдэры).

**Асаблівасці сюжэтна-кампазіцыйнай будовы «Пошукаў будучыні».** Твор складаецца з дзвюх частак: «Украдзенае маленства» і «Вялікае скрыжаванне». Трэба падкрэсліць маштабнасць ахопу падзей у рамане, аперыраванне цэлымі эпохамі. Аўтар прасачыў лёс Беларусі і беларусаў на працягу надзвычай складаных дзесяцігоддзяў: Першая сусветная вайна, падзел Беларусі на Усходнюю і Заходнюю, Вялікая Айчынная вайна. Праз Сумлічы і падзеі, якія ў іх адбываюцца, пісьменнік абагульнена паказаў усю нашу краіну.



Правообладатель Национальный институт образования

**Навукоўцы гавораць.** Паводле літаратуразнаўца Міхася Тычыны, назва вёскі Сумлічы ў рамане «Пошукі будучыні» паходзіць ад слова «сумленне».

У рамане выяўлена пэўная цыклічнасць як гістарычных, так і асабістых падзей у лёсе пэўных герояў: немцы, у тым ліку і Густаў Шрэдэр, другі раз прыходзяць на нашу зямлю; Нявада глядзіць на ўнучку Лізу і думае, што і яна такая не па гадах сталая, як была яго дачка Волечка; дарослая Волечка зноў пакутуе ў хаце, у якой пакутавала ў маленстве. Гэта важны прыём пабудовы «Пошукаў будучыні». Нягледзячы на сюжэтную дынаміку, з дапамогай паўтораў у рамане выяўлена замкнёнае кола, у якім апынуліся беларусы.

У творы сустракаюцца праспекцыі — «апярэджванні» ланцужковага ходу падзей, падказкі наконт будучага: «Яны абое належалі да таго пакалення, якое не ведала сапраўднага маленства. Але затое перад імі стаяла ўжо іхняя маладосць. А каб хто ім сказаў, што другое пасля іх пакаленне (іх дзеці) ужо і маладосці мець не будуць, што іх маладосць з’есць чужы прышэлец?» І калі ў пачатку твора сам апавядальнік апярэджвае ход падзей і можа выпадкова прагаварыцца, што чакае чытача далей, то пазней такія прадчуванні ўжо ўкладаюцца ў думкі персанажаў. Напрыклад, прадбачанне новай вайны падаецца, калі Нявада сустракае на скрыжаванні невядомага чалавека: «Можа, ужо зноў тут блізка ходзіць той вялікі злодзей, што ўкраў у яго Волеччына маленства?»

Разам з тым такое апярэджванне хутчэй выключэнне, чым правіла. Наадварот, аўтар пераважна імкнуўся заінтрыгаваць чытача. Адзін з распаўсюджаных прыёмаў у тэкстах Кузьмы Чорнага — убачыць «нейкага чалавека» і далей паступова яго разглядаць і раскрываць. Пазней жа «нейкія» людзі абавязкова распазнаюцца як «свае» або «чужыя».

У «Пошуках будучыні» прысутнічаюць часавыя маркёры (паказчыкі, знакі), асабліва калі падзеі раскрываюцца ў гістарычным зрэзе: «Іх думкі не пакідалі іх аж да сямнаццатага верасня трыццаць дзявятага года», «Канчаўся ўжо трэці тыдзень вайны, калі Лізавета падышла да бацькавай хаты». Гэта дае магчымасць зарыентаваць чытача ў часе.

Кузьма Чорны выявіў сябе як майстар ствараць дэтэктыўную інтрыгу. Напрыклад, у «Пошуках будучыні» Нявада заўважае на падораным немцам Волечцы гадзінніку надпіс «Граф Паліводскі». Падобны надпіс «Памажы мне, Божа, знайсці дзверы ў маю будучыню»



Правообладатель Национальный институт образования

ўбачыў Нявада на дзвярах карчмы. Тады ж, дзякуючы карчмару, чытач даведваецца пра гісторыю Паліводскага.

Сюжэт «Пошукаў будучыні» разгалінаваны. Лёсы прадстаўнікоў розных сюжэтных ліній, розных сем'яў і пакаленняў у пэўныя моманты перасякаюцца: напрыклад, Сымон Ракуцька вызваліць з нямецкага канцлагера не толькі сваю жонку, але і дачку Волечкі ды Кастуся Лукашэвіча — Лізу. У мастацкім тэксце ёсць і вобразы-сімвалы, якія пэўным чынам звязваюць персанажаў. Напрыклад, золата, праз адносіны да якога ў многім раскрываецца ўнутраны свет герояў.

Асаблівасць кампазіцыі выяўляецца і ў тым, што часта ў творы вялікая колькасць інфармацыі абрушваецца на чытача праз персанажа, які распавядае ўстаўную міні-гісторыю. Напрыклад, пра Густава-старэйшага спачатку мы даведваемся са слоў фельчара: «Ага, — зразумеў нарэшце фельчар, — ты рад, ты шчаслівы, што ачуняў і ўжо здаровы?» Ён спадзяецца, што немец хоча чым-небудзь аддзякаваць добрым людзям і малой Волечцы.

А калі фельчар другі раз распавядае пра Шрэдэра хворай дзяўчынцы і Кастусю, яго рэпліка займае каля трох старонак. Таксама са слоў Волечкі даведваемся пра ўсё, што адбывалася ў апошні час у Сумлічах, і гэта вельмі аб'ёмны аповед.

Такая ж разгорнутая рэпліка Гертруды, калі яна расказвае, як Густаў добраахвотна пайшоў першы раз на вайну, пра дарма аддадзенае золата, праклёны Шрэдэра-старэйшага, змаганне яго сына Фрыдрыха за ўвесь свет для Германіі.

Збыткоўнасць інфармацыі ў рэпліках персанажаў суседнічае ў рамане з эпізодамі навелістычнага характару, напрыклад, з гісторыяй кахання Кастуся Лукашэвіча і Волечкі Нявадавай.

У рамане выкарыстоўваюцца мастацкія прыёмы і спосабы стварэння тэксту, напрацаваныя Чорным у папярэдніх літаратурных творах.

! **Навукоўцы гавораць.** Алесь Адамовіч заўважыў, што ў кожным сваім наступным мастацкім тэксце Кузьма Чорны развіваў тэмы і прыёмы, выкарыстаныя ў папярэдніх: «Кожны твор яго — прыступка да наступнага. Нават больш: здаецца, што ўсё жыццё чалавек ішоў да галоўнага свайго твора і ўсё, што напісана ім, — толькі "матэрыял" да яго».

**Драматычны лёс ахвяр Першай і Другой сусветных войнаў.** Падчас Першай сусветнай вайны наша краіна стала памежнай зонай, на якой дзве імперыі змагаліся за свае інтарэсы. У гэты час больш за два (некаторыя даследчыкі лічаць, што амаль тры) мільёны чалавек



Правообладатель Национальный институт образования

уцяклі на Усход як бежанцы. Само існаванне беларусаў як асобнай нацыі ставілася пад сумненне краінамі-захопнікамі і тутэйшымі здраднікамі. У творы мы бачым гэта на прыкладзе вобразаў графа Паліводскага, Люцыяна Акаловіча, Шрэдэраў.

Калі Кузьма Чорны пісаў «Пошукі будучыні», ішла Вялікая Айчынная вайна і трэба было падтрымліваць баявы дух людзей. Галоўнай у культурнай сітуацыі 1940-х гадоў зрабілася еднасць. Пісьменнік падкрэсліваў людскую аб'яднанасць часам, прасторай, супольна перажытымі падзеямі. Кузьма Чорны, як і іншыя творцы гэтага перыяду, услаўляў і гераізм, але гэта не перашкодзіла яму выявіць нацыянальнае і агульнафіласофскае ў рамане.



Дрэвы. Малюнак Кузьмы Чорнага

**Аўтарская канцэпцыя будучыні беларускага народа.** Нягледзячы на апраўданыя ваенным часам ідэалагічныя мэты, у творы на першым месцы — выяўленне беларускай нацыі як асобнай, каларытнай і моцнай, са сваёй уласнай гісторыяй.

У пэўных фрагментах твора прасочваецца прыпавесційная інтанацыя. Адным з найбольш яскравых вобразаў-сімвалаў у рамане стала таполя, якая расце на Вялікім скрыжаванні і каля якой адбываюцца важныя падзеі: «...узвышаецца вялікае дрэва, усёй вышынёй зялёнае і ўпартае ў беспярапынным змаганні з навакольным светам за сваё патомства». Гэта старое дрэва давала шмат насення, з якога выраслі маладыя дрэўцы. Яны знішчаліся касой, плугамі, іх таптлі і ламалі. Перасаджаныя Нявадам дубчыкі ў хуткім часе былі стаптаныя нейчымі ботамі. Але таполя насуперак усяму давала новае насенне. Так і беларусы выжывалі, нягледзячы на прыгнёт, пакуты, здзек. Паводле твора, краіна ўяўляе сабой скрыжаванне дарог, што вядуць на Усход і на Захад.

**Няздзейсненыя мары старэйшага пакалення (Нявады, Сымона Ракуцькі). Тэма «скрадзенага дзяцінства» ў рамане.** У творы закранаецца праблема будучыні, што выяўлена ў назве. Людзі шукаюць шчасце для сябе і сваіх дзяцей. Аднак як ні жадалі ў рамане бацькі шчаслівага лёсу для нашчадкаў, а ўсё роўна іх дзецям даводзілася трываць здзек і пакуты. Нявада, Сымон Ракуцька марылі пра тое, што ў іх дзяцей будзе добры лёс, але ўсё склалася па-іншаму.



Правообладатель Национальный институт образования

У першай частцы рамана «Украдзенае маленства» вялікая ўвага аддадзена лёсу малых, у якіх вялікі злодзей (сімвал зла) адабраў дзяцінства. Нявада з цяжкасцю пазнаў сваю дачку Волечку, вярнуўшыся з вайны. Пазней ён да апошняга будзе імкнуцца ўратаваць ад новай навалы ўнучку Лізу.

Падлеткі Волечка і Кастусь увасабляюць найлепшыя чалавечыя якасці. І менавіта гэтыя героі «Пошукаў будучыні» — прадстаўнікі таго ж пакалення, да якога належаў сам Кузьма Чорны, на долю якога выпалі дзве вайны і распалавіньванне краіны. Ідэя рускага класіка Фёдара Дастаеўскага, што ніякая найвышэйшая гармонія не варта слязы на шчацэ дзіцяці, блізкая і нашаму таленавітаму празаіку. Чорны стварыў у рамане вобразы сталых дзяцей: з аднаго боку, гэта яшчэ не дарослыя людзі, а з другога — не па гадах сур'ёзныя, вымушаныя праз знешнія абставіны стаць дарослымі. У аповедзе яскрава выяўляюцца адносіны да маленькіх герояў — напрыклад, шкадаванне да Волечкі: «Волечка, малая гаспадыня гэтай хаты». Гора праследуе беларусаў пакаленне за пакаленнем. Цяжкія выпрабаванні давядзецца перажыць і Лізе — дачцэ Кастуся і Волечкі.

Сымон Ракуцька — персанаж, у якога забралі шчасце, магчымасць гадаваць дзяцей разам з жонкай. «Нехта злы і бязлітасны» скраў у Ракуцькі дзяцінства Тамаша ды Лізы, маладосць жонкі, бо «праз сям'ю» прайшла мяжа паміж Заходняй і Савецкай Беларуссю. Боль героя настолькі моцны, што ён спачатку нават не можа прызнацца дачцэ, якая ўжо вырасла «пад Польшчай», што з'яўляецца яе бацькам.

**Выкрыццё ідэалогіі фашызму ў рамане «Пошукі будучыні».** Пісьменнік стварыў вобраз-сімвал вялікага злодзея — гэта абагульненае ўвасабленне войнаў, фашызму, сусветнага зла, якое забірае ў людзей шчасце. Аўтару на той час служкамі вялікага злодзея бачыліся Шрэдэры-старэйшыя і Шрэдэр-малодшы. Паэтыка рамана часам набывае рысы міфапаэтыкі. Так, немцы паказаны ў творы спрошчана, вельмі адназначна: як тыя, хто па сваёй волі прыходзіць ваяваць з мэтай разбагацець.

У дачыненні ж да станоўчых герояў аўтар выкарыстаў гіпербалізацыю. Так, Ліза Ракуцька непраўдападобна перакусіла шыю немцу ў танку, а таксама кінула гранату ў другога ворага.

У рамане побач з асноўнай лініяй аповеду часта змешчаны эмацыянальна-публіцыстычныя ўстаўкі: «Горкая практыка паказала, што ваяўнічае геройства народа нараджаецца і выпрацоўваецца не ад замілаванасці да рэк крыві на полі вайны, а ад неабходнасці сцерці



Правообладатель Национальный институт образования

з твару зямлі такую погань, якая ў нашы дні ў вобразе Гітлера заявіла, што нармальны стан мужчыны — вечна быць у вайне».

У «Пошуках будучыні» асуджаюцца авантурысцкія планы графа Паліводскага і Густава Шрэдэра — новых прэтэндэнтаў на панаванне ва ўмовах акупацыі. З дапамогай прыёму рэтраспекцыі (вяртання назад у часе аповеду) падкрэсліваецца, што Паліводскі і раней прыносіў няшчасце людзям. Варта ўзгадаць яго няўдзячнасць у дачыненні да Сымона Ракуцькі, які ўратаваў графа ад смерці. У часы Вялікай Айчыннай вайны Паліводскі падтрымлівае немцаў і становіцца кіраўніком воласці.

У рамане з самага пачатку не ствараецца ілюзія, што Густаў Шрэдэр — станоўчы герой. Аднак калі Густаў трапіў у дом Волечкі падчас Першай сусветнай вайны, на нейкі момант складваецца ўражанне, што персанаж змяняецца, у яго прачынаецца сумленне. Шрэдэр-старэйшы аддаў скрадзеныя рэчы малой выратавальніцы з думкай, што «ўсё золата, якое толькі ёсць на свеце, — нікчэмная драбяза і непатрэбшчына перад самім жыццём». Пасля сцэны душэўнага парывання Густава фельчар адразу ж канстатуе, што аддадзены Волечцы скарб — гэта рэчы, знятыя немцам з мёртвых або параненых афіцэраў. Такім чынам, мы даведваемся, што Шрэдэр-старэйшы фактычна быў марадзёрам.

Фельчар дае яскравую характарыстыку ворагу і пасля прачытання яго ліста да родных, калі прыехаў лячыць хворую Волечку: «Вы чуеце, як яго ўжо точыць чарвяк, што ён так ірвануўся душой? От бо нямецкая душа!» І сапраўды, «прасвятленне», якое адбываецца з крывадушным персанажам, аказваецца несапраўдным: ён усе гады да вяртання ў нашу краіну будзе шкадаваць, што аддзячыў дзецям золатам за выратаванне жыцця. У творы акцэнтуецца ўвага на тым, што, калі з'явілася вучэнне фюрэра аб заваёве Германіяй свету, Густаў Шрэдэр адразу знайшоў у ідэалогіі фашызму адлюстраванне ўласных думак.

У «Пошуках будучыні» з самага пачатку чытаем словы Кастуся, яшчэ хлопчыка, выгнанніка з-пад Вільні: «Табе добра, у цябе немец, чорт яго бяры, яны з гармат смалілі па нашай вёсцы і нас у свет выгналі, а ў мяне хворы бацька ўчора памёр на дарозе, хворы і з дому выехаў, і маці памерла на тым тыдні, пры дарозе пахавана, і сястра памерла». Але тады ён яшчэ знаходзіць у сабе сілы на міласэрнасць.



Правообладатель Национальный институт образования

Ключавы момант у творы — змена погляду Кастуся Лукашэвіча, што ўжо ні пры якіх умовах больш не шкадуе ворага. Пісьменнік адлюстраваў у рамане важную думку: нельга даравацъ ворагам, яны не змяняюцца. Калі адзін раз чалавек пераступае мяжу чалавечнасці — яму даецца шанс на выпраўленне, калі двойчы — гэта ўжо сістэма.

Адмоўным персанажам у «Пошуках будучыні» выступае Люцыян Акаловіч, з вуснаў якога ў творы гучыць асобная гісторыя. Гісторыя яго жыцця і жыцця яго сям'і; яго бацькі, якія марыў пра Польшчу ад мора да мора, смяяўся са слова «Беларусь» і ненавідзеў усё, што не з'яўлялася польскім. Распавядае персанаж і пра Паліводскага, што вербаваў людзей (у тым ліку і Люцыяна) служыць Германіі і, такім чынам, Польшчы. Акаловіч у пэўны момант радуецца таму, што немцы ідуць наперад. Але аказваецца, што маці Акаловіча спалілі, бацьку павесілі, а сам персанаж, як вораг, сутыкнуўся з Нявадам і быў пабіты на скрыжаванні дарог: «За плячыма ў мяне ганьба, а перад вачыма пустэча». У словы персанажа ўкладзены думкі, якія аўтар аспрэчвае праз асуджэнне Акаловіча іншымі, станоўчымі, героямі.

Раман прасякнуты **антываенным пафасам**. У «Пошуках будучыні» выразна адлюстравана думка, што вайна — гэта зло. Ад яе пакутуюць і дарослыя, і дзеці. Пісьменнік выявіў супярэчнасці ваеннага часу, калі паказаў розныя падыходы да барацьбы за будучыню Нявады і Кастуся Лукашэвіча. Кастусь вырашае змагацца з дапамогай сілы, а Нявада гатовы ісці на пэўныя кампрамісы, каб ратаваць унучку, бо да апошняга верыць у чалавека: «Вырві ты з чалавека сэрца і ўстаў на яго месца звярынае, дык у чалавечых грудзях і звярынае сэрца стане чалавечым». Гэта пазіцыя вельмі блізкая самому аўтару, творы якога маюць выразнае гуманістычнае гучанне.

**Стылёвыя адметнасці творчасці і псіхалагізм у прозе Кузьмы Чорнага.** Пісьменнік выступае ў «Пошуках будучыні» майстрам мастацкай дэталі. Напрыклад, у той момант, калі нарадзілася і закрычала ўнучка Ліза, на руку Нявады ўпала першая сняжынка як сімвал шчаслівай навіны. У творы паказана, што нават нязначная дэталь можа стаць зачэпкай, каб абудзіць у чалавека вір пачуццяў.

Важным элементам для раскрыцця псіхалогіі персанажаў з'яўляецца моўная характарыстыка. Варта адзначыць унутраныя маналогі герояў, часта экзальтаваныя, якія дапамагаюць раскрыць іх псіхалагічны стан. Напрыклад, Юрась Нявада часта разважае пра адабраную магчымасць гадаваць дачку.



Правообладатель Национальный институт образования



Жаночы канцлагер Равенсбрук (1939—1945)

Кузьма Чорны вялікую ўвагу надаваў і партрэтнай характарыстыцы герояў. Праз апісанне знешнасці ў пісьменніка атрымліваецца падкрэсліць індывідуальнасць. З дапамогай тонка расстаўленых акцэнтаў чытачу даецца падказка, што адбываецца ў душы героя. Вось якім чынам аўтар апісвае жонку Сымона Ракуцькі, калі яна знаходзіцца ў канцлагеры: «Рысы твару строгія і, можа, нават халодныя. Позірк спакойны, мала рухавы, ён як бы быў выяўленнем чалавечай упэўненасці, што нічога новага на гэтым старым свеце не ўбачыш». Часта з дапамогай партрэта адлюстроўваюцца душэўныя зрухі герояў. Такім чынам, у рамане Кузьмы Чорнага не проста створаны зрокавыя вобразы — кожны знешні штрых з'яўляецца элементам псіхалагічнай характарыстыкі.

Істотную ролю ў мастацкім тэксце адыгрываюць пейзажныя і бытавыя замалёўкі. Кузьма Чорны пісаў: «Бярозавы гасцінец, што ішоў цераз Сумлічы з усходу на захад, ляжаў пад снегам, але на два крокі ў бок ад яго былі голыя палявыя прасторы з іржэўем і раллёй і жоўтыя з зеленаватым адценнем паплавы». У гэтым прыкладзе прырода ўплывае на стан, настрой чалавека, выклікае настальгію.

Сялянскае жыццё хоць і паказана цяжкім, але паэтызуецца ў рамане. Для Нявады каштоўнасці вясковага жыцця маюць перавагу над уладай і грашыма. Ён разважае: «Пазбірайце вы, кажу, золата з усяго свету, зрабіце з яго трон, пасадзіце на яго мяне кіраваць паўсветам... дык я перад вамі буду прасіцца і маліцца: пусціце, калі ласка...: я колькі год жыта не сеяў».

1. Чым творчасць Кузьмы Чорнага вылучаецца з агульнай літаратурнай плыні?
2. Лёсы якіх пакаленняў выяўлены ў творы? Што адрознівае і што аб'ядноўвае прадстаўнікоў гэтых пакаленняў?
3. Як вы разумееце сэнс назвы рамана?
4. Вызначце ідэю «Пошукаў будучыні». Прасачыце, якім чынам яна развіваецца ў мастацкім тэксце.
5. Даведайцеся ў сваіх бацькоў, бабуль, дзядуль, якую будучыню яны жадалі сваім дзецям. Ці спраўдзіліся іх надзеі? Напішыце невялікае эсэ на тэму «Глядзець у будучыню».



Правообладатель Национальный институт образования

6. Узгадайце верш Максіма Танка «Шчасце». Каму з персанажаў рамана Кузьмы Чорнага найбольш адпавядае канцэпцыя шчасця, выказаная ў вершы?
7. Якія гістарычныя падзеі адабралі дзяцінства ў Волечкі і Кастуся, Тамаша і Лізы?
8. Што зблізіла Волечку і Кастуся? Як і з дапамогай якіх прыёмаў, мастацкіх сродкаў Кузьма Чорны апісвае іх пачуцці і адносіны?
9. Уявіце, што Сымон Ракуцька і яго сваякі вялі б сямейны летапіс. Якія падзеі там былі б адлюстраваны? Які перыяд гісторыі ён ахапіў бы?
10. Падумайце, як мог бы скласціся далей лёс Лізы Лукашэвіч.
11. Што, на вашу думку, сімвалізуе таполя на Вялікім скрыжаванні? Успомніце іншыя сімвалічныя вобразы дрэў у беларускай лірыцы і прозе.
12. Дайце характарыстыку вобразу Нявады (знешні воблік, характар, учынкі, мова героя, адносіны аўтара і іншых дзейных асоб).
13. Намалюйце кластар «Героі рамана “Пошукі будучыні”», пракаментуйце адлюстраваныя сувязі паміж персанажамі. Каго вы лічыце галоўным героем, каго — другаснымі? Чаму?
14. Якой Кузьма Чорны паказвае Другую сусветную вайну ў рамане «Пошукі будучыні»? Праілюструйце адказ цытатамі з твора.
15. Параўнайце вобразы Нявады і Густава Шрэдэра. Каштоўнасці якога героя падзяляе аўтар? З якой мэтай ён уводзіць героя-антыпода?
16. Якую ролю ў творы мае партрэтная характарыстыка персанажаў?
17. Знайдзіце апісанне жонкі Сымона ў той час, калі яна знаходзілася ў канцлагеры, разгледзьце фотаздымак «Жаночы канцлагер Равенсбрук». Наколькі псіхалагічна дакладна аўтар апісаў палонную, яе стан? Якія мастацкія сродкі дапамаглі пісьменніку ў гэтым?
18. Якія вобразы-сімвалы вы можаце назваць у рамане? Што яны сімвалізуюць?
19. Адшукайце ў тэксце мастацкія дэталі. На што яны ўказваюць?
20. Чаму Кузьму Чорнага называюць пісьменнікам-псіхолагам?
21. Разгледзьце дызайн вокладкі рамана Кузьмы Чорнага «Пошукі будучыні». Якія колеры пераважаюць у ёй? Якія выявы, эмоцыі? Наколькі ваша ўражанне ад рамана супадае з ілюстрацыяй мастака? Апішыце ілюстрацыю, якая супадала б з вашымі адчуваннямі.
22. Уявіце сябе блогерам. Прапануйце пост пра раман «Пошукі будучыні», каб зацікавіць падпісчыкаў.
23. Стварыце буктрэйлер да кнігі «Пошукі будучыні».



Правообладатель Национальный институт образования

## Раман як эпічны жанр

***Раман*** — эпічны празаічны (часам — вершаваны) твор, у якім шырока ахоплены істотныя жыццёвыя з'явы пэўнага сацыяльнага асяроддзя, нацыі і эпохі, паказаны шматлікія характары ў іх развіцці, псіхалагічнай напоўненасці, створаны разнастайныя бытавыя малюнкі.

Раману ўласцівы: 1) шматлікасць галоўных і пабочных сюжэтных ліній, якія існуюць паралельна і перакрыжоўваюцца; 2) неабмежаванасць у часе і прасторы; 3) вялікая колькасць дзейных асоб (станоўчых і адмоўных); 4) наяўнасць пазасюжэтных элементаў (аўтарскія адступленні, устаўныя эпізоды, пейзажы, інтэр'еры, абрамленні).

Тэрмін для абазначэння жанру бярэ свой пачатак з XII стагоддзя, калі так называлі творы, якія былі напісаны на раманскай (старафранцузскай) мове і супрацьпастаўляліся лацінскай мадэлі. У Сярэдневякоўі мелі папулярнасць рыцарскія раманы.

У сучасным разуменні гэты жанр сфарміраваўся толькі ў XVI—XVIII стагоддзях. У наш час вылучаюць наступныя жанравыя разнавіднасці рамана: гістарычны, псіхалагічны, філасофскі, сацыяльны, бытапісальны, прыгодніцкі, раман-утопію, дэтэктыўны і г. д. Беларускімі пісьменнікамі-класікамі былі створаны сацыяльна-бытавыя, сацыяльна-палітычныя, сатырычныя, філасофскія, гістарычныя раманы, раман у вершах і інш.

! Спроба стварыць раман была яшчэ ў Ядвігіна Ш., які пісаў «Золата», але не завяршыў мастацкі тэкст. Першым завершаным раманам у беларускай літаратуры даследчыкі лічаць «Сокі цаліны» Цішкі Гартнага, напісаны ў пачатку XX стагоддзя.

1. Якім характарыстыкам павінен адпавядаць твор, каб называцца раманам? Прывядзіце адпаведныя прыклады вывучаных твораў.
2. Прывядзіце аргументы на карысць таго, што твор «Пошукі будучыні» напісаны ў жанры рамана.
3. Назавіце некалькі сучасных раманаў. Чым яны адрозніваюцца ад класічных узораў жанру?



Правообладатель Национальный институт образования

## Пытанні і заданні для паўтарэння і падагульнення

1. Якія біяграфічныя факты пра пісьменнікаў-франтавікоў вас найбольш уразілі?
2. Як вайна паўплывала на літаратурны працэс? Ці чыталі вы творы замежных аўтараў пра перыяд Другой сусветнай вайны? Паразважайце, што можа аб’ядноўваць літаратуры розных краін таго часу.
3. Ахарактарызуйце тэматыку творчасці пісьменнікаў у ваенны перыяд.
4. Выберыце верш ваеннай пары, які вас асабіста крануў. Падрыхтуйце ролік з дэкламацыяй верша для сайта ўстановы адукацыі.
5. Якая роля сатырычных часопісаў, плакатаў і газет у развіцці літаратуры ваенных гадоў?
6. Выканайце заданне «5 пытанняў» па творчасці Петруся Броўкі, Аркадзя Куляшова, Максіма Танка.
7. Акрэсліце значэнне творчасці Кузьмы Чорнага для беларускай літаратуры.
8. Пералічыце праблемы, якія пастаўлены аўтарам у рамане «Пошукі будучыні».
9. Складзіце сінквейн «Раман “Пошукі будучыні”».
10. Паразважайце, чым адрозніваецца паказ вайны ў паэзіі і прозе.

Андрэ Маруа

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПАСЛЯВАЕННЫХ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯЎ (1945—1965)

**1.** Узгадайце найбольш важныя гістарычныя падзеі, якія адбыліся ў Беларусі ў 1945—1965 гадах. **2.** Якія пісьменнікі працавалі ў літаратуры падчас вайны? Хто з іх ужо быў вядомы? Хто толькі заявіў пра сябе?

Першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі ўяўляюць сабой важны, але неаднародны ў ідэйна-эстэтычных адносінах перыяд літаратурнага развіцця. Разгледзім асноўныя тэндэнцыі, якія фарміравалі аблічча нацыянальнага прыгожага пісьменства ў 1945—1965 гадах.

**Першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.** Перамога СССР у Вялікай Айчыннай вайне абумовіла патрыятычны і жыццесцвярджальны пафас літаратуры гэтага перыяду. Цэнтральнымі ў слоўным мастацтве з’яўляліся тэмы нядаўняй вайны і аднаўлення мірнага жыцця, адбудоўвання гарадоў і вёсак. Аслабленая за гады рэпрэсій і ваеннага ліхалецця пісьменніцкая супольнасць (Кастусь Кірэенка, Анатоль



Правообладатель Национальный институт образования



Справа налева: Міхась Лынькоў, Якуб Колас, Кандрат Крапіва, Павел Кавалёў, Васіль Барысенка, Пятро Глебка, Максім Лужанін, Пятрусь Броўка і Максім Танк у дзень 65-годдзя Якуба Коласа ў яго дома (1947)

Вялюгін, Аляксей Пысін, Мікола Аўрамчык, Аляксей Кулакоўскі, Іван Мележ, Іван Шамякін, Кастусь Губарэвіч, Андрэй Макаёнак, Максім Танк, Янка Брыль) захавала некаторых прадстаўнікоў старэйшага пакалення і прырасла яркімі індывідуальнасцямі з ліку былых франтавікоў і прадстаўнікоў заходнебеларускай літаратуры.

**Паэзія.** У многіх вершах паэтаў-франтавікоў адлюстраваны складаныя пачуцці салдата, які сустрэў доўгачаканую Перамогу, вярнуўся ў родныя мясціны, але замест квітнеючых садоў убачыў папялішчы (вершы 1945 года: «Франтавік» Пімена Панчанкі, «Зварот» Пятра Глебкі, «Скончыўшы паход» Максіма Лужаніна, «Сумна пахне палын…» Анатоля Вялюгіна). У лірыцы першых пасляваенных гадоў яшчэ чулася водгулле нядаўняй трагедыі, паўставалі малюнкі руін і спусташэння, а таму ў ёй гучалі тужлівыя ноты. Але, нягледзячы на гэта, у большасці твораў увасаблялася надзея на лепшае, адчуваўся энтузіязм і рашучасць былых воінаў аднавіць знішчанае ворагам. Гэта ідэя была прадыктавана сапраўдным народным рухам па аднаўленні Радзімы і працоўным гераізмам.

Вядучая для ўсёй пасляваеннай літаратуры тэма адбудовы разбуранай гаспадаркі і стваральнай працы знайшла адлюстраванне ў лірыцы Аркадзя Куляшова, Петруся Броўкі, Аляксея Пысіна, Анатоля Вялюгіна, Сяргея Дзяргая і інш.

Захапленне навакольнымі краявідамі і паяднанне лірычнага героя са светам прыроды выявіліся ў лірыцы былога франтавіка Кас-



Правообладатель Национальный институт образования

туся Кірэенкі. Пейзажныя вершы «Асенняе рэха», «Раніца на Свіцязі», «Летняя ноч» не толькі раскрылі самабытны талент аўтара, але сталі адметнай з'явай тагачаснай паэзіі. Прыродаапісальная лірыка побач з інтымнай і філасофскай шырока прадстаўлена і ў шматлікіх вершах з першых пасляваенных зборнікаў Максіма Танка («Каб ведалі»; «На камні, жалезе і золаце»; «У дарозе»).



*У. Лупейка.* Аднаўленне рэек каля будынка чыгуначнага вакзала ў Мінску (1945)

**Здабыткі ў жанры паэмы.** У блізкім тэматычным ключы развівалася і беларуская паэма: творы Петруся Броўкі «Ясны кут», «Хлеб», Пімена Панчанкі «Маладосць у паходзе», Аркадзя Куляшова «Новае рэчышча», «Толькі ўперад» і іншыя сведчылі пра мастацкія пошукі аўтараў у гэтым жанры.

Адметную старонку тагачаснай літаратуры ўяўляла сабой паэзія Максіма Танка, у якой спалучаліся схільнасць да мастацкага эксперымента і творчае засваенне фальклорных традыцый. Адзін з найбольш значных здабыткаў нацыянальнага ліра-эпасу ў гэты перыяд — паэма **Максіма Танка «Люцыян Таполя»** (1946), прысвечаная тэме мастака і мастацтва.

Праблема творчай і грамадзянскай свабоды заўсёды прыцягвала ўвагу паэта — былога лідара вызваленчага руху Заходняй Беларусі. Не страціла яна сваёй вастрыні для ўжо савецкага паэта і пасля ўз'яднання дзвюх частак Беларусі. Агульныя падыходы да пытанняў культуры ў другой палове 1940-х — сярэдзіне 1950-х гадоў, рэгламентацыя ўсіх сфер грамадскага жыцця, якая працягвалася з даваеннага часу, не спрыялі мастацкім пошукам і эксперыментам, з'яўленню новых разнастайных творчых метадаў, школ і рухаў. Літаратура краіны развівалася ў рэчышчы адзінага метаду — сацыялістычнага рэалізму, непарыўна звязанага з ідэалогіяй і прапагандай, прызначанага для ідэалізацыі і ўслаўлення існуючага ладу. На такім сацыяльна-гістарычным фоне паэма Максіма Танка, прысвечаная падзеям мінулага, вылучалася высокай паэтычнай культурай.

Галоўны герой твора Люцыян Таполя, выдатны разьбяр па дрэве, увасабляе таленавітасць і няскоранасць народа. Выключнасць майстра



Правообладатель Национальный институт образования

выяўляецца ў супрацьстаянні з біскупам Сямашкам, надзеленым неабмежаванай уладай. Ён жорстка пакараў вольналюбівага мастака: забараніў на доўгае дзесяцігоддзе брацца за працу. Справай гонару для разьбяра стала помста. Паэма нагадвае эпічныя фальклорныя творы гістарычнай тэматыкі, у прыватнасці, паданні і легенды. Стылізацыя пад фальклор дазволіла Максіму Танку ў алегарычнай форме выкрыць балючыя праблемы творцаў-сучаснікаў, выступіць супраць нівеліроўкі індывідуальнага і нацыянальнага ў мастацтве. У паэме «Люцыян Таполя» сцвярджаецца права мастака на свабоду самавыяўлення. Ідэйна-тэматычна блізкія да гэтага ліра-эпічнага твора паэма Янкі Купалы «Курган», апавяданне Змітрака Бядулі «Бондар».

**Проза.** Для літаратуры гэтага перыяду характэрны павышаная цікавасць да тэмы вайны і партызанскага змагання, паказ кіруючай ролі камуністычнай партыі, яе вызначальнага ўкладу ў перамогу над ворагам. Усе падзеі ўзнаўляліся з панарамным, эпапейным размахам, як, напрыклад, у раманах Івана Шамякіна «Глыбокая плынь», Міхася Лынькова «Векапомныя дні», Івана Мележа «Мінскі напрамак», Аляксея Кулакоўскага «Расстаёмся ненадоўга». У творах дзейнічала вялікая колькасць персанажаў, якія рэзка размяжоўваліся на станоўчых (савецкіх людзей) і адмоўных (фашыстаў і іх паслугачоў). Вобразы галоўных герояў белетрызаваліся і рамантызаваліся. Трэба адзначыць, што такое захапленне героямі вайны і працы было прадыктавана не толькі ідэалагічнымі ўстаноўкамі, але і рэальнасцю: краіна была спустошана — і толькі людзі вялікай духоўнай сілы, трываласці маглі ўзняць яе з руін.



Руіны на вул. Савецкай у Мінску (цяпер праспект Незалежнасці) (1944)

> Замежныя даследчыкі, што пісалі пра Другую сусветную вайну, у адрозненне ад беларускіх літаратараў, не мелі доступу да савецкіх архіваў. Таму англійскі гісторык Эрыксан у навуковым даследаванні спасылаўся на мастацкі тэкст Івана Мележа «Мінскі напрамак», дзе вельмі дакладна прапісаны ўсе фактаграфічныя дэталі (напрыклад, знаходжанне савецкіх войск у пэўны дзень у пэўнай мясцовасці).



Правообладатель Национальный институт образования

На фоне твораў, прысвечаных нядаўняй вайне, усенароднаму змаганню на фронце і ў тыле, вылучаліся адзінкавыя мастацкія тэксты на вясковую тэму Аляксея Кулакоўскага, Івана Шамякіна, аўтабіяграфічныя аповесці Янкі Брыля, што раскрывалі рэаліі Заходняй Беларусі («Сірочы хлеб», «У сям'і»). Заходнебеларуская тэматыка развівалася і ў рамане Піліпа Пестрака «Сустрэнемся на барыкадах», дзе паказваліся складанасці жыцця і змагання пад польскай уладай. Напісаннем аповесці «На ростанях» была завершана шматгадовая праца Якуба Коласа над аднайменнай трылогіяй, у якой асэнсоўваліся перыпетыі станаўлення нацыянальнай інтэлігенцыі, адлюстроўваліся пошукі адукаванымі маладымі людзьмі і самім пісьменнікам адметнага беларускага шляху.

**Драматургія.** Як і ў эпічнай паэзіі, у беларускай драматургіі пасляваеннага дзесяцігоддзя ярка выявілася патрэбнасць у асэнсаванні трагічных і гераічных падзей мінулай вайны. Па меркаванні даследчыка Міколы Мішчанчука, для падобнай тэматыкі найбольш прыдатны драматычны жанр — гераічная драма. Пры гэтым у пасляваенны час пачала плённа развівацца камедыяграфія. Лепшымі драматычнымі творамі дзесяцігоддзя справядліва лічацца п'есы на ваенную тэму: «Мілы чалавек», «З народам» Кандрата Крапівы, «Канстанцін Заслонаў» Аркадзя Маўзона, «Брэсцкая крэпасць» Кастуся Губарэвіча.



Сцэна са спектакля «Канстанцін Заслонаў» Аркадзя Маўзона

Першая п'еса беларускага драматурга Аркадзя Маўзона «Канстанцін Заслонаў» пра легендарнага беларускага партызана мела незвычайны поспех. У 1947 годзе яна была пастаўлена ў Беларускім тэатры імя Янкі Купалы (сёння — Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы), у ролі Крушыны — Уладзімір Дзядзюшка, у ролі Кроплі — Глеб Глебаў. Гэты спектакль атрымаў Дзяржаўную прэмію СССР. У 1949 годзе па п'есе быў зняты аднайменны фільм, які тады паглядзелі больш за 17 мільёнаў гледачоў.

Побач з творамі гераічнага зместу папулярнасцю ў драматургаў карыстаўся жанр лірычнай камедыі, дзе ўвага аўтараў звярталася на праблемы сучаснасці, аднак без заглыблення ў іх сутнасць. Нават такі таленавіты і вопытны камедыёграф, як Кандрат Крапіва, гаворачы



Правообладатель Национальный институт образования

пра пасляваеннае калгаснае жыццё ў п'есе «Пяюць жаваранкі», не пазбег спрошчанасці і павярхоўнасці ў вырашэнні канфлікту.

Падзеяй стала з'яўленне камедыі Андрэя Макаёнка «Выбачайце, калі ласка!», дзе аўтар засяродзіўся на выкрыцці сапраўдных заган грамадства, на высмейванні махінатараў і прыстасаванцаў. Камедыя маладога беларускага драматурга хутка атрымала агульнасаюзную папулярнасць і прынесла аўтару шырокую вядомасць. У ёй знарок парушаліся прынцыпы тэорыі бесканфліктнасці, што прадвызначала развіццё ўсіх сфер савецкага мастацтва.

Вынікам панавання тэорыі бесканфліктнасці сталі адыход ад традыцый рэалістычнага мастацтва, вялікая колькасць схематычных, ілюстрацыйных твораў, ігнараванне праблем надзвычай складанай пасляваеннай эпохі.

***Тэорыя бесканфліктнасці*** — тэрмін у літаратурнай крытыцы, які абазначаў адмаўленне ў творчасці ад традыцыйнага канфлікту «добрага з дрэнным» і сцвярджэнне правамернасці канфлікту «добрага з лепшым». Творы, напісаныя ў рэчышчы гэтай тэорыі, паказвалі савецкую рэчаіснасць у прыхарошаным выглядзе, у іх дзейнічалі толькі станоўчыя персанажы.

Не пагаджаючыся з падобным станам рэчаў, Кандрат Крапіва выступіў з палемічнымі і смелымі на той час артыкуламі «Аб сатырычнай камедыі» і «Канфлікт — аснова п'есы». Аўтар патрабаваў свабоду і самастойнасць для драматургаў, незалежнасць ад партыйных кураратараў мастацтва і падпарадкаваных ім крытыкаў.

**Другое пасляваеннае дзесяцігоддзе.** Смерць Іосіфа Сталіна ў 1953 годзе прадвызначыла пафас абнаўлення і сацыяльнага аптымізму. Старэйшыя пісьменнікі Аркадзь Куляшоў, Пімен Панчанка, Максім Танк, Янка Брыль, Іван Мележ, Іван Шамякін і іншыя выяўлялі новыя грані майстэрства. Пасля вымушанага маўчання і забыцця вярнуліся ў літаратуру творцы, якім пашчасціла выжыць пасля рэпрэсій (Уладзімір Дубоўка, Язэп Пушча, Сяргей Грахоўскі, Алесь Звонак і інш.). З прыходам маладой генерацыі «дзяцей вайны» (Вячаслаў Адамчык, Рыгор Барадулін, Анатоль Вярцінскі, Ніл Гілевіч, Васіль Зуёнак, Уладзімір Караткевіч, Іван Пташнікаў, Міхась Стральцоў, Янка Сіпакоў і інш.) распачаўся новы яркі этап у гісторыі айчыннай літаратуры.

! XX з'езд КПСС (1956), на якім быў асуджаны культ асобы Іосіфа Сталіна, стаў пачаткам так званай «адлігі» — перыяду адноснай палітычнай і творчай свабоды ў савецкім грамадстве.



Правообладатель Национальный институт образования

**Паэзія.** Характар паэзіі другога пасляваеннага дзесяцігоддзя вызначала тэндэнцыя да лірызацыі, узмацненне асобаснага пачатку. Любоў да роднага краю і клопат пра захаванне мовы сталі лейтматывамі лірыкі Пімена Панчанкі, Рыгора Барадуліна, Ніла Гілевіча, Уладзіміра Караткевіча і інш. Шырокую прадстаўленасць мела філасофская лірыка, новым словам у якой загучала тэма асваення космасу (Аркадзь Куляшоў). У грамадзянскай лірыцы старэйшых паэтаў (Пятрусь Броўка, Аркадзь Куляшоў, Максім Танк, Пімен Панчанка) адлюстравалася пераацэнка ранейшых каштоўнасцей і ўласных творчых набыткаў. Паказальным у гэтых адносінах стаў верш Пімена Панчанкі «Анкета» — прызнанне ў тым, што паэт не заўсёды на высокім узроўні трымаў планку літаратурнага майстэрства, растрачваючы свой талент на пустыя словы.

Роздум над прызначэннем і прыродай паэтычнага мастацтва, часам балючы і пакутлівы, даў добрыя вынікі. Новы этап творчай эвалюцыі вопытных аўтараў засведчылі кнігі «Пахне чабор» Петруся Броўкі, «Смага» Кастуся Кірэенкі, «Новая кніга» Аркадзя Куляшова, «Мой хлеб надзённы» Максіма Танка, «Пры святле маланак» Пімена Панчанкі, «Твае далоні» Аляксея Пысіна.

Па-ранейшаму паэты не пакідалі без увагі ваенную тэму. У вершах 1960-х гадоў, напісаных прадстаўнікамі франтавога пакалення («Іван-чай» Аляксея Пысіна, «Сустрэча былых канагонаў» Міколы Аўрамчыка, «Акупацыя» Сяргея Дзяргая), знаходзілі мастацкае асэнсаванне трагічныя франтавыя падзеі, супраціўленне ў падполлі, знясільваючая праца і прыгнёт у палоне. Атрымала развіццё заяўленая раней тэма



Ва ўніверсітэцкім скверыку (1950-я). Стаяць (злева направа): Рыгор Барадулін, Анатоль Клышка, Васіль Зуёнак, Анатоль Вярцінскі, Генадзь Бураўкін. Сядзяць: Юрась Свірка, Мікола Арочка, Кастусь Цвірка



Правообладатель Национальный институт образования

вогненных вёсак і лагераў смерці («Трасцянец» Максіма Танка, «Рэквіем па кожным чацвёртым» Анатоля Вярцінскага, «Гарыць, гарыць мая Лагойшчына» Ніла Гілевіча).

Побач з гэтым радасцю жыцця, аптымізмам маладосці, адкрытасцю свету, настроямі вясны і абнаўлення поўніліся вершы паэтаў-пачаткоўцаў, пра што сведчаць назвы іх першых лірычных зборнікаў: «Песня ў дарогу», «Прадвесне ідзе па зямлі» Ніла Гілевіча, «Маладзік над стэпам», «Рунець, красавац, налівацца!» Рыгора Барадуліна, «Сонечны дождж», «Лірычны вырай» Янкі Сіпакова і інш.

Аптымістычныя ноты, абумоўленыя вяртаннем на Радзіму, магчымасцю адкрыта займацца творчасцю і выдаваць кнігі, загучалі ў вершах рэабілітаваных літаратараў (Уладзімір Дубоўка, Язэп Пушча, Станіслаў Шушкевіч, Мікола Хведаровіч). У некаторых творах выяўляліся душэўныя пакуты вязня, рабіліся звароты да тэмы сталінскіх рэпрэсій (Сяргей Грахоўскі).

**Здабыткі ў жанры паэмы.** Прыкметнай з’явай тагачаснага літаратурнага працэсу і адным з першых укладаў у мастацкае асэнсаванне тэмы лагераў смерці стала лірыка-публіцыстычная паэма **Петруся Броўкі «Голас сэрца»** (1960). Аснову твора, агульную танальнасць і настрой якога вызначаюць матывы сыноўняга болю і бяды, склала асабістая трагедыя аўтара: яго маці была знішчана ў Асвенціме. Наведванне ў 1947 годзе лагера смерці пакінула ў душы пісьменніка цяжкі след.

З часам боль асірацелага сына не сцішваўся, а, наадварот, патрабаваў увасаблення ў мастацкім слове. Так узнікла паэма-маналог, у якой голас збалелага сэрца, асэнсаванне асабістай трагедыі ператварыліся ў важкі і ўсхваляваны голас за мір ва ўсім свеце — твор гучыць рэквіемам па ўсіх ахвярах вайны.

> ***Рэквіем*** — твор, у якім паэтычна апяваюцца чалавечыя ахвяры, страты і адначасова раскрываюцца магутнасць і хараство жыццёвых сіл, здольных супрацьстаяць злу; у ім спалучаюцца лірычна-прачула-журботны (або трагічна-балючы) і ўзвышана-суровы, стрымана-ўрачысты, часам прамоўніцка-публіцыстычны пачаткі *(Паводле Аляксея Пяткевіча)*.

> **!** **Літаратурныя сувязі.** Памяці ахвяр вайны прысвечаны вершы «Рэквіем» Максіма Танка, «Рэквіем па кожным чацвёртым» Анатоля Вярцінскага. Рэквіемам па сябрах, знішчаных у 1930-я гады, з’яўляецца паэма «Маналог» Аркадзя Куляшова.



Правообладатель Национальный институт образования

Паэмны жанр арганічна спалучае ў сабе адзнакі лірыкі і эпасу, аднак іх суадносіны могуць быць розныя. «Голас сэрца» адпавядае асноўным характарыстыкам лірычнай паэмы. Напісаны ў форме маналогу-споведзі, твор раскрывае розныя адценні перажыванняў лірычнага героя, увасабляючы агульную для канца 1950—1960-х гадоў тэндэнцыю да лірызацыі, узмацнення суб'ектыўна-лірычнага пачатку. У адрозненне ад паэм з перавагай эпасу падобныя творы не маюць выяўленага сюжэта, а грунтуюцца найперш на ракрыцці складанага спектра лірычных перажыванняў, асобныя фрагменты аб'ядноўваюцца на аснове асацыятыўнай сувязі, а не па прынцыпе лагічнай паслядоўнасці. Такая ж мастацкая арганізацыя тэксту характэрна для створаных у гэты перыяд паэм «Маналог» Аркадзя Куляшова, «Блакада» Рыгора Барадуліна і іншых, што ў фармальных адносінах з'яўляюцца цыкламі вершаў, злучаных вобразам лірычнага героя і праблемна-тэматычным адзінствам.

Адсутнасць скразнога сюжэта ў «Голасе сэрца» Петруся Броўкі становіцца фонам для перадачы «падзей» у душы лірычнага героя, дазваляе спалучаць розныя ча́савыя пласты, неаднолькавыя па сваім настроі адрэзкі тэксту, вяртацца да раней сказанага з мэтай акцэнтаваць увагу чытача на самым важным. Кожная з чатырох частак паэмы прысвечана асобнай тэме і раскрывае розныя грані душэўных перажыванняў лірычнага героя. Яднае фрагменты ў адзінае мастацкае цэлае памяць пра маці і ідэя захавання свету ад новай вайны. У творы арганічна спалучаюцца лірычнае і публіцыстычнае: адчуванне страты выходзіць далёка за межы сыноўняй і пашыраецца да страты агульнанароднай і агульначалавечай. Моцны лірычны струмень, звязаны з вобразам маці, засцерагае паэму ад публіцыстычнай дэкларатыўнасці і лозунгавасці, дапамагае выявіць яе антываенны і гуманістычны пафас.

**Проза.** Шматлікія творы гэтага перыяду засведчылі вяртанне да класічных традыцый рэалістычнага мастацтва. Павысілася цікавасць літаратуры да ўнутранага свету звычайнага чалавека (апавяданні Івана Мележа, Янкі Брыля, Івана Пташнікава, Івана Чыгрынава, Міхася Стральцова).

Дзякуючы Уладзіміру Караткевічу проза ўзбагацілася творамі гістарычнай



*Н. Мурашка.* Ілюстрацыя да аповесці Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» (2015)



Правообладатель Национальный институт образования

тэматыкі (аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха»; раманы «Каласы пад сярпом тваім», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні»). Гістарычныя аповесці і раманы пісьменніка садзейнічалі папулярызацыі беларускага мінулага, абуджэнню нацыянальнай годнасці. Героі твораў — выключныя, смелыя, неардынарныя людзі — не пакідалі абыякавымі чытачоў рознага ўзросту. З імем Уладзіміра Караткевіча і яго аповесцю «Дзікае паляванне караля Стаха» звязана ўзнікненне ў айчыннай літаратуры жанру гістарычнага дэтэктыва.

! **Літаратурныя сувязі.** Распачатую Уладзімірам Караткевічам традыцыю беларускага гістарычнага дэтэктыва працягваюць сучасныя пісьменнікі. У 2004 годзе выдавецтвам «Мастацкая літаратура» заснавана серыя «Сучасны беларускі дэтэктыў». Першым быў выдадзены зборнік «Карона Вітаўта Вялікага». Гістарычныя дэтэктывы пісалі Міраслаў Адамчык («Забойства на Калядах»), Сяргей Балахонаў («Імя грушы»), Максім Клімковіч («Сцэнарый смерці», разам з Уладзімірам Сцяпанам — «Тэолаг»), Людміла Рублеўская («Золата забытых магіл»), Тэафілія Сабоцкая («Сапежынскі прывід»). З часам развілася лінія беларускага міліцэйскага дэтэктыва, якая брала вытокі з сацыяльна-бытавой прозы: творы Мікалая Чаргінца, Віктара Праўдзіна, Андрэя Федарэнкі, Алеся Наварыча, Валянціны Кадзетавай, Уладзіміра Шыціка, Франца Сіўко.

У другое пасляваеннае дзесяцігоддзе з'явіліся раманы на тэму нядаўняга мінулага і сучаснасці, якія пазней стануць нацыянальнай класікай. Іван Мележ завяршыў працу над кнігай «Людзі на балоце», што разам з наступнымі раманамі «Подых навальніцы», «Завеі, снежань» складзе маштабнае мастацкае палатно «Палеская хроніка», прысвечанае паказу жыцця землякоў у паваротны перыяд гісторыі — напярэдадні і ў час калектывізацыі.



Рукапіс рамана «Птушкі і гнёзды» Янкі Брыля (1963)

Раман Янкі Брыля «Птушкі і гнёзды», названы аўтарам «кнігай адной маладосці», узнаўляў старонкі біяграфіі самога пісьменніка: заходнебеларускае маленства, служба ў войску, гітлераўскі палон, прымусовая праца ў нямецкага гаспадара-баўэра, уцёкі на радзіму... У стылявых адносінах гэты твор значна адрозніваўся ад традыцыйнага рамана, паколькі ў ім пераважала лірычная плынь. Разгортванне знешніх падзей выцяс-



Правообладатель Национальный институт образования

нялася перадачай складанага ўнутранага жыцця галоўнага героя. Ключавыя тэмы і праблемы рамана — вызначэнне сутнасці фашызму і сталінізму, ідэя захавання міру, разуменне патрыятызму — раскрываліся праз лірычныя маналогі, з якіх складаецца гэты наватарскі ў тэматычных і жанравых адносінах твор.

Новымі павевамі ў грамадскім жыцці пасля XX з'езда партыі выклікана з'яўленне рамана Івана Шамякіна «Сэрца на далоні». Асноўная калізія заснавана на сутыкненні прадстаўнікоў старой і новай, пасляcталінскай, эпохі. Цяжкія шляхі праўды пра гарадское падполле, запаўненне «белых плям» у яго гісторыі, звяржэнне ашуканцаў і рэабілітацыя абылганых падпольшчыкаў — тыя моманты, што ўтваралі галоўную сюжэтную лінію рамана. Пісьменнік закранаў і заўсёды актуальныя праблемы бацькоў і дзяцей, узаемаадносін у сям'і, паказваў стаўленне розных герояў да кахання, вернасці, сяброўства.



Вокладка кнігі Івана Шамякіна «Сэрца на далоні» (2008)

Рамантычнае разуменне гэтых паняццяў выяўлялася ў рамане Уладзіміра Караткевіча «Нельга забыць» — «амаль што сентыментальным» творы пра сапраўднае, наканаванае лёсам каханне, перашкодай для якога можа стаць толькі смерць.

> **!** У рамане «Нельга забыць» прататыпам Ірыны Горавай, каханай галоўнага героя, стала Ніна Молева, якая была выкладчыцай Уладзіміра Караткевіча на Вышэйшых літаратурных курсах у Маскве.

У якасна іншым рэчышчы адбывалася асэнсаванне ваеннай тэмы: спрошчанасць і апісальнасць, гераізацыя і рамантыка саступалі месца суровай «акопнай» праўдзе. На змену шырокаму ахопу рэчаіснасці прыходзіла ўдумлівае мастацкае даследаванне лакалізаваных у прасторы і часе падзей, заглыбленне ў псіхалогію персанажаў. Грамадскі рэзананс выклікалі ваенныя аповесці Васіля Быкава, які першы адмовіўся ад панарамных твораў і сканцэнтраваў увагу на малой колькасці персанажаў — радавых удзельнікаў вайны («Жураўліны крык», «Здрада», «Трэцяя ракета», «Альпійская балада», «Пастка»).

У аповесцях Васіля Быкава вайна паўставала ў самых суровых праявах, калі чакаць удару даводзілася не толькі ад ворага. Пісьменнік



Правообладатель Национальный институт образования

паказваў перараджэнне ўчарашняга таварыша, што вырашыў захаваць сваё жыццё цаной здрады, агучваў думку пра непрафесіяналізм камандавання, бяздумныя загады якога абарочваліся вялікімі чалавечымі стратамі, гаварыў пра блізкае суседства сапраўднага гераізму з крывадушнасцю, дробязнасцю і баязлівасцю, якія на вайне маглі каштаваць жыцця.


Кадр з мастацкага фільма «Альпійская балада» (1965, рэж. Б. Сцяпанаў)

Адметнае месца ў прозе Васіля Быкава займае тэма ахвяр вайны: яго непакоіць і абурае тое, што за геапалітычныя гульні паміж краінамі плоцяць сваёй кроўю і жыццём ні ў чым не вінаватыя жанчыны, дзеці, старыя. Гэтай праблеме прысвечана, напрыклад, аповесць «Альпійская балада».

Партызанскі вопыт пісьменнікаў паслужыў асновай для раманаў Івана Навуменкі «Сасна пры дарозе» і Алеся Адамовіча «Вайна пад стрэхамі», дзе паказвалася асобаснае станаўленне і ўзмужненне ўчарашніх школьнікаў ва ўмовах акупацыі, іх барацьба ў тыле ворага.

**Навукоўцы гавораць.** Традыцыі ваеннай тэмы ў беларускай літаратуры закладаліся класікамі: Максімам Гарэцкім, Кузьмой Чорным, Міхасём Лыньковым. Вылучаюцца тры перыяды ў эвалюцыі беларускай ваеннай прозы:

1) 1940—1950-я гады — «чорна-белы», часам рамантызаваны паказ вайны, з ідэальным героем і бесканфліктнасцю, уласцівымі паэтыцы сацрэалізму. Герой — просты і мужны чалавек, часцей селянін, які глядзіць на наступствы вайны вачамі гаспадара;

2) канец 1950-х—1970-я гады — адыход ад схематызму ў паказе сваіх салдат і ворагаў, увага да псіхалогіі герояў. Вайна — найперш фон для вырашэння праблем чалавечага існавання. Прыход у літаратуру «дзяцей вайны»;

3) 1980—2000-я гады — пераасэнсаванне вайны (Іван Навуменка, Васіль Быкаў, Вячаслаў Адамчык, Алесь Адамовіч, Янка Брыль, Уладзімір Калеснік, Мікола Аўрамчык). Выяўленне ў творы таго, што героі нібыта ведаюць пра факты і дакументы, якія адкрыліся толькі ў пазнейшы час (Іван Чыгрынаў, Васіль Быкаў). Раскрыццё тэмы калабарантаў-здраднікаў (Вячаслаў Адамчык, Іван Чыгрынаў). Паказ вайны ў новым ракурсе: жанчына на вайне (Іван Шамякін, Святлана Алексіевіч), святары і вернікі на вайне (Васіль Быкаў, Ірына Жарнасек).

У творах маладзейшых пісьменнікаў народная трагедыя паўставала ў новым ракурсе — праз успрыняцце дзіцяці і падлетка. У апавя-



Правообладатель Национальный институт образования

даннях Івана Пташнікава «Алёшка», Міхася Стральцова «На чацвёртым годзе вайны», Вячаслава Адамчыка «Салодкія яблыкі» і іншых даследаваліся складанасці сталення маленькага чалавека ў бесчалавечны час, раскрываліся таямніцы дзіцячай душы, мары, якім далёка не заўсёды суджана збыцца. Названымі творамі ў беларускай літаратуры заявіла пра сябе тэма абпаленага вайной маленства, што будзе плённа распрацоўвацца ў наступныя дзесяцігоддзі. Прадстаўнікі гэтага пакалення паклалі пачатак і ў засваенні айчыннай прозай хатынскай тэмы (аповесць «Тартак» Івана Пташнікава).

**Драматургія.** Папулярнай заставалася тэма Вялікай Айчыннай вайны: ёй прысвечаны п'есы «Юныя мсціўцы» Аляксандра Гутковіча і Уладзіміра Хазанскага, «Выбух» Міхаіла Алтухова і Мікалая Гарулёва, «Людзі і д'яблы» Кандрата Крапівы, «Марат Казей» Валянціна Зуба і інш. Узнікалі творы рэвалюцыйнай тэматыкі, рабіліся спробы асвоіць жанр сямейна-бытавой драмы, стварыць п'есы маральна-этычнай праблематыкі (Кастусь Губарэвіч, Аркадзь Маўзон, Валянцін Зуб, Іван Козел і інш.). Як адзін з галоўных вектараў развіцця драматургіі выразна абазначылася цікавасць аўтараў да сучаснай рэчаіснасці, надзённых пытанняў. Акрамя вядомых драматургаў, што працягвалі пошук новых тэм і канфліктаў, у новай якасці паспрабавалі сябе і паспяховыя празаікі Іван Мележ («Пакуль вы маладыя»), Іван Шамякін («Не верце цішыні»; «Выгнанне блудніцы»). Тым не менш драматургія, якая паступова пераадольвала наступствы тэорыі бесканфліктнасці, не мела такіх значных дасягненняў, як паэзія і проза.

Паслабленне ідэалагічных і цэнзурных абмежаванняў, адносная свабода творчасці, рэабілітацыя бязвінна асуджаных пісьменнікаў, шматлікія мастацкія знаходкі — усё гэта дало падставы даследчыкам называць другое пасляваеннае дзесяцігоддзе літаратурным рэнесансам, параўноваць з «бурапеннымі» 1920-мі гадамі.

1. Якія тэмы дамінавалі ў літаратуры першых пасляваенных дзесяцігоддзяў? Параўнайце з тэмамі, якія пераважаюць у сучаснай літаратуры.
2. Паразважайце, чаму менавіта тэма Вялікай Айчыннай вайны была ў той перыяд галоўнай. З чым звязаны новыя падыходы ў яе раскрыцці?
3. Якім чынам у мастацкіх тэкстах выяўлялася «тэорыя бесканфліктнасці»?
4. Дайце тлумачэнне слову «адліга». Чаму менавіта так сталі называць перыяд у грамадскім і літаратурным жыцці пасля 1956 года?
5. Як пашыраліся ў гэты час праблемна-тэматычныя рамкі паэзіі, прозы і драматургіі? Прывядзіце прыклады твораў.



Правообладатель Национальный институт образования

6. Чым прынцыпова адрознівалася літаратурнае развіццё першага і другога пасляваенных дзесяцігоддзяў?
7. Што яднае літаратурны працэс другога пасляваеннага дзесяцігоддзя з 1920-мі гадамі?
8. Складзіце канспект раздзела: канспект — апорную схему, цытатны канспект, тэматычны канспект, план-канспект (на выбар).
9. Якія сучасныя фільмы-экранізацыі пра вайну вы глядзелі? Як вы думаеце, ці ёсць адрозненне ў падыходах да ацэнкі тых падзей нашымі сучаснікамі і сведкамі вайны?

# *Пімен Панчанка*

(1917—1995)

**1.** Назавіце пісьменнікаў, блізкіх па ўзросце да Пімена Панчанкі (гл. стужку часу на форзацы). **2.** Якія важныя гістарычныя падзеі ім давялося перажыць?

Падчас перабудовы паэт падпісаў зварот беларускіх пісьменнікаў, артыстаў і вучоных да Міхаіла Гарбачова. У гістарычным архіве ён захоўваецца пад назвай «Патрабуюцца рашучыя дзеянні па выратаванні роднай мовы, роднай культуры» (1986—1987). Сваёй творчасцю Пімен Панчанка і сам як найлепш спрыяў захаванню, развіццю нацыянальнай мовы і літаратуры.



Пімен Панчанка нарадзіўся 23 жніўня 1917 года ў Рэвелі (цяпер Талін), але неўзабаве сям'я вярнулася ў Беларусь, дзе прайшло дзяцінства будучага паэта. Першай «школай» для яго стаў лес у ваколіцах Бягомля, з якім была звязана праца бацькі і куды той часта браў сына з сабой. У 1932 годзе ў мястэчку Бягомль хлопец скончыў сямігодку, і ў хуткім часе яго сям'я пераехала ў Бабруйск. У гэтым горадзе пачалося самастойнае жыццё Пімена Панчанкі. Паспрабаваўшы сябе ў якасці рабочага на мясцовым дрэваапрацоўчым камбінаце, юнак вырашыў вучыцца далей.



Правообладатель Национальный институт образования

З цвёрдым намерам стаць настаўнікам ён скончыў педагагічныя курсы, настаўніцкі інстытут у Мінску і нават працаваў па спецыяльнасці на Магілёўшчыне. Але вайсковая служба змяніла прафесійныя планы: мабілізаваны ў армію ў верасні 1939 года, малады чалавек удзельнічаў у паходзе ў Заходнюю Беларусь. У гады Вялікай Айчыннай вайны паэт служыў ваенным карэспандэнтам у франтавых газетах. Менавіта ў складаных ваенных умовах адбывалася яго асобаснае і літаратурнае сталенне.

Далейшае мірнае жыццё было звязана з рэдакцыямі літаратурна-мастацкіх газет і часопісаў («Вожык», «Літаратура і мастацтва», «Советская Отчизна» (цяпер «Нёман»)), але найперш — з творчасцю. Аўтар больш як трыццаці кніг, Пімен Панчанка стаў адным з найбольш таленавітых і яркіх творцаў свайго часу, сведчанне таму — не толькі запатрабаванасць яго паэзіі чытачамі, але і шматлікія дзяржаўныя ўзнагароды і прэміі: Літаратурная прэмія імя Янкі Купалы (1959) за паэму «Патрыятычная песня», Дзяржаўная прэмія СССР (1981) за кнігу перакладзеных на рускую мову вершаў «Где ночует жаворонок» і інш. Пісьменніку, літаратурнаму крытыку, актыўнаму грамадскаму дзеячу Пімену Панчанку ў 1973 годзе было прысвоена ганаровае званне народнага паэта БССР.

Абвостранае пачуццё справядлівасці нярэдка прымушала мастака слова паўставаць супраць сістэмы. Гэтак было і тады, калі ён страціў пасаду рэдактара часопіса «Маладосць» за публікацыю аповесці Васіля Быкава «Мёртвым не баліць», і тады, калі ў касмапалітычныя 1960-я выступаў палымяным абаронцам беларускай мовы. Не мог мірыцца ён і з бездухоўнасцю пачатку 1990-х гадоў, вострымі вершамі настойліва нагадваючы пра маральнасць і заклікаючы да чалавекалюбства. «Без чалавечнасці не будзе і вечнасці» — так сфармуляваў свае адносіны да свету Пімен Панчанка, і гэтых слоў ён цвёрда прытрымліваўся ў мастацтве і паўсядзённасці.

Творчасць паэта пачыналася ў драматычныя для краіны 1930-я гады. Нягледзячы на разгул рэпрэсій, Пімен Панчанка ўваходзіў у літаратуру ўпэўненым паэтам-аптымістам. Мажорныя вершы і паэмы ў ваенныя гады саступілі месца выдатным узорам патрыятычнай лірыкі, што засведчыла з'яўленне сапраўднага майстра слова. Заяўленая высокая эстэтычная планка не была адолена ў першыя мірныя дзесяцігоддзі, аднак пасля сур'ёзнага перагляду паэтам ранейшых творчых арыенціраў з сярэдзіны 1950-х гадоў яго талент толькі набіраў



Правообладатель Национальный институт образования

моц. Яго лепшыя зборнікі «Кніга вандраванняў і любові» (1959), «Пры святле маланак» (1966), «Крык сойкі» (1976) і іншыя ўвайшлі ў залаты фонд беларускай літаратуры. Дзякуючы Пімену Панчанку грамадзянская, філасофская, сатырычная плыні беларускай паэзіі ўзбагаціліся метафарычнымі творамі-водгукамі на самыя балючыя праблемы сучаснасці — маральныя, экалагічныя, сацыяльныя, нацыянальныя.

**Уклад у развіццё літаратуры**

1. Паэзія перыяду Вялікай Айчыннай вайны не ўяўляецца без такіх твораў Пімена Панчанкі, як «Герой», «Сінія касачы», «Краіна мая», «Кожны з нас прыпасае Радзімы куток…», «Маё і тваё маленства». Як ніхто іншы з паэтаў-франтавікоў ён здолеў паяднаць у ваеннай лірыцы асабіста-інтымнае і грамадска-патрыятычнае. Яго багатыя на адценні лірычнага пачуцця, дасканалыя ў эстэтычных адносінах творы кардынальна адрозніваліся ад пашыранай тады вершаванай публіцыстыкі і пазначалі паварот да псіхалогіі чалавека, радавога ўдзельніка вялікай трагедыі.

2. Яркай з'явай у творчасці Пімена Панчанкі і ва ўсёй беларускай літаратуры стаў «Іранскі дзённік». Зборнік вершаў 1944—1945 гадоў, напісаных падчас службы ў Іране, пашыраў праблемна-тэматычны дыяпазон айчыннай паэзіі, раскрываў беларускаму чытачу новыя далягляды.

3. Пімен Панчанка ў пераломныя гістарычныя перыяды неаднойчы задаваў вектары развіцця беларускай паэзіі. Равеснік Кастрычніцкай рэвалюцыі, адданы прыхільнік і абаронца яе дасягненняў быў, аднак, здольны на прызнанне памылак савецкага ладу і на публічнае пакаянне. Яго пасля469сталінскі верш «Анкета» (1954) сведчыў пра паварот да жыццёвай праўды не толькі самога паэта, але і цэлага пакалення: «Калі мая песня каго й хвалявала, // То тая, апранутая ў шынель... // Растрачана дзён незваротных нямала // На дробязь, на глупства, на тосты, на мель». У часы перабудовы[1] грамадскі рэзананс выклікала яго «Паэма сораму і гневу» (1986), дзе злачынствы савецкай эпохі прызнаваліся як асабістыя: «Я цэрквы закрываў, // Я абразы паліў, // Сялянскую маёмасць перапісваў». Услед за Піменам Панчанкам складаныя і драматычныя перыпетыі савецкай гісторыі пачалі па-мастацку пераасэнсоўваць многія іншыя беларускія пісьменнікі.

---

[1] *Перабудо́ва* — палітычныя і эканамічныя рэформы, што пачаліся ў СССР у другой палове 1980-х гадоў.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Паглядзіце дакументальны фільм «Пімен Панчанка: сінія касачы для паэта-філосафа» з серыі «Запіскі на палях» (2019, рэжысёр Інга Шычкова, тэлеканал «Беларусь 3»). На аснове фільма ўстанавіце: а) чаму ў дачыненні да паэта несправядлівыя словы «калі гавораць гарматы, музы маўчаць»; б) якія рысы характару былі вызначальнымі для Пімена Панчанкі; в) як паэт ставіўся да падлеткавага бунтарства сваіх унукаў.
2. Што адметнага ў ваеннай лірыцы Пімена Панчанкі?
3. Чаму «Іранскі дзённік» лічыцца новым словам у тагачаснай беларускай паэзіі?
4. Як вы разумееце выраз «паэзія — барометр эпохі»? Як ён суадносіцца з творчасцю Пімена Панчанкі?
5. Чым былі выкліканы змены ў светапоглядзе пісьменніка?
6. Паразважайце, як характарызуе Пімена Панчанку яго здольнасць прызнаваць памылкі. Ці ведаеце вы асабіста людзей, здольных на такія ўчынкі?

## Лірыка Пімена Панчанкі

Ваенную паэзію Пімена Панчанкі вызначае патрыятычны пафас: ён выяўляецца ў вершах-прызнаннях у любові знявечанаму ворагамі краю, у паэтычных малюнках разбураных гарадоў і вёсак, што кантрастуюць з успамінамі пра спакойнае мірнае жыццё. Праз асобныя фрагменты-замалёўкі ваеннай рэчаіснасці паўстае маштабная карціна народнай трагедыі і гераічнага змагання. Адзін з такіх эпізодаў занатаваны ў надзвычай моцным па сіле эмацыянальнага ўздзеяння вершы **«Герой»** (1943) — стрымана-лаканічным аповедзе пра подзвіг безыменнага пехацінца. Ён, як і мільёны такіх жа простых салдат, свядома ахвяраваў сваім жыццём у імя агульнай перамогі: «Злосна сказаў: “Уставай, пяхота! // Мы не на пляжы, а на вайне”. // І лёг на змяіныя скруткі дроту. // І дзвесце салдацкіх запыленых ботаў // Прайшлі па яго спіне».



*М. Альперт.* Камбат (1942)

Верш складаецца ўсяго з трох строф, але і ў такім невялікім аб’ёме паэту ўдалося раскрыць жахлівую і непрыхарошаную праўду вайны.



Правообладатель Национальный институт образования

У першай страфе ўзнаўляецца момант воінскага подзвігу, але ён апісваецца вельмі коратка і сцісла, без характэрных для твораў гераічнага зместу ўзвышана-ўсхваляваных інтанацый. Аўтар дасягае выбуховага лаканізму за кошт рэзкіх кантрастаў (поле бою — пляж) і яркіх параўнанняў (калючы дрот — змяіны скрутак), гаворыць пра выключнае і неверагоднае для сённяшніх чытачоў як пра звычайную паўсядзённасць. У пачатку другой страфы ў верш «прарываюцца» эмоцыі, чуюцца ноткі шкадавання («Не ён, а другія ішлі ў атаку»), але гэта шкадаванне хутчэй пра тое, што салдат не змог працягнуць бой, а не пра яго смерць. Франтавік Пімен Панчанка не дае волю пачуццям, а тут жа вяртаецца да рэалій бітвы, паказваючы такім чынам, наколькі моцна ў часы вайны мянялася шкала каштоўнасцей, калі цана кожнага заваяванага рубяжа аказвалася значна вышэйшай за цану чалавечага жыцця.

Уся горыч і непапраўнасць страты выяўляюцца ў трэцяй страфе. У ваеннай лірыцы Пімена Панчанкі важную мастацкую функцыю выконваюць пейзажныя замалёўкі. У вершы «Герой» менавіта яны дапамагаюць перадаць трагізм і гераізм сітуацыі, робяць непатрэбнымі аўтарскія тлумачэнні і ацэнкі: «А ён свае косці з іржавых калючак // Сваімі рукамі без стогну аддзёр, // Зваліўся на травы, і стала балюча // І травам, і росам, і ветрам гаючым, // Што прыляцелі з валдайскіх азёр». Падобная рамантычная вобразнасць побач з іншымі характарыстыкамі (гераічны змест, дынамічны, напружаны сюжэт) набліжаюць твор да жанру балады.

! Пісьменнік-франтавік Васіль Быкаў быў вельмі ўражаны «бязлітаснымі ў сваёй крывавай праўдзівасці радкамі» верша «Герой» Пімена Панчанкі: «Думаецца, калі б ён пра фронт не напісаў болей нічога, дык адных гэтых радкоў хапіла, каб з такой яркай канкрэтнасцю выказаць усю пакутніцка-гераічную сутнасць мінулай вайны».

Верш **«Спарышы»** (1954) пацвярджае ўменне Пімена Панчанкі кароткімі штрыхамі-дэталямі стварыць аб'ёмны, эпічна разгорнуты малюнак, расказаць складаную гісторыю чалавечых узаемаадносін. У вершы «Спарышы» — гісторыя неўзаемнага кахання юнака да дзяўчыны. У апавядальна-размоўных інтанацыях паказваецца драма двух герояў, раскрываюцца прычыны іх горкіх расчараванняў: у хлопца — гэта вяселле каханай, у дзяўчыны — нешчаслівае, як аказалася пасля, замужжа.



Правообладатель Национальный институт образования

Ключавой мастацкай дэталлю выступае вобраз спарышоў. Спарышамі беларусы называлі спараныя, двайныя прадметы — каласы, грыбы, арэхі. Паводле народных павер'яў, яны прыносілі шчасце іх уладальніку. З надзеяй на шчасце і ўзаемнасць герой твора «абшастаў ценісты арэшнік, // Змок увесь, але знайшоў, знайшоў — // <...> // Пару запаветных спарышоў». Каханая са смехам прыняла падарунак, аднак яго важнасць і значэнне зразумела толькі праз гады. Пры наступнай сустрэчы пасталелая, ужо з маршчынкамі ля вачэй, яна скардзіцца на свой лёс, на гультая і п'яніцу мужа, шкадуе, што некалі не заўважала сапраўды адданага ёй юнака. З вобразам захаванага хлопцам арэха-спарыша звязана і надзея на магчымы працяг іх адносін: «Вось і ўся гісторыя... А можа, // Гэта толькі першая з дарог? // Нездарма яе так устрывожыў // Ціхі сказ хлапца: "А я збярог"». Такім чынам, Пімен Панчанка паўстае не толькі палымяным паэтам-грамадзянінам, але і тонкім лірыкам.


Арэхі-спарышы

Верш з назвай «Спарышы» ёсць у Алеся Разанава. Калі ў Пімена Панчанкі спарышы — метафара паяднання хлопца і дзяўчыны, то ў Алеся Разанава — гэта ўвасабленне дваістай сутнасці чалавека: «З дня ў дзень, з году ў год, з веку ў век збіраюся з тайнаю моцай, каб калі-небудзь абвергнуць сваё існаванне, адолець дваістасць і стаць насампраўдзе сабой».

Заўсёды актуальная для беларускага грамадства і нацыянальнай літаратуры праблема захавання мовы па-новаму загучала ў сярэдзіне XX стагоддзя. У гэты час у СССР быў узяты курс на русіфікацыю, што, згодна з уяўленнямі кіраўніка краіны Мікіты Хрушчова, павінна было наблізіць утапічную мару пра ўсеагульнае шчасце — паскорыць пабудову камунізму. На жаль, найбольш актыўна і паспяхова нацыянальная мова выцяснялася ў Беларусі. Верш **«Родная мова»** (1964) — балючы водгук Пімена Панчанкі на тагачасныя рэаліі, востры пратэст супраць іх.

Для лірычнага героя родная мова з'яўляецца натуральнай жыццёвай стыхіяй, «як раса, як сляза, як зара», яна неаддзельная ад прыроднага свету («ластавак шчабятання», «звону світальнага палескіх крыніц», «сіні чабору», «барваў зарніц»). У сітуацыі, калі



Правообладатель Национальный институт образования

вынішчэнне мовы паўстае як непазбежнае, ён прапануе пайсці на нявыгадны, але ўсё ж кампраміс: «Толькі месяцаў назвы пакіньце, // Назвы родныя роднай зямлі». У эпоху бяспамяцтва старажытныя назвы застануцца апошнімі знакамі беларускай самабытнасці: «Студзень — з казкамі снежных аблокаў, // Люты — шчодры на сіні мароз, // Сакавік — з сакатаннем і сокам // Непаўторных вясновых бяроз...»

Натуральнае патрабаванне чалавека-патрыёта ў вершы гучыць як балючая просьба пра апошнюю літасць: «Ці плачу я, ці пяю?.. // Восень. На вуліцы цёмна... // Пакіньце мне мову маю, // Пакіньце жыццё мне!» Але і ў гэтай першапачатковай канцоўцы твора савецкія цэнзары ўбачылі дзёрзкасць. Каб зменшыць катэгарычны тон, паэту прыйшлося замяніць фінал на больш «нейтральныя» і лірычныя радкі: «Ці плачу я, ці пяю, // Ці размаўляю з матуляю — // Песню сваю, мову сваю // Я да грудзей прытульваю».

! **Літаратурныя сувязі.** У канцы 1980-х гадоў, праз некалькі дзесяцігоддзяў пасля верша «Родная мова», у Пімена Панчанкі з'явіўся поўны расчаравання твор на тую ж тэму — «Развітанне». Верш меў вялікі рэзананс. Малады паэт Анатоль Сыс нават напісаў твор-адказ «Прачытаўшы верш Пімена Панчанкі “Развітанне”». Потым Анатоль Сыс прасіў у класіка прабачэння за свой паэтычны водгук, а Пімен Панчанка прызнаўся, што пісаў «Развітанне» якраз з разлікам на тое, каб нехта запярэчыў.

Верш **«Той дзень прапаў і страчаны навекі...»** (1973) з'яўляецца роздумам пра сэнс жыцця. Публіцыстычна завострана Пімен Панчанка ставіць пытанне аб прызначэнні чалавека і бачыць яго ў неабходнасці рабіць дабро: «Той дзень прапаў і страчаны навекі, // Калі ты не зрабіў таго, што мог; // Калі не паспрыяў ты чалавеку, // Няшчыры быў, зманіў, не дапамог».

Лірычны герой твора паўстае альтруістам і гуманістам, заклапочаным бядой і неабыякавым да несправядлівасці. У «напаміне пра будучыню», за якую кожны нясе асабістую адказнасць, прысутнічаюць і аголена дыдактычныя, маралізатарскія ноткі: «Не мы, жыццё табе даўгі заплаціць // За раўнадушша. // Вінаваты сам». Такая паліфанія настрояў арганічная для творчасці паэта. У вершы знайшлі ўвасабленне таксама іншыя рысы лірыкі Пімена Панчанкі, што ўтвараюць яго адметны стыль: спавядальны характар, адкрытасць, шчырасць лірычнага пачуцця ў спалучэнні з вострай палемічнасцю, бескампраміснасцю, нацэленасцю на злабадзённыя пытанні.



Правообладатель Национальный институт образования

Пімен Панчанка выкарыстаў багаты арсенал сродкаў мастацкага выяўлення. Мастацкі эфект ствараецца за кошт «спалучэння неспалучальнага»: напрыклад, бязвобразнага пісьма (аўталогіі) у першай страфе і шматлікіх метафар у наступных («Той дзень збяднеў, зліняў на сотню радуг // І, попелам пасыпаны, сканаў», «Той дзень, лічы, завянуў пустацветам»). Паступовае ўзмацненне эмоцый і адначасова рытмічная выразнасць верша дасягаюцца пры дапамозе анафары: чатыры з сямі строф пачынаюцца аднолькава. Змена інтанацый у фінале — ад узрушанасці да сцішанай спавядальнасці — сведчыць пра разнастайнасць рытміка-інтанацыйнага малюнка і стварае непаўторную панчанкаўскую атмасферу.

***Аўталогія*** (ад грэч. *autos* — ‘сам’ і *logos* — ‘слова’) — выкарыстанне ў мастацкім творы слоў у іх прамым лексічным значэнні.

Лірычная замалёўка **«Крык сойкі»** (1975) раскрывае адну з ключавых у творчасці Пімена Панчанкі праблем — узаемаадносіны чалавека і прыроды. У «навукова-тэхнічныя» 1970-я гады яшчэ больш адчувальным стаў адрыў чалавека ад прыроды, распачаты ў папярэднія дзесяцігоддзі. Гэты верш вылучае далікатнае, а не заваёўніцкае стаўленне да прыроды, гатоўнасць да дыялогу, пошук паразумення са светам дрэў і траў. У ім лаканічна выражаны роздум над месцам чалавека на зямлі.

Перакананне ў тым, што гарманічныя адносіны паміж людзьмі і наваколлем павінны быць адзіным арыенцірам для сучаснікаў, увасабляецца ў метафары «крык сойкі». Лірычны герой твора спрабуе зразумець птушку, якая, верагодна, крыкам заяўляе няпрошанаму госцю ўласныя правы як гаспадыні лесу, ахоўвае свае ўладанні. Апошняя страфа цалкам складаецца з рытарычных пытанняў («Што ж ты крыкам мяне сустракаеш? // Мы маглі б падружыцца, бадай. // Ці то ворагаў многа маеш? // Ці то мне пагражае бяда?»). Яны скіроўваюць да думкі пра небяспеку, якая тоіцца ў парушэнні прыроднага суладдзя, магчымасці «рукатворных» экалагічных катастроф, выкліканых спажывецкімі адносінамі да навакольнага асяроддзя. Пра гэта прырода папярэджвае чалавека сама. Трэба толькі быць адкрытым і ўважлівым, каб пачуць яе крык.



*М. Будавей.* Партрэт Пімена Панчанкі (1982)



Правообладатель Национальный институт образования

Пімен Панчанка — паэт-грамадзянін, паэт-публіцыст, паэт-лірык. З кожным новым паваротам лёсу высвечваліся новыя грані яго таленту, узбагачалася тэматыка твораў. Пяру паэта падуладныя і тонкі пранікнёны лірызм, і гераічны пафас, і філасофскае разважанне. У другой палове XX стагоддзя яго паэзія расквітнела з новай сілай.

! **Літаратурныя сувязі.** Ваенная тэма звязвае такія творы беларускай літаратуры, як верш Пімена Панчанкі «Герой», аповесць Васіля Быкава «Жураўліны крык», верш Анатоля Вярцінскага «Два полі». Экалагічная тэма, пазначаная ў «Крыку сойкі», раскрываецца ў іншым творы Пімена Панчанкі «Сармацкае кадзіла». Многія беларускія мастакі слова, падобна Пімену Панчанку ў вершы «Спарышы», паэтызуюць каханне. Гэта, вядома, Максім Багдановіч («Раманс», «Маладыя гады»), Пятрусь Броўка («Пахне чабор»), Аркадзь Куляшоў («Бывай…»), Яўгенія Янішчыц («Ты пакліч мяне. Пазаві…»).

1. На матэрыяле разгледжаных твораў акрэсліце праблемна-тэматычны дыяпазон паэзіі Пімена Панчанкі. Якія з важных для пісьменніка праблем не страцілі актуальнасці і сёння?
2. Чаму верш «Герой» прынята лічыць баладай? У чым заключаецца гераізм безыменнага салдата?
3. Падзяліце верш «Спарышы» на часткі. Вызначце настрой кожнай з іх. Якія словы ўказваюць на змену танальнасці твора? Што выражаюць эпітэты?
4. Якія эмоцыі выклікаюць у вас героі верша «Спарышы»? Ці магчыма падобная гісторыя ў нашы дні? Прыдумайце яе фінал.
5. Як адбілася змена канцоўкі на вершы «Родная мова»? Прыгадайце вершы іншых аўтараў з падобнай назвай.
6. Вызначце асноўную думку верша «Той дзень прапаў і страчаны навекі...». Наколькі вам блізкая жыццёвая пазіцыя аўтара? Прааналізуйце сродкі мастацкай выразнасці ў творы.
7. Растлумачце сэнс метафары «крык сойкі». Якія праблемы раскрываюцца пры яе дапамозе?
8. Разгледзьце «Партрэт Пімена Панчанкі» Міхася Будавея. Як выяўляецца вобраз пісьменніка праз мастацкія дэталі, фон?
9. Праслухайце верш Пімена Панчанкі (на выбар). Ці згодны вы з такім прачытаннем твора? Агучце свой варыянт. Растлумачце, якія паўзы і акцэнты ў параўнанні з чытальнікамі вы зрабілі і чаму.
10. Вывучыце верш Пімена Панчанкі «Герой» на памяць.



Правообладатель Национальный институт образования

## Лірычны герой, лірычнае «я» і аўтар

***Лірычны герой*** — мастацкі вобраз, ад імя якога вядзецца гаворка ў вершы (вобраз аўтара, але не сам аўтар), асноўная дзейная асоба паэтычнага твора, чые рысы характару, светапогляд і біяграфічныя факты паўтараюцца ў тэкстах пэўнага цыкла, кнігі або творчасці паэта ў цэлым.

Лірычны герой надзелены ўстойлівымі асобаснымі характарыстыкамі, мае адметны, індывідуальны воблік і непаўторны лёс, фарміруецца на працягу ўсёй творчасці паэта. У творах лірычны герой дзейнічае, стварае пэўныя сітуацыі, гаворыць пра сябе. Лірычны герой знаходзіцца ў цеснай сувязі з аўтарам, але іх нельга атаясамліваць нават пры супадзенні біяграфічных фактаў. Не ў кожнага аўтара ёсць лірычны герой (напрыклад, яго няма ў Алеся Разанава).

У вобразе лірычнага героя можа адлюстроўвацца светапогляд паэта, яго духоўны і жыццёвы вопыт, перажыванні, рысы характару. Так, асабісты франтавы вопыт Пімена Панчанкі ўвасобіўся ў вобразе лірычнага героя яго ваенных вершаў — патрыятычна настроенага маладога чалавека, захопленага думкай пра родны край, ідэяй яго вызвалення, неабыякавага да прыгажосці свету насуперак страшным рэаліям вайны.

Вобраз лірычнага героя можа змяняцца ад верша да верша, спасцігацца чытачом паступова. У 1970-я гады лірычны герой паэзіі Пімена Панчанкі паўставаў непрымірымым да грамадскіх заган і маральных хібаў максімалістам, у пачатку 1990-х яго пазіцыя стала яшчэ больш катэгарычнай і безапеляцыйнай. Лірычны ж герой усёй паэзіі Пімена Панчанкі — гэта шчыры, сумленны чалавек, які сцвярджаў хараство жыцця і актыўна змагаўся з яго заганамі.

Лірычная гераіня Яўгеніі Янішчыц амаль тоесная самой пісьменніцы. Кажучы «...яшчэ бяжыць дзяўчынка // Па кладцы той, якой даўно няма», дарослая расчараваная лірычная гераіня адсылала чытача да вобраза кладкі, на якой саму паэтку сфатаграфаваў пры першай сустрэчы будучы муж.

Вельмі часта розніца паміж аўтарам і лірычным героем абумоўлена рэаліямі літаратурнага працэсу. Лірычны герой Гаўрылы з Полацка (Алаізы Пашкевіч) — мужчына. А Янка Купала разумеў, што блізкі



Правообладатель Национальный институт образования

да яго лірычны герой, шляхетны, далікатны, не быў бы запатрабаваны рэвалюцыйным XX стагоддзем і беларускім масавым чытачом так шырока, як герой-селянін.

***Лірычнае «я»*** — мастацкі вобраз, што выяўляецца ў асобных вершах аўтара і выражае пэўны светапогляд, які не абавязкова падзяляе сам аўтар і які можа не адносіцца да канкрэтнай асобы, у тым ліку аўтарскай. Пры паўтарэнні ў цыкле вершаў або ўсёй творчасці паэта можа аформіцца ў лірычнага героя.

Лірычны герой у творчасці аўтара паўтараецца і развіваецца, а лірычнае «я» можа быць выпадковым, аднаразовым, тыповым для пэўнага часу, выкліканым літаратурнай модай. Лірычныя «я» аднаго і таго ж паэта могуць супярэчыць адно аднаму.

Уладзімір Дубоўка, які нарадзіўся ў 1900 годзе, пісаў: «Закладалі падмурак дзяржавы сваёй // мы нядаўна, ў сямнаццатым годзе...» У 1917 годзе паэт вучыўся ў Новавіленскай настаўніцкай семінарыі, а ў творы выражаны тыповы для тых часоў светапогляд. Часта лірычнае «я» (або лірычнае «мы») выяўляецца ў ваеннай лірыцы, як, напрыклад, у Максіма Танка: «Мы адступалі, падпаліўшы // свае сядзібы і зямлю». Лірычнае «я» верша Анатоля Вярцінскага «Два полі» апавядае пра салдата, а паэт у часы вайны быў дзіцём.

***Аўтар*** — рэальная асоба, якая стварыла мастацкі тэкст.

Аўтар з'яўляецца носьбітам пэўных поглядаў на свет, мастацкіх прынцыпаў (пісьменніца-мадэрністка, паэт-маладняковец). Аўтар можа карыстацца псеўданімам і выбудоўваць вакол яго новую асобу з выдуманай біяграфіяй (Мацей Бурачок). Аўтар гаворыць у вершы праз лірычнага героя або праз лірычнае «я». Пры гэтым займеннікі «я» і «мы» ў паэтычным творы могуць мець дачыненне як да лірычнага героя, так і да лірычнага «я» ў залежнасці ад пастаўленай аўтарам творчай задачы.

1. Параўнайце, якім чынам выяўлена асоба аўтара ў вершы Яна Чачота «На прыезд Адама Міцкевіча» XIX стагоддзя і ў вершы Пімена Панчанкі «Спарышы» XX стагоддзя.
2. Даследчыкі сцвярджаюць, што не ў кожнага паэта ёсць лірычны герой. Як вы думаеце, пра што пішуць паэты, у творчасці якіх няма лірычнага героя?



Правообладатель Национальный институт образования

3. Чаму нельга рабіць высновы пра лірычнага героя пэўнага аўтара, калі прачытаны толькі адзін яго верш?
4. Як вы апішаце лірычнае «я», тыповае для нашага часу?

# Іван Мележ

(1921—1976)

? **1.** З якой празаічнай замалёўкай Івана Мележа вы знаёміліся ў папярэдніх класах? Звярніце ўвагу на яркасць і вобразнасць пейзажнага малюнка ранняй восені ў гэтай замалёўцы. **2.** Якую ролю можа адыгрываць пейзаж у эпічным творы?

Фраза «Таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім» лічыцца штампам, аднак да Івана Мележа яна падыходзіць ідэальна. З маленства ён быў надзвычай дапытлівы, рана навучыўся чытаць, пісаць, маляваць, майстраваць. Як згадваў яго аднакласнік Пятро Чарняк, Іван хадзіў у школу ў пасталах, якія сам зрабіў з лазы (пасталы — мяккі сялянскі абутак, зроблены з цэлага кавалка скуры, які насіцца з анучамі і прывязваецца да ног аборамі). Сапраўдную ж славу сярод аднагодкаў Мележу прынесла стварэнне драўлянага ровара. Колы былі змайстраваны з двух арэхавых абручоў, але са спіцамі і рамай.



Іван Мележ нарадзіўся 8 лютага 1921 года ў вёсцы Глінішча Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці.

Яго маленства было звычайным для вясковага хлопца, а кнігі — першай вялікай любоўю і самым дарагім скарбам. Напэўна, таму вельмі рана ўзнікла жаданне пісаць. Захапленне юнака падтрымаў настаўнік Міхась Пакроўскі, які спрыяў апублікаванню ў 1939 годзе ў «Чырвонай змене» першага верша — «Радзіме».

Праз год Мележ паступіў у Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і літаратуры і амаль адразу быў прызваны ў войска. У Карпатах сустрэў вайну. Быў цяжка паранены, ледзь не страціў правую руку. Плячо было зусім разбіта. Галоўны ўрач Антонаў ампутацыю не дазволіў, бо разумеў, што маладому хлопцу рука спатрэбіцца. Пасля аперацыі было невыносна балюча. Рука потым



Правообладатель Национальный институт образования

доўга яшчэ ныла, баялася кожнага штуршка, нават хадзіць трэба было вельмі асцярожна. Пазней пісьменнік згадваў, што першы аповед пісаў у Тбілісі левай рукой. Гэта было пакутліва цяжка: непаслухмяны быў аловак, ад таго і «непаслухмяныя» словы... У 1944 годзе ўжо ў Мінску газета «Звязда» надрукавала апавяданне «Сустрэча», напісанае ў шпіталі.

У 1948 годзе была выдадзена кніга прозы «Гарачы жнівень». Назву ёй дала аднайменная аповесць, створаная ў 1946 годзе пасля наведвання спустошанай падчас вайны роднай вёскі.

Жанравыя рамкі творчасці пісьменніка пашыраліся. З канца 1947 года ён некаторы час працаваў над раманам «Мінскі напрамак». Аўтар расказваў пра вызваленчую барацьбу на тэрыторыі Беларусі летам 1944 года і аперацыю «Баграціён». Праца над творам стала важным этапам у творчым росце Івана Мележа-празаіка. Ён прызнаваўся, што «толькі з яе (кнігі) выхадам адчуў сябе пісьменнікам».

Пасля «Мінскага напрамку» Іван Мележ апынуўся нібы на растанях. Цяжкая праца над раманам знясіліла, ён адчуваў сябе не ў стане ўзяцца за нешта значнае. Каля трох гадоў не пісаў буйных твораў. У гэты час Іван Паўлавіч у думках неаднаразова вяртаўся да роднага Палесся, падсвядома адчуваючы, што яшчэ не сказаў сваё галоўнае слова — не напісаў кнігу, у якой бы «адважыўся ажывіць вобразы далёкага маленства і юнацтва свайго, з неадольным хваляваннем, з заміраннем сэрца прайшоў зноў па тых дарогах, сцяжынках і травах, па якіх хадзілі калісьці лёгкія і хуткія дзіцячыя ногі...».

Абсягі творчасці Івана Мележа шырокія: зборнікі прозы «Блізкае і далёкае», «У гарах дажджы», «Што ён за чалавек», п'есы «Пакуль вы маладыя», «Дні нараджэння» і іншыя, літаратурна-крытычныя артыкулы, эсэ, інтэрв'ю («Жыццёвыя клопаты», «Першая кніга: Дзённікі, сшыткі, з запісных кніжак»), а таксама яго галоўная кніга — цыкл «Палеская хроніка», якую літаратуразнаўцы называюць гімнам пісьменніка роднаму краю і народу.



Іван Мележ, Авяр'ян Дзеружынскі, Алесь Пальчэўскі на сустрэчы з чытачамі (1961)

За дасягненні ў развіцці беларускай літаратуры ў 1972 годзе Івану Паўлавічу было прысвоена ганаровае званне народнага пісьменніка БССР.

Вясной 1976 года адбылася адна з апошніх сустрэч чытачоў з Іванам Паўлавічам. Ужо занатавана была ў яго запісных кніжках балючая думка:



Правообладатель Национальный институт образования

«Адламала галіну, на якой поўна зялёных яблыкаў, я, як гэтая галіна. Поўна ва мне задум, якія прападуць са мной».

Здароўе пісьменніка пагоршылася. Ён, мабыць, разумеў, што лёс адмераў няшмат часу, і працаваў, не шкадуючы сябе. Мележу вельмі хацелася завяршыць «Палескую хроніку», але зрабіць гэта не ўдалося нават пры такой напружанай працы: 9 жніўня 1976 года Івана Паўлавіча не стала.

**Уклад у развіццё літаратуры**

1. «Мінскі напрамак» (1947—1952) — першы ў беларускай савецкай літаратуры раман, у якім пісьменнік паказаў беларусаў не толькі партызанамі, што было ўжо стэрэатыпам, але і воінамі-франтавікамі. Хаця для савецкай літаратуры канца 1940-х — пачатку 1950-х гадоў акцэнт на нацыянальнасці савецкіх воінаў быў нехарактэрны.

2. «Палеская хроніка» — глыбокае філасофска-мастацкае асэнсаванне жыцця беларускага народа ў 1920-х гадах, твор, з'яўленне якога стала магчымым толькі пасля XX з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Гэта новы этап у творчасці Мележа-бытапісальніка, які змог перагледзець свае прынцыпы і пісаць больш смела і глыбока, і новы этап для самой беларускай літаратуры, што займела манументальны тэкст, у якім на высокім мастацкім узроўні, у «крыху кансерватыўнай манеры» *(Іван Навуменка)* раскрывалася жыццё палескай вёскі на гістарычным пераломе.

3. У 1960—1970-я гады творы Івана Мележа выклікалі актыўную грамадскую дыскусію. Гэта абмеркаванне прымусіла і чытачоў, і крытыкаў задумацца над пастаўленымі аўтарам пытаннямі пра вынікі калектывізацыі, раскулачвання.

1. Пазнаёмцеся з відэаматэрыяламі інтэрнэт-рэсурсаў па запыце «Іван Мележ» і вызначце асноўныя вехі на жыццёвым шляху пісьменніка.
2. Звярніцеся да ваеннага дзённіка[1] Івана Мележа. Прасачыце этапы сталення юнака. Засяродзьце ўвагу на захапленні пісьменніка песняй. Падумайце, чаму ён лічыць песні самымі вернымі сябрамі.
3. Прачытайце верш Ніла Гілевіча «Апошні аўтарскі вечар Івана Мележа» і паразважайце над яго зместам. Чаму песню «Шумяць вербы» можна лічыць сімвалам малой радзімы Івана Мележа? Растлумачце сэнс апошняй страфы паэтычнага твора. Апішыце, якім чалавекам вам уяўляецца Іван Паўлавіч паводле гэтага верша.

[1] *Мележ, І.* Першая кніга : дзённікі, сшыткі, з запісных кніжак. Мінск, 1977.



Правообладатель Национальный институт образования

## Раман «Людзі на балоце»

**Творчая гісторыя, тэматыка і праблематыка «Палескай хронікі».** З другой паловы 1940-х гадоў Івана Мележа неадступна хвалявала задума стварыць вялікі раман пра роднае Палессе, якое ў яго свядомасці атаясамлівалася з усёй Радзімай, з беларускім народам.

«Хочацца, каб, чытаючы маю кнігу, вы адчулі, што я не мог не напісаць яе. ...Я хацеў выканаць свой сыноўні абавязак перад бацькоўскай зямлёй, перад роднымі людзьмі; яна невыпадкова пачынаецца прысвячэннем — “Бацьку, маці, бацькоўскай зямлі”» *(Іван Мележ. «Жыццёвыя клопаты»)*.




*В. Кандраценка.* Скульптурная кампазіцыя «Людзі на балоце» ў Хойніках (2010)

Першы накід — апавяданне «Хлопец і дзяўчына», у цэнтры якога — узаемаадносіны паміж Ганнай, Васілём і Яўхімам. Прага помсты вядзе Яўхіма ў Куранёўку, бо трэба разлічыцца з Васілём, які нібыта вінаваты, што на Чортавым балоце разбіта Яўхімава банда. З Васілём у Яўхіма і асабістыя рахункі — з-за Ганны. Яўхім хоча забіць Васіля, але Ганна засланяе каханага і гіне. Сюжэт урыўка падказаў назву твора — «Звер сочыць з зарасніку».

Адначасова пісьменнік пачаў працу над раманам «Час спадзяванняў», галоўным героем якога быў Валодзя Дзятлікаў, учарашні выпускнік. І ў першым, і ў другім творы падаваліся толькі асобныя эпізоды з прыватнага жыцця герояў, слаба звязаныя з падзеямі эпохі. Аўтар вырашае звярнуцца да больш ранняга перыяду ў жыцці палескай вёскі і робіць некалькі накідаў будучага твора.

Адзін з першых накідаў рамана выглядаў так:
«Васіль (Цімох) — 1905 г.
Ганна — 1907 г.
Луг. Першае каханне.
Прыход бандытаў.
Сватанне.
Вяселле — 1925 г.
Жаніцьба Васіля (Цімоха) — 1926 г.
Сустрэча Ганны і Васіля — 1927 г.»



Правообладатель Национальный институт образования

Сямейна-побытавыя рамкі рамана абмяжоўвалі творчыя планы аўтара. Ён імкнуўся да кнігі, героем якой быў бы народ. Акрэсліўся канфлікт твора:

Супярэчнасць, барацьба паміж ранейшым укладам жыцця беларускай вёскі і новым, прынесеным 1917 годам

У грамадскім жыцці Куранёў (аб'ектыўны план)

Ва ўнутраным свеце герояў твора (суб'ектыўны план)

З'явілася новая назва — «Туманы над багнаю». Увага пісьменніка акцэнтавалася на ўслаўленні духоўнай велічы ўсяго народа, які ўсвядоміў сваю гістарычную сілу. Узніклі змены ў задуме. Выразна бачыўся цыкл твораў, прысвечаных жыццю палескай вёскі. Вымалёўвалася вялікае эпічнае палатно — «Палеская хроніка»: «Людзі на балоце» (1961), «Подых навальніцы» (1965), «Завеі, снежань...» (надрукавана ў 1976 годзе), «За асакою — бераг» (накіды), «Праўда вясны» (накіды).



Франтыспіс[1] кнігі Івана Мележа «Люди на болоте» (1987)

Раман «Людзі на балоце» аўтар пачаў як лірычны твор і называў яго лірычным раманам, а працяг трылогіі ствараў ужо як трагедыйныя раманы-даследаванні. У іх выявілася грамадзянская смеласць і ідэйна-мастацкая маштабнасць у асэнсаванні складаных абставін калектывізацыі на Палессі, жыцця Беларусі 1920—1930-х гадоў, праўдзівасць і шчырасць аўтара ў спалучэнні з яго высокай прафесійнай культурай, глыбокім і тонкім псіхалагізмам, разуменнем душы беларускага селяніна.

Раман Івана Мележа «Людзі на балоце» перакладзены болей як на 20 моў свету, у тым ліку на англійскую, фінскую, нямецкую, кітайскую, чэшскую, балгарскую, славацкую, мовы народаў савецкіх рэспублік.

[1] *Франтыспі́с* — малюнак перад першай старонкай кнігі на цотнай паласе.



Правообладатель Национальный институт образования

Пісьменнік неаднаразова станавіўся лаўрэатам літаратурных прэмій. За раман «Людзі на балоце» ў 1962 годзе Іван Мележ атрымаў Літаратурную прэмію імя Якуба Коласа.

! **З успамінаў.** Ствараючы раманы, Іван Мележ кіраваўся мантажна-кінематаграфічным прынцыпам. Янка Скрыган згадваў: «...Мележ можа пісаць, не пільнуючыся паслядоўнасці твора. Тыя мясціны, якія найбольш гатовы ў галаве, прадуманы, перажыты ўяўленнем — у канцы гэта або ў сярэдзіне кнігі, — а потым ужо кампанаваць іх, устаўляючы кожную на сваё месца».

**Нацыянальныя характары ў рамане.** Пісьменнік вельмі любіў сваіх «людзей на балоце» — палешукоў, што добра відаць у творы. Ён умеў разгледзець у палешуку ці паляшучцы персанажа такога ўзроўню, як Андрэй Балконскі або Іван Карамазаў; паказаць, што іх жыццёвыя страсці — радасць і гора, каханне і страты, мары і сумненні — усё гэта не менш складанае, чым страсці шэкспіраўскіх герояў. «Палессе — край незвычайна цяжкі для чалавечага жыцця і надзвычай багаты фарбамі, маляўнічы, — зазначаў аўтар у кнізе "Жыццёвыя клопаты". — Багатыя душой тут і людзі — ім уласціва і выключная мяккасць характару, і выключная працавітасць, а пры неабходнасці — і адвага. <...> Пачынаючы пісаць сваю хроніку, я абнадзейваў сябе тым, ...што яны, мае знаёмыя, варты таго, каб іх ведалі — ведалі і любілі».

! У паэме «Новая зямля», напісанай паводле гісторыі сям'і Міцкевічаў, Якуб Колас з доляй іроніі характарызуе сваіх герояў: «Мае знаёмыя няўзрачны, // Нічым не слаўны і не значны, // Ўсё людзі простыя, малыя, // Хоць па-свойму і ўдалыя, // Але ўдалымі іх не лічуць. // Жывуць, цярпліва долю смычуць...» Параўнайце гэты падыход з мележаўскай характарыстыкай яго персанажаў.

Мележаўская канцэпцыя жыцця і чалавека таксама выяўляецца ў філасофскіх і разам з тым простых словах: «Людзям тут трэба было жыць, і яны жылі». У творы беражліва захавана эстэтыка фальклору, паказана гісторыя не аднаго пакалення людзей, спрадвечны лад іх жыцця, які патрабуе да сябе сур'ёзных і паважных адносін. Перад намі арыгінальныя, дасканала выпісаныя характары з выразнай індывідуальнасцю: кожны «не галоўны» можа стаць «галоўным», «павесці за сабой» дзеянне, як толькі гэтага запатрабуе рух падзей або



Правообладатель Национальный институт образования

аўтарскай думкі. Для Івана Мележа, як і для Кузьмы Чорнага, «чалавек — гэта цэлы свет», у якім выяўляюцца глыбокія і складаныя перажыванні і ўчынкі. Дзякуючы майстэрству псіхалагічнага аналізу пісьменніка раскрываюцца глыбінныя таямніцы чалавечай свядомасці, унутраны свет палешукоў.

Вось вясковы кніжнік, «палітык», «хадзячая энцыклапедыя» — Андрэй Руды. І хоць звычка ўстаўляць недарэчы кніжныя словы, якія ён сам часта не разумее, выглядае камічна, у герої па-свойму ўвасобілася цяга селяніна да ведаў, да пазнання вялікага свету. Побач — Сарока, вострая на язык, так і сыпле прыказкамі і прымаўкамі. У яе памяці — векавыя пласты народнага вопыту, што дапамагае ёй знайсці сваё месца ў куранёўскай грамадзе. Здольны да жартаў і Зайчык, які заўсёды аптымістычна ўспрымае жыццё. Яго супрацьлегласцямі выглядаюць адкрытая душа Хоня, недаверлівы Нібыто-Ігнат, дзівакаваты Пракоп Лясун, які гаворыць з такім намаганнем, «нібы воз сена падымае»...

Пісьменнік вельмі глыбока адчуваў сваіх герояў. З першых старонак перад чытачом адкрываецца звычайнае, вякамі ўзважанае жыццё, са сваімі стара даўнімі клопатамі — пра зямлю, ураджай, хлеб. Ва ўкладзе жыцця палешукоў знайшлі адлюстраванне самыя старажытныя — язычніцкія — уяўленні чалавека пра навакольны свет, пра жыццё людзей і прыроды. Трываласць гістарычнай памяці прасочваецца нават у імёнах і мянушках мележаўскіх герояў: Корч, Сарока, Пракоп Лясун, Грыбок, Зайчык, Руды...

Праз сакавітыя замалёўкі побыту вяскоўцаў, праз іх адносіны да новага пісьменнік паказвае характары сваіх персанажаў, якім уласціва ўся гама чалавечых пачуццяў: яны кахаюць, ненавідзяць, радуюцца, адчайваюцца, спадзяюцца — адчуваюць і перажываюць па-свойму тонка. Здзіўляе багаццем і палескім каларытам гаворка куранёўцаў: «мамо», «цётко», «братко», «жыто», «ето», «дзераво»... У звароце да мясцовага слова і выразу няма нічога штучнага — яны ўспрымаюцца вельмі натуральна і дапамагаюць чытачу больш дакладна ўявіць герояў твора.

**!** **Навукоўцы гавораць.** «Гэта кніга не якогасьці прыватнага, хаця б і істотнага, значэння і месца ў літаратуры, не з тых, што прыкладаюцца да больш значных і дапаўняюць тым самым агульную карціну. Гэта кніга магістральнага месца і значэння — гэта да яе прыкладаюцца іншыя добрыя і нават выдатныя кнігі...» *(Ніл Гілевіч).*



Правообладатель Национальный институт образования

**Майстэрства раскрыцця ўнутранага свету Васіля Дзятла.** Вобраз Васіля поўны драматызму. Важная заслуга пісьменніка ў тым, што ён імкнуўся ўлічыць усе ўмовы і акалічнасці жыцця свайго героя. Мележаўскі Васіль нагадвае Міхала з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля», ён блізкі да Тамаша (раман Кузьмы Чорнага «Зямля»). Герой падобны і да Хведара Роўбы (аповесць Васіля Быкава «Аблава»), Дзяніса Зазыбы з раманаў Івана Чыгрынава, хаця напісаны гэтыя кнігі былі пазней. Ва ўсіх названых творах ёсць таксама яшчэ адзін вельмі важны герой — гэта сама зямля, якая адыгрывае значную ролю ў мастацкай канцэпцыі кожнага пісьменніка. Яна — аснова ўсяго. У гэтым можна пераканацца з першых старонак мележаўскага рамана. «Уся сіла чалавека — у зямлі, — разважае Васіль. — І сіла ўся, і радасць! Няма зямлі — няма, лічы, і чалавека». Ён не перастае думаць пра зямлю нават на спатканні з Ганнай, якую шчыра кахае.

Аўтару важна было вылучыць думку пра тое, што чалавек, у якога любоў да зямлі становіцца вышэй за каханне і даражэй за сябе самога, выходзіць на вельмі прынцыповыя і непахісныя асновы праўды.



Кадр з мастацкага фільма «Людзі на балоце» (1981, рэж. В. Тураў). У ролі Васіля Дзятла — Юрый Казючыц

Вось, думаецца, дзе вытокі маралі, блізкай і роднаснай Васілю. Аднак ён не паўтарыў нікога са сваіх «папярэднікаў» — у яго ўласны лёс, руплівасць, любоў да зямлі і працы, з якімі ён звязваў асабістае жыццёвае прызначэнне. Седзячы ў юравіцкай турме, Васіль пакутаваў не столькі ад гэтага свайго незайздроснага становішча, колькі ад бяздзеяння: «...думаў, балеў душою па дамоўцы, па недамалочаным жыце, па небараку Гузу...».

Аўтар вельмі патрабавальны да свайго героя, у якім спалучаюцца і шчыры працаўнік, і ўласнік. Гэтай супярэчнасцю адзначана і свядомасць «людзей на балоце», што, дарэчы, добра адчувае старшыня валвыканкама Апейка. Наведаўшы Васіля ў турме, Апейка ў размове з ім выказаў свой погляд на сялянства: «Для вас, для вашага шчасця стараюцца, гінуць людзі. А вы, вы — за сябе пастаяць не ўмееце!.. Ты — не бандыт, ты — крот, які капаецца ў сваёй нары. І толькі адну сваю шкуру беражэ. А там — хоць трава не расці! Хай другія прынясуць табе шчасце на талерачцы!..»



Правообладатель Национальный институт образования

Васіль хоча быць багатым, жыць у дастатку, і ў гэтым няма нічога дзіўнага. Але шлях, які ён выбірае, не вядзе да жаданай мэты, не прыносіць шчасця. Герой не можа вось так, адразу, беззваротна, аддаць «некаму» сваю зямлю, якая корміць яго сям'ю. Ён спыняецца перад нялёгкім выбарам: Ганніна каханне або ўласная гаспадарка, тое, што набыта — зямля каля цагельні, новая хата і ўся сялянская жыўнасць вакол яе. Што рабіць? Выбіраючы другое, ён вызначае свой лёс. Мележ разважаў: «Не кіне ён ніколі поле гэтае, якім не пацешыўся, хату, у якой не жыў яшчэ; не кіне — каб і хацеў! Не можа кінуць, як не можа сам сябе загубіць!» У гэтым рашэнні выявілася праўда жыцця і праўда мележаўскага мастацтва.

**Раскрыццё псіхалогіі заможных сялян.** Вобраз гаспадара ў рамане выяўляецца не толькі ў паказе Васіля Дзятліка, а таксама іншых «людзей на балоце»: Нібыто-Ігната, Дамецiка, Цімоха Чарнушкі. Разам з тым пісьменнік глыбока раскрывае сацыяльную прыроду вясковага багацея Халімона Глушака, тлумачыць яе з пазіцый не толькі грамадства, але і канкрэтнай асобы. Іван Мележ у рамане не спяшаецца адназначна асуджаць уласніцтва як з'яву, а абгрунтоўвае натуральнае жаданне і права чалавека мець нешта сваё, карыстацца плёнам сваёй штодзённай непасільнай працы. Заўсёды, усё жыццё, Халімон пры гаспадарцы: «Стары Корч рабіў усё разам з іншымі, і сам хвіліны не пастаяў, і другім стаяць не даў». Куранёцы ўспрымаюць яго як коршака, павука, гадзюку, старога ліса, усе думкі якога скіраваны на багацце, што асляпляе яго, пазбаўляе чалавечнасці. Але ў героі «з тхарыным» позіркам глыбока схаваных вачэй аўтар імкнуўся паказаць не толькі прагу да матэрыяльнага.



Кадр з мастацкага фільма «Людзі на балоце» (1981, рэж. В. Тураў). У ролі Халімона Глушака — Юрый Гарабец, у ролі Яўхіма Глушака — Барыс Няўзораў

Каб глыбей раскрыць вобраз Халімона Глушака, пісьменнік зрэдку пакідаў яго адзін на адзін з успамінамі, «як год за годам, можна сказаць, усё жыццё гнуўся, выжыльваўся дзеля сваёй зямлі». Глушак — няшчасны чалавек, бо «долю сваю, можна сказаць, знявечыў праз гэта: з-за пасагу ж пабраўся з няўдаліцай Лантуховай Кулінай. Гнілога Лантуха, бацьку яе, усцёг сабе на шыю, каб прылічыць да сваіх блішчастыя лантухоўскія залатоўкі».



Правообладатель Национальный институт образования

Пісьменнік бачыў у сваім героі чалавека, які шмат зведаў, перажыў, перадумаў: «дзеля тае зямелькі» стаў лепшым гаспадаром у Куранях, дамогся багацця — даволі шмат зямлі, сельскагаспадарчыя машыны, лішкі хлеба. У яго гумне пануе незвычайная чысціня. Робіць ён усё «не хапаючыся, паважна, нават урачыста». Але ці стаў ён шчаслівым? Пакутліва перажывае Халімон павевы новага часу. Таму і шукае герой паратунку ў працы.

Пры ўсёй супярэчлівасці характару Глушак не проста Корч, які трымаецца за зямлю ўсімі каранямі, а селянін-працаўнік, якому цяжка пазбавіцца сваіх прынцыпаў. Уся яго надзея на прадаўжэнне роду: «Бацькава насенне!» — з задавальненнем гаворыць ён пра сына Яўхіма. Але той больш «ахвочы да жыццёвых уцех», праца для яго не ў радасць. Ён гатовы паздзекавацца са слабейшага, прадэманстраваць перад усімі сваю перавагу. У партрэтах героя абсалютны лоск: блішчасты казырок, фарсістае галіфэ, прылізаны чуб, твар, як памазаны салам, масляністыя вочкі... Найбольш эстэтычна знішчальным з'яўляецца наступнае назіранне: «Яўхім ішоў першы, трымаючы гладкага, агністага колеру каня на кароткім повадзе, сам такі ж гладкі, дужы, як конь». Гэта параўнанне падкрэслівае недахоп чалавечнасці, духоўнасці ў героя, яго арыентацыю на сілавыя дзеянні, што даволі часта паказваецца на старонках твора.

У мележаўскіх чарнавых распрацоўках вобразаў ёсць запіс: «Васіль прывязаны да зямлі больш, чым Яўхім». І гэта слушна. Не можа Яўхім стаць сапраўдным гаспадаром, працягнуць бацькаву справу, бо не з ласкай, як Васіль, ставіцца да зямлі. Ён не марыў пра яе ўсё жыццё, не выпакутаваў яе, як Васіль, — атрымаў задарма. Таму і не мае зямля для Яўхіма ніякай каштоўнасці, а з'яўляецца выключна сродкам дабрабыту.

**Драматычны лёс Ганны.** Ганна Чарнушка ўвасабляе шматлікія маральна-духоўныя каштоўнасці. Сцвярджаючы іх дзейснасць, моц, хараство, Іван Мележ паэтызаваў вобраз Ганны. У пачатку рамана паказана, як глядзяць на яе куранёўцы: яна, нібы рабіна, цвіце красой дзявочай маладосці. Гэта паэтычная паралель — працяг хараства народнага жыцця, аблічча продкаў. Невыпадкова пісьменнік падкрэсліў, што Ганна вельмі падобная да маці.

Звяртаюць на сябе ўвагу яе «вільготна-цёмныя, падобныя на спелыя вішні», вочы, у якіх «увесь час блішчэла, ззяла няўціхнае хваляванне». Гэта партрэтная дэталь паўтараецца і вар'іруецца аўтарам вельмі часта: «...у іх таксама ж нешта таілася, у цудоўных



Правообладатель Национальный институт образования

вішнёва-чорных вачах», «стомленымі вішнёвымі вачыма паглядвала яна на гасцей». Эстэтычная важкасць дэталі ў тым, што вочы ставяцца ў адзін паэтычны рад з прыроднай праявай, якая выклікае самыя чыстыя і светлыя пачуцці. Рабіна, вішня, макаў цвет (так бачыць дачку бацька) і Ганна — адна эстэтычная лінія.


Сцэна са спектакля «Людзі на балоце». Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. У ролі Ганны — Валянціна Гарцуева

Аўтар (зноў жа вачыма куранёўцаў) прыкмячаў і змены ў характары гераіні: станаўленне натуры — моцнай, незалежнай, здольнай пастаяць за сябе. Малюючы Ганну, Іван Мележ карыстаўся псіхалагічна дакладнымі назіраннямі. Заўважаецца яе пачуццё ўласнай годнасці, вытрымка, імкненне ў маральна цяжкіх сітуацыях заставацца вернай сабе, не паказваць сваё гора на людзях. Ганна гатова ратаваць каханага ад бандыцкай расправы, бараніць яго на допыце. Але вось правялі па вуліцы арыштаванага Васіля, які нават не адгукнуўся на яе шчырыя словы... І яна, вяртаючыся ў свой двор, «ішла дахаты, з выгляду спакойная, паважная, ішла так, як і належала ёй ісці. Ні разу не азірнулася, нават не паглядзела, куды яго павялі».

Іван Мележ любуецца Ганнай-працаўніцай, якая завіхаецца па гаспадарцы, працуе на полі, дапамагае бацьку ў гумне. Усялякая справа ладзіцца ў яе руплівых руках. Дзяўчына не па ўзросце мудра ставіцца да спрадвечных жыццёвых каштоўнасцей: паважае бацькоў, слухаецца іх ва ўсім. Яна выходзіць замуж за Яўхіма, падпарадкоўваючыся жаданню родных, спадзеючыся на спрадвечнае «сцерпіцца — злюбіцца». Яе развагі-маналогі пра замужжа шчымлівыя і праўдзівыя, як само жыццё.

Далейшы лёс гераіні складаны і супярэчлівы: жыццё ў хаце Карчоў, страта любай дачушкі, спатканні з Васілём і надзея на вяртанне радасцей маладосці. Усё гэта патрабуе ад Ганны мужнасці, цярплівасці, самаахвярнасці.

**Чалавек і прырода ў творы.** Хроніка жыцця Куранёў пачынаецца так: «Хаты былі на востраве. Востраў гэты, праўда, не кожны прызнаў бы за востраў — аб яго не плёскаліся ні марскія, ні нават азёрныя хвалі. Навокал адно гніла куп'істая дрыгва ды моклі панурыя лясы».



Правообладатель Национальный институт образования



*С. Хохман.* Палеская вёска (1930-я)

Як бачым, палеская прырода далёкая ад ідыліі. Нягледзячы на гэта, куранёўцы любілі свой родны кут. Жыццё і праца тут былі цяжкія, але ў нейкіх сваіх гранях не пазбаўленыя і своеасаблівай паэзіі — прыгажосці лесу, поля, сенажаці.

У рамане шмат маляўніча выпісаных сцэн: перадсенакосная летняя раніца, жнівеньскі гарачы поўдзень, першыя зазімкі, зімовыя адвячоркі. Але, бадай, самая паэтычная карціна — «маладзенькая, з тонкім, як дубец, камлём рабіна», якая аднойчы неспадзявана «апранулася ў лёгкае празрыста-зялёнае плацце з кволых, рэзных лісточкаў». Сціплае і непрыкметнае дрэва раптам «заружавела, зазырчэла яркім, кідкім хараством, гарачым полымем агністых гронак. І не адны вочы, не абыякавыя, не ачарсцвелыя ў жыццёвых пакутах да хараства, глядзелі здзіўлена, зачаравана: «Глядзі ты!..» Пейзажныя замалёўкі выяўляюць душэўны стан герояў, з'яўляюцца адным са сродкаў раскрыцця іх унутранага свету, узмацняюць эмацыянальнае ўздзеянне на чытача.

У творы пераканаўча пацвярджаецца сувязь чалавека з прыродай, што не толькі ўзбагачае светаўспрыманне герояў, але і дапамагае ім усвядоміць сваю залежнасць ад навакольнай рэчаіснасці, набыць гармонію, неабходную для ўласнай душы і адносін да жыццёвых праяў.

**Традыцыі празаічнага эпасу. Наватарства. Мастацкі стыль пісьменніка.** Стыль кожнага творцы ў нейкай ступені вызначаецца яго папярэднікамі. Вялікую ролю ў выпрацоўцы мастацкага стылю Івана Мележа адыграла яго творчая вучоба на лепшых узорах мастацкага слова. Раннія творы пісьменніка ўжо вызначаліся вернасцю жыццёвай праўдзе, глыбокім псіхалагічным аналізам чалавечых учынкаў, вастрынёй сацыяльнага і духоўнага бачання рэчаіснасці. З самага пачатку для тэкстаў Івана Паўлавіча былі характэрныя эпічная паўната і цэласнасць узнаўлення характараў і абставін. Гэта сведчыла, што ў літаратуру прыйшоў арыгінальны мастак, які глыбока разумее і любіць чалавека, здольны ярка паказаць яго ўнутраны свет. З часам

> ***Стыль пісьменніка*** (ад грэч. *stylos* — 'палачка для пісьма') — ідэйна-мастацкая своеасаблівасць творчасці. З'яўляючыся канкрэтным увасабленнем адзінства зместу і формы, рэалізуецца ў тым, пра што і як піша аўтар.



Правообладатель Национальный институт образования

пашыраліся жанравыя рамкі твораў, а зварот да паказу жыцця любага Палесся надаў стылю аўтара рамана «Людзі на балоце» яшчэ большы лірызм. Асэнсаванне падзей прымусовай калектывізацыі напоўніла твор праўдзівым драматызмам.

**Літаратурныя сувязі.** Літаратурнымі настаўнікамі Івана Мележа былі Якуб Колас, Кузьма Чорны, Цішка Гартны, Леў Талстой, Міхаіл Шолахаў. Якуб Колас вабіў каларытнасцю мовы, уменнем раскрыць унутраны свет герояў, самабытнасцю апісання прыроды, побыту. Кузьма Чорны — майстэрствам псіхалагічнага аналізу. Цішка Гартны — здольнасцю паказаць чалавечы характар у працы.

Паўната, шматграннасць увасаблення тагачаснай рэчаіснасці ў яе сувязі з мінулым і будучым — вось што было мэтай Івана Мележа. Маштабнасць мыслення, веданне карэнных каштоўнасцей народнага жыцця складае стылёвую адметнасць яго твораў. На думку крытыка Серафіма Андраюка, «жыццё ў хроніцы ўспрымаецца як бы роўнае, тоеснае самому сабе, гэта значыць, жыццю рэальнаму».

**Навукоўцы гавораць.** «Іван Мележ — пісьменнік, які выпрацаваў свой уласны стыль, адметную манеру весці апавяданне. Яго фраза — ёмістая, ёй уласціва імкненне ахапіць матэрыяльнае, рэчыўнае багацце навакольнага свету, даць яго пластычны вобраз. Але ў той жа час гэтая фраза і музычная, яна вызначаецца багаццем інтанацый, адценняў, у ёй пераплятаюцца ўсе гамы эмацыянальнага спектра: гумар — з лірыкай, спакойная апавядальнасць — з патэтыкай» *(Іван Навуменка)*.

Іван Мележ здолеў убачыць тое, чаго да яго не бачыў ніхто. Ён добра разумеў і перадаў паляшуцкую свядомасць, псіхалогію сваіх герояў. А ўвядзенне ў канву «Палескай хронікі» этнаграфічнага матэрыялу дало магчымасць мастаку дасканала ўзнавіць рэчаіснасць палескай вёскі 1920-х гадоў, адзначыць агульнае і акрэсліць тыя рысы характару, што робяць палешукоў адметнымі. Плённым аказаўся таксама зварот да фальклору, які выступае ў творы як адна са сфер жыцця народа.

***Традыцыя*** (ад лац. *traditio* — ‘перадача’) — перадача мастацкага вопыту з пакалення ў пакаленне, яго творчае праламленне ў гісторыі літаратуры.

Ідучы па ўжо традыцыйным шляху, Іван Мележ па-свойму імкнуўся не толькі паказаць драматызм таго, што адбывалася ў пераломны перыяд гісторыі народа, але і дайсці «да каранёў». Больш пільную ўвагу праявіў Іван Мележ да



Правообладатель Национальный институт образования

***Наватарства*** — развіццё пісьменнікам лепшых уласцівасцей творчай спадчыны, адкрыццё новых шляхоў у літаратуры, вынаходніцтва новых падыходаў, прыёмаў, сродкаў у вершатворчасці, якія замацуюцца і створаць новыя традыцыі.

ўнутранага свету селяніна-працаўніка, да сацыяльна-этычнай сутнасці чалавечых узаемаадносін. Напоўніўшы спрадвечную вясковую тэматыку палескім матэрыялам, Іван Мележ здолеў выказаць сваё слова пра чалавека на зямлі. Ён з сучасных яму пазіцый расказаў пра падзеі 1920-х гадоў, да асэнсавання якіх ужо звярталася літаратура. Наватарства мастака выявілася ў тым, што ён засяродзіўся на драматызме для сялянства паспешлівай і гвалтоўнай калектывізацыі.

З першых старонак твора Іван Мележ паказаў сябе не вучнем, а мастаком-сапернікам, які не баіцца будаваць «сваю грэблю». Гэта ўпэўненасць тлумачыцца не толькі глыбокім веданнем жыццёвага матэрыялу, але і пэўным адчуваннем часу. Аўтар гаварыў пра «Палескую хроніку» як пра «кнігу ў поўным сэнсе народную, кнігу, якая праслаўляла б народ, яго подзвіг, была б прасякнута вялікай павагай да яго і клопатам пра яго».

У Івана Мележа арганічна спалучаюцца жанр і хронікі, і раманаэпапеі. Мы бачым не толькі падзеі гістарычнага значэння, адлюстраваныя ў храналагічнай паслядоўнасці (хроніка), але і лёс галоўных герояў у цеснай сувязі з лёсам усіх беларусаў, шматграннасць дачыненняў чалавека да жыцця (раман-эпапея, эпічны раман).

Заслуга пісьменніка не толькі ў тым, што, паказваючы той суровы час, ён імкнуўся захаваць у творы непаўторны каларыт эпохі, але і ў тым — і гэта галоўнае, — што яго гістарызм спалучае праўдзівы паказ жыцця з усімі яго складанасцямі. Лёс герояў «Палескай хронікі» арганічна і непасрэдна звязваецца з рухам гісторыі, які пачынае ўздзейнічаць на ўсю мастацкую плынь твора, часта патрабуючы ад герояў глыбокага роздуму, прыняцця надзвычай адказных рашэнняў і здзяйснення адпаведных учынкаў.

«Палеская хроніка» прасякнута павагай да духоўных каштоўнасцей народа, яго працоўнай маралі, патрыятызму: не толькі асоба для гісторыі, але і гісторыя для асобы! Але, зразумела, і чалавек павінен адчуваць адказнасць перад часам і грамадствам — гэта таксама адна з важных думак пісьменніка.

«Палеская хроніка» застаецца ў найвышэйшай ступені актуальнай і сучаснай, бо пытанне аб прызначэнні чалавека і яго прыроды і сёння знаходзіцца на пярэднім плане. Іван Мележ прыходзіць да надзвы-



Правообладатель Национальный институт образования

чай важных ідэйных высноў аб жыцці ў грамадстве па гуманістычных законах.

**Навукоўцы гавораць.** «Мы звыкліся з думкаю, што пісьменнік “адлюстроўвае” свет. Але нагадаю яшчэ раз, што Вялікі пісьменнік не адлюстроўвае, а пераадольвае і перастварае рэчаіснасць» *(Пятро Васючэнка)*.

1. Разгледзьце кампазіцыю Валерыя Кандрацэнкі «Людзі на балоце». Ці адпавядае яна тэме мастацкага твора? Як бы вы перадалі гэту тэму ў скульптуры?
2. Як раскрываецца характар Васіля праз апісанне яго знешнасці, думак, перажыванняў? Якім паўстае Васіль у адносінах да маці, дзеда, брата, Ганны?
3. Разгледзьце франтыспіс выдання рамана 1987 года. Які момант адлюстраваны на малюнку? Чаму, на вашу думку, ілюстратар выбраў менавіта гэту сцэну? Як змяніўся статус героя пасля сцэны касьбы?
4. Чаму паміж Васілём і Яўхімам узнікла спрэчка за зямлю? Якія матывы для яе былі ў кожнага героя? Ці згодны вы з думкай Віктара Каваленкі, што Васіль — гэта ў будучым той самы Глушак?
5. Ці сапраўднае было каханне Васіля да Ганны? Іх расстанне — выпадковасць або заканамернасць? Выкажыце ўласнае меркаванне.
6. У чым выяўляецца жыццёвае крэда Глушака? Чаму ў тэксце даецца партрэт героя на фоне самага вялікага ў Куранях гумна? Як раскрываецца Халімон у працы?
7. Складзіце пералік эпітэтаў, якімі вы маглі б ахарактарызаваць старога Глушака. Узгадайце сітуацыі, у якіх выяўляецца яго характар. Арганізуйце дыскусію «Халімон Глушак — станоўчы або адмоўны персанаж?».
8. Паразважайце, што збліжае і што адрознівае бацьку і сыноў — Яўхіма і Сцяпана. Чаму стары Глушак называе «бацькавым насеннем» толькі Яўхіма?
9. Чаму аўтар паказвае Ганну праз успрыманне розных людзей? Якой бачаць яе бацька, Васіль, Яўхім, сам аўтар? Якую партрэтную дэталь і чаму настойліва паўтарае Іван Мележ у апісанні гераіні?
10. Чым адрозніваюцца паводзіны, думкі і перажыванні Ганны ад паводзін Васіля ў сцэне з бандытамі?
11. Не захацела ці не змагла Ганна зрабіць інакш, калі пайшла замуж за Яўхіма? Чаму? Якой асобай — моцнай ці слабай — можна лічыць гэту гераіню?



Правообладатель Национальный институт образования

12. Як вы думаеце: Ганна пераможца або ахвяра абставін? Абгрунтуйце сваю пазіцыю.

13. Разгледзьце кадры з мастацкага фільма «Людзі на балоце» (1981, рэжысёр Віктар Тураў, «Беларусьфільм») і сцэну са спектакля Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Ці супадае ўяўленне пра герояў у аўтара аповесці і рэжысёраў? Паразважайце, чаму немагчыма замяніць чытанне кнігі праглядам фільма або спектакля. Як вы лічыце, ці будзе мець поспех у сучаснага гледача новая экранізацыя твора Івана Мележа або серыял па яго матывах? Аргументуйце адказ.

14. Выканайце заданне «Хвіліна маўлення» па творчасці Івана Мележа.

15. Знайдзіце ў творы апісанні прыроды ў розныя поры года. Як выяўляюць пейзажныя карціны душэўны стан персанажаў і рух іх пачуццяў? Каго з герояў не цікавіць прырода? Як гэта іх характарызуе?

16. Разгледзьце фотаздымак палескай вёскі, зроблены ў тыя ж гады, калі развіваецца дзеянне ў «Палескай хроніцы». Як прырода паўплывала на штодзённыя заняткі палешукоў? Наколькі праўдзіва апісвае аўтар клопаты куранёўцаў?

17. Якая трагедыя закранула прыроду беларускага Палесся ў 1986 годзе? Чаму звесткі пра побыт і культуру гэтага рэгіёна, захаваныя ў раманах Мележа, сталі надзвычай каштоўнымі?

18. Стварыце макет старонкі Васіля Дзятла (або іншых герояў), якой яна магла б быць у сацыяльных сетках, прадумайце посты, рэпосты, склад сяброў (падпісчыкаў), ілюстрацыйную частку. Вызначцеся, якая платформа найлепш падыдзе для вашай мэты («УКантакце», Facebook, Instagram, Pinterest, TikTok-канал і інш.).

19. Пазнаёмцеся з вершам Пімена Панчанкі «Зямля бацькоў» («А на Палессі ўсё нядробна…»). Якія радкі з гэтага верша маглі б стаць тэмай вечарыны, прысвечанай творчасці Івана Мележа? Якія — эпіграфам да сачынення па рамане «Людзі на балоце»?

20. Напішыце сачыненне-разважанне «Не жыццё гэта, калі не любіш, калі ў душы нянавісць адна…» (Вобраз Ганны), «Вобразы-сімвалы ў “Палескай хроніцы” Івана Мележа і рамане “Пошукі будучыні” Кузьмы Чорнага», «Трагедыя “вялікага пералому” ў адлюстраванні Івана Мележа і Міхася Зарэцкага» або на вольную тэму (на выбар).

Раман «Подых навальніцы»

21. Вывучыце на памяць урывак з рамана Івана Мележа «Людзі на балоце» (са слоў «Як тая рабіна, цвіла ў гэтае лета Ганна...», заканчваючы словамі «...так і відаць — маладосць, сіла ў кожнай жылачцы!»).



Правообладатель Национальный институт образования

## Пытанні і заданні для паўтарэння і падагульнення

1. У якіх жанрах распрацоўвалася тэма Вялікай Айчыннай вайны ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе?
2. Як змяніліся падыходы да адлюстравання ваеннай тэмы ў другое пасляваеннае дзесяцігоддзе?
3. Якія гістарычныя падзеі і якім чынам паўплывалі на развіццё літаратуры сярэдзіны 1940-х — 1960-х гадоў?
4. Выберыце найбольш яркіх, на ваш погляд, пісьменнікаў першых пасляваенных дзесяцігоддзяў. У чым заключаецца адметнасць іх творчасці? Абгрунтуйце свой выбар.
5. Якія рысы выяўляюцца ў лірыцы Пімена Панчанкі?
6. У чым заключаецца ўклад Пімена Панчанкі ў беларускую літаратуру?
7. Якія праблемы, актуальныя для сучаснасці, уздымаюцца ў паэзіі Пімена Панчанкі?
8. Растлумачце паняцці «лірычны герой», «лірычнае “я”», «аўтар». Як яны суадносяцца адно з адным?
9. Стварыце ў групах міні-праект па адной з наступных тэм (на выбар): «Маральныя нормы ў сялянскім асяроддзі і іх уплыў на жыццёвыя прынцыпы людзей (на прыкладзе твораў Івана Мележа, Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага)»; «Героі-палешукі і іх побыт у рамане “Людзі на балоце” Івана Мележа і ў аповесці Якуба Коласа “У палескай глушы”»; «Праблема зямлі ў “Людзях на балоце” Івана Мележа і ў паэме “Новая зямля” Якуба Коласа»; «Духоўная веліч чалавека працы ў рамане “Людзі на балоце” Івана Мележа і ў творах Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага»; «Будні і святы ў рамане “Людзі на балоце” Івана Мележа і ў паэме “Новая зямля” Якуба Коласа».
10. Складзіце збіральны вобраз беларуса паводле творчасці Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Івана Мележа. Вызначце асноўныя рысы яго характару.
11. Калі б вы былі заснавальнікамі чытацкай прэміі ў галіне літаратуры, якія творы, вывучаныя ў X класе, трапілі б у тройку намінантаў і чаму?
12. Мінскі завод гадзіннікаў у 2020 годзе выпусціў серыю вырабаў з цытатамі вершаў Максіма Багдановіча. Прапануйце падобны праект з цытатамі твораў пасляваеннай беларускай літаратуры.
13. Складзіце крыжаванку па пройдзеным матэрыяле. Абмяняйцеся з аднакласнікамі створанымі крыжаванкамі і разгадайце іх.

Паўтарэнне і падагульненне вывучанага



Правообладатель Национальный институт образования

# Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў

**Абразо́к** — замалёўка са слаба разгорнутым сюжэтам або бессюжэтная, у якой узмоцнены вобразна-экспрэсіўны пачатак, паяднаны змест выказвання і настраёвасць.

**Авангарды́зм** — агульная назва наватарскіх стыляў і плыняў мяжы XIX—XX стагоддзяў, якія адмаўлялі традыцыйныя падыходы ў мастацтве.

**Акцэ́нтны верш** — від рыфмаванага танічнага верша, заснаваны на роўнай колькасці націскаў (акцэнтаў) у радку.

**Александры́йскі верш** — верш з радкамі, папарна аб'яднанымі мужчынскімі і жаночымі рыфмамі, напісаны шасцістопным ямбам з цэзурай (паўзай) пасля трэцяй стапы.

**Алітара́цыя** — паўтарэнне аднолькавых зычных гукаў у вершаваным творы.

**Асана́нс** — паўтарэнне аднолькавых галосных гукаў у вершаваным творы.

**Аўтало́гія** — выкарыстанне ў мастацкім творы слоў у іх прамым лексічным значэнні.

**Аўтабіяграфі́зм** і **дакументалі́зм** — выяўленне ў мастацкіх творах фактаў з асабістага жыцця пісьменніка (аўтабіяграфізм) або згадванне ў творах рэальных падзей з жыцця людзей ці гісторыі пэўнай краіны, выкарыстанне рэальных фактаў, а таксама дакументаў (дакументалізм).

**А́ўтар** — рэальная асоба, якая стварыла мастацкі тэкст.

**Бала́да** — драматычна напружаны, сюжэтны ліра-эпічны верш казачна-фантастычнага, легендарна-гістарычнага або гераічнага зместу.

**Баро́ка** — мастацкі стыль і эстэтычны напрамак, для якога характэрна не пераймание рэчаіснасці, а ўзнаўленне новай рэчаіснасці ў больш мудрагелістай, ускладненай мастацкай форме.

**Белетры́стыка** — мастацкая проза; непаэтычныя творы вытанчанай славеснасці (раманы, аповесці, нарысы і інш.).

**Бурле́ск** — разнавіднасць паэзіі класіцызму, калі «высокія» рэчы апяваюцца наўмысна «нізкім» стылем і наадварот.

**Былі́ца** — разнавіднасць вершаванага апавядання, у аснову якога пакладзены аповед пра цікавы жыццёвы выпадак.

**Верлі́бр**, або **свабо́дны верш**, — верш, у якім адсутнічаюць рыфма і чаргаванне націскных і ненаціскных складоў.

**Во́льны верш** — від рыфмаванага сілаба-танічнага верша з няроўнай колькасцю стоп у радку.



Правообладатель Национальный институт образования

**Вытво́рчы рама́н** — літаратурны твор, у цэнтры якога знаходзіцца прафесіянал, што рашае вытворчыя задачы.

**Гаварко́е про́звішча** — мастацкі прыём, пры якім прозвішча персанажа перадае галоўную рысу яго характару, маральныя якасці або асаблівасці знешнасці.

**Гіпе́рбала** — троп, якім абазначаецца рэзкае перабольшанне якіх-небудзь уласцівасцей чалавека, прадмета або з'явы з мэтай звярнуць увагу на гэтыя ўласцівасці і выявіць стаўленне пісьменніка да іх.

**Гу́тарка** — вершаваны маналог або дыялог, у якім у форме няспешнай гаворкі раскрываюцца вострыя сацыяльна-палітычныя і маральныя праблемы.

**Дра́ма** — п'еса з вострым канфліктам сацыяльнага або пабытавага характару, які развіваецца ў пастаянным напружанні, адрозніваецца ад трагедыі тым, што ў драме героі маральна перамагаюць абставіны.

**Жыціе́** — жанр сярэдневяковай літаратуры, у якім распавядаецца пра ўзорнае жыццё людзей, кананізаваных царквой.

**Змест** і **фо́рма** — паняцці, якія паказваюць, ***што*** (змест) і ***як*** (форма) выяўляецца ў літаратурным творы.

**Імажыні́зм** — паэтычная школа, для якой маляванне словам, чыстая вобразнасць значаць больш за тэматыку твораў, дзе аўтары пазбягаюць неабавязковых слоў, цэняць нечаканыя і запамінальныя слоўныя малюнкі.

**Імпрэ́сія** — невялікі празаічны або вершаваны твор, у якім карціна жыцця адлюстроўваецца як момант, выхаплены з гісторыі, які суправаджаецца выражэннем эмоцый, пачуццяў і імгненных уражанняў аўтара.

**Імпрэсіяні́зм** — літаратурная плынь, у якой дамінуюць суб'ектыўныя ўражанні аўтара і якая вызначаецца фрагментарнасцю і расплывістасцю адлюстравання, увагай да дэталей, адценняў.

**Інтэрме́дыя** — невялікая камічная сцэнка бытавога або сацыяльнага зместу, што разыгрываецца паміж актамі асноўнай п'есы.

**Калігра́ма** — верш, радкі якога ўтвараюць сабой малюнак.

**Камедыягра́фія** — сукупнасць камедый пэўнага аўтара, перыяду, літаратуры, эпохі.

**Кано́н** — узор, стандарт; твор мастацтва, які лічыцца афіцыйным, прызнаным.

**Канфлі́кт** — супрацьстаянне, сутыкненне супрацьлеглых поглядаў дзейных асоб у літаратурным творы.

**Катэхі́зіс** — форма падачы матэрыялу ў пытаннях і адказах.

**Класіцы́зм** — напрамак у літаратуры, адна з важных рыс якога — зварот да вобразаў і форм антычнага мастацтва; мае строгую іерархію жанраў: «высокія» і «нізкія». Арыентуецца на прыгожае, узнёслае, гераічнае і тыпізуе яго, не падкрэслівае індывідуальнае, непаўторна-асаблівае. Тэорыя класіцызму патрабавала вядомага з антычнай драмы правіла трох адзінстваў: часу, месца і дзеяння.

**Ле́тапіс** — гісторыка-літаратурны твор з апісаннем падзей па гадах.

**Лiры́чнае «я»** — мастацкі вобраз, што выяўляецца ў асобных вершах аўтара і выражае пэўны светапогляд, які не абавязкова падзяляе сам аўтар і які можа



Правообладатель Национальный институт образования

не адносіцца да канкрэтнай асобы, у тым ліку аўтарскай. Пры паўтарэнні ў цыкле вершаў або ўсёй творчасці паэта можа аформіцца ў лірычнага героя.

**Лiры́чны геро́й** — мастацкі вобраз, ад імя якога вядзецца гаворка ў вершы (вобраз аўтара, але не сам аўтар), асноўная дзейная асоба паэтычнага твора, чые рысы характару, светапогляд і біяграфічныя факты паўтараюцца ў тэкстах пэўнага цыкла, кнігі або творчасці паэта ў цэлым.

**Літарату́рны напра́мак** — творчае адзінства груп літаратараў пэўнага гістарычнага перыяду, блізкіх па светапоглядзе і мастацкай манеры.

**Літарату́рны працэ́с** — гістарычнае развіццё літаратуры, якое абумоўлена масавым узаемадзеяннем і ўзаемаўплывам асоб, твораў, крытыкі, грамадска-палітычных абставін, літаратурнага канона і эстэтычных ідэалаў часу.

**Мадэрні́зм** — агульная назва літаратурных плыняў, якія вызначаліся засяроджанасцю на ўнутраным свеце чалавека, адасобленасцю ад сацыяльна-гістарычных пераўтварэнняў, элітарнасцю, незвычайнасцю мастацкай формы.

**Маста́цкая дэта́ль** — выяўленчая і выразная падрабязнасць, рыса або элемент прадмета, партрэта, інтэр’ера, пейзажу і іншага літаратурнага твора, якая нясе значную ідэйна-эмацыянальную і сэнсавую нагрузку.

**Маста́цкі троп** — слова або выраз, ужытыя ў пераносным значэнні, калі адна з’ява характарызуецца праз рысы, якасці, уласцівасці іншай з’явы.

**Метані́мія** — від тропа, у якім назва адной з’явы (прадмета) замяняецца на другую паводле іх унутранай або знешняй сувязі і незалежна ад іх падабенства.

**Мета́фара** — ужыванне слова або выразу ў пераносным значэнні, калі на аснове падабенства адна з’ява або прадмет супастаўляецца з другой з’явай або прадметам.

**Нава́тарства** — развіццё пісьменнікам лепшых уласцівасцей творчай спадчыны, адкрыццё новых шляхоў у літаратуры, вынаходніцтва новых падыходаў, прыёмаў, сродкаў у вершатворчасці, якія замацуюцца і створаць новыя традыцыі.

**Наве́ла** — апавядальны жанр, які характарызуецца напружаным, драматычным дзеяннем, лаканічным паказам не столькі знешніх падзей, колькі перажыванняў і настрою персанажаў, нечаканым фіналам.

**Неарамантьі́зм** — «новы рамантызм», эстэтычная плынь, што ўзнікла ў Еўропе на мяжы XIX і XX стагоддзяў, развівала эстэтыку рамантызму.

**Памфле́т** — надзённы мастацка-публіцыстычны сатырычны твор, у якім выкрываюцца хібы грамадскага жыцця (палітычныя, культурныя, сацыяльныя) або заганы пэўных асоб.

**Партрэ́т** — апісанне знешняга выгляду, адзення, рухаў, позы літаратурнага персанажа. Асаблівасці партрэтнага апісання залежаць ад стылю пісьменніка.

**Пасляслó́ўе** — змешчаны пасля твора дадатак, прысвечаны ўдакладненню, абмеркаванню, каментаванню асноўнага тэксту, які ўжо вядомы чытачу.

**Па́фас** — эмацыянальны змест мастацкага твора, пачуцці і эмоцыі, якія аўтар укладвае ў тэкст, чакаючы суперажывання чытача. У залежнасці ад па-



Правообладатель Национальный институт образования

чуццяў, якія перажывае чытач, пафас бывае сентыментальны, гераічны, рамантычны, трагічны, сатырычны і інш.

**Постмадэрні́зм** — плынь у еўрапейскай і паўночнаамерыканскай культуры другой паловы XX — пачатку XXI стагоддзя. У адрозненне ад мадэрнізму з яго ўстаноўкай на навізну постмадэрнізм звяртаецца да культурнай спадчыны мінулага як аб’екта гульнявога асваення, іранічнага цытавання і сітуацыйнага пераасэнсавання, крыніцы стылізацыі і камбінавання яе форм.

**Прадмо́ва** — уступнае слова да кнігі, у якім выдавец, рэдактар або аўтар паведамляе чытачу звесткі, неабходныя для лепшага разумення прапанаванага тэксту.

**Прало́г** — уступ у мастацкім творы, які знаёміць чытача (гледача) з падзеямі, што папярэднічалі асноўнаму дзеянню.

**Прататы́п** — асоба, якая рэальна існавала і паслужыла аўтару правобразам (мадэллю) для стварэння літаратурнага персанажа.

**Про́паведзь** — жанр аратарскай прозы, які мае рэлігійна-дыдактычны (павучальны) характар і прызначаны для прамаўлення падчас набажэнства.

**Пры́мхі** — ірацыянальныя кампаненты грамадскай і індывідуальнай свядомасці, якія датычаць незвычайнага, цудадзейнага і страшнага.

**Пры́тча** (прыпавесць) — невялікі алегарычны аповед павучальнага характару, які, у адрозненне ад байкі, не мае традыцыйных умоўных персанажаў.

**Псіхалагі́зм** — мастацка-вобразнае адлюстраванне і выяўленне ў мастацкім творы ўнутранага жыцця асобы, што абумоўлена каштоўнасцямі аўтара, яго ўяўленнямі аб асобе і задумай, канцэпцыяй твора.

**Рама́н** — эпічны празаічны (часам — вершаваны) твор, у якім шырока ахоплены істотныя жыццёвыя з’явы пэўнага сацыяльнага асяроддзя, нацыі і эпохі, паказаны шматлікія характары ў іх развіцці, псіхалагічнай напоўненасці, створаны разнастайныя бытавыя малюнкі.

**Раманты́зм** — мастацкі напрамак, які сфарміраваўся на мяжы XVIII—XIX стагоддзяў у краінах Заходняй Еўропы. Цэнтр мастацкай сістэмы рамантызму — асоба, галоўны канфлікт — паміж асобай і грамадствам.

**Раманты́чны геро́й** — вядучы мастацкі вобраз літаратуры рамантызму; выключная асоба ў выключных абставінах, герой, якога не разумее грамадства і які супрацьстаіць недасканаламу свету, пераўтвараючы рэчаіснасць паводле сваіх ідэалаў.

**Рэалі́зм** — літаратурны метад і напрамак, які з’явіўся пасля рамантызму і заключаўся ў праўдзівым адлюстраванні рэчаіснасці; у адрозненне ад рамантызму, скіраванага на выключнае, у рэалізме важна тыповае.

**Рэ́квіем** — твор, у якім паэтычна апяваюцца чалавечыя ахвяры, страты і адначасова раскрываюцца магутнасць і хараство жыццёвых сіл, здольных супрацьстаяць злу; у ім спалучаюцца лірычна-прачула-журботны (або трагічна-балючы) і ўзвышана-суровы, стрымана-ўрачысты, часам прамоўніцка-публіцыстычны пачаткі.



Правообладатель Национальный институт образования

**Рэнеса́нс** — эпоха ў гісторыі культуры Еўропы, якая прыйшла на змену Сярэдневякоўю і папярэднічала Асветніцтву і Новаму часу.

**Сатыры́чная каме́дыя** — разнавіднасць камедыі, у якой выкарыстаны сатырычныя сродкі выкрыцця грамадскіх заган (іронія, пародыя, сарказм, гіпербала, гратэск).

**Сацыялісты́чны рэалі́зм** — літаратурны напрамак, тып мастацкага мыслення, выкліканы да жыцця гістарычнымі падзеямі XX стагоддзя. Ідэалагічным фундаментам гэтага напрамку стаў марксізм.

**Сентыменталі́зм** — літаратурны напрамак, у якім пачуццё прызнаецца сутнасцю чалавечай прыроды.

**Сімвалі́зм** — літаратурная плынь, якая вызначаецца зваротам да філасофскіх таямніц, выкарыстаннем сімволікі, недасказанасці, намёкаў, загадкавых вобразаў. Сімвал — знак, што злучае рэальны і ірэальны свет.

**Сіне́кдаха** — разнавіднасць метаніміі, у якой назвы паняццяў, з'яў, прадметаў замяняюцца іншымі на падставе іх колькасных суадносін (напрыклад, частка ў значэнні цэлага і наадварот, адзіночны лік у значэнні множнага і наадварот).

**Сло́ва** — жанр красамоўства ў даўняй літаратуры, твор павучальнага зместу.

**Стыль пісьме́нніка** — ідэйна-мастацкая своеасаблівасць творчасці. З'яўляючыся канкрэтным увасабленнем адзінства зместу і формы, рэалізуецца ў тым, пра што і як піша аўтар.

**Схала́стыка** — сярэдневяковая філасофія, у якой дзеля тэарэтычнага абгрунтавання рэлігійных дагматаў выкарыстоўваюцца фармальныя, абстрактныя лагічныя аргументы.

**Сяля́нка** — даўні паэтычны жанр, у якім апяваюцца праца і побыт вяскоўца, каханне на ўлонні прыроды, вяртанне ў залаты век беззаганнага існавання.

**Тані́чнае вершаскладა́нне** — сістэма вершаскладання, у аснове якой — аднолькавая колькасць моцных, або апорных, націскаў у вершаваных радках. Колькасць жа ненаціскных складоў паміж націскнымі можа быць рознай.

**Тво́рчая гісто́рыя маста́цкага тэ́ксту** — аднаўленне працэсу напісання твора з тым, каб удакладніць сацыяльна-псіхалагічныя і біяграфічныя перадумовы творчай працы, зразумець канкрэтна-гістарычны сэнс твора ў яго завершанай форме.

**Траге́дыя** — п'еса, заснаваная на непрымірымым канфлікце паміж моцнай высакароднай асобай і абставінамі, якія не даюць ёй магчымасці рэалізавацца. Гэты кафлікт мае глыбокі філасофскі змест, актуальны характар у палітычных, сацыяльных або духоўных адносінах.

**Трады́цыя** — перадача мастацкага вопыту з пакалення ў пакаленне, яго творчае праламленне ў гісторыі літаратуры.

**Тэо́рыя бесканфлі́ктнасці** — тэрмін у літаратурнай крытыцы, які абазначаў адмаўленне ў творчасці ад традыцыйнага канфлікту «добрага з дрэнным» і сцвярджэнне правамернасці канфлікту «добрага з лепшым». Творы, напісаныя



Правообладатель Национальный институт образования

ў рэчышчы гэтай тэорыі, паказвалі савецкую рэчаіснасць у прыхарошаным выглядзе, у іх дзейнічалі толькі станоўчыя персанажы.

**Увасабле́нне**, або **персаніфіка́цыя**, — разнавіднасць метафары, у якой рэчам, прадметам і з'явам прыроды надаюцца чалавечыя ўласцівасці.

**Фельето́н** — жанр мастацкай публіцыстыкі, які мае пераважна сатырычную накіраванасць і спалучае надзённасць і насычаную вобразнасць, дакументальную дакладнасць і высокі эмацыянальны накал.

**Футуры́зм** — мастацкі рух 1920-х гадоў, які сцвярджаў мастацтва будучыні праз адмаўленне традыцыйнай культуры. У творах апяваліся гарадская эстэтыка і індустрыялізацыя.

**Хаджэ́нні** — апісанні падарожжаў да святых мясцін, на Блізкі Усход.

**Экспрэсіяні́зм** — адна з плыняў авангардызму, якая вызначаецца трагічным светапоглядам, напружанасцю пачуццяў, шматзначнасцю матываў, сімвалаў і перавагай плана выражэння ўнутранага зместу над планам знешняга адлюстравання.

**Эпі́тэт** — слова альбо выраз у функцыі азначэння, якія надаюць слову-назоўніку дадатковую выразнасць, экспрэсіўнасць.

**Эўфемі́зм** — троп, што замяняе іншым словам, спалучэннем такое выслоўе, якое выглядае няёмка, груба або непрыстойна.

Спіс твораў для дадатковага чытання.

Адказы на заданні.

Правообладатель Национальный институт образования

# Спіс выкарыстаных крыніц


*Адамовіч, А.* Маштабнасць прозы : урокі творчасці Кузьмы Чорнага / А. Адамовіч. — Мінск : Навука і тэхніка, 1972.

Архивы Беларуси : информационный ресурс органов архивного дела и делопроизводства и системы государственных архивных учреждений Республики Беларусь [Электронный ресурс]. — Режим доступа : https : //archives.gov.by/. — Дата доступа : 12.01.2020.

*Бабарэка, А.* Збор твораў : у 2 т. / А. Бабарэка. — Вільня ; Беласток : Ін-т беларусістыкі : Беларускае гістарычнае таварыства, 2011. — Том 1 : Літаратурна-крытычныя працы.

*Багарадава, Т.* 1917 год у кантэксце «ваеннай» аповесці М. Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне» / Т. Багарадава // Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць (да 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага) : матэрыялы XXV Гарэцкіх чытанняў, Мінск, 22 чэрвеня 2017 г. / Дзярж. музей гісторыі бел. літ., Рэсп. фонд імя братоў Гарэцкіх, Цэнтр даследав. беларус. культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ; рэдкал. : Р. Гарэцкі (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск : РІВШ, 2017. — С. 38—43.

*Багдановіч, М.* Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. — Мінск : Навука і тэхніка, 1992—1995.

*Багушэвіч, Ф.* Выбраныя творы / Ф. Багушэвіч ; уклад. з тэксталаг. падрыхт., прадм. і камент. Я. Янушкевіча. — Мінск : Беларуская навука, 2015.

*Бароўка, В.* «Раскіданае гняздо» Янкі Купалы як узор мастацкай і сэнсавай зладжанасці : да 105-годдзя стварэння п’есы / В. Бароўка // Роднае слова. — 2018. — № 7. — С. 3—6.

Беларуская літаратура : хрэстаматыя ; склад. : У. Адамчык, М. Адамчык. — Мінск : Сучасны літаратар, 2004.

Беларуская літаратура : хрэстаматыя ; склад. М. Хаўстовіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2006. — Частка першая (Другая палова XVIII — першая палова XIX стст.).

Беларускія Александрыя, Троя, Трышчан... : перакладная белетрыстыка Беларусі XV—XVII стст. ; уклад., расчыт., пер. са старабеларус., прадм., камент. А. Бразгунова. — Мінск : Беларуская навука, 2009.

Беларускія летапісы і хронікі : пер. са старажытнарус., старабел., пол. ; уклад. У. Арлова ; навук. рэд., аўт. прадм. В. Чамярыцкі. — Мінск : Кнігазбор, 1997.

*Броўка, П.* Збор твораў : у 9 т. / П. Броўка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1987—1992.




Правообладатель Национальный институт образования

*Бугаёў, Д.* Уладзімір Дубоўка : кніга пра паэта / Д. Бугаёў. — Мінск : Беларуская навука, 2005.

*Быкаў, В.* Поўны збор твораў : у 14 т. / В. Быкаў. — Мінск, 2005—2019. — Т. 10, кн. 1 : Маладыя гады (1985, 2001) : артыкулы, эсэ, прадмовы, інтэрв'ю, гутаркі, аўтабіяграфіі, выступленні (1957—1980). — 2014.

*Бядуля, Змітрок.* Выбраныя творы / Змітрок Бядуля ; уклад., прадм., камент. У. Казберука. — Мінск : Кнігазбор, 2006.

*Бядуля, Змітрок.* Збор твораў : у 5 т. / Змітрок Бядуля. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. — Т. 5. — Кн. 2.

*Васючэнка, П.* Драматургічная спадчына Янкі Купалы : вопыт сучаснага прачытання / П. Васючэнка. — Мінск : Навука і тэхніка, 1994.

*Гарун, Алесь.* Выбраныя творы / Алесь Гарун ; уклад. У. Казберука. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2003.

*Гарэцкі, М.* Гісторыя беларускае літаратуры / М. Гарэцкі ; уклад. і падрыхт. тэксту Т. Голуб. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1992.

*Гарэцкі, М.* Выбраныя творы / М. Гарэцкі ; уклад. Р. Гарэцкага і Т. Голуб ; прадм. і камент. Т. Голуб. — Мінск : Кнігазбор, 2009.

*Гілевіч, Н.* Удзячнасць і абавязак : літ.-крытыч. артыкулы і нататкі / Н. Гілевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1982.

Гісторыя беларускай літаратуры : Старажытны перыяд : падручнік для філалагічных спецыяльнасцей педагагічных вышэйшых навучальных устаноў / [М. М. Грынчык і інш.] ; пад агульн. рэд. М. А. Лазарука і А. А. Семяновіча. — Мінск : Вышэйшая школа, 1997.

Гісторыя беларускай літаратуры XI—XIX стагоддзяў : у 2 т. / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Якуба Коласа і Янкі Купалы ; навук. рэд. У. Мархель, В. Чамярыцкі. — Мінск : Беларуская навука, 2006—2010.

Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літаратуры ; рэд. У. Гніламедаў [і інш.]. — Мінск : Беларуская навука, 2001—2015.

*Гурская, А.* Куляшоў Аркадзь / А. Гурская, Я. Клімуць // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / Ін-т літ. імя Янкі Купалы АН Рэспублікі Беларусь ; Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі ; пад рэд. А. Мальдзіса. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 1994. — Т. 3 : Івашын — Кучар. — С. 459—460.

*Дубоўка, У.* О Беларусь, мая шыпшына... : выбранае / У. Дубоўка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2002.

*Жураўлёў, В.* Актуальнасць традыцый : Якуб Колас у пісьменніцкім асяродку / В. Жураўлёў. — Мінск : Беларуская навука, 2002.

*Жыбуль, В.* Авангардысцкія напрамкі ў кантэксце ўсходнеславянскіх літаратурных сувязяў 20—30-х гг. XX ст. / В. Жыбуль // Веснік БДУ. — Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. — 2003. — № 3. — С. 3—8.

*Замоцін, І.* Беларуская драматургія : Драматычныя творы Я. Купалы / І. Замоцін // Узвышша. — 1927. — № 1. — С. 71—82.

*Зарэцкі, Міхась.* Збор твораў : у 4 т. / Міхась Зарэцкі ; Ін-т літ-ры імя Янкі Купалы. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1989—1992.



Правообладатель Национальный институт образования

*Каваленка, В.* Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Развіццё беларускай літаратуры XIX—XX стагоддзяў / В. Каваленка. — Мінск : Навука і тэхніка, 1975.

*Каваленка, В.* Міфапаэтычныя матывы ў беларускай літаратуры / В. Каваленка. — Мінск : Навука і тэхніка, 1981.

*Казлова, В.* На скрыжаваннях лёсу : зб. прац / В. Казлова. — Мінск : Выдавецкі цэнтр БДУ, 2009.

*Казлоўская, М.* Універсальнае ў драматычным канфлікце п'есы Янкі Купалы «Раскіданае гняздо» / М. Казлоўская // Веснік БДУ. Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. — 2006. — № 3. — С. 10—14.

*Капуста, Ж.* Інтэрпрэтацыя паэтычнай традыцыі Янкі Купалы ў розных эстэтычных кірунках 1920-х гг. / Ж. Капуста // Міфалогія — фальклор — літаратура : праблемы паэтыкі : зб. навук. прац ; склад. Т. Шамякіна ; пад агул. рэд. В. Рагойшы. — Мінск : Выдавецкі цэнтр БДУ, 2007. — Вып. 5. — С. 60—66.

*Карский, Е.* Белорусы : в 3 т. / Е. Карский. — Петроград, 1922. — Т. 3. Вып. 3 : Очерки словесности белорусского племени. Художественная литература на народном языке.

*Колас, Якуб.* Выбраныя творы / Якуб Колас ; уклад., прадм., камент. М. Тычыны. — Мінск : Кнігазбор, 2007.

*Колас, Якуб.* Збор твораў : у 20 т. / Якуб Колас. — Мінск : Беларуская навука, 2007—2012.

*Корань, Л.* Кузьма Чорны / Л. Корань // Цукровы пеўнік : літ.-крытыч. артыкулы. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1996.

*Крапіва, Кандрат.* Выбраныя творы / Кандрат Крапіва ; уклад., прадм., камент. С. Андраюка. — Мінск : Беларуская навука, 2008.

Кузьма Чорны. Чалавек — гэта цэлы свет : успаміны, эсэ, артыкулы, інтэрв'ю, дакументы ; уклад. Г. Шаблінская. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2016.

*Куляшоў, А.* Збор твораў : у 5 т. / А. Куляшоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1974—1977.

*Купала, Янка.* Поўны збор твораў : у 9 т. / Янка Купала. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1995—2003.

Литературный энциклопедический словарь ; под общ. ред. В. Кожевникова, П. Николаева ; редкол. : Л. Андреев, Н. Балашов, А. Бочаров [и др.]. — М. : Советская энциклопедия, 1987.

*Лужанін, М.* Колас расказвае пра сябе : аповесць-эсэ : для сярэд. і ст. шк. узросту / М. Лужанін. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1997.

*Луцкевіч, А.* Выбраныя творы : праблемы культуры, літаратуры і мастацтва / А. Луцкевіч. — Мінск : Кнігазбор, 2006.

*Макарэвіч, А.* Гісторыя беларускай літаратуры першай трэці XX ст. : дапаможнік : у 2 ч. / А. Макарэвіч. — Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2013. — Ч. 1.

Максім Багдановіч : энцыклапедыя ; пад навук. рэд. М. Труса. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2011.



Правообладатель Национальный институт образования

Максім Гарэцкі : успаміны, артыкулы, дакументы ; склад. А. Ліс, І. Саламевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1984.

*Мальдзіс, А.* Творчае пабрацімства : беларуска-польскія літаратурныя ўзаемасувязі ў XIX стагоддзі / А. Мальдзіс // Выбранае / А. Мальдзіс ; уклад. В. Грышкевіч ; прадм. Г. Кісялёў, В. Чамярыцкі. — Мінск, 2007. — С. 13—19.

*Мархель, У.* Прадвесце : беларуска-польскае літаратурнае ўзаемадзеянне ў першай палове XIX ст. / У. Мархель. — Мінск : Навука і тэхніка, 1991.

*Мележ, І.* Жыццёвыя клопаты : літаратурная крытыка, публіцыстыка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1975.

*Мележ, І.* Збор твораў : у 10 т. / І. Мележ. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1979—1985.

*Мельнікава, З.* «Гісторыя беларускае літаратуры» М. Гарэцкага і станаўленне метадалогіі айчыннага літаратуразнаўства / З. Мельнікава // Максім і Гаўрыла Гарэцкія : матэрыялы XXV Гарэцкіх чытанняў, Мінск, 22 чэрвеня 2017 г. ; рэдкал. : Р. Гарэцкі (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск : РІВШ, 2017. — С. 118—125.

*Мельнікава, З.* Псіхалогія літаратурнай творчасці : вучэб.-метад. комплекс / З. Мельнікава. — Брэст : БрДУ, 2016.

*Мельнікаў, А.* Францішак Багушэвіч : творца беларускай нацыі / А. Мельнікаў. — Рыга : Ін-т беларус. гісторыі і культуры, 2018.

*Мушынскі, М.* Мае Каласавіны : з вопыту вывучэння літаратурнай і грамадска-культурнай дзейнасці Якуба Коласа / М. Мушынскі. — Мінск : Беларуская навука, 2016.

*Мушынскі, М.* Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі : жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага / М. Мушынскі ; навук. рэд. А. Макарэвіч ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Якуба Коласа і Янкі Купалы. — Мінск : Беларуская навука, 2013.

*Навуменка, І.* Кніга адкрывае свет : літ.-крытыч. артыкулы / І. Навуменка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1978.

*Панчанка, П.* Выбранае : вершы, паэма / П. Панчанка ; прадм. Р. Барадуліна. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1993.

*Рагойша, В.* Літаратуразнаўчы слоўнік : тэрміны і паняцці : для школьнікаў і абітурыентаў / В. Рагойша. — Мінск : Народная асвета, 2009.

*Рагойша, В.* «Людем посполитым к доброму научению» : Паэтычная творчасць Францыска Скарыны / В. Рагойша // Дзеяслоў. — 2018. — № 91. — С. 256—277.

*Рагойша, В.* Мой Трыглаў : кніга пра Янку Купалу, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча / В. Рагойша. — Мінск : Кнігазбор, 2012.

*Рагойша, В.* Паэтычны слоўнік / В. Рагойша. — Мінск : Беларуская навука, 2004.

*Рагуля, А.* Трывожнае абуджэнне : проза Ядвігіна Ш. / А. Рагуля // Роднае слова. — 2009. — № 1. — С. 9—11.

*Разанаў, А.* Паляванне ў райскай даліне : Версэты. Паэмы. Пункціры. Вершаказы. З Вяліміра Хлебнікава. Зномы / А. Разанаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1995.



Правообладатель Национальный институт образования

*Саламевіч, Я.* Ядвігін Ш. / Я. Саламевіч // Роднае слова. — 2009. — № 1. — С. 8.

*Сінькова, Л.* Дынаміка жанравых структур у беларускай прозе XX стагоддзя / Л. Сінькова // Веснік БДУ. — Сер. IV. — 1996. — № 1. — С. 3—7.

Старажытная беларуская літаратура (XII—XVII стст.) ; уклад., прадм. і камент. І. Саверчанкі. — Мінск : Кнігазбор, 2007.

Сцежкамі жыцця : успаміны / П. Мядзёлка ; пад рэд. А. Ліса. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1974.

*Танк, Максім.* Збор твораў : у 13 т. / Максім Танк. — Мінск : Беларуская навука, 2006—2012.

*Ткачук, В.* Звонку і знутры. Праблема псіхалагізму і мастацкага характару ў сучасным літаратуразнаўстве / В. Ткачук // Беларуская думка. — 2014. — № 1. — С. 98—103.

*Трафімчык, А.* Колас зямлі беларускай : да 135-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа : дапам. для настаўнікаў / А. Трафімчык. — Мінск : Народная асвета, 2017.

*Тычына, М.* Кузьма Чорны : эвалюцыя мастацкага мыслення / М. Тычына ; навук. рэд. В. Івашын. — Мінск : Беларуская навука, 2004.

Філаматы і філарэты : зборнік ; уклад., пер. польскамоўн. твораў, прадм., біягр. даведкі пра аўт. і камент. К. Цвіркі. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 1998.

Францішак Бенядзікт Багушэвіч : жыццё і творчасць : альбом ; склад. : У. Содаль, Е. Мацюш. — Мінск : Народная асвета, 1986.

*Хадыка, А.* Вяртанне «Пана Міністра» / А. Хадыка // Новы час. – 2011. — № 11 (233). — 18 сак. — С. 15.

*Цётка.* Выбраныя творы / Цётка ; уклад., прадм. В. Коўтун, камент. С. Александровіча і В. Коўтун. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2001.

*Чачот, Я.* Выбраныя творы / Я. Чачот ; уклад., пер., прадм., камент. К. Цвіркі. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 1996.

*Чорны, Кузьма.* Выбраныя творы / Кузьма Чорны ; уклад. і прадм. М. Тычыны, камент. М. Тычыны, Я. Янушкевіча. — Мінск : Беллітфонд, 2000.

*Штэйнер, І.* Шматмоўная літаратура Беларусі XIX стагоддзя / І. Штэйнер. — Мінск : Беларуская навука, 2002.

*Шынкарэнка, В.* Летапісец / Максім Багдановіч : энцыклапедыя ; склад. І. Саламевіч, М. Трус ; рэдкал. Т. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2011.

*Ядвігін Ш.* Выбраныя творы / Ядвігін Ш. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2006.

*Яцухна, В.* Тэорыя літаратуры : дапам. для студэнтаў філалаг. спецыяльнасцей ВНУ / В. Яцухна / Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. — Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006.

Поўны спіс выкарыстаных крыніц



Правообладатель Национальный институт образования

# Змест

Ад аўтараў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
**Уводзіны** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
*Тэорыя літаратуры.* Літаратурны напрамак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11

**ДАЎНЯЯ ЛІТАРАТУРА (XI—XVIII СТАГОДДЗІ)**

ЛІТАРАТУРА ЭПОХІ СЯРЭДНЕВЯКОЎЯ (XI—XV стагоддзі) . . . . . . . . . 17
*Тэорыя літаратуры.* Жанры літаратуры Сярэдневякоўя . . . . . . . . . . 24
ЛІТАРАТУРА ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ (XVI стагоддзе) . . . . . . . . . . . . . . 26
**Францыск Скарына** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
*Тэорыя літаратуры.* Жанры літаратуры Адраджэння . . . . . . . . . . . . 41
ЛІТАРАТУРА ЭПОХІ БАРОКА (XVII—XVIII стагоддзі) . . . . . . . . . . . . 42
ЛІТАРАТУРА АСВЕТНІЦТВА (другая палова XVIII — пачатак XIX стагоддзя) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
*Пытанні і заданні для паўтарэння і падагульнення* . . . . . . . . . . . . . . 52

**РАЗВІЦЦЁ НОВАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XIX СТАГОДДЗЯ**

АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XIX СТАГОДДЗЯ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
РАМАНТЫЗМ У ЕЎРАПЕЙСКІМ І БЕЛАРУСКІМ МАСТАЦТВЕ СЛОВА КАНЦА XVIII — ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТАГОДДЗЯ . . . . . . . . 59
**Ян Чачот** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63
Паэтычная творчасць Яна Чачота . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
*Тэорыя літаратуры.* Рамантызм як літаратурны напрамак . . . . . . . . 68
**Францішак Багушэвіч** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70
Паэма «Кепска будзе!» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74
*Тэорыя літаратуры.* Рэалізм як літаратурны напрамак . . . . . . . . . . . 77
*Пытанні і заданні для паўтарэння і падагульнення* . . . . . . . . . . . . . . 78

**ШЛЯХІ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ**

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ . . . . . . . . . . . . . 79
*Тэорыя літаратуры.* Літаратурны працэс . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 83



Правообладатель Национальный институт образования

**Цётка** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 87
Патрыятычная лірыка Цёткі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 91
**Ядвігін Ш.** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
Апавяданне «Дуб-дзядуля» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 96
**Янка Купала** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98
П’еса «Раскіданае гняздо» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
*Тэорыя літаратуры.* Выяўленне аўтарскай пазіцыі ў драматычным творы 110
**Якуб Колас** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 112
Трылогія «На ростанях» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 114
**Максім Багдановіч** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 122
Паэзія Максіма Багдановіча . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 124
*Тэорыя літаратуры.* Верлібр і вольны верш . . . . . . . . . . . . . 132
Алгарытм аналізу паэтычнага твора . . . . . . . . . . . . . . . . . . 133
Аналіз верша «Летапісец» Максіма Багдановіча . . . . . . . . . . . 134
**Алесь Гарун** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 137
Паэзія Алеся Гаруна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 139
*Пытанні і заданні для паўтарэння і падагульнення* . . . . . . . . . 142
БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА 1920—1930-х ГАДОЎ . . . . . . . . . . . 143
**Максім Гарэцкі** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 152
Апавяданне «Літоўскі хутарок» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 156
*Тэорыя літаратуры.* Аўтабіяграфізм і дакументалізм . . . . . . . . 159
**Змітрок Бядуля** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 161
Апавяданне «Бондар» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 164
Алгарытм аналізу празаічнага твора . . . . . . . . . . . . . . . . . . 167
Аналіз апавядання «Бондар» Змітрака Бядулі . . . . . . . . . . . . 168
**Уладзімір Дубоўка** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 172
Паэзія Уладзіміра Дубоўкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 175
*Тэорыя літаратуры.* Мастацкія тропы . . . . . . . . . . . . . . . . . 179
**Кандрат Крапіва** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 182
Камедыя «Хто смяецца апошнім» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 185
*Тэорыя літаратуры.* Сатырычная камедыя. Канфлікт у драматычным творы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 193
Алгарытм аналізу драматычнага твора . . . . . . . . . . . . . . . . . 193
**Міхась Зарэцкі** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 194
Апавяданне «Дзіўная» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 197
*Тэорыя літаратуры.* Псіхалагізм у мастацкім творы . . . . . . . . . 202
*Пытанні і заданні для паўтарэння і падагульнення* . . . . . . . . . 203
БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПЕРЫЯДУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (1941—1945) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 204
ГЕРОІКА-ПАТРЫЯТЫЧНЫ ПАФАС ВАЕННАЙ ЛІРЫКІ . . . . . . . . 209
**Пятрусь Броўка** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 212
**Аркадзь Куляшоў** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 217



Правообладатель Национальный институт образования

**Максім Танк** . . . . . . . . . . 222
**Кузьма Чорны** . . . . . . . . . . 227
Раман «Пошукі будучыні» . . . . . . . . . . 231
*Тэорыя літаратуры.* Раман як эпічны жанр . . . . . . . . . . 240
*Пытанні і заданні для паўтарэння і падагульнення* . . . . . . . . . . 241
БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПАСЛЯВАЕННЫХ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯЎ (1945—1965) . . . . . . . . . . 241
**Пімен Панчанка** . . . . . . . . . . 254
Лірыка Пімена Панчанкі . . . . . . . . . . 257
*Тэорыя літаратуры.* Лірычны герой, лірычнае «я» і аўтар . . . . . . . . . . 263
**Іван Мележ** . . . . . . . . . . 265
Раман «Людзі на балоце» . . . . . . . . . . 268
*Пытанні і заданні для паўтарэння і падагульнення* . . . . . . . . . . 281

Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў . . . . . . . . . . 282
Спіс выкарыстаных крыніц . . . . . . . . . . 288

Правообладатель Национальный институт образования

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Вучэбнае выданне

**Бязлепкіна-Чарнякевіч** Аксана Пятроўна
**Акушэвіч** Андрэй Аляксандравіч
**Воюш** Інга Дзмітрыеўна і інш.

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

Вучэбны дапаможнік для 10 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання
(з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню)

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *Н. М. Мамчыц*
Мастак *Г. А. Ламанава*
Мастацкі рэдактар *З. П. Болцікава*
Камп'ютарная вёрстка *А. М. Кісялёва*
Карэктары *Д. Р. Лосік, Н. Ф. Федарэнка, В. М. Паўлючэнка*

Падпісана да друку 03.08.2020. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 21,65. Ул.-выд. арк. 17,82 + 30,82 (эл. дадат.). Тыраж 131 230 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/263 ад 02.04.2014.
Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск

Правообладатель Национальный институт образования

# Стужка часу (XI—XIX стагоддзі)




Правообладатель Национальный институт образования

# Стужка часу (канец XIX — XX стагоддзе)




Правообладатель Национальный институт образования



ISBN 978-985-594-737-1

Правообладатель Национальный институт образования